**Анатоль Вялікі**

# На раздарожжы

***Беларусы і палякі***
***ў час перасялення***
***1944-1946***

**Мінск**
**2004**

www.kamunikat.org

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь

Анатоль Вялікі

# На раздарожжы
# Беларусы і палякі ў час перасялення. 1944-1946

манаграфія

Мінск
2004

www.kamunikat.org

УДК 947.6+943.8
ББК
В

Рэкамендавана да друку
Навуковым саветам Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь

Навуковы рэдактар
кандыдат гістарычных навук В.Дз.Селяменеў,
Рэцэнзент
доктар гістарычных навук, прафесар У.Е.Снапкоўскі

Вялікі А.
На раздарожжы. Беларусы і палякі ў час перасялення. 1944-1946.-Мн.:
В НАРБ, 2004.- 230 с.

ISBN 985-435-915-8

У манаграфіі аналізуецца адна са складаных і маладаследаваных старонак гісторыі Беларусі сярэдзіны 40-х гадоў XX стагоддзя – перасяленне польскага насельніцтва з Беларусі ў Польшчу і беларусаў з Польшчы ў Беларусь. Паказваюцца знешнія і ўнутрыпалітычныя прычыны, якія абумовілі ўстанаўленне савецка-польскай мяжы і ажыццяўленне перасялення насельніцтва, аналізуецца сукупнасць фактараў, якія вымушалі людзей перасяляцца, ці адмаўляцца ад перасялення, характарызуюцца адносіны кіраўніцтва Беларусі і Польшчы да перасяленчага працэса, вызначаюцца асноўная, этапы, дынаміка, колькасны, прафесійны, сацыяльны стан перасяленцаў. Разлічана на навукоўцаў, выкладчыкаў і студэнтаў гістарычных факультэтаў ВНУ, усіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі XX стагоддзя.

УДК 947.6+943.8
ББК

ISBN 985-435-915-8
© Вялікі А., 2004

На раздарожжы
Беларусы і палякі ў час перасялення
1944-1946

Уводзіны
Раздзел 1. Савецка-польская мяжа і Беларусь: погляд з усходу і захаду
Глава 1. Лінія Керзана: апошні тэрытарыяльны падзел Беларусі
Глава 2. Эвакуацыя, рэпатрыяцыя, абмен насельніцтвам ці перасяленне?
Глава 3. Беларуска-польскія пагадненні аб перасяленні: здабыткі і пралікі беларускай дыпламатыі

Раздзел 2. З "Другой Рэчы Паспалітай" у камуністычную Польшчу
Глава 1. "Ніякай складанай сітуацыі ў заходніх абласцях Беларусі няма..."
Глава 2. Ехаць ці заставацца?
Глава 3. Пад пільным чэкісцкім наглядам
Глава 4. Выбар зроблены - у Польшчу
Глава 5. Армія Краёва ў Беларусі: за і супраць перасялення
Глава 6. Касцёл у час перасялення

Раздзел 3. Вясна 1945 г. Ад нейтралітэту да татальнага кантролю
Глава 1. "Выкрасліць з рэгістрацыйных спісаў ...": адміністрацыйны рэсурс у дзеянні
Глава 2. Цяжкая дарога дадому
Глава 3. Зыход

Раздзел 4. З прасавецкай Польшчы ў камуністычную Беларусь
Глава 1. Адзінства ўсіх: беларусы павінны выехаць за лінію Керзана
Глава 2. "Чырвоная агітацыя"
Глава 3. "Эвакуацыя" і Армія Краёва на Беласточчыне
Глава 4. Правал перасяленчай акцыі

Заключэнне
Літаратура і крыніцы
Дадаткі

## Уводзіны

У гісторыі беларуска-польскага памежжа сярэдзіны 40-х гадоў XX стагоддзя перасяленне, якое ажыццяўлялася паміж Беларуссю і Польшчай у 1944-1946 гг., займае асаблівае месца. Перасяленне палякаў з заходняга рэгіёна Беларусі ў Польшчу, а беларусаў з Польшчы, галоўным чынам з Беласточчыны, у БССР з'явілася значным палітычным, эканамічным, сацыяльным, дыпламатычным фактарам беларуска-польскіх адносін сярэдзіны 40-х гадоў, які наўпрост закранаў нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы Беларусі. Не менш істотна перасяленне паўплывала на асабістыя лёсы соцень тысяч людзей. Яно разарвала трывалыя роднасныя, сяброўскія, суседскія сувязі, паўплывала на змяненне дэмаграфічнай структуры насельніцтва, аказала значны ўплыў на культуру і жыццёвы ўклад людзей, які складваўся стагоддзямі.

Аўтар паспрабаваў паказаць складаны, супярэчлівы, неадназначна ўспрыняты этап у гісторыі беларускага народа і яго ўзаемаадносіны з бліжэйшым заходнім суседам – Польшчай. Разам з тым сучасная беларуская гістарыяграфія вымагае разглядаць перасяленчую акцыю не толькі як двухбаковыя адносіны паміж БССР і Польшчай, а значна шырэй – у рэчышчы пасляваеннага развіцця Беларусі, якое адбывалася на фоне агульнаеўрапейскіх працэсаў, найперш зменаў межаў у Цэнтральна-Усходняй Еўропе, абумоўленых вынікамі Другой сусветнай вайны. Змены межаў непазбежна выклікалі - і гэта таксама было адным з істотных вынікаў вайны - перасяленні насельніцтва ў пасляваеннай Еўропе. Таму перасяленне, якое наўпрост закранула Беларусь, неабходна разглядаць не толькі як беларускую справу, а агульнаеўрапейскую, да ўзнікнення і рашэння якой спрычыніліся галоўныя ўдзельнікі Другой сусветнай вайны, а на заключным яе этапе – краіны антыгітлераўскай кааліцыі і найперш СССР, ЗША і Англія.

Планы заходніх саюзнікаў СССР у пытанні перасялення ўзніклі пасля таго, як Савецкі Саюз цвёрда і паслядоўна выказаўся, што Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна ёсць неад'емная частка Савецкага Саюза. На канферэнцыі ў Тэгеране ў час дыскусій аб будучай усходняй мяжы Польшчы паўстала пытанне аб неабходнасці перасялення грамадзян, якія не пажадаюць жыць на тэрыторыях, што ўвайшлі ў склад СССР, а таксама на тых, што адышлі да Польшчы.

Асаблівасцю ўключанасці Беларусі ў агульнаеўрапейскія перасяленчыя працэсы з'яўлялася тое, што яна выступала не як аб'ект, а як суб'ект міжнароднага права і фармальна паўнапраўны

ўдзельнік міжнародных адносін. Якасна новы статус Беларусі на міжнароднай арэне надаваў закон СССР  ад 1 лютага 1944 г. аб прадастаўленні саюзным рэспублікам паўнамоцтваў у галіне знешніх зносін. Закон замацаваў правы Беларусі ўступаць у непасрэдныя зносіны з замежнымі дзяржавамі, заключаць з імі пагадненні і абменьвацца консульскімі і дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі. Гэтыя змены былі замацаваныя ў Канстытуцыі БССР, і ў адпаведнасці з імі ў сакавіку 1944 г. быў створаны Наркамат замежных спраў (НКЗС) БССР. Разам з тым неабходна ўсведамляць, што Беларусь знаходзілася ў складзе СССР і цалкам падпарадкоўвалася знешнепалітычнай дактрыне Масквы, нягледзячы на змены ў дзяржаўна-прававым статусе  Беларусі і яе месцы ў сістэме міжнародных адносін.

Перасяленне праходзіла ў складаных грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных абставінах, абумоўленых Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнамі і пасляваенным аднаўленчым перыядам, дзейнасцю ў заходнім рэгіёне Беларусі разгалінаванай сеткі ўзброенага польскага падполля, панаваннем у значнай частцы беларусаў і палякаў антысавецкіх настрояў. Ход перасялення паказаў, што беларускія ўлады не спрагназавалі і не ўлічылі, што сотні тысяч палякаў пажадаюць змяніць грамадзянства і перасяліцца ў Польшчу, у той  час як абсалютная большасць беларусаў Беласточчыны не пажадае пераехаць у БССР і застанецца ў Польшчы. Колькасныя паказчыкі засведчылі, па-першае, што ад'езд палякаў з заходніх абласцей БССР значна пераважаў над прыездам беларусаў з Польшчы, што не магло колькасна і якасна кампенсаваць людскія страты Беларусі ў час перасялення. Па-другое - гэта была адна з самых масавых хваль беззваротнай міграцыі насельніцтва з рэспублікі ў пасляваенны час, якая значна паўплывала на дэмаграфічную сітуацыю ў заходнім рэгіёне Беларусі.

Перасяленне ажыццяўлялася, калі ў Беларусі панаваў камуністычны рэжым, а Польшча ўсё больш і больш трапляла ў залежнасць ад Масквы. Таталітарная ўлада спрычынілася да таго, што перасяленчая акцыя ва ўсёй яе шматаспектнасці  аказалася адной з найбольш засакрэчаных тэм у Беларусі, ды і ў Савецкім Саюзе і Польшчы, і стала недасягальнай для даследаванняў айчыннымі гісторыкамі. Усе дакументальныя матэрыялы, якія датычыліся перасяленчага працэсу, трапілі ў спецсховішчы і да пачатку 90-х гадоў знаходзіліся на сакрэтным рэжыме захоўвання. На тэму перасялення было накладзена жорсткае партыйнае табу, і яно толькі тэзісна згадвалася ў працах гісторыкаў, мемуарнай

літаратуры. Дастаткова нагадаць, што ва ўспамінах колішняга наркама (з 1946 – міністра) замежных спраў БССР Кузьмы Кісялёва няма ніводнага радка аб гэтым працэсе. Няма, нягледзячы на тое, што ён як наркам замежных спраў і адначасова намеснік Старшыні ўрада БССР "курыраваў" ход працэсу перасялення і да таго ж асабіста адказваў у бюро ЦК КП(б)Б за яго арганізацыю, ход, вынікі.

Гэтаму факту можа быць некалькі тлумачэнняў як унутранага, так і знешняга характару. Галоўнымі, на наш погляд, з'яўляліся наступныя. Па- першае, таталітарны характар улады не дазваляў ёй прызнаць факта, што з "самай дэмакратычнай і вольнай" краіны кінуліся наўцёкі сотні тысяч людзей у прасавецкую Польшчу, якая стварыла і прадаставіла людзям лепшыя ўмовы простага чалавечага жыцця і побыту. Зыход соцень тысяч людзей з заходняга рэгіёна Беларусі магчыма разглядаць як іх маўклівы пратэст, "галасаванне нагамі" супраць савецкай улады. Па-другое, усталяваннем і падтрыманнем добрасуседскіх, не абцяжараных ніякімі праблемамі стасункаў з прасавецкім, поўнасцю залежным ад Масквы ўрадам Польшчы. І ў Маскве, і ў Варшаве "закрылі" вочы на праблемы масавых дэпартацый насельніцтва з Заходняй Беларусі ў 1939-1941 гг. і ў пасляваенны час, праблему Арміі Краёвай, палякаў як нацыянальнай меншасці ў Беларусі і беларусаў у Польшчы і многае іншае. У савецка-польскіх добрасуседскіх і прыязных адносінах беларускай праблемы, а вышэйзгаданае і з'яўлялася такой, не павінна было існаваць, і яна ў савецкім афіцыёзе не існавала. Па-трэцяе, перасяленчую акцыю магчыма разглядаць як "зачыстку" тэрыторыі Заходняй Беларусі ад ненадзейнага, з палітычнага, нацыянальнага, сацыяльнага погляду, "элемента", да якога і ў Маскве, і ў Мінску ставіліся з насцярогай і ў пэўнай ступені з варожасцю. У сукупнасці гэтыя прычыны і прывялі да таго, што тэма перасялення ва ўсёй яе шматаспектнасці стала забароненай і невывучаемай беларускай савецкай гістарыяграфіяй.

Аднак нельга сказаць, што па праблеме перасялення зусім не было прац. Напрыканцы 40-х – пачатку 50-х гадоў працэс перасялення пачынае адлюстроўвацца ў агульнасаюзнай літаратуры. У выдадзеныя ў 1949 і 1952 гг. зборнікі дакументаў "Знешняя палітыка Савецкага Саюза" ўвайшлі матэрыялы, у якіх утрымліваюцца звесткі аб перасяленні палякаў з СССР у Польшчу[1]. Аднак дакументы, прадстаўленыя ў іх, характарызуюцца

[1] Внешняя политика Советского Союза. Документы и материалы, 4 сентября – 31 декабря 1945 г.-М.: Госполитиздат, 1949.

нешматлікасцю і аднабаковасцю, бо праблему перасялення асвятляюць выключна ў кантэксце савецка-польскіх адносін. “Кантэкст” савецка-польскіх адносін быў дамінуючым для нешматлікіх прац беларускіх і расійскіх гісторыкаў, а таксама для шэрагу зборнікаў дакументаў, якія выйшлі ў наступныя гады.

Праблема перасялення знайшла больш грунтоўнае і аб’ектыўнае адлюстраванне ў працах прадстаўнікоў беларускай дыяспары, напрыклад, у працах М.Волацiча[2]. Ён прыйшоў да высновы, што перадача Беласточчыны Польшчы ажыццявілася за кошт нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў Беларусі ў выніку перамоваў паміж Масквой і Варшавай, таму мела ярка акрэслены антыбеларускі характар. Перасяленне ён ахарактарызаваў як абсалютна непатрэбную акцыю, якая, “апрача шкоды, нічога не прынесла беларускаму народу”[3]. Нягледзячы на празмерную катэгарычнасць, спрэчнасць многіх высноў, дыскусійнасць шэрагу палажэнняў, яго праца доўгі час заставалася адзінай працай па-за межамі Беларусі, у якой была спроба аналізу прычын, ходу, вынікаў перасялення для Беларусі і беларускага народа.

У пачатку 90-х гадоў айчынныя і замежныя гісторыкі атрымалі магчымасць доступу да комплекса дакументаў, якія знаходзіліся на сакрэтным захоўванні, і больш глыбокага і ўсебакова разгляду гэтай праблемы. У першую чаргу неабходна адзначыць працу В.Парсаданавай[4], зборнік дакументаў, які падрыхтавалі расійскія гісторыкі і архівісты[5], артыкулы Г.Кнацько і У.Ракашэвіча[6], у якіх рабілася спроба аб’ектыўнага аналіза перасяленчаскага працэсу. Значная ўвага праблеме перасялення, аналізу беларуска-польскіх адносін надавалася ў працах У.Снапкоўскага.[7] Фактычна ён першы з беларускіх гісторыкаў

---

[2] Волацiч М. Насельніцтва Заходняй Беларусі і яго перасяленне паміж сучаснай Польшчай і БССР // Беларускі зборнік.-Мюнхен, 1956.-Кн.4. Яго ж. Лінія Керзона на фоне падзеяў і тэрытарыяльных зьменаў у Усходняй Эўропе // Спадчына.1993.-№ 6.

[3] Волацiч М. Насельніцтва Заходняй Беларусі … С.34.

[4] Парсаданова В.С. Советско-польские отношения. 1945-1949.- М.:Наука, 1990.

[5] НКВД и польское подполье. 1944-1945: (По «Особым папкам» И.В.Сталина): Сб.док. / Сост. Т.В.Волокитина и др.-М.:Рос. АН, Ин-т славяноведения и балканистики, 1994.

[6] Кнатько Г. К вопросу об обмене населением между Белоруссией и Польшей в 1944-1946 гг. // Тэзісы чацвёртай навуковай канферэнцыі беларускіх і польскіх гісторыкаў «Армія Краёва на тэрыторыі Заходняй Беларусі» (чэрвень 1941 – ліпень 1944 гг.), Гродна, 6-7 кастрычніка 1994 г. / Бел. навук. аслед. цэнтр дакумент., археагр. і архіўнай справы.-1994.- С.103-108; Ракашевич В. Послевоенная демаркация советско-польской границы и «великое переселение» белорусского и польского населения // Тэзісы чацвёртай навуковай канферэнцыі беларускіх і польскіх гісторыкаў «Армія Краёва на тэрыторыі Заходняй Беларусі» (чэрвень 1941 – ліпень 1944 гг.), Гродна, 6-7 кастрычніка 1994 г. / Бел. навук. аслед. цэнтр дакумент., археагр. і архіўнай справы.-1994.- С.119-126.

[7] Снапкоўскі У.Е. Знешнепалітычнай дзейнасць Беларусі. 1944-1953 гг. / Пад рэд. Ю.П.Броўкі.-Мінск: Бел.навука, 1977. Яго ж. Савецка-польскія пагадненні аб абмене

адзначыў, што для Беларусі перасяленне з'явілася значнай дзяржаўнай, палітычнай, эканамічнай падзеяй беларуска-польскіх адносін сярэдзіны 40-х гадоў.

Уплыў польскага падполля на перасяленне закранулі ў сваіх працах В.Ермаловіч і С.Жумар, а таксама Н.Рыбак. Аднак спрэчнымі з'яўляюцца іх высновы аб тым, што галоўнай задачай перасялення палякаў з заходніх абласцей Беларусі ў Польшчу з'яўлялася звужэнне сацыяльнай базы польскага падполля[8].

Станоўчым фактам з'яўляецца тое, што з сярэдзіны 90-х гадоў гісторыкі заходніх абласцей Беларусі на рэгіянальным матэрыяле пачалі даследаваць згаданую тэму. Найбольш грунтоўна яе распрацоўваюць гісторыкі Гродзенскага універсітэта, якія ў рамках комплекснага аналізу этнасацыяльных і соцыякультурных працэсаў на Гродзеншчыне ў XX ст. вывучаюць рознабаковыя аспекты перасялення і іх вынікі для Гродзенскай вобласці. Вынікі іх даследаванняў знайшлі адлюстраванне ў матэрыялах рэспубліканскай навуковай канферэнцыі, якая адбылася ў Гродна ў 1997 г.[9].

Тым не менш багаты рэгіянальны матэрыял знаходзіць недастатковае практычнае выкарыстанне. Так, у надрукаваных у другой палове 90-х гадоў гісторыка-дакументальных хроніках "Памяць" Глыбоцкага, Валожынскага, Навагрудскага, Брэсцкага раёнаў, г. Гродна і іншых раёнаў і гарадоў заходняга рэгіёна Беларусі не згадваецца аб перасяленні насельніцтва. Пэўным выключэннем сталі хронікі "Памяць" г. Пінска, Бераставіцкага і Пастаўскага раёнаў. Аднак, калі ў хроніцы г. Пінска прыводзіцца толькі вытрымка з дакладной запіскі Пінскага АК КП(б)Б у ЦК КП(б)Б "Аб перасяленні грамадзян польскай нацыянальнасці ў Польшчу", без каментараў, тлумачэнняў, аналіза колькасных дадзеных аб перасяленцах у Польшчу, складанасцях гэтага працэсу ў былой Пінскай вобласці, то ў хроніках Бераставіцкага і Пастаўскага раёнаў аўтары паспрабавалі прааналізаваць грамадска-палітычную сітуацыю ў час перасялення, вызначыць

---

насельніцтвам 1944-1945, 1957 г. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: / Гал. рэд Г.П.Пашкоў.- Мінск: Бел.Энцыкл., 2001.-Т.6. Кн.1.-С.197-198. Яго ж. Міжнародныя аспекты вызначэння савецка-польскай мяжы ў 1941-1945 гг. // Бел. гіст. часопіс.-1994.-№3.-С.9-14.

[8] Ермолович В.И., Жумарь С.В. Огнем и мечом: Хроника польского националистического подполья в Белоруссии (1939-1953 гг.) –Минск: БелНИИДАД. 1994; Рыбак Н.А. Деятельность Армии Крайовой и постаковских формирований в Западной Белоруссии в 1944-1954 гг. Дис. …канд. ист. наук, 007.00.02-Минск, 2001.

[9] Этнасацыяльныя і культурныя працэсы ў заходнім рэгіёне Беларусі: гісторыя і сучаснасць: //Матэрыялы рэсп. навук. канф., Гродна, 5-6 снежня 1997 г./ Гродзенск. дзярж. ун-т; Адк. рэд. І.П.Крэнь.-Гродна, 1998

матывы, якія вымушалі палякаў перасяляцца, іх колькасны, прафесійны, сацыяльны склад і г.д.[10].

Значны блок матэрыялаў, у якіх адлюстраваны ўзаемаадносіны эміграцкага ўрада, Польскага Камітэта Нацыянальнага Вызвалення (ПКНВ) з урадам СССР, іх погляды ў вызначэнні савецка-польскай мяжы ўтрымліваецца ў чацвёртым томе дакументальнага зборніка "Знешняя палітыка Беларусі"[11]. Асобныя звесткі аб перасяленні ўтрымліваюцца ў зборніку дакументаў і матэрыялаў, якія падрыхтавалі супрацоўнікі Нацыянальнага архіва РБ і Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны[12]. Разам з тым даводзіцца канстатаваць, што беларуская гістарыяграфія па гэтай праблеме саступае і са значным спазненнем, у параўнанні з польскімі і ўкраінскімі гісторыкамі, пачала распрацоўваць перасяленчую праблематыку.

Сярод работ польскіх гісторыкаў у першую чаргу неабходна адзначыць грунтоўную працу Я. Чарнікевіча, які на значным дакументальным матэрыяле прааналізаваў колькасны, сацыяльны, прафесійны, узроставы стан перасяленцаў з Беларусі ў Польшчу.[13] Значную каштоўнасць уяўляе зборнік дакументаў пад рэдакцыяй прафесара С.Цысельскага.[14] Вартасць зборніка дакументаў у тым, што аўтары прыйшлі да высновы аб неабходнасці тэарэтычнага асэнсавання ўжо назапашанага дакументальнага матэрыялу, удакладнення тэрмінаў "эвакуацыя", "рэпатрыяцыя", "перасяленне", "абмен насельніцтвам", "перамяшчэнне" ў адносінах да перасяленцаў з РСФСР і заходніх абласцей Беларусі і Украіны, больш глыбокага аналізу матываў, якія вымушалі людзей перасяляцца ці адмаўляцца ад перасялення, вывучэння структуры насельніцтва на тэрыторыях, якія змяніліся ў выніку падзей 1939-1941 гг. і пасляваеннага часу, характарыстыкі міграцыйных рухаў

---

[10] Памяць: Берастав. раён: гіст. дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Рэд.- уклад. М.І.Пацэка.-Мінск: БЕЛТА, 1999; Памяць: Пастаўскі раён: гіст. дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Уклад. К.І.Козак, А.І.Кузняцоў.- Мінск: БЕЛТА, 2001; Памяць: Пінск: гіст. дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Уклад.: В.М.Курсаў, С.Ф.Шапіра, Гал. рэд. Г.К.Кісялёў.-Мінск: БЕЛТА, 1998.

[11] Знешняя палітыка Беларусі: Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т.4 (чэрвень 1941 г.-жнівень 1945 г.) / Складальнік Н.М.Дзятчык і інш.-Мн.:БДУ, 2001.

[12] Белорусские остарбайтеры: в 3 кн. /Сост.: Г.Д.Кнатько, А.И.Адамушко и др.; Редкол. В.И.Адамушко и др.-Минск: Нац. арх. Респ. Беларусь, 1998 Кн.3. Ч.1: Репатриация, 1944-1951; Белорусские остарбайтеры: в 3 кн. /Сост.: Г.Д.Кнатько, А.И.Адамушко и др.; Редкол. В.И.Адамушко и др.- Минск: Нац. арх. Респ. Беларусь, 1998. Кн.3. Ч.2: Репатриация, 1944-1951

[13] Czerniakiewicz J. Repatriacja ludnosci polskiej z ZSRR 1944-1948. Warszawa.-Wyd-wo Nauk. PWN, 1987; Яго ж. Przemiezczenia Polakow i Zydow na Kresach Wschodnich II Rzecypospolitey w ZSRR 1939-1959.-Warszawa: Uniwersitet Warszawski, 1991.

[14] Przesiedlenie Ludnosci Polskiej z Kresow Wschodnich do Polski 1944-1947. Wybor, opracowanie i redakcja documentow Ciesielski S.- Warszawa: "Neriton". Instytut Historii PAN, 1999.

на вызваленых тэрыторыях у час і пасля Другой сусветнай вайны. Істотны матэрыял, які ўтрымлівае звесткі аб рэакцыі мясцовых улад Беласточчыны, а таксама падполля да перасяленчай акцыі, прадстаўлены ў зборніку дакументаў, падрыхтаваных польскімі гісторыкамі і архівістамі[15]. Асобным радком неабходна вылучыць працу не прафесійнага гісторыка, а святара з Беласточчыны Г.Сосны,[16] якая ўяўляе сабой збор архіўных дакументаў (данясенні, рапарты, лісты ваяводскіх, гмінных уладаў), якія адлюстроўваюць пасляваенную рэчаіснасць на Беласточчыне, адносіны мясцовых уладаў да беларусаў да і пасля падпісання беларуска-польскага пагаднення аб перасяленні насельніцтва. У кантэксце сваіх прац звярталіся да разгляду гэтай праблемы Ю.Сядлецкі, Я.Мірановіч, П.Эберхардт[17].

Да гэтага часу ў Беларусі не было напісана працы, спецыяльна прысвечанай разгляду праблемы абмену насельніцтвам ва ўсёй яе шматаспектнасці. Аўтар паспрабаваў разгледзець унутры/ і знешнепалітычныя фактары, якія абумовілі ўсталяванне савецка-польскай мяжы і неабходнасць перадачы Польшчы часткі тэрыторыі Беларусі, а таксама ажыццяўлення перасялення насельніцтва з БССР у Польшчу, і з Польшчы ў Беларусь, вызначыць сукупнасць фактараў, якія вымушалі людзей перасяляцца або адмаўляцца ад перасялення, прааналізаваць асноўныя этапы і дынаміку перасяленчага працэсу, колькасны, прафесійны, узроставы стан перасяленцаў, ахарактарызаваць адносіны і стаўленне ўрадаў Беларусі і Польшчы, а таксама мясцовых уладаў да гэтага працэсу, разгледзець дзейнасць упаўнаважаных Польшчы і прадстаўнікоў СНК БССР па ажыццяўленню перасялення, іх узаемаадносіны з мясцовымі ўладамі, паказаць ролю Арміі Краёвай у перасяленчым працэсе.

Рашэнне гэтай задачы немагчыма было без выкарыстання шырокага кола дакументальных крыніц і ў першую чаргу дакументаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, асабліва

---

[15] Bialostocczyzna 1944-1945 w dokumentech podziemia i oficialnych wladz. Oprac.J.Kulak.- Warszawa,1998.

[16] Sprawy narodowosciowe i wyznaniowe na Bialostocczyzne (1944-1948). W ocenie wladz Rzeczpospolitej Polskij. Wybor dokumentow: Situcyjne sprawozdania woewody Bialostockiego w Bialymstoku oraz Powiatowych starostow Bialostockiego i Sokolskiego w latach 1944-198 / Zebr. G. Sosna.- Ryboly, 1996.

[17] Mironowicz E. Bialorusiny w Polsce. 1944-1949. Warszawa. Wyd-wo Nauk. PWN.-;1993; Яго ж. Polityka narodowosciowa PRL.- Bialystok.-T-wo Hist., 2000; Siedlecki J. Losy Polakow w ZSRR w latach 1939-1986. Londyn: Gryf. Publ. 1998; Эбэрхардт П. Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі. 1897-1989. Менск: Бел.фонд Сораса, 1997.

фондаў 7, 777, 788, 789, у якіх сканцэнтраваны асноўны комплекс дакументаў па даследаванай праблеме. Надзвычай важнымі з'яўляюцца фонды былога архіва ЦК КПБ – ф.4, вопісы 29, 51, 61, 42 ды іншыя, якія даюць уяўленне аб пазіцыі партыйнага кіраўніцтва рэспублікі і мясцовых органаў да перасяленчага працэсу. Значную каштоўнасць маюць дакументы архіва Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, а таксама абласнога і занальных архіваў у гг. Гродна, Маладзечна, Баранавічы. Каштоўнымі крыніцамі з'яўляюцца зборнікі дакументаў аб удзеле СССР у міжнародных канферэнцыях перыяду Другой сусветнай вайны, знешнепалітычнай дзейнасці СССР і БССР, зборнікі міжнародных дагавораў і пагадненняў, заключаных СССР і БССР, дакументы і матэрыялы па гісторыі савецка-польскіх і беларуска-польскіх адносін.

Безумоўна, паглыбленню і пашырэнню разгляду асобных аспектаў разглядаемай тэмы спрыялі б дакументальныя матэрыялы, якія маюцца ў архівах Польшчы і найперш у Архіве новых актаў у Варшаве, а таксама ў Архіве знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі. Істотнай крыніцай, якая таксама адсутнічае ў працы, з'яўляюцца матэрыялы эміграцкай, а таксама польскай перыёдыкі таго часу.

Тым не менш, нягледзячы на пэўныя крыніцазнаўчыя прабелы, аўтар спадзяецца, што дадзеная праца будзе спрыяць пашырэнню і паглыбленню ведаў па праблеме перасялення, а таксама асэнсаванню складаных і да цяперашняга часу неадназначна ўспрыманых польскімі і беларускімі гісторыкамі падзей, што мелі месца ў беларуска-польскім памежжы ў сярэдзіне 40-х гадоў XX стагоддзя.

* * *

Лічу сваім маральным абавязкам выказаць шчырую падзяку старэйшым калегам і настаўнікам, якія шчодра дзяліліся ведамі і дапамагалі мне ў працы над гэтай кнігай: перш за ўсё, майму навуковаму кіраўніку доктару гістарычных навук, прафесару У.Ф. Ладысеву, а таксама прафесарам У.Е.Снапкоўскаму, М.К.Сакалову, Г.А.Космачу, А.А.Каваленi, А.М.Лютаму, дацэнтам А.В.Ціхаміраву, А.Ф.Рацько, Л.Л.Шкуцько, І.І.Варывончыку, Э.С.Ярмусіку, С.П.Барадзіну. Іх парады, заўвагі, думкі заўсёды з'яўляліся слушнымі, карыснымі, дапамагалі мне больш дакладна сфармуляваць і абгрунтаваць свае думкі і высновы і значна пашырылі маё ўяўленне па даследуемай праблеме.

Я выказваю шчырую і глыбокую падзяку дырэктару Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь В.Сяляменеву, гісторыку, архівісту В.Скалабану, А. Гесь, былой загадчыцы аддзела інфармацыі Н.Дзюбе, дзе я маю гонар працаваць, а таксама супрацоўнікам аддзела і ўсім супрацоўнікам Нацыянальнага архіва, якія заўсёды паважліва і з разуменнем ставіліся да маіх зваротаў і на працягу многіх гадоў аказвалі мне ўсебаковую дапамогу і падтрымку.

Я ўдзячны польскім калегам, прафесарам Я.Мірановічу, Ст.Цысельскаму, якія дабразычліва і з павагай ставіліся да маёй працы, хаця з крытычнасцю і пэўным скептыцызмам успрымалі некаторыя мае думкі і высновы.

Асаблівая ўдзячнасць маёй сям'і за цярплівасць і разуменне неабходнасці працы над гэтай кнігай.

Выказваю глыбокую ўдзячнасць за арганізацыйную падтрымку Польскаму Інстытуту ў Мінску і асабіста яго дырэктару Сп. Цэзарыю Карпінскаму.

## Раздзел 1.
## Савецка-польская мяжа і Беларусь:
## погляд з усходу і захаду

### Глава 1.
### Лінія Керзана – апошні тэрытарыяльны падзел Беларусі

Перамога Савецкага Саюза і краін антыгітлераўскай кааліцыі ў Другой сусветнай вайне прывяла да значных тэрытарыяльных змен і ўсталявання ў шэрагу краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы залежных ад Масквы пракамуністычных рэжымаў. Не стала выключэннем з гэтага працэсу і Польшча, якой у савецкай канцэпцыі будаўніцтва пасляваеннай Еўропы адводзілася важнейшая роля з-за яе стратэгічна выгаднага геапалітычнага палажэння. Аднак «польская праблема» з'яўлялася адной з найбольш складаных палітычных праблем, якія існавалі паміж саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі. Найбольш важныя з іх – будучае дзяржаўнае будаўніцтва ў пасляваеннай Польшчы і яе межы і, у прыватнасці - ўсходняя мяжа, бо яе вызначэнне самым непасрэдным чынам закранала Беларусь. Лінія Керзана, як усходняя мяжа Польшчы і адпаведна заходняя мяжа СССР, "узнікла" на міжнароднай арэне ў XX ст. другі раз на канферэнцыі саюзнікаў у Тэгеране (27 лістапада – 1 снежня 1943 г.). Беларусь ні ў якой якасці не прысутнічала ў Тэгеране, разам з тым, яе "прысутнасць", у выглядзе пытання заходніх абласцей БССР, ушчыльную паўстала яшчэ да канферэнцыі. Аднак для таго, каб зразумець усю складанасць сітуацыі, якая мела месца да Тэгерана, неабходна азірнуцца назад.

Рашэнне пытання аб савецка-польскай мяжы наўпрост закранала Беларусь, таму неабходна больш падрабязна спыніцца на яго разглядзе і галоўнае, прасачыць эвалюцыю поглядаў усіх зацікаўленых бакоў і ў першую чаргу кіраўніцтва СССР і Беларусі, лонданскага эміграцкага і люблінскага ўрадаў. Неабходнасць уважлівага разгляду гэтай праблемы тлумачыцца тым, што ўсталяванне савецка-польскай мяжы і яе беларуска-польскага ўчастка, прывяло да значных тэрытарыяльных, а таксама выклікала не менш значныя дэмаграфічныя змены ў складзе і колькасці насельніцтва заходняга рэгіёна Беларусі.

Пазіцыя кіраўніцтва Савецкага Саюза ў пытанні заходняй мяжы перацярпела значную эвалюцыю. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны СССР лічыў, што заходняя мяжа краіны, якая была ўстаноўлена ў выніку вераснёўскіх падзей 1939 г., не падлягае абмеркаванню, не кажучы ўжо пра яе змены. Аднак агрэсія Германіі супраць СССР унесла істотныя змены ў адносіны Савецкага Саюза і польскага ўрада ў выгнанні. Неабходнасць змагацца з агульным ворагам прывяла да падпісання савецка-польскага пагаднення паміж урадамі СССР і Польшчы аб аднаўленні дыпламатычных адносін, якое было заключана 30 ліпеня 1941 г. У ім, у прыватнасці, адзначалася, што "ўрад СССР прызнае савецка-германскія дагаворы 1939 г. адносна тэрытарыяльных перамен у Польшчы страціўшымі сілу"[18]. Разам з тым такая неакрэсленая і неканкрэтная фармулёўка, без яе далейшага тлумачэння і завершанасці, "падвесіла" пытанне аб будучай савецка-польскай мяжы і давала магчымасць абодвум бакам прытрымлівацца і адстойваць свой пункт гледжання "адносна тэрытарыяльных перамен у Польшчы". Адной з самых галоўных спрэчных праблем, па якой бакі мелі супрацьлеглыя погляды, з'яўлялася "беларускае пытанне" – праблема Заходняй Беларусі, якая ў 1939 г. была ўз'яднана з БССР. Прынцыповыя разыходжанні ў гэтым пытанні непазбежна вялі да канфліктнасці і напружанасці ў стасунках паміж эміграцкім урадам і ўрадам СССР.

Пазіцыя эміграцкага ўрада ў "беларускім пытанні" праявілася ўжо восенню 1941 г. 10 лістапада 1941 г. пасольства Польшчы ў СССР накіравала ў Наркамат замежных спраў (НКЗС) СССР ноту, у якой выказала пратэст і нязгоду ў сувязі з прызывам у Чырвоную Армію "ўсіх польскіх грамадзян, якія перасяленыя савецкімі ўладамі з *занятых тэрыторый Польскай Рэспублікі* (выдзелена мной. – А.В.), маючых у выдадзеных ім гэтымі ўладамі дакументах адзначанай нацыянальнасць украінскую, беларускую і яўрэйскую, павінны быць накіраваны ў Чырвоную Армію"[19]. Як вынікае з гэтага ўрыўка ноты, эміграцкі ўрад лічыў Заходнюю Беларусь "занятай тэрыторыяй Польскай Рэспублікі", а беларусаў – польскімі грамадзянамі.

Наркамат замежных спраў СССР, вытрымаўшы паўзу, адрэагаваў адэкватна. 1 снежня 1941 г. НКЗС накіраваў пасольству Польшчы ў СССР ноту, у якой падкрэслівалася, што "ў

[18] Знешняя палітыка Беларусі: Зб. дак. і матэрыялаў. / Склад. Н.М.Дзятчык і інш.- Мінск: Бел. дзярж. ун-т, 2001.- С.35.
[19] Там сама. Т.4. ... С.46.

адпаведнасці з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 2 лістапада 1939 г., усе грамадзяне заходніх абласцей Украінскай і Беларускай ССР, знаходзячыся на тэрыторыі адзначаных абласцей да 1-2 лістапада 1939 г., набылі ў адпаведнасці з законам “Аб грамадзянстве Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік” ад 19 жніўня 1939 г. грамадзянства СССР”[20]. Гэта значыць, што і Савецкі Саюз лічыў іх сваімі грамадзянамі, а тэрыторыю, на якой яны пражывалі, тэрыторыяй СССР.

Яшчэ большую раздражнёнасць, нервовасць і пратэст саюзнага НКЗС выклікала яшчэ адна заява эмігранцкага ўрада аб прыналежнасці Заходняй Беларусі да Польшчы. Так, у “ноце НКЗС СССР пасольству Польшчы ў СССР з пратэстам у сувязі з тэрытарыяльнымі дамаганнямі польскага эмігранцкага ўрада на Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну” (17 студзеня 1942 г.), адзначалася, што “народны камісарыят лічыць няправільнай заяву пасольства як у вышэйазначанай ноце, так і ў іншых дакументах, у якіх гарады Львоў, Брэст, Станіславаў і іншыя гарады на тэрыторыі Украінскай ССР і Беларускай ССР, уваходзячыя ў склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, адносяцца да ліку гарадоў, якія знаходзяцца на землях Польскай Рэспублікі”[21].

“Вайна дыпламатычнымі нотамі”, якая распачалася ў 1941 г., не толькі працягнулася ў 1942 г., а значна абвастрылася ў 1943 г. 16 студзеня 1943 г. НКЗС СССР накіраваў пасольству Польшчы ў СССР ноту, у якой падкрэсліў, што ўсе грамадзяне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны з’яўляюцца грамадзянамі СССР[22]. Аднак гэтая нота азначала не што іншае, як выказанае дыпламатычнай мовай прызнанне Савецкім Саюзам законнасці ўключэння ў 1939 г. Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў склад СССР. У сваю чаргу, польскі эмігранцкі ўрад упарта працягваў стаяць на тым, што не можа і не павінна быць ніякіх перамоваў з Савецкім Саюзам у гэтым прынцыповым для палякаў пытанні. Цвёрдасць, дакладней упартасць бакоў, у пытанні ўз’яднаных з СССР у 1939 г. тэрыторый, прывяла да ўзрастання напружанасці і ўрэшце рэшт да разрыву дыпламатычных адносін паміж СССР і Польшчай, які адбыўся 25 красавіка 1943 г.[23].

Лінія Керзана ў якасці заходняй мяжы СССР была зацверджана рашэннямі Тэгеранскай канферэнцыі (23 лістапада - 1 снежня 1943 г.) кіраўнікоў трох дзяржаў. І.Сталін, пасля таго як

[20] Там сама. Т.4. … С.46.
[21] Знешняя палітыка Беларусі Т.4, …С.47.
[22] Тама сама. Т.4. …С.82.
[23] Тама сама. Т.4. …С.90.

абгрунтаваў пазіцыю Савецкага Саюза адносна савецка-польскай мяжы, заявіў, што "ўкраінскія землі павінны адысці да Украіны, а беларускія — да Беларусі. Савецкі ўрад стаіць на гэтым пункце погляду на гэтую мяжу і лічыць гэта правільным"[24]. Аналізуючы выказванні І.Сталіна аб беларускіх землях, неабходна разумець, што ён, безумоўна, не думаў аб інтарэсах Беларусі і беларускага народа, а разглядаў іх толькі з пункту гледжання агульнасаюзных інтарэсаў[25]. У выніку перамоваў, якія адбыліся на канферэнцыі, была прынятая прапанова У.Чэрчыля аб тым, што "ачаг польскай дзяржавы і народа павінен размяшчацца паміж так званай лініяй Керзана і лініяй ракі Одэр"[26].

Аднак савецкае кіраўніцтва даволі гнутка падыходзіла да праблемы вызначэння савецка-польскай мяжы і пагаджалася ўнесці пэўныя карэктывы ў свае погляды. Так, у заяве ўрада СССР аб перспектывах савецка-польскіх адносін (11 студзеня 1944 г.) адзначалася, што "Савецкі ўрад не лічыць нязменнымі межы 1939 г. У гэтыя межы могуць быць унесеныя выпраўленні на карысць Польшчы ў тым кірунку, каб раёны, дзе пераважае польскае насельніцтва, былі перададзеныя Польшчы. У гэтым выпадку савецка-польская мяжа магла б прайсці прыкладна па так званай лініі Керзана"[27].

Краёва Рада Народова - вярхоўны орган нацыянальна-дэмакратычнага фронту - на пасяджэнні 23 студзеня 1944 г. абмеркавала савецкую заяву ад 11 студзеня 1944 г. і выказала згоду з пунктам гледжання СССР у пытанні аб межах і з адпаведнымі рашэннямі Тэгеранскай канферэнцыі. КРН прыйшла да высновы, што "заяву ўрада СССР, у якой прапануецца ўрэгуляваць польска-украінска-беларускую мяжу шляхам пагаднення з Польшчай, КРН ад імя польскага народа прымае як аб'ектыўна правільную і адказваючую агульным інтарэсам аснову для вызначэння праблем межаў паміж зацікаўленымі народамі і для ўстанаўлення добрасуседскіх і саюзных адносін паміж Польшчай і СССР"[28]. З заявай Савецкага Саюза і рашэннямі канферэнцыі пагадзіўся і СПП[29].

У студзені-лютым 1944 г. Савецкі ўрад, ідучы насустрач заходнім саюзнікам, зрабіў спробу абмеркаваць заяву ад 11

[24] Снапкоўскі У. Знешнепалітычная дейнасць Беларусі. 1944-1953 гг. / Пад рэд. Ю.П.Броўкі.- Мінск: Бел. Навука, 1977.- С.77.
[25] Там сама. С.77.
[26] Парсаданова В.С. Советско-польские отношения. 1945-1949.-М.: Наука, 1990.- С.133.
[27] Там сама. С.176.
[28] Знешняя палітыка Беларусі ... Т.4, С.172.
[29] Парсаданова В., Назв. соч. С.135.

студзеня 1944 г. з эміграцкім урадам і прапанаваў яму афіцыйна заявіць, што "лінія мяжы, ўстаноўленая Рыжскім дагаворам, належыць змяненню і што лінія Керзана з'яўляецца лініяй новай мяжы паміж СССР і Польшчай"[30]. Нягледзячы на канструктыўнасць пазіцыі СССР у гэтым пытанні, эміграцкі ўрад адхіліў савецкую прапанову[31]. Адказ матываваўся тым, што яна не абапіраецца на юрыдычную базу і таму не можа быць прызнаная ў якасці мяжы.

Чым жа тлумачылася "гнуткая" пазіцыя СССР у пытанні мяжы, і чым жа было выклікана жаданне І.Сталіна пайсці на саступкі ў гэтым важным і прынцыповым для Савецкага Саюза пытанні ? Неабходна прызнаць слушнай выснову М.Волаціча, што прапановы, якія прагучалі ў заяве ад 11 студзеня 1944 г., мелі мэтай "задаволіць нацыянальныя амбіцыі палякаў і знайсці іх падтрымку ў змаганні з Нямеччынай" і што І.Сталін "баяўся пайменна, каб Палякі ў тылах савецкай арміі не распачалі партызаншчыны супраць Саветаў"[32]. Што датычыць першага сцверджання, то з ім неабходна пагадзіцца. Аднак другое выклікае сумненні. Наўрад ці І.Сталін сур'ёзна баяўся развіцця польскага партызанскага руху ў тыле Чырвонай Арміі. Да гэтай высновы М.Волаціча неабходна ставіцца дастаткова крытычна. Неўспрыманне І.Сталіным сур'ёзнасці ваеннага патэнцыялу, на які абапіраўся эміграцкі ўрад, прагучала на сустрэчы І.Сталіна з брытанскім паслом у Расіі Кларкам Керрам напрыканцы лютага 1944 г. На заўвагу К.Керра аб тым, што ў выпадку, калі палякі не знойдуць рашэння з Савецкім Саюзам (у пытанні аб усходняй мяжы Польшчы. – А.В.), у Польшчы можа пачацца грамадзянская вайна, І.Сталін, падкрэсліў К.Керр, адказаў пытаннем: "Вайна з кім ?, паміж кім ?, дзе ?. Як гэта можа адбыцца ? У польскага ўрада няма ўзброеных сілаў у Польшчы, а толькі нешматлікае падполле, усяго некалькі агентаў лонданскага ўрада"[33]. І.Сталін, адзначыў К.Керр, выказаў меркаванне, што "ў той час, як Чырвоная Армія працягне вызваленне Польшчы, Мікалайчык будзе паўтараць свае банальнасці, а да таго часу, як Польшча будзе вызвалена, унутры краіны ўзнікне яшчэ адзін урад"[34].

---

[30] Там сама, С.175.

[31] Документы и материалы по истории советско-польских отношений: В 12 т. / Ред коллегия И.А.Хренов, В.Т.Ковальский и др., М.:Наука, 1974.-Т.8. январь1944 г. – декабрь 1945 г. С.24.

[32] Волаціч М. Лінія Керзана на фоне падзеяў і тэрытарыяльных зменаў у Усходняй Еўропе // Спадчына, 1993. № 6.- С.31.

[33] Фейс Г. Черчилль. Рузвельт. Сталин. Война, которую они вели, и мир, которого они добились / Пер. с англ. Л.А.Игоревского.-М.:ЗАО Центрополиграф, 2003.-С.269.

[34] Там сама. С.269.

У ліпені 1944 г. крытычнасць да магчымасці арганізацыі ўзброенай барацьбы супраць "саветаў" выказаў прэзідэнт ЗША Ф.Рузвельт. У гэты час С.Мікалайчык знаходзіўся ў Вашынгтоне і чатыры разы сустракаўся з прэзідэнтам ЗША Ф.Рузвельтам, абмяркоўваючы ўвесь спектр польска-савецкіх адносін. У размовах з амерыканскім прэзідэнтам прэм'ер-міністр эмігранцкага ўрада дамагаўся ад Ф.Рузвельта падтрымкі сваёй пазіцыі аб непрымальнасці для палякаў лініі Керзана ў якасці ўсходняй мяжы Польшчы. Аднак Ф.Рузвельт заняў вельмі асцярожную пазіцыю і толькі паабяцаў С.Мікалайчыку, што пры спрыяльных абставінах ён паспрабуе выступіць пасрэднікам паміж лонданскім урадам і Масквой у гэтым спрэчным пытанні. Разам з тым ён параіў С.Мікалайчыку сустрэцца са Сталіным і паспрабаваць знайсці рашэнне ў гэтым складаным пытанні. Аднак самае галоўнае, што параіў Ф.Рузвельт С.Мікалайчыку, заключалася ў наступным: "Вы, палякі, павінны прыйсці да пагаднення з Расіяй. У вас няма шанцаў адолець Расію самастойна, а ... брытанцы і амерыканцы не маюць намеру змагацца з Расіяй"[35].

Як вынікае з гэтага, ужо на пачатку 1944 г. І.Сталін быў упэўнены, што ні грамадзянскай вайны, ні сур'ёзнага сапраціўлення з боку "нешматлікага падполля" (у параўнанні з ваенным патэнцыялам Чырвонай Арміі. – А.В.) у Польшчы не будзе. Яго ўпэўненасць у гэтым, а таксама разлік на ўзнікненне ў Польшчы "яшчэ аднаго ўрада" спраўдзіліся поўнасцю.

Больш сур'ёзнай, чым пагроза польскага падполля, для І.Сталіна з'яўлялася стратэгічная і далёка ідучая мэта – уцягненне Польшчы ў арбіту ўплыву Савецкага Саюза. Для выканання гэтай задачы неабходна было прыняць больш істотныя захады, чым падтрымка Польшчы ў змаганні з агульным ворагам ці страх перад польскай партызанкай. Дасягненне гэтай мэты было магчымым толькі тэрытарыяльнымі саступкамі і стварэннем у Польшчы прамаскоўскага ўрада. Таму ў заяве і прагучала, што "межы могуць быць выпраўлены на карысць Польшчы", і мяжа павінна ў агульным супадаць з лініяй Керзана.

Аналізуючы гэтую заяву, асабліва ў месцы, дзе адзначаецца гатоўнасць пайсці на тэрытарыяльныя саступкі Польшчы, неабходна пагадзіцца з высновай М.Волацiча, што "ад самой Расіі залежала, ці яна хоча зрачыся беларускіх і ўкраінскіх зямель на карысць Польшчы"[36]. Аналагічнай высновы прытрымліваецца Г.Фэйс. Аналізуючы пазіцыі бакоў у Тэгеране ён падкрэслівае: "У

[35] Там сама, С.338.
[36] Волацiч М. Назв твор. С.31.

Тэгеране … ён (Чэрчыль. – А.В.) хутчэй звяртаўся да Сталіна, а не спрабаваў спрачацца з ім. Па яго паводзінах згадвалася гатоўнасць прыняць рашэнне Савецкага Саюза”. І далей: “ Нагадваючы такім чынам, што пазіцыя брытанцаў не будзе занадта жорсткай, ён спытаў у Сталіна, ці паспрабуюць яны адсунуць межы. Сталін адказаў станоўча”[37]. Як вынікае, у Тэгеране ні У.Чэрчыль, ні Ф.Рузвельт не выступалі супраць мяжы, якая была ўстаноўлена ў 1939 г. Гэта значыць, што толькі ад І.Сталіна залежала, ці хоча ён “зрачыся” беларускіх зямель.

Выснова М.Волаціча пацвярджаецца выступленнем У.Чэрчыля ў англійскім парламенце 27 лютага 1945 г. У прамове перад парламентарыямі У.Чэрчыль заявіў: “Польская праблема падраздзяляецца на два галоўныя пытанні: межы Польшчы і вольнасць Польшчы … У кастрычніку 1944 г. я быў у Маскве, і маршал Сталін пацвердзіў, што могуць быць адхіленні ад 8 да 10 кіламетраў у абодвух накірунках (ад лініі Керзана – А.В.). Як мне падалося, гэта было выдатным падыходам у поглядах на гэтую праблему. Аднак, калі мы сустрэліся ў Ялце, расійская прапанова змянілася. Як вядома, тыя невялікія змены, зробленыя коштам Расіі, а не коштам Польшчы, каб палякі маглі быць спакойныя раз і назаўсёды і каб надалей дыскусій на гэтую тэму не адбывалася. Мы віталі гэтую савецкую прапанову”[38]. Аднак У.Чэрчыль крыху памыліўся. Тэрытарыяльныя адхіленні былі зроблены не коштам тэрыторыі Расіі, а коштам тэрыторыі Беларусі.

Аднак вернемся да выказвання І.Сталіна аб «узнікненні яшчэ аднаго ўрада ў Польшчы». Паралельна з абмеркаваннем складанага «польскага пытання» ўнутры сталінскага кіраўніцтва выспеў і пачаў ажыццяўляцца доўгатэрміновы стратэгічны план пошукаў альтэрнатывы эміграцкаму ўраду, як «недагаварному партнёру». Ажыццяўленнем гэтага плана І.Сталіна стала стварэнне ў СССР Саюза Польскіх Патрыётаў (СПП), поўнасцю падпарадкаванага Крамлю.

4 студзеня 1943 г. В.Васілеўская і А.Лямпе, дзеячы польскага камуністычнага руху, накіравалі ліст В.Молатаву, у якім прапанавалі стварыць польскі палітычны цэнтр у СССР як супрацьвагу сілам, што групаваліся вакол эміграцкага ўрада. У другой палове лютага гэтага ж года І.Сталін прыняў В.Васілеўскую, Г.Мінца і В.Гроша і ў выніку абмеркавання пытання аб дзейнасці

[37] Фейс Г. Назв соч… С.256.
[38] Armia Krajowa w dokumentach. 1944-1945. T.V pazdziernik 1944 – lipiec 1945.-Londyn, 1981.-S.295.

польскай эміграцыі ў СССР даў згоду на стварэнне СПП[39]. У адрозненне ад эміграцкага ўрада СПП адразу ж заявіў, што прытрымліваецца прынцыповага палажэння, што «польскія землі павінны быць аб'яднаныя ў межах польскай дзяржавы, а межы Рыжскага дагавора не адпавядаюць законным жаданням беларусаў і ўкраінцаў да нацыянальнага ўз'яднання»[40].

Левы лагер таксама прадстаўляла Польская рабочая партыя (ППР), якая не толькі заявіла аб сваім рашучым намеры ўзяць уладу ў краіне, але прынцыпова вызначыла свае погляды як на будучае нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва, так і на ўзаемаадносіны з СССР. Яны былі сфармуляваны ў Дэкларацыі ППР "За што мы змагаемся" (лістапад 1943 г.) У ёй адзначалася, што ППР гатова ўзяць уладу ў краіне, а «гарантам свабоды і незалежнасці» будзе выступаць СССР, з якім павінен быць усталяваны моцны саюз і сяброўскія адносіны. У дачыненні да ўзаемаадносін з беларускім і ўкраінскім народамі Дэкларацыя падкрэслівала, што "на ўсходніх тэрыторыях, спрадвеку заселеных бальшынёй украінскага і беларускага народаў, польскі народ, які крывёю плаціць за сваю свабоду, прызнае прынцып права народаў на самавызначэнне, бо ён не можа адмовіць братнім украінскаму і беларускаму народам права ў вызначэнні сваёй дзяржаўнай прыналежнасці ў адпаведнасці з воляй народу. Гэта забяспечыць нам мір на ўсходзе і ўмацуе нашы пазіцыі на захадзе і ў Балтыцы". Такім чынам, у Дэкларацыі ППР прызнавалася законнае права беларускага народа на ўсходнія тэрыторыі, на якіх беларусы пражывалі стагоддзямі.

Заходнія краіны, і ў першую чаргу Англія і ЗША, хоць і падтрымлівалі эміграцкі ўрад, але, не жадаючы канфлікту з СССР, лічылі абгрунтаваным і лагічным жаданне савецкага кіраўніцтва забяспечыць бяспеку сваёй заходняй мяжы ў пасляваеннай Еўропе і пагаджаліся прызнаць лінію Керзана ў якасці заходняй мяжы Савецкага Саюза. Разам з тым яны таксама выступалі за стварэнне Польшчы як аднанацыянальнай дзяржавы, што месціцца паміж лініяй Керзана на Усходзе і ракой Одэр на Захадзе.

Наданне Беларусі правоў у галіне знешняй палітыкі (люты 1944 г.) абумовіла абмеркаванне пытання беларуска-польскіх адносін, вызначэння беларуска-польскага ўчастка савецка-польскай мяжы партыйна-савецкім кіраўніцтвам рэспублікі. Неабходна больш падрабязна спыніцца на аналізе пазіцыі Мінска ў

[39] Парсаданова В. Назв. соч. С.124.
[40] Парсаданова В. Назв. соч. С.126.

гэтым пытанні, бо раней гэтаму не надавалася значнай увагі. Разам з тым гэтая пазіцыя заслугоўвае больш глыбокага вывучэння, бо з'яўляецца не такой спрошчанай, як падавалася раней.

Ушчыльную пытанне аб будучыні заходніх абласцей Беларусі разглядалася на пленуме ЦК КП(б)Б, які праходзіў у Маскве 26-28 лютага 1943 г. Фактычна на пленуме абмяркоўвалася пытанне аб узмацненні партызанскага руху на акупаванай тэрыторыі Беларусі, аднак удзельнікі пленума надалі значную ўвагу разгляду сітуацыі, што склалася ў заходніх абласцях. Разам з прызнаннем неабходнасці пашырэння і актывізацыі там партызанскага руху удзельнікі пленума выказалі погляды на будучыню заходніх абласцей. Найбольш ясна выказаўся па гэтаму пытанню сакратар ЦК КП(б)Б Ц.Гарбуноў. Ён адзначыў, што "Беларусь будзе савецкай у межах сваіх спрадвечных беларускіх зямель". І напэўна галоўнае: "У нашай прапагандзе мы вельмі нясмела ставім пытанне аб *усёй Беларусі*, у межах яе законных граніц. У цэнтральнай нашай прэсе вельмі мала адводзіцца месца *усёй нашай Беларусі* (выдзелена намі. - А.В.)"[41].

Цімоха Гарбунова падрымаў Панцеляймон.Панамарэнка. Неабходна больш дэталёва і ўважліва разгледзець пазіцыю П.Панамарэнкі ў гэтым пытанні, бо, выкажам меркаванне, яна адлюстроўвала не толькі яго асабісты пункт гледжання ў пытанні мяжы і перадачы Польшчы часткі тэрыторыі Беларусі. Магчыма сцвярджаць, што першы сакратар ЦК КП(б)Б агучыў на пленуме ЦК КП(б)Б меркаванне часткі беларускай грамадскасці, прадстаўленай шэрагам навукоўцаў і партыйна-савецкай эліты, пераважна яе сярэдняга звяна, якія былі заклапочаны лёсам пасляваеннай Беларусі і яе тэрытарыяльнай цэласнасцю.

Выступаючы перад удзельнікамі пленума П.Панамарэнка больш паловы сваёй прамовы прысвяціў “польскай праблематыцы”. Ён узгадаў аб з’ездзе палякаў, што адбыўся ў Эдынбургу ў кастрычніку 1942 г., на якім быў заслуханы даклад прафесара Віельгорскага “Аб значэнні ўсходніх тэрыторый для польскай рэспублікі”. П.Панамарэнка зачытаў рэзалюцыю, прынятую на з’ездзе, у якой падкрэслівалася: “Мы павінны перадаць нашым будучым пакаленням нашыя ўсходнія тэрыторыі ў недатыкальнасці, як незамянімы элемент незалежнасці рэспублікі ва ўсіх адносінах. ...Стоячы на ахове Вільні, Гродна, Навагрудка або Пінска, мы тым самым абараняем незалежнасць усёй

[41] НАРБ, ф.4, воп.20, спр.213, арк.171.

тэрыторыі Польшчы, ад Балтыкі да Карпат, ад Палесся да Сілезіі. …Усходнія вобласці рэспублікі з'яўляюцца калыскай, з якой выйшаў гістарычны тып паляка. Гэта айчына Хадкевічаў, Рэйтанаў, Касцюшкаў, Міцкевічаў, Славуцкіх, Траўгутаў, Пілсудскіх, Падарэўскіх. Сумленныя высілкі многіх стагоддзяў працы, якія прыклалі плуг, меч, крыж і кніга – назаўсёды звязалі лёс гэтых тэрыторый з лёсам ўсёй радзімы і звязалі яе з заходняй культурай"[42].

Далей ён паведамляў дэлегатам пленума, што "Мысль Польска" піша: "На Усходзе мы патрабуем, што мы неаднаразова сцвярджалі і за што мы паслядоўна змагаемся, захавання меж 1939 г. Патрабаванне інтэгральнасці ўсходняй мяжы застаецца канонам польскай палітыкі". "Вядомосці польскі", працягваў далей цытаваць П.Панамарэнка, падкрэсліваюць: "Расія не мае ніякіх прычын патрабаваць дадатковых тэрыторый, і яна павінна прызнаць, што стратэгічная неабходнасць дыктуе Польшчы захаванне межаў Рыжскага дагавора. Ніякае прасоўванне Польшчы на захад ніколі не зможа кампенсаваць страты нашых усходніх ускраін"[43]. Завяршаючы сваё выступленне, П.Панамарэнка адзначыў: "З прыведзеных вышэй, а таксама шматлікіх артыкулаў у газетах і часопісах, пастаноў з'ездаў і арганізацый, выступленняў рознага кшталту грамадскіх, у тым ліку афіцыйных, дзеячаў, паводзін эміграцыі і г.д. магчыма лічыць дакладна ўстаноўленым наступнае: палякі ў адносінах усходніх межаў настроены непрымірыма за захаванне ўмоў Рыжскага дагавора. Гэта лічыцца канонам сучаснай польскай палітыкі. Больш крайнія элементы патрабуюць нават барацьбы за ўсходнія тэрыторыі Польшчы Ягелонаў … І вось, таварышы, калі прааналізаваць гэтыя ўсе каноны польскай палітыкі, то яны адносяцца да таго, што яны жадаюць, каб Заходняя Беларусь была ў іх. А мы кажам, што яна павінна быць у нас, бо яна - Заходняя Беларусь"[44].

Як вынікае са слоў П.Панамарэнкі на лютаўскім пленуме ЦК КП(б)Б, ён і партыйнае кіраўніцтва Беларусі добра ведалі пазіцыю лонданскага эмігранцкага ўрада і сіл, якія групаваліся вакол яго. Аднак у 1943 г. ён, як кіраўнік рэспублікі, цвёрда быў перакананы, што Заходняя Беларусь ёсць неад'емная частка БССР, і ніякай гаворкі аб яе адыходзе да Польшчы не можа быць.

---

[42] Там сама, арк.275.
[43] Там сама, арк.276-277.
[44] НАРБ, ф.4, воп.20, спр.213, арк.279.

Без перабольшання, яго неардынарнае выступленнне на лютаўскім пленуме ЦК КП(б)Б па згаданай праблеме, шматразовае цытаванне і каментар выказванняў палітычных дзеячаў, аб’яднаных вакол эмігранцкага польскага ўрада, сведчылі аб тым, што першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі ведаў усю глыбіню крызісу савецка-польскіх адносін і, выкажам думку, прадбачыў і прагназаваў іх далейшае пагаршэнне. Неабходна адзначыць, што яго выступленне на пленуме перад партыйна-савецкімі работнікамі па праблеме межаў пасляваеннай Беларусі, прэтэнзіях эмігранцкага ўрада на Заходнюю Беларусь не было спантанным і зымправізаваным. Яго выступленне, хутчэй за ўсё, было санкцыянавана Крамлём, бо закранала сферу міжнародных адносін, якая з’яўлялася прарэгатывай Цэнтра. Прычынай дэталёвай ўвагі да абмеркавання гэтага пытання з’явілася наступнае. 25 лютага 1943 г., г.зн. літаральна за дзень да пачатку работы пленума, прагучала заява польскага эмігранцкага ўрада аб савецка-польскіх адносінах[45], якая фактычна справакавала разрыў дыпламатычных адносін паміж СССР і Польшчай, што адбыўся 25 красавіка 1943 г. Не абмеркаваць гэтую заяву, тым больш, што ў ёй прынцыпова вызначалася, што “ў пытанні аб межах паміж Польшчай і Савецкай Расіяй захоўваецца статус-кво, якое існавала да 1 верасня 1939 г.”[46], кіраўніцтва Беларусі не магло, бо гэта значыла, што Заходняя Беларусь застаецца ў складзе Польшчы. Таму першы сакратар Кампартыі Беларусі і надаў столькі ўвагі аналізу і разгляду гэтага пытання і прынцыпова вызначыў, што Заходняя Беларусь - гэта неад’емная частка БССР.

Заява эмігранцкага ўрада ад 25 лютага 1943 г. выклікала імгненную рэакцыю і стала прадметам абмеркавання не толькі ў палітычных колах Масквы, Лондана, Вашынгтона, Мінска, але і ў шырокіх колах беларускай грамадскасці. Найбольш дакладна і канцэнтравана сфармуляваў і выказаў думку беларускай грамадскасці Якуб Колас у артыкуле “Белоруссия и Польша будут жить в своих законных, определенных историческим правом, границах». Наколькі ўразіла і ўзрушыла Я.Коласа заява эмігранцкага ўрада, сведчыць ліст, які ён напісаў 22 сакавіка 1943 г. Н.А.Нагіной. Ён адзначыў у лісце: «За час маёй паездкі, з 4 лютага па 21 сакавіка, я нічога не напісаў, акрамя артыкула – водгук на выступленне польскага ўрада ў Лондане ад 25 лютага цяперашняга года аб савецка-польскіх адносінах. Артыкул ухвалены. Магчыма, што ён з'явіцца ў «Известиях» ці «Правде».

[45] Знешняя палітыка Беларусі ...Т.4, С.87.
[46] Там сама, Т.4, С.87.

Аднак гэта справа палітыкі, і з'яўленне артыкула ў друку будзе залежаць ад розных абставін»[47]. Я.Колас быў абсалютна ўпэўнены, калі пісаў, што «…гэта справа палітыкі». Яго артыкул перш за ўсё быў прызначаны не для «ўнутранага», а для «знешняга» чытача, што як раз і сведчыла аб яго палітычнай накіраванасці і зместу.

Народны Пясняр Беларусі пісаў (стыль і арфаграфія Я.Коласа захаваны. – А.В.): «В эти исторические дни, когда на советско-германском фронте решается исход войны и судьбы славянских народов, диссонансом прозвучало выступление польского правительства в Лондоне 25 февраля о польско-советских отношениях. В своём выступлении польское правительство заявляет, что «в вопросе о границах между Польшей и Советской Россией сохраняется статус-кво, существовавший до 1-го сентября 1939 года», что «подрыв этой позиции, соответствующей Атлантической хартии, вредит единству Объединенных наций». Подумало ли польское правительство, сидя в уютных лондонских отэлях далеко от Польши, гибнущей под немецкой пятой, о том, что сохранение «этой позиции» вредит единству и целостности белорусского и украинского народов, искусственно расчлененных в дни их тяжелых испытаний ? Подумало ли польское правительство о том, что декларация о будущих границах на востоке уже нарушает единство наций, о котором оно так заботится, и льёт воду на колёса геббельсовской мельницы. Польское правительство заявляет также, «что ни до начала нынешней войны, ни во время войны польский народ не соглашался ни на какое сотрудничество с немцами против Советского Союза". Это, безусловно, верно: польский народ хорошо знает, что такое немцы и чего может ожидать от них польский народ. Но неверно говорит польское правительство, когда оно отождествляет польский народ с его правителями типа польского министра Бека, вся деятельность которого была направлена к сотрудничеству с гитлеровской Германией против Советского Союза. К такому сотрудничеству, конечно, польский народ никакого отношения не имел и не имеет. Никаких враждебных чувств, ущемляющих права беларусского и украинского народов, он также никогда не питал. Географическое соседство двух больших славянских народов, польского и белорусского, наоборот, связывает их общностью жизненных, политических и культурных целей. В достижении этих целей они часто стояли плечом к плечу на одной линии фронта, как союзника, как воины-братья.

[47] Колас Я. Збор твораў у чатырнаццаці тамах. Т.13. Пісьмы 1908-1949 гг. Мн., «Маст. літ.», 1997.-С.355.

…Обращаясь в недалёкое прошлое, мы должны признать, что чёрной страницей в истории польского государства остаётся насильственный захват польскими империалистами западной части Белоруссии в 1920-1921 гг. Ни один народ мира, в том числе и польский, не оправдывал этот захват и считал его актом насилия. Живое тело белорусского народа польские империалисты раскроили пополам. Они искореняли всё белорусское и заменяли его польским. … День, когда представители белорусского народа Западной Белоруссии сошлись на всенародное собрание в Белостоке, был днём радостного торжества, днём подлинного всенародного праздника. … Польский народ всем сердцем понимал радостные чувства освобожденных белорусов и разделял их радости.

Этого не поняли и не поймут только уцелевшие от германского разгрома жалкие остатки военной реакционной империалистической клики Польши. Кое-кто из них, как генерал Желиховский, никак еще не может согласиться с тем, что после войны Советская Белоруссия снова обретет свое прежние границы от Орши до Бреста, что исконные белорусские города Гродно, Новогрудок, Барановичи, Белосток, Пинск, Брест и другие снова будут советскими белорусскими городами. …Польский народ знает свое историческое место и сам определит свою судьбу, исходя из самых искренних чувств благодарности к великому русскому, белорусскому, украинскому и всем советским народам за величайшую братскую помощь в его освобождении. Белорусский народ и Польша снова будут жить в своих законных, определенных справедливым правом границах»[48].

Зазначым, што існуе некалькі варыянтаў артыкула Я.Коласа, але мы цытуем першапачатковы варыянт, які захоўваецца ў Нацыянальным архіве РБ. У той варыянт, які быў надрукаваны пазней у часопісе «Славяне», былі ўнесены значныя праўкі і скарачэнні. Як вынікае з артыкула, Я. Колас таксама быў упэўнены, што Заходняя Беларусь застанецца ў складзе БССР. Карыстаючыся нагодай, я выказваю шчырую удзячнасць Віталю Скалабану, які прадаставіў і прапанаваў мне выкарыстаць артыкул Я.Коласа ў гэтай працы.

Цвёрда і ўпэўнена пазіцыя кіраўніцтва Беларусі прагучала 23 чэрвеня 1943 г. у закрытым лісце ЦК КП(б)Б “Аб ваенна-палітычных задачах работы ў заходніх абласцях БССР”[49]. У раздзеле “Задачы палітычнай барацьбы”, з усёй яснасцю і

[48] НАРБ, ф.4683, воп.3, спр.365, арк.1-9.
[49] Знешняя палітыка Беларусі …Т. 4. С.112-118.

відавочнасцю пакрэслівалася: “Падпольныя партыйныя цэнтры, партызанскія атрады, арганізуючы і ўзначальваючы барацьбу народа, павінны развіваць яе на той аснове, што заходнія вобласці Савецкай Беларусі з’яўляюцца неад’емнай часткай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Дзяржавы, неад’емнай часткай тэрыторыі Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. На гэты карэнны элемент нашай палітыкі, які мае дзяржаўны характар, ЦК звяртае асаблівую ўвагу ў сувязі з тым, што польскі ўрад і нацыяналістычныя польскія колы, якія сталі на пазіцыю варожых адносін да Савецкага Саюза і, не прызнаючы гістарычных правоў беларускага і ўкраінскага народу быць аб’яднанымі ў сваіх нацыянальных дзяржавах, выступілі з захопніцкім планам раздзелу спрадвечных беларускіх і ўкраінскіх зямель. Польскі ўрад разглядае заходнія вобласці Савецкай Беларусі і Савецкай Украіны як частку тэрыторыі Польшчы, ігнаруе ўсім вядомы факт уз’яднання беларусаў і ўкраінцаў у сваіх нацыянальных дзяржавах, якое ўжо адбылося, і выступае за палітыку раздраблення беларускага і ўкраінскага народаў. …Існаванне рознага кшталту арганізацый, якія накіроўваюцца польскімі нацыяналістычнымі (віленскім, люблінскім, варшаўскім і інш.) цэнтрамі, павінна разглядацца як супрацпраўнае ўмяшальніцтва ў справы і інтарэсы нашай краіны”[50].

Аналагічнага погляду прытрымлівалася частка навуковай інтэлігенцыі. Найбольш дакладна пазіцыю беларускай інтэлігенцыі сфармуляваў прафесар Ціміразеўскай сельскагаспадарчай акадэміі, беларус па паходжанню С.Колеснеў. 9 ліпеня 1943 г. ён напісаў ліст П.Панамарэнку, у якім выказаў сваё меркаванне наконт будучых межаў Беларусі. Ліст невялікі, таму варта прывесці яго з невялікімі скарачэннямі. “З паведамленняў друку, а таксама з факта разрыву дыпламатычных адносін паміж СССР і Польскім урадам з відавочнасцю выцякае, што рэакцыйныя колы польскай эміграцыі, якія маюць сур’ёзную падтрымку некаторых колаў у Англіі і Амерыцы, развіваюць шалёную друкаваную прапаганду за пасляваенныя межы “Вялікай Польшчы”, уключаючы і Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. Друкаваная прапаганда не абмяжоўваецца злоснымі нападкамі на СССР у газетных артыкулах, а сістэматычна і ўпарта ажыццяўляецца спроба “аб’ектыўна навукова” даказаць правамоцнасць польскіх тэрытарыяльных прэтэнзій на ўсе землі, якія ляжаць на захад ад гэтак званага Беларускага Скалістага кража, які ідзе ад адгор’яў

[50] Знешняя палітыка Беларусі …Т.4, С.113-114, 116.

Сярэднерускага ўзвышша праз плато паміж Оршай і Віцебскам на Мінск і далей на Мазыр да Дняпра. Гэта пытанне не новае. Яшчэ на Рыжскай мірнай канферэнцыі па ўстанаўленню межаў з Польшчай польская дэлегацыя спрабавала ўзмоцнена даказаць, што Беларускі Скалісты краж з'яўляецца натуральнай мяжой Усходняй і Заходняй Еўропы, а значыць, і ўсходняй мяжой Польшчы. Зараз зноў сусветная грамадская думка ўводзіцца сістэматычна ў зман на базе гэтай неразумнай і зацяганай ідэйкі, якая, аднак, карыстаецца сур'ёзным крэдытам у рэакцыйных палітычных і навуковых колах Англіі і Амерыкі. Пускаюцца ў ход і іншыя, менш выгадныя казыры, кшталту агульнасці этнаграфічных, гістарычных і эканамічных фактараў тэрыторый Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Безумоўна, межы пасляваенных дзяржаў будуць вызначацца не гэтымі фактарамі, а сілай і магутнасцю дзяржаваў. Гэта асабліва адносіцца да СССР. Аднак не трэба забываць і майстэрства дыпламатыі (майстэрства Талейрана). Змог жа Талейран на Венскім кангрэсе сваім майстэрствам абараніць цалкам тэрытарыяльную цэласнасць разгромленай у напалеонаўскіх войнах Францыі і нават захаваць за ёй права вялікай дзяржавы.

Я думаю, што Цэнтральнаму Камітэту і Ураду Беларусі ў поўнай згодзе з Саюзным кіраўніцтвам неабходна было б ужо зараз даць даручэнне невялікай аўтарытэтнай групе (у складзе аднаго-двух гісторыкаў, эканаміста, географа і аднаго геолага падрыхтаваць шэраг сур'ёзных прац, якія ўстанаўліваюць адзінае права СССР на спрэчныя землі. Шэраг прац неабходна было б надрукаваць за мяжой, у Англіі і Амерыцы, у мэтах аб'ектыўнага раскрыцця сапраўднай сутнасці імперыялістычных спроб польскага ўрада і зману грамадскай думкі саюзных і сяброўскіх нам дзяржаў. Гэтую ж групу аўтарытэтных работнікаў неабходна было б рыхтаваць у якасці экспертаў і прадстаўнікоў на наступнай пасляваеннай мірнай канферэнцыі, дзе прэтэнзіі Польшчы могуць выплыць на паверх"[51].

Нагадаем, што ліст быў накіраваны Панцеляймону Панамарэнку 9 ліпеня, а 12 ліпеня, г.зн. праз тры дні, С.Колеснеў быў запрошаны П.Панамарэнкам і меў з ім працяглую гутарку. Як бачым, прапановы, сфармуляваныя С.Колесневым, вельмі зацікавілі першага сакратара ЦК КП(б)Б, бо нічым іншым немагчыма патлумачыць хуткасць прыёму ім прафесара. Магчыма

[51] НАРБ, ф.4, воп.33а, спр.165, арк.209-210.

толькі меркаваць, аб чым яны гутарылі і ці прыняў П.Панамарэнка прапановы С.Колеснева.

Такім чынам, вясной-летам 1943 г. партыйна-савецкае кіраўніцтва рэспублікі, творчая, навуковая інтэлігенцыя нават не дапускалі магчымасці перадачы часткі тэрыторыі Заходняй Беларусі Польшчы, а беларуска-польскую мяжу, што была ўстаноўлена ў выніку верасьнёўскіх падзей 1939 г., разглядала як законную мяжу, што не падлягае змене. Пазіцыя партыйнага кіраўніцтва рэспублікі ў 1943 г. адпавядала пазіцыі Крамля, які да заявы ўрада СССР аб савецка-польскіх адносінах ад 11 студзеня 1944 г. займаў жорсткую пазіцыю і не хацеў ісці на тэрытарыяльныя саступкі Польшчы. Аднак гэтая заява кардынальна мяняла справу, бо ў ёй выказвалася жаданне СССР вызначыць савецка-польскую мяжу ў адпаведнасці з лініяй Керзана. Гэта значыла, што частка тэрыторыі заходніх абласцей БССР павінна была адысці да Польшчы.

Неабходна заўважыць, што да заявы ТАСС ад 11 студзеня 1944 г. Масква ні тое, што не ўзгадніла пытанне аб магчымасці перадачы часткі Беларусі Польшчы, а нават і не папярэдзіла беларускае кіраўніцтва аб гэтым. У Мінску былі абсалютна ўпэўнены, што Беласточчына застанецца ў складзе БССР. Магчыма сцвярджаць, што заява ТАСС для партыйна-савецкага кіраўніцтва Беларусі была громам з яснага неба. Пацвярджэннем гэтай высновы можа быць наступнае. Партыйнае кіраўніцтва Беларусі 1 студзеня 1944 г., г.зн. за дзесяць дзён да заявы ТАСС, вызначыла склад партыйных работнікаў Беластоцкага абкама партыі, якія былі зацверджаны ў сваіх пасадах[52]. Больш таго, у дакладной запісцы Беластоцкага АК КП(б)Б "Палітычны стан Беластоцкай вобласці", накіраванай у ЦК КП(б)Б 1 студзеня 1944 г., адзначалася: "Да 1 студзеня 1944 г. падпольным абкамам КП(б)Б створаны наступныя райкамы: Лапскі, Свіслацкі, Ваўкавыскі, Гродзенскі, Аўгустоўскі межрайкамы, Снядоўскі, Замбраўскі, Скідальскі райкамы. *Акрамя гэтага, падабраны і зацверджаны ЦК сакратары межрайцэнтраў Ломжынскага, Бранскага, Чыжэўскага, сакратары райкамаў Сапоцкінскага і Крынкаўскага. Абкамам КП(б)Б падабраны для працы сакратарамі РК КП(б)Б і прадстаўлены на зацверджанне ЦК – 5 чалавек. Да працы прыступілі 7 райкамаў, два межрайкамы (Аўгустоўскі, Чыжэўскі), два сакратары райкамаў КП(б)Б* (выдзелена мной. – А.В.). Змест работы ў раёнах партыйных камітэтаў зводзіцца, у сучасны

[52] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.33, арк.1.

момант, да наступнага: а) устанаўленне сувязей з савецкім актывам і насельніцтвам; б) выданне і распаўсюджванне літаратуры, зводак інфармбюро, правядзенне гутарак з насельніцтвам; в) стварэнне антыфашысцкіх арганізацый і кіраўніцтва імі; г) стварэнне скрытых партызанскіх рэзерваў і ўзбраенне іх; е) стварэнне і кіраўніцтва камсамольскімі арганізацыямі”[53]. Як вынікае з гэтага, і ў Беластоцкім абкаме партыі і ў Цэнтральным Камітэце Кампартыі Беларусі (паколькі ЦК зацвердзіў работнікаў райкамаў у пасадах) нават не дапускалася думкі аб тым, што Беласточчына будзе перадана Польшчы. Зыходзячы з гэтага, Беластоцкі абкам партыі поўным ходам рыхтаваў кадры для працы ў вобласці пасля яе вызвалення ад немцаў.

У сувязі з гэтым цікавасць уяўляе рэакцыя ўрада Беларусі і асабіста П.Панамарэнкі, як першага сакратара ЦК КП(б)Б і Старшыні СНК БССР, на сітуацыю, якая кардынальна змянілася. Пазіцыю беларускага кіраўніцтва наконт перадачы Беласточчыны Польшчы П.Панамарэнка афіцыйна агучыў на VI сесіі ВС БССР (сакавік 1944 г.). Выступаючы 21 сакавіка з дакладам "Аб вызваленні беларускіх зямель, далейшых задачах барацьбы беларускага народа супраць нямецкіх захопнікаў і аднаўленні народнай гаспадаркі Беларускай ССР", ён заявіў, і на гэта неабходна звярнуць увагу, што мяжа, якая была ўстаноўлена ў 1939 г., "*справядлівая як у гістарычных, так і этнаграфічных адносінах і адпавядае інтарэсам як Польшчы, так і Беларусі*". І далей: "*Уз'яднаная беларуская дзяржава не аддасць нікому і ніколі метра зямлі, які належыць беларускаму народу. У гэтым на баку беларускага народа права і дастатковая сіла, каб абараніць краіну ад усялякіх замахаў*"[54]. (выдзелена мной. – А.В.). Фактычна гэтымі словамі ён паўтарыў сваю пазіцыю, а таксама партыйнага кіраўніцтва Беларусі, якая была сфармулявана на лютаўскім пленуме ЦК КП(б)Б і ў заяве ЦК КП(б)Б “Аб ваенна-палітычных задачах работы ў заходніх абласцях БССР”. Як выцякае са слоў П.Панамарэнкі, ні аб якай перадачы Польшчы часткі тэрыторыі Беларусі гаворка не ідзе. Аднак праз тры дні, 24 сакавіка, на гэтай жа сесіі Старшыня Прэзідыума ВС БССР Н.Наталевіч фактычна дэзавуіруе словы П.Панамарэнкі. Н.Наталевіч, закранаючы пытанні ўзаемаадносін з Польшчай і пытанні беларуска-польскай мяжы, заявіў дэпутатам: "*У адпаведнасці з лініяй Керзана да Польшчы адыходзіць большасць раёнаў Беластоцкай вобласці,*

[53] Там сама, арк. 14-15.
[54] Знешняя палітыка Беларусі ... Т.4 С.182-183.

*якія з 1939 г. па 1941 г. уваходзілі ў склад Беларускай ССР"* [55]. Адзінае, на што асмеліўся Н.Наталевіч, гэта заявіць, што "ў некаторых раёнах, у прыватнасці Бельскім, пераважае беларускае насельніцтва, таму прэтэнзіі польскага эміграцкага ўрада на гэты раён мы лічылі абсалютна няправільнымі. Я звяртаюся да Вярхоўнага Савета разгледзець гэтае пытанне і прасіць саюзны ўрад пры вызначэнні дзяржаўных межаў паміж Савецкім Саюзам і Польшчай улічыць цалкам законнае і справядлівае жаданне беларускага народа ўз'яднаць усе спрадвечныя беларускія землі ў адзіную Беларускую Савецкую дзяржаву"[56].

У сувязі з супрацьлеглымі выказваннямі двух вышэйшых дзяржаўных асоб (П.Панамарэнка – першы сакратар ЦК КП(б)Б і адначасова Старшыня СНК БССР, М.Наталевіч – Старшыня Прэзідыума ВС БССР) узнікае шэраг прынцыповых пытанняў. Чаму з розніцай у тры дні прагучалі такія розныя заявы аб беларуска-польскай мяжы ? Чаму П.Панамарэнка заявіў аб справядлівасці мяжы, якая была ўсталявана ў 1939 г., ведаючы аб заяве савецкага ўрада ад 11 студзеня 1944 г., у якой гаварылася, што СССР гатовы прызнаць лінію Керзана ў якасці савецка-польскай мяжы і саступіць Польшчы частку тэрыторыі СССР (гэта якраз і значыла, што Беласточчына адыйдзе да Польшчы) ? Ці было гэта жаданне П.Панамарэнкі на самай справе захаваць цэласнасць беларускіх зямель і спадзяванні адстаяць усю тэрыторыю, якая ўвайшла ў склад БССР у 1939 г. ? Ці гэта быў своеасаблівы зандаж думкі Крамля па праблеме Беласточчыны ? Таксама невядома, ці было гэта асабістае выказванне П.Панамарэнкі, ці пры падрыхтоўцы свайго даклада ён абмяркоўваў гэтае пытанне з членамі ўрада або членамі бюро ЦК КП(б)Б ? Калі гэта быў зандаж, то за гэтыя тры дні П.Панамарэнку далі ясна зразумець, што лёс Беласточчыны вырашаны, і яна застанецца ў складзе Польшчы. Таму 24 сакавіка і прагучала заява Н.Наталевіча, якая адрознівалася ад заявы П.Панамарэнкі. Характэрна, што дэпутаты ВС БССР ці не "заўважылі", ці не захацелі "заўважыць" рознагалосся ў выступленнях кіраўнікоў рэспублікі і нават не абмяркоўвалі гэтага пытання, хоць гаворка ішла ні аб чым іншым, як аб перадачы часткі тэрыторыі Беларусі замежнай дзяржаве.

Аналізуючы без перабольшання неардынарнае выступленне П.Панамарэнкі на VI сесіі ВС БССР (сакавік 1944 г.), магчыма вылучыць два моманты, што падштурхнулі яго выступіць з прамовай, якая фактычна супярэчыла заяве ўрада СССР ад 11

---

[55] Там сама, С.195.
[56] Там сама, С.195.

студзеня 1944 г. Па-першае, у лютым 1944 г. рэспубліцы было прадастаўлена права ажыццяўлення "самастойнай" знешнепалітычнай дзейнасці, і, магчыма, П.Панамарэнка ўсур'ёз успрыняў той факт, што рэспубліцы на самай справе дазволяць праводзіць самастойную знешнюю палітыку. Па-другое, яго выступленне ўсё ж магчыма разглядаць як спробу захаваць тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі і не дапусціць перадачы Беласточчыны Польшчы. Аднак Крэмль, які дапусціў пэўную "гульню" у самастойнасць, на самай справе не меў намеру аддаваць права вызначэння межаў Беларусі. Далейшы ход падзей яскрава гэта прадэманстраваў.

Разам з такім "прамаскоўскім" поглядам на савецка-польскую мяжу, перадачу часткі Беларусі Польшчы існаваў іншы погляд, які быў агучаны Віцэ-Прэзідэнтам Цэнтральнай Беларускай Рады М.Шкялёнкам на Другім Усебеларускім Кангрэсе (27 чэрвеня 1944 г.). М.Шкялёнак, аналізуючы і ацэньваючы перамовы, якія вяліся ўрадам СССР з ПКНВ і лонданскім эміграцкім урадам наконт межаў і тэрыторыі Беларусі, адзначыў, што, дзелячы беларускія землі, Расія і Польшча дзейнічаюць не на аснове права, а на аснове «ганебнай дамовы як звычайныя захопнікі». Ён падкрэсліў, што "асновай маскоўска-польскіх прэтэнзій да Беларусі ляжала заўжды толькі захопніцтва, што спосаб, якім яны па чарзе няволілі Беларусь, быў гвалт, а не якія-небудзь дабравольныя ўмовы ці традыцыі. Гісторыя не дае ніякага абгрунтавання іхнім прэтэнзіям да Беларусі"[57]. М.Шкялёнка падтрымаў Я.Малецкі, які таксама падкрэсліў, што «Маскоўшчына і Польшча заўсёды былі ворагамі Беларусі, а іх трактаты – варожыя. Беларускі народ заўсёды пратэставаў супраць іх, і цяпер яны для яго зніклі»[58]. Выступленне М.Шкялёнка ды і іншых, улічваючы той факт, што Кангрэс праводзіўся літаральна за некалькі дзён да вызвалення Беларусі, мела толькі дэкларатыўны характар і адлюстроўвала погляды беларускай калабарацыі на ўзаемаадносіны Масквы і Варшавы, якія за кошт Беларусі рашалі свае знешнепалітычныя задачы.

Нават і пасля таго, як лёс Беласточчыны быў вырашаны, партыйнае кіраўніцтва Беластоцкай, а пасля Гродзенскай вобласці звярталася да П.Панамарэнкі з прапановамі аб захаванні тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі. 5 красавіка 1944 г. першы сакратар Беластоцкага абкама партыі В.Самуцін звяртаецца з лістом да П.Панамарэнкі і просіць яго растлумачыць сітуацыю,

---

[57] Знешняя палітыка Беларусі ... Т.4, С.216.
[58] Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі, Пасл. А.Грыцкевіча; Укл: Н.Дашкевіч. Мн.: «Навука і тэхніка», 1993.-С.328.

якая склалася з пытаннем аб мяжы і магчымай перадачы Польшчы Беласточчыны. В. Самуцін пакрэсліваў: "Савецкі ўрад заявіў, што не лічыць межы з Польшчай нязменнымі і што пры пэўных умовах ён згодны ўстанавіць мяжу па так званай лініі Керзана. Мы ў сваёй прапагандзе зыходзім з устаноўкі ЦК КП(б)Б аб нязменнасці межаў. Я запытаў ЦК па гэтаму пытанню, але адказу не атрымаў. Абкамам дадзены ўказанні зыходзіць у прапагандзе з установак, якія ўтрымліваюцца ў заяве савецкага ўрада. Акрамя таго, узнікае пытанне, ці правільна будзе пасылаць ўпаўнаважанага ЦШПР і БШПР у раён, аб якім у заяве савецкага ўрада гаворыцца, што пры пэўных умовах ён (урад СССР. – А.В.), згодны на адыход гэтага раёна да Польшчы. Ці не знаходзяцца гэтыя дзеянні ў супярэчнасці адно з адным. Па гэтаму пытанню чакаю ад Вас радыёграмы. Справа ідзе аб групе раёнаў вобласці"[59]. Цікавасць яго лісту надае наступнае. Беластоцкі абкам партыі амаль тры месяцы пасля заявы ТАСС ад 11 студзеня (студзень-красавік), зыходзіў з установак ЦК КП(б)Б, "аб нязменнасці межаў" рэспублікі. Магчыма меркаваць, што і ў ЦК КП(б)Б, і ў Беластоцкім абкаме партыі цяплілася і не знікала надзея, што Беласточчына ўсё ж застанецца ў складзе БССР.

Кіраўніцтва Беластоцкага АК КП(б)Б паспрабавала "адстаяць" Беласточчыну летам 1944 г. 8 ліпеня 1944 г. на імя першага сакратара ЦК КП(б)Б П.Панамарэнкі была накіравана дакладная запіска старшыні Беластоцкага абласного савета дэпутатаў працоўных П.Ратайкі і сакратара Беластоцкага абкама партыі А.Эльмана, у якой яны спрабавалі абгрунтаваць гістарычную прыналежнасць Бельскага, Заблудаўскага, Беластоцкага раёнаў да "старажытных беларускіх зямель". Да таго ж яны звярнуліся да П.Панамарэнкі, каб ён "паставіў пытанне перад савецкім урадам аб тым, каб у час перамоваў з Польшчай г. Беласток, Беластоцкі, Бельскі і Заблудаўскі раёны былі пакінутыя ў складзе БССР"[60]. Партыйнае кіраўніцтва Гродзенскай вобласці не пакідала надзеі і ў далейшым захаваць у складзе БССР як мага болей тэрыторыі былой Беластоцкай вобласці. У снежні 1944 г. сакратар Гродзенскага АК КП(б)Б П.Калінін у чарговы раз спрабуе прыцягнуць увагу П.Панамарэнкі да тэрытарыяльнай праблемы ўжо Гродзенскай вобласці і "ўдакладніць" лінію мяжы на карысць

---

[59] НАРБ, ф.4, воп.33а, спр.568, арк.5.

[60] Рыбак Н.А. К вопросу об общественно-политической ситуации в западных областях БССР после освобождения республики (1944-1945 гг.) //Беларусь в годы Великой Отечественной войны: уроки истории и современность: Материалы междунар. научн. конф. (Минск, 29-30 июня 2004 г.) /Сост. А.М.Литвин и др.-Мн.: Институт истории НАН Беларуси, 2004.-С.221.

Беларусі. У лісце да П.Панамарэнкі ён адзначае: “Пры ўстанаўленні мяжы Беларускай ССР і ПКНВ у жніўні 1944 г. раённы цэнтр Бераставіцкага раёна г. Крынкі і прылягаючыя да яго вёскі Гур’яны, Крушаняны, Паўднёвы Востраў, Новы Востраў, Скрабдякі і вёска Гаркавічы Сакалскага раёна з перавагай у іх беларускага насельніцтва адышлі да тэрыторыі ПКНВ. Насельніцтва азначаных пунктаў неаднаразова вусна звярталася ў Бераставіцкі РК з просьбай пакінуць г. Крынкі з прылягаючымі да яго вёскамі ў межах БССР. Аб гэтым жа была падана заява на імя т. Сталіна 95 жыхароў вёскі Гаркавічы былога Сакалскага раёна. Улічваючы звароты беларускага насельніцтва і з мэтай усталявання больш дакладнай мяжы паміж Беларускай ССР і ПКНВ Гродзенскі АК просіць пры ўдакладненні мяжы паміж Беларускай ССР і ПКНВ вызначыць пытанне аб далучэнні да тэрыторыі БССР г. Крынкі і вёсак Гур’яны, Спадвілы, Вайцахоўшчына, Плебанава, Белагорцы, Цюлічы, Жылічы, Грыбаўшчына, Паўднёвы Востраў, Новы Востраў, Інгулы, Гаркавічы і іншых населеных пунктаў з перавагай беларускага насельніцтва, устанавіць лінію мяжы паміж Беларускай ССР і ПКНВ наступным чынам: мястэчка Кузніца, станцыя Жэдня, станцыя Орля, станцыя Клешчальцы з уключэннем гэтых населеных пунктаў у склад Бераставіцкага раёна і сумежных раёнаў Брэсцкай вобласці”[61]. Аднак П.Панамарэнка як вопытны наменклатуршчык добра разумеў, што на календары не верасень 1939 г. і пытанне Беласточчыны ўжо вырашана ў Крамлі і ні пры якіх умовах пераглядацца не будзе. Таму гэты, як і папярэднія звароты партыйна-савецкага кіраўніцтва Гродзенскай вобласці, засталіся без адказу.

У далейшым П.Панамарэнка ў публічных выступленнях ніколі не закранаў гэтай тэмы. Не закранаў, нягледзячы на той факт, што на яго імя вясной-восенню 1944 г. паступалі сотні, тысячы заяваў ад беларусаў Беласточчыны, якія прасілі яго пакінуць тэрыторыю Беластоцкай вобласці ў складзе БССР. Так, восенню 1944 г. звыш 6 тысяч жыхароў Белавежы Гайнаўскай гміны накіравалі ў ЦК КП(б)Б калектыўны ліст, у якім прасілі "партыю і ўрад БССР", далучыць г. Белавежу і Белавежскую пушчу да БССР[62]. У кастрычніку 1945 г. НКЗС БССР паведамляў у ЦК КП(б)Б, што “з 18 па 20 ліпеня гэтага года (1945 г. – А.В.) у НКЗС БССР паступілі заявы ад жыхароў 21 вёскі з беларускім насельніцтвам, якія знаходзяцца за лініяй Керзана, на тэрыторыі Польшчы (Бельскі

[61] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.33, арк.60.
[62] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1902, арк.28.

павет, Арлянская і Клюкавіцкая воласці Беластоцкай вобласці). Кожная заява падпісаная жыхарамі гэтых вёсак. Усяго 975 подпісаў. У сваіх заявах яны просяць перагледзець граніцу паміж Польшчай і БССР і далучыць іх вёскі да Беларускай рэспублікі, бо абсалютная большасць насельніцтва ў вышэйазначаных вёсках – беларускае"[63]. Аднак, як і звароты партыйнага кіраўніцтва Гродзенскай вобласці, так і звароты насельніцтва засталіся без адказу.

Жаданне І.Сталіна прывесці да ўлады ў Польшчы левыя сілы вымусілі кіраўніцтва СССР энергічна падтрымаць КРН у якасці адзінага «паўнамоцнага прадстаўніка», «абараняючага» інтарэсы польскага народа. Важным крокам у гэтым напрамку з'явілася прыняцце ў маі 1944 г. у Маскве дэлегацыі КРН на чале з членам Прэзідыума КРН Э.Асубка-Мараўскім. Перамовы, якія адбыліся і ў якіх прынялі ўдзел І.Сталін і В.Молатаў, паказалі, што Савецкі Саюз гатовы прызнаць і будзе аказваць усебаковую дапамогу КРН, нягледзячы на тое, што "могуць узнікнуць вялікія цяжкасці з боку саюзнікаў", якія жадалі стварэння Часовага ўрада Польшчы на кааліцыйнай аснове з уключэннем у яго прадстаўнікоў "лонданцаў"[64].

Больш канкрэтна пытанне аб межах і тэрыторыі, якое непасрэдна закранала Беларусь, было агучана ў лісце ўпаўнаважанага КРН Э. Асубкі-Мараўскага і старшыні Галоўнага кіраўніцтва СПП В. Васілеўскай, якія звярнуліся 15 ліпеня 1944 г з лістом да І. Сталіна, у якім яны выказалі неабходнасць стварэння Часовага польскага ўрада. Яго стварэнне, як адзначалася, дасць магчымасць будаваць адносіны паміж СССР і Польшчай на аснове міждзяржаўных пагадненняў. У лісце таксама падкрэслівалася неабходнасць перадачы Польшчы заходняй часткі Беластоцкай вобласці.

21 ліпеня 1944 г. было абвешчана аб стварэнні Польскага камітэта нацыянальнага вызвалення (ПКНВ), які 22 ліпеня 1944 г. звярнуўся з Маніфестам да польскага народа, у якім пацвярджалася імкненне да ўрэгулявання пытання савецка-польскай мяжы па этнічнаму прынцыпу. КРН і створаны ёю ПКНВ прызналі, што "ўсходняя мяжа павінна быць лініяй добрасуседскага сяброўства, а не перашкодай паміж намі і нашымі суседзямі, яна павінна быць урэгулявана згодна прынцыпу:

[63] Архіў МЗС РБ, ф.907, воп.2, спр.400, арк.4.
[64] Парсаданова В. Назв. соч. С.164.

польскія землі — Польшчы, украінскія, беларускія і літоўскія землі — Савецкай Украіне, Беларусі і Літве"[65].

24—26 ліпеня ў Маскве адбыліся перагаворы паміж Савецкім урадам і ПКНВ, у ходзе якіх важнейшае месца заняло пытанне аб дзяржаўнай мяжы паміж СССР і Польшчай. Польская дэлегацыя, зыходзячы з прызнання права беларускага і ўкраінскага народаў на самавызначэнне, прапанавала лінію мяжы ў адпаведнасці з этнаграфічным прынцыпам і вылучыла на пярэдні план пытанне аб Белавежскай пушчы, якая павінна была стаць крыніцай сыравіны для прамысловасці Гайнаўкі, а таксама польскім нацыянальным паркам. І.Сталін, аднак, не хацеў перадаваць пушчу палякам. Толькі пасля настойлівага звароту М. Роля-Жымерскага, які папрасіў ад імя ўсёй польскай дэлегацыі ўрэгуляваць пытанне аб Белавежскай пушчы, І.Сталін пачаў хістацца і сказаў: "Тое, што я з вамі тут узгадняю, павінен буду затым яшчэ раз абмеркаваць з беларусамі перад прыняццем канчатковага рашэння". Калі дэлегацыя ПКНВ вярнулася ў гатэль, В.Молатаў праінфармаваў Э. Асубку-Мараўскага аб тым, што І.Сталін згадзіўся пакінуць Польшчы Белавежу разам з часткай Белавежскай пушчы[66].

27 ліпеня 1944 г. В. Молатаў і Э. Асубка-Мараўскі падпісалі пагадненне паміж урадамі СССР і ПКНВ аб савецка-польскай мяжы, за аснову якога была прынята лінія Керзана з адступленнямі ад яе на карысць Польшчы (на беларускім участку) Беластоцкай вобласці і часткі Белавежскай пушчы. Пры гэтым урад СССР "пагадзіўся на наступныя выпраўленні азначанай лініі на карысць Польшчы, саступіўшы Польскай Рэспубліцы: а) тэрыторыю, размешчаную на ўсход ад лініі Керзана да ракі Заходні Буг і ракі Салокія, да поўдня ад г. Крылаў; б) частку тэрыторыі Белавежскай пушчы на ўчастку Няміраў-Ялаўка, размешчаную на ўсход ад лініі Керзана з астаўленнем Нямірава, Гайнаўкі, Белавежа і Ялаўкі на баку Польшчы"[67]. Гэта пагадненне мела ў пэўнай ступені падрыхтоўчы, "часовы" характар, паколькі было падпісана ПКНВ, які выконваў функцыі часовага польскага ўрада. У момант яго падпісання значная частка польскай тэрыторыі знаходзілася пад нямецкай акупацыяй. Акрамя таго, мяжа паміж двумя дзяржавамі была вызначана без уліку маючых адбыцца перагавораў паміж урадамі трох вялікіх дзяржаў у Ялце, дзе планавалася абмеркаваць "польскае пытанне".

[65] Снапкоўскі У. Назв. твор. С.79.
[66] Там сама, С.80.
[67] Знешняя палітыка Беларусі ... Т.4, С.327.

Польскі эмігранцкі ўрад па-ранейшаму адмаўляўся прызнаваць лінію Керзана і заключанае ПКНВ з СССР пагадненне аб мяжы. Перамовы ў Маскве савецкага ўрада з дэлегацыяй эміграноцкага ўрада на чале з прэм'ер-міністрам С. Мікалайчыкам, што адбыліся ў жніўні і кастрычніку 1944 г., засведчылі гэтае. Пазіцыя польскага эміграноцкага ўрада адносна мяжы Польшчы з СССР была выкладзена ў яго мемарандуме ад 29 жніўня 1944 г. У ім, у прыватнасці, падкрэслівалася, што Польшча, якая панесла вялікія страты ў вайне, не можа выйсці з вайны зменшанай тэрытарыяльна. На ўсходзе ў складзе Польшчы павінны застацца галоўныя цэнтры польскага культурнага жыцця (Вільня і Львоў) і крыніцы сыравіны. Канчатковае ўрэгуляванне польска-савецкай мяжы прапаноўвалася ажыццявіць рашэннем канстытуцыйнага сейма ў адпаведнасці з дэмакратычнымі прынцыпамі. Падкрэслівалася неабходнасць правядзення добраахвотнага абмену польскага, беларускага і ўкраінскага насельніцтва. Аднак І.Сталін адхіліў канцэпцыю часовай дэмаркацыйнай лініі паміж СССР і Польшчай, прапанаваную С.Мікалайчыкам, паколькі лінія мяжы ўжо была вызначана на аснове пагаднення з ПКНВ.

На перамовах па "польскаму пытанню" ў Маскве ў кастрычніку 1944 г., у якіх удзельнічалі І.Сталін, У.Чэрчыль, кіраўнікі польскага эміграноцкага ўрада і ПКНВ, на С.Мікалайчыка быў аказаны моцны ціск з мэтай прызнаць лінію Керзана ў якасці дзяржаўнай савецка-польскай мяжы. Вось што успамінаў аб маскоўскіх перамовах У.Чэрчыль: «На перамовах у Маскве ў кастрычніку я моцна настойваў, каб Мікалайчык падумаў аб дзвюх рэчах – аб прыняцці дэ-факта лініі Керзана з двухбаковым абменам насельніцтвам»[68]. Аднак прэм'ер-міністр эміграноцкага ўрада, нягледзячы на вельмі моцны ціск, аказаны на яго ў Маскве, праявіў цвёрдасць і не пагадзіўся на саступкі. "Вы б, панове, дрэнна думалі пра мяне, — сказаў Мікалайчык, — згадзіся я аддаць 40% тэрыторыі дзяржавы і 13 мільёнаў польскіх грамадзян, у тым ліку 5 мільёнаў палякаў". Эміграноцкі ўрад не прызнаў пагаднення аб абмене насельніцтвам, заключанага БССР з ПКНВ, і адзначыў, што БССР, як і іншыя савецкія рэспублікі, дзейнічала ў адпаведнасці з інструкцыямі ўрада СССР. Лонданскі ўрад заявіў, што гэтыя пагадненні не датычацца рэпатрыяцыі польскіх грамадзян, дэпартаваных з тэрыторыі Усходняй Польшчы ў глыбіню СССР у 1939—1941 гг. і што пры дапамозе "аднабаковага рашэння ён спрабуе змяніць традыцыйны этнаграфічны выгляд

[68] Черчилль У.С. Триумф и трагедия... С.135.

гэтых тэрыторый шляхам адвольнага перамяшчэння мас мільёнаў людзей"[69].

Важнейшае значэнне для міжнародна-прававога ўрэгулявання пытання аб савецка-польскай мяжы мелі рашэнні Крымскай канферэнцыі (4-11 лютага 1945 г.). І.Сталін, выступаючы ў дыскусіі аб межах Польшчы, нагадаў аб тым, што лінія Керзана была прыдуманая не рускімі. Яе аўтарамі з'яўляюцца Керзан, Клемансо і амерыканцы, якія прымалі ўдзел у Парыжскай канферэнцыі 1919 г. Ён сказаў, што лінія Керзана была прынята супраць волі Леніна, які не жадаў аддаваць Польшчы Беласток і Беластоцкую вобласць, што, згодна лініі Керзана, адыходзілі да Польшчы. І.Сталін заявіў, што згода Савецкага ўрада з гэтай лініяй ужо з'явілася адступленнем ад пазіцыі Леніна і што на большае ён катэгарычна не пойдзе. Пасля дыскусій кіраўнікі трох урадаў пагадзіліся, што ўсходняя мяжа Польшчы павінна ісці ўздоўж лініі Керзана з адступленнямі ад яе ў некаторых раёнах ад 5 да 8 км на карысць Польшчы.

Канчаткова савецка-польская мяжа была вызначана і замацавана рашэннямі Патсдамскай канферэнцыі кіраўнікоў СССР, ЗША і Англіі (17 ліпеня – 2 жніўня 1945 г.). Міжнародна-прававое прызнанне мяжы паміж СССР і Польшчай дазволіла абодвум дзяржавам заключыць замест пагаднення ад 27 ліпеня 1944 г. двухбаковы дагавор аб савецка-польскай мяжы, які 16 жніўня 1945 г. падпісалі намеснік Старшыні СНК СССР В. М. Молатаў і Старшыня Савета Міністраў Польскай Рэспублікі Э. Асубка-Мараўскі. Пры дакладным вызначэнні пагранічнай лініі дагавор уносіў і некаторыя карэктывы. Ён канстатаваў адступленне на карысць Польшчы ад лініі Керзана не да 5—8 км, як гэта прадугледжвалася ў Крыме, а да 30 км. Па дагавору СССР саступіў Польшчы дадаткова тэрыторыю, размешчаную на ўсход ад лініі Керзана да ракі Заходні Буг і ракі Салокія; на поўдзень ад г. Крылоў (на 30 км у глыбіню тэрыторыі УССР), а таксама частку Белавежскай пушчы (на 17 км у глыбіню тэрыторыі БССР). "Савецкі варыянт" лініі Керзана адразаў ад Беларусі тэрыторыю плошчай 14,3 тыс. км$^2$ з насельніцтвам, паводле перапісу 1946 г., каля 638 тыс. чалавек. Беласточчына, далучаная да Польшчы, уяўляла сабой тэрыторыю, якая раўнялася палове плошчы такіх сярэдніх еўрапейскіх краін, як Албанія ці Бельгія[70]. На прэс-канферэнцыі ў Варшаве 27 жніўня 1945 г. прэзідэнт КРН Б. Берут падкрэсліў, што дзякуючы дагавору ўкраінскае і беларускае

[69] Снапкоўскі У. Назв. твор. С.81.
[70] Снапкоўскі У. Назв. твор. С.87.

насельніцтва ўз'ядноўваецца ў сваіх дзяржавах, а Польшча пазбаўляецца ад ачага пастаяннай занепакоенасці і ўнутраных рознагалоссяў, ператвараецца ў аднанацыянальную дзяржаву.

Неабходна падкрэсліць, што з пункту гледжання міжнароднага і ўнутрыдзяржаўнага права СССР дагавор ад 16 жніўня 1945 г. не ўяўляецца такім бездакорным і адназначным актам. Нягледзячы на тое, што ён быў заключаны па ўпаўнаважанню Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, у які ўваходзілі старшыні прэзідыумаў Вярхоўных Саветаў усіх саюзных рэспублік і ратыфікаваны ім, гэты дагавор не абмяркоўваўся ў вышэйшых органах дзяржаўнай улады і кіравання УССР, БССР і ЛітССР, чые нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы ён непасрэдна закранаў. Нават фармальнай згоды вышэйшых органаў дзяржаўнай улады БССР на змяненне межаў рэспублікі, як таго патрабавалі Канстытуцыі СССР і БССР, не мелася. М. Хрушчоў пісаў у сваіх успамінах аб тым, што да Польшчы "адышлі і асобныя землі з чыста беларускім і ўкраінскім насельніцтвам. Відаць, Сталін дзеля таго, каб "задобрыць" польскае самалюбства, саступіў іх: тут, я б сказаў, меў месца акт вялікай палітычнай гульні на новай аснове, каб аслабіць непрыемны асадак, які застаўся ў польскага народа ў выніку дагавора, падпісанага намі з Рыбентропам"[71].

Дагавор аб дзяржаўнай мяжы паміж СССР і Польшчай быў ратыфікаваны Краёвай Радай Нарадовай 31 снежня 1945 г., а Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР 13 студзеня 1946 г. Ён прадугледжваў стварэнне змешанай савецка-польскай камісіі па дэмаркацыі мяжы з месцазнаходжаннем у Варшаве. Камісія пачала сваю працу ў маі 1946 г. і скончыла дэмаркацыю беларуска-польскай часткі савецка-польскай мяжы ў маі 1948 г.

Адзначым, што напярэдадні дэмаркацыі мяжы беларускае кіраўніцтва ў чарговы раз паспрабавала «выправіць» беларуска-польскі ўчастак мяжы на карысць рэспублікі. Восенню 1945 г. Наркамат замежных спраў БССР накіраваў старшыням раённых выканаўчых камітэтаў усіх памежных з Польшчай раёнаў – Сапоцкінскага, Гродзенскага, Бераставіцкага, Свіслацкага Гродзенскай, Шэрашаўскага, Высокаўскага, Брэсцкага, Дамачаўскага Брэсцкай абласцей ліст наступнага зместу: «Прашу тэрмінова паведаміць свае заўвагі эканамічнага, геаграфічнага характару адносна новай памежнай лініі з Польскай рэспублікай»[72]. З раёнаў у НКЗС ішлі розныя меркаванні. Старшыня Высокаўскага райвыканкама паведамляў: «У выніку таго, што раён выключна

[71] Там сама, С.88.
[72] Архіў МЗС РБ, ф.907, воп.2, спр.400, арк.8.

бедны лесам, мяжу ў раёне вескі Токары неабходна было б адсунуць на 2-3 км на захад»[73]. Сугучную думку выказаў старшыня Сапоцкінскага райвыканкама, які прапанаваў «уключыць у склад тэрыторыі Беларусі азёры Глэмбока і Шляны, а таксама лясныя масівы, якія неабходны для паляпшэння эканамічнага становішча раёна»[74]. Старшыня Шэрашаўскага райвыканкама таксама адзначаў неабходнасць уключэння ў склад БССР чыгуначнага вузла Гайнаўка, што "дасць магчымасць мець чыгуначную сетку Брэст-Гродна»[75]. У той жа час старшыня Дамачаўскага РВК паведамляў К.Кісялёву, што «новая лінія мяжы задавальняе нашыя патрэбы»[76]. Заўважым, што прапановы кіраўнікоў раёнаў, што межавалі з Польшчай, часткова былі ўлічаны, асабліва гэта тычылася Высокаўскага раёна.

Дэмаркацыя савецка-польскай мяжы на яе беларуска-польскай частцы праводзілася на тэрыторыі Сапоцкінскага, Бераставіцкага, Гродзенскага раёнаў Гродзенскай і Шэрашаўскага, Высокаўскага, Брэсцкага, Дамачаўскага раёнаў Брэсцкай абласцей[77]. Яна праходзіла ў некалькі этапаў і ў асноўным была скончана ў маі 1948 г. Першы этап пачаўся адразу ж пасля ратыфікацыі дагавора Прэзідыумам ВС СССР 13 студзеня 1946 г. і скончыўся восенню 1946 г. У выніку працы савецка-польскай змешанай камісіі беларуска-польская мяжа ад 1 да 3 км была перанесена на захад на ўчастку Высокаўскага раёна Брэсцкай вобласці, а на ўчастку Шэрашаўскага Брэсцкай, Бераставіцкага і Гродзенскага Гродзенскай вобласці наадварот, прайшла некалькі на ўсход[78]. Адхіленні мяжы прывялі да таго, што на ўчастку Высокаўскага раёна да Беларусі адышлі 24 населеныя пункты, якія налічвалі 700 двароў, у якіх пражывала 3606 чалавек. У той жа час у паласе Шэрашаўскага, Бераставіцкага раёнаў Брэсцкай вобласці да Польшчы адыходзіла 40 населеных пунктаў, якія налічвалі 1414 двароў, у якіх пражывалі 7143 чалавекі[79]. З гэтай колькасці польскіх гаспадарак налічвалася 798, беларускіх - 616. У выніку таго, што яны апынуліся ў 800-мятровай пагранічнай паласе, то ўсе 616 беларускіх гаспадарак былі адселеныя ўглыб БССР.

Наступны этап дэмаркацыі беларуска-польскай мяжы і ў сувязі з гэтым перасяленне насельніцтва праходзілі з 18 красавіка

[73] Архіў МЗС РБ, ф.907, воп.2, спр.400, арк.2.
[74] Там сама, арк.10.
[75] Там сама, арк.10.
[76] Там сама. арк.3.
[77] Там сама, арк.4.
[78] НАРБ, ф.4, воп.100, спр.2, арк.173.
[79] Там сама , арк. 173.

па 31 мая 1948 г. 31 мая 1948 г. у Бераставіцах прадстаўнікі ўрада Беларусі і Польшчы падпісалі пагадненне аб тым, што "на ўчастках мяжы № № 9, 10, 11, 12, 13, 14, 15 савецкія і польскія пагранічнікі выйшлі на ахову новай дэмаркацыйнай мяжы да 25 мая 1948 г."[80]. Бакі таксама адзначылі, што "ў выніку праведзенай працы перасялена ў Польшчу з памежных раёнаў БССР 276 польскіх гаспадарак, якія налічвалі 1281 чалавек"[81].

Працэс дэмаркацыі не скончыўся 1948 г., а працягваўся ў наступныя гады. Так, у красавіку 1949 г. з Сапоцкінскага раёна Гродзенскай вобласці пры дэмаркацыі мяжы да Польшчы адышлі 19 вёсак і 4 хутары, у якіх пражывала 5367 чалавек. У сувязі з яшчэ адной дэмаркацыяй мяжы 8 сакавіка 1955 г., да Польшчы адышло яшчэ 2 вёскі і 4 хутары Сапоцкінскага раёна з насельніцтвам у 1835 чалавек. Канчатковае ўрэгуляванне памежных пытанняў паміж Польшчай і БССР ажыццявілася толькі ў сярэдзіне 1955 г., калі з Гродзенскай вобласці да Польшчы адышло 26 вёсак і 4 хутары[82].

Правядзенне дэмаркацыі беларуска-польскай часткі савецка-польскай мяжы ў афіцыйных дакументах, падпісаных беларускімі і польскімі прадстаўнікамі, разглядалася як дэмаркацыя "дзяржаўнай мяжы паміж СССР і Польшчай", якая адбывалася ў адпаведнасці з "Пратаколам пасяджэння змешанай камісіі Саюза ССР і Польшчы ад 10 красавіка 1948 г. па дэмаркацыі дзяржаўнай мяжы паміж СССР і Польскай Рэспублікай"[83]. Гэта сведчыла аб тым, што заходняя мяжа Беларусі вызначалася не на аснове двухбаковага беларуска-польскага, а савецка-польскага дагавора. З гэтага вынікае, што кіраўніцтва Беларусі не мела права самастойна вызначаць межы рэспублікі. Яны вызначаліся ў Маскве.

---

[80] НА РБ, ф.787. воп.2, спр.5, арк.17.
[81] НА РБ, ф.787. воп.2, спр.5, арк.9.
[82] Бодак А. Урегулирование пограничных вопросов между Польшей и Белоруссией в первое послевоенное десятилетие // Granice i pogranicza. Bialystok. 1999, T.1.- S.255-256.
[83] НАРБ, ф.787, воп.2, спр.5, арк. 8; воп.1, спр.64, арк.159.

# Глава 2.
# Эвакуацыя, рэпатрыяцыя, абмен насельніцтвам ці перасяленне?

Ідэя масавых перасяленняў насельніцтва як рашэнне этнічных праблем у стасунках паміж дзяржавамі не з'явілася «вынаходніцтвам» кіраўнікоў краін-удзельніц антыгітлераўскай кааліцыі. І да XX ст. практыкаваліся масавыя перамяшчэнні насельніцтва, якія трактаваліся па-рознаму: рэпатрыяцыя, абмен насельніцтвам, перасяленне, перамяшчэнне і г.д. Аднак толькі XX стагоддзе выкрысталізавала гэтую ідэю, тэарэтычна абгрунтавала і і практычна ажыццявіла. Ідэя перасяленняў была прапанавана ў 1916 г. швейцарцам французскага паходжання Жоржам Мантадонам. На яго думку, гэта быў прамы шлях да рэалізацыі канцэпцыі этнічна аднароднай нацыянальнай дзяржавы.

На Версальскай мірнай канферэнцыі пры ўсталяванні новых межаў адразу ж узнікла праблема нацыянальных меншасцяў, якія заявілі аб сабе ў новых дзяржавах - Польшчы, Чэхаславакіі, Венгрыі і г.д. Для вырашэння гэтай праблемы былі прапанаваны два варыянты: а) перасяленні і б) гарантыі свабоднага развіцця нацыянальных меншасцяў. Аднак пасля першай сусветнай вайны толькі на Балканах рашыліся на перасяленне нацыянальных меншасцяў. Прыкладам сталі падпісаная ў 1919 г. у Нейі грэчаска-балгарская канвенцыя, а таксама грэчаска-турэцкая канвенцыя, падпісаная ў 1923 г. у Лазане[84]. Разам з тым, як падкрэсліла даследчыца Л.Мілякова, ні адзін з колішніх вядучых палітыкаў не прапанаваў практыку перасялення нацыянальных меншасцяў у іншых раёнах Еўропы, акрамя Балканскага. А сам балканскі вопыт разглядаўся ў той час негатыўна, улічваючы перш за ўсё вялікія эканамічныя і сацыяльныя затраты, якія выклікала гэтая аперацыя.

Ідэю перасялення выкарыстала фашысцкая Германія, калі праз спланаваную з нямецкай педантычнасцю акцыю “Zuruck nach Reich” каля аднаго мільёна немцаў было перяселена ў Германію з Італіі, Латвіі, Эстоніі, Валыні, Заходняй Беларусі, Бельска-Падляскага, Венгрыі і іншых рэгіёнаў[85].

[84] Милякова Л.Б. Польша на пути к моноэтничному государству (1918-1947 гг.) //http:www.history.machaon.ru/all/number_13/analit4/milyakova/index.html

[85] Czerniakiewicz J. Repatriacja ludnosci polskiej z ZSRR 1944-1948. Warszawa.-Wyd-wo Nauk. PWN, 1987.- S.27.

Пачатак Другой сусветнай вайны "ўцягнуў" Савецкі Саюз і Беларусь у перасяленчыя акцыі. У выніку падзелаў сфер уплыву паміж СССР і Германіяй, а таксама ўсталявання новай мяжы паміж гэтымі дзяржавамі паўстала пытанне аб немцах, рускіх, украінцах, беларусах, палякох, якія жылі па абодва бакі мяжы. У сувязі з гэтым 16 лістапада 1939 г. у Маскве было падпісана савецка-германскае міжурадавае пагадненне аб эвакуацыі ўкраінскага, беларускага, рускага і русінскага насельніцтва, а таксама нямецкага насельніцтва з тэрыторыі былой Польшчы[86]. Бакі пагадзіліся пачаць эвакуацыю з дня падпісання пагаднення і скончыць яе да 1 сакавіка 1940 г. Для ажыццяўлення "эвакуацыі" была створана Змешаная камісія і прызначаны савецкія і нямецкія ўпаўнаважаныя. Месцазнаходжаннем галоўных упаўнаважаных з'яўляліся: савецкага – Луцк, нямецкага – Холм, Яраслаў.

4 снежня 1939 г. у Беластоцкую вобласць прыбыў нямецкі раённы ўпаўнаважаны з 30 супрацоўнікамі, якія павінны былі ажыццяўляць "эвакуацыю". У выніку перамоваў, што адбыліся паміж нямецкім і савецкім раённымі ўпаўнаважанымі, была дасягнута дамоўленасць, што нямецкі раённы ўпаўнаважаны будзе знаходзіцца ў Бельску, а тэрытарыяльныя ўчасткі ў м. Супрасль Беластоцкага павета, весцы Ізорка Ломжынскага павета, м. Ізабеліна Ваўкавыскага павета і м.Гайнаўка Бельскага павета[87]. Адзначым, што з тэрыторыі, якая адышла да СССР у Германію перасяляліся галоўным чынам немцы. Астатніх немцы лічылі непажаданым "элементам" і не "пускалі" ў Германію. Так, за перыяд працы змешанай савецка-германскай камісіі з Беластоцкай вобласці ў Германію выехала (дадзеныя па стану на 5 студзеня 1940 г.): немцаў – 5335 чалавек, палякаў – 108, украінцаў – 10, рускіх – 8, чэхаў – 1[88]. Як вынікае з гэтага, ніводны беларус не выехаў у Германію. У той жа час савецкі раённы прадстаўнік адзначаў, што многія палякі выказвалі жаданне перасяліцца ў Германію. Ён адзначаў, што "асобныя жыхары Бельска, палякі, з'яўляюцца ў камісію і патрабуюць, каб іх вывезлі ў Германію. Да таго ж выказваюць рэзкую незадаволенасць савецкай уладай. Так, жыхар Бельска Ян Касцюк, па нацыянальнасці паляк, 12 снежня з'явіўся ў камісію і заявіў у прысутнасці нашых прадстаўнікоў аб сваім жаданні выехаць з СССР. Пры гэтым ён заявіў: "У час вайны маё сэрца было за немцаў. Калі вы мяне не выпусціце, то я

---

[86] Иларионова Т.Е. Обмен населением между СССР и Германией накануне и в начале Второй мировой войны // Отечественная история. 2004. № 4.-С.56
[87] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.2075, арк.108.
[88] Там сама, арк.113.

нелегальна перабяруся ў Германію, я не цярплю бальшавікоў”[89]. Т.Іларыёнава таксама адзначае, што тэрыторыю, якая ўвайшла ў склад СССР, жадалі пакінуць ні толькі этнічныя немцы, але і палякі.[90]

1 сакавіка 1940 г. бакі планавалі скончыць абмен насельніцтва, але гэта зрабіць не ўдалося з-за вялікай колькасці жадаючых перасяліцца ў Германію. У далейшым гэтую акцыя спыніла Вялікая Айчынная вайна. На жаль, у Нацыянальным архіве РБ знаходзіцца нязначная частка дакументальных матэрыялаў, якія не могуць даць поўнага ўяўлення аб абмене насельніцтвам, што ажыццяўляўся з Беластоцкай і Брэсцкай абласцей БССР. Да цяперашняга часу дакладна невядомы колькасны, нацыянальны, прафесійны, узроставы, сацыяльны стан тых, хто змог пераехаць у Германію, а таксама тых, хто пераехаў у БССР, маёмасць, якую дазвалялася ці забаранялася вывозіць, колькасны склад савецкіх упаўнаважаных і іх узаемаадносіны з нямецкімі ўпаўнаважанымі і г.д. Больш істотным, на наш погляд, з’яўляецца наступнае. Беларусь не мела ніякага дачынення да савецка-германскага пагаднення аб “эвакуацыі” і не нясе адказнасці за абмен насельніцтвам, які ажыццяўляўся з яе тэрыторыі дзвюма таталітарнымі дзяржавамі – Германіяй і Савецкім Саюзам. Разам з тым, ужо напачатку Другой сусветнай вайны Беларусь была ўцягнута ў перасяленчыя працэсы, якія набылі надзвычай вялікія памеры пасля яе заканчэння.

Ідэя масавых перамяшчэнняў знайшла сваіх прыхільнікаў у дэмакратычных палітычных колах розных краін у час Другой сусветнай вайны. Яшчэ ў 1942 г. і крыху пазней Э.Бенеш выступаў з ідэямі перасялення судэцкіх немцаў, амерыканскі прэзідэнт Ф.Рузвельт у 1943 г. ухваліў, а ў 1944 г. пацвердзіў сваю пазіцыю адносна перасялення нямецкага насельніцтва з Усходняй Прусіі, якая павінна была адысці да Польшчы. Планы заходніх саюзнікаў аб перасяленні насельніцтва з тэрыторый, якія адышлі да СССР у 1939 г., узніклі пасля таго, як Савецкі Саюз цвёрда заявіў, што Заходняя Беларусь, Заходняя Украіна і Літва застануцца ў складзе СССР[91]. Польскі эмігранцкі ўрад таксама з'яўляўся прыхільнікам гэтай ідэі.

На самай справе, абмяркоўваючы ўвесь спектр складанага "польскага пытання" - пытання аб савецка-польскай мяжы, тэрыторыі, якая павінна была адысці да Польшчы - усе зацікаўленыя бакі (ЗША, Англія, СССР, ПКНВ, эмігранцкі ўрад) добра разумелі, што

[89] Там сама, арк.114
[90] Иларионова Т. Назв. соч. С.58
[91] Милякова Л.Б. Назв. соч.

вызначэнне дзяржаўнай мяжы непазбежна патрабуе прывядзення ў адпаведнасць з ёй і этнічнай мяжы паміж дзвюмя краінамі. Гэтая задача магла быць вырашана толькі адным шляхам – арганізаваным перасяленнем насельніцтва. У сувязі з абмеркаваннем праблемы перасялення насельніцтва з беларуска-польскага памежжа, неабходна звярнуць увагу на адзін прынцыповы момант гэтай праблемы. Усе зацікаўленыя бакі, аб якіх згадвалася вышэй, перш за ўсё турбавала праблема не людзей, якія падлягалі перасяленню, а тэрыторыя, у дадзеным выпадку – тэрыторыя Заходняй Беларусі. Лёсы соцень тысяч людзей па абодва бакі мяжы, іх жаданні, волевыяўленне не клапацілі нікога. Фактычна яны сталі заложнікамі палітычных рашэнняў, якія прымаліся кіраўнікамі вялікіх дзяржаў, зыходзячы са сваіх стратэгічных інтарэсаў.

Ініцыятарам пытання перасялення насельніцтва, якое пражывала ў беларуска-польскім памежжы, з'явіўся англійскі бок. Літаральна за некалькі дзён да Тэгеранскай канферэнцыі міністр замежных спраў Англіі А.Ідэн накіраваў 22 лістапада 1943 г. у Кабінет Міністраў Вялікабрытаніі мемарандум, у якім абгрунтоўвалася пазіцыя Англіі ў пытанні аб савецка-польскай мяжы. У мемарандуме А.Ідэн таксама выказаў прапанову аб тым, каб на маючай адбыцца ў Тэгеране канферэнцыі разам з абмеркаваннем пытання аб мяжы ўдзельнікі абмеркавалі пытанне аб перасяленні насельніцтва, якое апынецца па абодва бакі савецка-польскай мяжы. Заўважым, што А.Ідэн не лічыў гэтую праблему першапачатковай, бо адзначыў, што вызначэнне мяжы выклікае перасяленне насельніцтва, якое магчыма ажыццявіць, калі ўдзельнікі канферэнцыі палічаць гэта пажаданым[92].

Прапанова А.Ідэна аб перасяленні насельніцтва ў час Тэгеранскай канферэнцыі была абмеркавана і падтрымана прэзідэнтам ЗША Ф.Рузвельтам на апошнім пасяджэнні канферэнцыі 1 снежня 1943 г. Прэзідэнт ЗША запытаў І.Сталіна: "Ці будзе магчымым арганізаваць у добраахвотным парадку перасяленне палякаў з тэрыторый, якія адыходзяць да СССР". І.Сталін даў кароткі адказ: "Гэта можна будзе зрабіць"[93].

Значную дынаміку прапанове Ф.Рузвельта надаў У.Чэрчыль, які на пачатку 1944 г. двойчы звяртаўся да І.Сталіна па гэтаму пытанню. Так, у лісце, накіраваным І.Сталіну 1 лютага 1944 г., ён

---

[92] Historia Dyplomacji Polskiej. T.5.-1939-1945 Pod. red. Michanowicza. Warszawa.-1999. Wydawnictwo Naukowe PWN.-S.448.

[93] Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны 1941-1945 гг. Т.2. Тегеранская конференция руководителей трёх союзных держав - СССР, США и Великобритании (28 ноября - 1 декабря 1943 г.) Сб. док. М.,"Политиздат".-С.148.

паведамляў, што пры яго перамовах з членамі ўрада С.Мікалайчыка аб усходняй мяжы Польшчы, якая праходзіць па лініі Керзана, палякі патрабавалі гарантый ад вялікіх дзяржаў, што "ў раёнах, якія павінны быць уключаны ў Савецкую Расію, тым палякам, якія таго пажадаюць, будзе аказана садзеянне ў іх выездзе на новае месца жыхарства"[94].

Больш канкрэтна і акрэслена тэма перасялення была закранута ў новым пасланні У.Чэрчыля, накіраваным І.Сталіну 27 лютага 1944 г. Ён паведамляў І.Сталіну, што польскі ўрад (эмігранцкі - А.В.), у выпадку ўсталявання новай польскай мяжы па лініі Керзана жадаў бы "ўзгадніць працэдуру абмену насельніцтвам паміж Польшчай і Савецкім Саюзам і працэдуру вяртання на Радзіму грамадзян гэтых дзяржаў. Гэта адпавядала б тым запэўненням, якія Вы далі мне"[95]. У гэтым жа лісце У.Чэрчыль запэўніваў І.Сталіна, што Англія на міжнароднай канферэнцыі, якая павінна адбыцца пасля вайны, будзе падтрымліваць СССР, калі ён падпіша з урадам Польшчы пагадненне, якое будзе ўтрымліваць пункт аб абмене насельніцтвам. Як вынікае з лістоў У.Чэрчыля, І.Сталін пагадзіўся правесці абмен насельніцтвам пасля канчатковага ўрэгулявання пытання аб савецка-польскай дзяржаўнай мяжы.

Праблему перасялення палякаў з тэрыторый, якія адыдуць да Савецкага Саюза, падзяляў і падтрымаў прэзідэнт ЗША Ф.Рузвельт. Напярэдадні маскоўскіх перамоваў, у якіх удзельнічалі І.Сталін, У.Чэрчыль, С.Мікалайчык і прадстаўнікі ПКНВ, ён у лісце, накіраваным С.Мікалайчыку, завяраў яго ў тым, што "калі ў сувязі з новымі межамі Польскай дзяржавы польскі ўрад і польскі народ жадалі б правесці перасяленне нацыянальных меншасцяў з Польшчы ці ў Польшчу, то ўрад Злучаных Штатаў нічога не меў бы супраць і па магчымасці аказваў бы садзейнічанне гэтаму перасяленню"[96]. Магчыма меркаваць, што гэты ліст меў мэтай змякчыць пазіцыю лонданскага ўрада на маскоўскіх перамовах наконт усходняй мяжы, а перасяленне палякаў з СССР у Польшчу разглядалася Ф.Рузвельтам як кампенсацыя людскіх страт, што панясе Польшча ў выніку страты часткі тэрыторыі і часткі насельніцтва.

Рашэнні Крымскай канферэнцыі актывізавалі дзейнасць КРН ў напрамку далейшага збліжэння з СССР. Так, прэм'ер-міністр Часовага ўрада Польскай рэспублікі Э. Асубка-Мараўскі,

---

[94] Переписка Председателя Совета Министров СССР с Президентом США и Премьер-Министром Великобритании во время Великой Отечественной войны. Т.1 (июль1941-ноябрь1945 гг). М.: 1986.-С.227.

[95] Документы и материалы по истории советско-польских отношений. М.: 1974., Т.8., (январь 1944 - декабрь 1945 гг.), С.46.

[96] Документы и материалы ... Т.8.- С.292-293.

выступаючы 2 студзеня 1945 г. на сесіі КРН, заявіў аб імкненні Польшчы да развіцця сяброўскіх адносін са сваім суседам - СССР. Ён таксама падкрэсліў неабходнасць усталявання непасрэдных дыпламатычных адносін з памежнымі савецкімі рэспублікамі - Украінай, Беларуссю і Літвой, і адзначыў, што гэта "аблегчыць нам узаемнае правядзенне добраахвотнага абмену насельніцтвам, якое назаўсёды радыкальна вырашыць нашыя складаныя нацыянальныя адносіны"[97].

Часовы ўрад нацыянальнага адзінства Польшчы, зыходзячы з прагматычнага пункту гледжання і ўлічваючы, што і Англія і ЗША падтрымліваюць яго намаганні ў справе перасялення палякаў з СССР у Польшчу, усё больш настойліва і паслядоўна падкрэсліваў неабходнасць вяртання ўсіх палякаў на радзіму. Прынцыповая пазіцыя ўрада Польшчы была сфармулявана віцэ-прэм'ерам польскага ўрада В.Гамулкам. Выступаючы 21 ліпеня 1945 г. на 8 сесіі КРН, ён заявіў, што "аднаўленне Польшчы ў новых межах на захадзе і ўсходзе пераўтварае нашу дзяржаву ў адзіны нацыянальны арганізм. Мы адмовіліся на карысць нашых суседзяў Украіны, Беларусі, Літвы ад тых зямель, якія этнаграфічна да іх адносяцца. Усе палякі, якія насяляюць адданыя землі, павінны вярнуцца ў краіну, у Польшчу. І для іх, і для тых, хто калі-небудзь эміграваў з краіны, адроджаная Польшча знойдзе месца, асабліва на захадзе"[98].

У Патсдаме, як гэта было і ў Ялце, і ў Маскве, надзённым і важным з'яўлялася пытанне аб перасяленні насельніцтва ў рамках вырашэння «польскага пытання». У.Чэрчыль успамінаў: «У ліпені 1945 г. мы сутыкнуліся з новым становішчам. Расія перасунула сваю мяжу да лініі Керзана. Гэта значыць, як мы з Рузвельтам разумелі, што тры ці чатыры мільёны палякаў павінны будуць перасяліцца на захад»[99]. І.Сталін таксама пагаджаўся з неабходнасцю не толькі перасялення, але і ўвогуле вяртання ў Польшчу палякаў, якія знаходзіліся на тэрыторыі СССР. У рэшце рэшт, на Патсдамскай канферэнцыі кіраўнікі ЗША, Англіі, СССР падкрэслілі, што "тры ўрады заклапочаны тым, каб дапамагчы Польскаму часоваму ўраду нацыянальнага адзінства ў справе лягчэйшага вяртання ў Польшчу ўсіх палякаў, якія знаходзяцца за мяжой і жадаюць вярнуцца ў Польшчу"[100].

Пры даследаванні гэтай праблемы ёсць неабходнасць удакладнення тэрмінаў "рэпатрыяцыя", "эвакуацыя", «абмен

---

[97] Снапкоўскі У, Назв. сач. С.82.
[98] Знешняя палітыка Беларусі ... Т.4, С.321.
[99] Черчилль У. С. Триумф и трагедия... С.364.
[100] Документы и материалы по истории советско-польских отношений. Т.8., С.539.

насельніцтвам», «перасяленне», якія ўжываюцца ў працах польскіх, беларускіх, рускіх гісторыкаў, бо яны не зусім дакладна адлюстроўваюць сутнасць працэсу, які меў месца ў беларуска-польскім памежжы ў азначаны перыяд. Тэрмін "рэпатрыяцыя" азначае "вяртанне на радзіму ваеннапалонных і грамадзян, якія апынуліся па-за яе межамі ў выніку ваенных дзеянняў, а таксама эмігрантаў з узнаўленнем у правах грамадзянства"[101]. "Эвакуацыя" - гэта "перасяленне насельніцтва з мясцовасці, якая знаходзіцца пад пагрозай ваеннага нападу, з раёнаў стыхійнага бедства і г.д."[102]. Што ж да тэрміна "перасяленне", то гэта "тое ж, што і міграцыя насельніцтва, а таксама форма арганізаванай міграцыі"[103].

Неабходна адзначыць, што сярод польскіх, расійскіх, беларускіх гісторыкаў няма адзінства ў гэтым пытанні. Так, частка польскіх гісторыкаў, у першую чаргу Я.Чарнікевіч, Ю.Сядлецкі ды іншыя адстойваюць мэтазгоднасць выкарыстання тэрміна "рэпатрыяцыя" і ўжываюць яго ў сваіх працах[104]. У той жа час шэраг даследчыкаў (С.Цысельскі ды іншыя) абгрунтоўваюць неабходнасць пераасэнсавання і ўдакладнення тэрмінаў "рэпатрыяцыя" і "эвакуацыя" ў дачыненні да працэсу перасялення палякаў з тэрыторыі Расійскай Федэрацыі і заходніх абласцей Украіны, Літвы і Беларусі. Яны прапаноўваюць ужываць тэрмін "рэпатрыяцыя" да працэсу вяртання палякаў, дэпартаваных у 1939-1941 гг. у РСФСР. Адносна палякаў Беларусі, Украіны, Літвы, па іх меркаваннях, больш дакладна і абгрунтавана ўжываць тэрмін "перасяленне", або "перамяшчэнне"[105].

На недакладнасць тэрміна "рэпатрыяцыя" звяртаюць увагу і англійскія даследчыкі. Так, англійскі гісторык К.Сворд, адзначыўшы метадалагічную цяжкасць вызначэння тэрміна "рэпатрыяцыя", канстатаваў, што "многія грамадзяне, якія пераехалі ў Польшчу ў выніку "рэпатрыяцыі", аб'ектыўна разважаючы, не былі рэпатрыянтамі". У дачыненні да палякаў, якія ў выніку розных абставін трапілі ў СССР, а пасля Другой сусветнай вайны вярнуліся ў Польшчу, ён прапанаваў ужываць тэрмін "перасяленне" або "перамяшчэнне"[106].

---

101 Демографический энциклопедический словарь. М."Советская энциклопедия".1985.,С.368.
102 Там сама, С.531.
103 Там сама, С.325.
104 Czerniakiewicz J. Repatriacja Ludnosci Polskiej z ZSSR. 1944-1948. Warszawa, 1987; Siedlecki J. Losy Polakow w ZSSR w latach 1939-1989. Bydgoszcz, 1990.- S.233.
105 Przesiedlenie ludnosci Polskiej z kresow wschodnich do Polski 1944-1947. Wybor, opracowanie i redakcja documentow S.Ciesielski.-Wydawnictwo NERITON. Instytut Historii PAN.-Warszawa, 1999.
106 Keith Sword. Deportation and Exile Poles in the Soviet Union. 1939-1948. St. Martin's Press, INC., New York, N.Y. 10010. 1994, S.175-176.

Некарэктнасць і недакладнасць фармулёвак у дачыненні да працэсу перасялення з заходняга рэгіёна Беларусі характэрны і для найноўшых даследаванняў расійскіх гісторыкаў, якія адзначаюць, што "ў памежных раёнах Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі адбывалася прымусовая ўзаемная эвакуацыя насельніцтва"[107].

На самай справе ёсць пэўныя метадалагічныя цяжкасці вызначэння сутнасці працэсу, што меў месца ў беларуска-польскім памежжы ў 1944-1946 гг. На наш погляд, тэрміны «перасяленне» і «абмен насельніцтвам» найбольш дакладна характарызуюць гэты працэс. Адзначым, што найбольш часта гэтыя тэрміны ўжываліся ў перапісцы, на перамовах кіраўнікоў краін-удзельніц антыгітлераўскай кааліцыі, пры абмеркаванні «польскага пытання».

Супярэчлівым, небездакорным з прававога пункту гледжання з'яўляецца тэрмін «рэпатрыяцыя». Не ўдаючыся ў юрыдычныя падрабязнасці, адзначым наступнае. У 1944 г. палякі заходніх абласцей Беларусі, якія да 1939 г. з'яўляліся грамадзянамі II Rzeczypospolitej, у 1944-1946 гг. пераязджалі ў зусім іншую краіну, бо II Rzeczypospolitej як суб'екта і аб'екта міжнароднага права не стала. На яе падмурку пачала паўставаць будучая Польская Народная Рэспубліка ((ПНР) з зусім іншай нарматыўна-прававой базай. Да таго ж усе грамадзяне, якія ў 1939 г. апынуліся ў складзе БССР, у адпаведнасці з Законам "Аб грамадзянстве Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік" ад 19 жніўня 1938 г. і Указам Прэзідыума ВС СССР ад 29 лістапада 1939 г. сталі грамадзянамі СССР[108]. Можна спрачацца і дыскутаваць аб правамоцнасці гэтых актаў, іх адпаведнасці міжнароднаму праву і г.д., але дэ-юрэ на момант перасялення яны з'яўляліся грамадзянамі СССР і ні ў якім іншым статусе не разглядаліся колішняй уладай. Таму разглядаць іх як рэпатрыянтаў, як тлумачыць слоўнік, было б неправамоцным.

Што ж датычыць тэрміна "эвакуацыя", то, пакідаючы па-за ўвагай тлумачэнне слоўніка, адзначым наступнае. У большасці справаводчай дакументацыі, у афіцыйнай перапісцы беларускіх уладаў, прадстаўнікоў СНК БССР па перасяленню ўжываецца менавіта гэты тэрмін. Цяжка патлумачаыць, чым гэта было выклікана і абумоўлена. Можна адзначыць наступнае. У пэўныя моманты перасяленне па формах і метадах, якія выкарыстоўвала таталітарная ўлада, на самай справе было падобна на эвакуацыю ці

[107] Новейшая история стран Европы и Америки. 20 век. Учебник для студентов высших учебных заведений. В 3 Ч. / Под редакцией А.М.Родригеса и М.В.Пономарева.-М.: Гуманит. изд. центр Владос, 2001.-Ч.3: 1945-2000.-С.98.
[108] Знешняя палітыка Беларусі ... Т.4, С.82

мала адрознівалася ад яе. Разам з тым ужываць гэты тэрмін падаецца не зусім правільным і абгрунтаваным.

Хацелася б засяродзіць увагу яшчэ на адным вельмі спрэчным дыскусійным і, на наш погляд, неабгрунтаваным падыходзе ў вызначэнні перасяленчай акцыі, які сустракаецца ў навукова-папулярнай літаратуры. Перасяленчы працэс – гэта этнічная чыстка палякаў, якая ажыццяўлялася ўладамі Беларусі ў 1944-1946 гг. Найбольш дакладна сфармуляваў гэта Т.Кручкоўскі. Ён піша, характарызуючы перасяленне 1944 –1946 гг., што "з пункту гледжання сучаснасці фактычна (прыклад Балкан) гэта была этнічная чыстка гэтых зямель ад палякаў". У другім месцы, характарызуючы перасяленне, ён зноў падкрэслівае: "Частцы палякаў удалося пакінуць Беларусь у рамках так званых рэпатрыяцыйных акцый (фактычна гэта былі этнічныя чысткі) і выехаць у Польшчу"[109].

Я не апраўдваю, тым больш не з'яўляюся прыхільнікам сталінскага рэжыму, які столькі год панаваў у Беларусі. Разам з тым рэчаіснасць у час перасялення, а таксама навуковая аб'ектыўнасць не дазваляюць характарызаваць перасяленне як этнічную чыстку палякаў. Прынцып добраахвотнасці перасялення, як бы да яго крытычна ні ставіліся даследчыкі гэтай праблемы (мы таксама засяродзім ўвагу на гэтым), усё ж дамінаваў на ўсім яго працягу. Адмовы тысяч зарэгістраваных палякаў ад перасялення, потым паўторная іх рэгістрацыя, месячны тэрмін для «роздуму» - рэгістравацца ці не - адмаўленне ад рэгістрацыі і выезду і непрыняцце рэпрэсіўных мер у дачыненні да тых, хто гэта зрабіў, магчымасць перавозу маёмасці і грошай (хоць і ў абмежаванай колькасці), права месца выбару жыхарства ў Польшчы і многае іншае не дае асновы сцвярджаць, як гэта робіць Т.Кручкоўскі, што перасяленне - гэта этнічная «чыстка» палякаў.

Такім чынам, кароткі агляд тэрмінаў, што ўжываюцца айчыннымі і замежнымі гісторыкамі, якія вывучаюць працэс, што адбываўся ў беларуска-польскім памежжы ў 1944-1946 гг., дазваляе нам характарызаваць яго як перасяленне насельніцтва, што ажыццяўлялася ўрадамі Беларусі і Польшчы на аснове беларуска-польскага пагаднення ад 9 верасня 1944 г. і дадактовага пратакола да яго ад 25 лістапада 1945 г.

[109] Кручковски Т.Т. Поляки на Беларуси на фоне истории и современности /Т.Т.Кручковски.- Слоним: ГОУПП «Слоним» тип., 2003.-С.139, 190.

## Глава 3.
## Беларуска-польскія пагадненні аб перасяленні: здабыткі і пралікі беларускай дыпламатыі

Асноўнымі нарматыўна-прававымі актамі, якія складалі юрыдычную базу і рэгламентавалі працэс абмену насельніцтвам, з’яўляліся: “Пагадненне паміж урадам Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і Польскім Камітэтам Нацыянальнага Вызвалення аб эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі БССР”, падпісанае 9 верасня 1944 г. Урадам БССР і ПКНВ, і дадатковы пратакол паміж БССР і Часовым урадам нацыянальнага адзінства Польшчы, падпісаны 25 лістапада 1945 г.

Аўтар прытрымліваецца думкі, што беларуска-польскае пагадненне ад 9 верасня 1944 г. было падпісана па ініцыятыве Крамля. Асновай для гэтага можа быць наступнае. 21 ліпеня 1944 г. было абвешчана аб стварэнні ПКНВ, а 26 ліпеня ўрад СССР і толькі што створаны Камітэт нацыянальнага вызвалення падпісалі пагадненне аб адносінах паміж савецкім галоўнакамандаваннем у Польшчы і польскай адміністрацыяй[110]. Фактычна гэта значыла прызнанне ПКНВ у якасці «законнага» ўрада Польшчы і магчымасць будаваць з ім адносіны на міжнародна-прававой базе. 27 ліпеня 1944 г. СССР і ПКНВ падпісалі пагадненне аб савецка-польскай мяжы, за аснову якой была прынятая лінія Керзана. Гэта значыла, што Беласточчына уключаецца ў склад Польшчы. Крыху болей як праз месяц (9 верасня 1944 г.) ПКНВ падпісвае з БССР пагадненне аб «эвакуацыі насельніцтва». Такім чынам, за кароткі тэрмін (з 21 ліпеня па 9 верасня 1944 г.) І.Сталін ажыццявіў некалькі надзвычай важных у стратэгічным плане задач. Ён паставіў саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі перад фактам прызнання з боку СССР Польскага камітэта нацыянальнага вызвалення ў якасці адзінага «законнага ўрада» Польшчы і тым самым паказаў поўнае ігнараванне польскага эмігранцкага ўрада. Гэта сведчыла (і ў далейшым поўнасцю спраўдзілася), што знікненне «лонданцаў» - справа часу. Больш істотным і глыбока прадуманым ходам Крамля, на наш погляд, з'яўлялася савецка-польскае пагадненне аб мяжы, нягледзячы на яго часовы характар,

[110] Парсаданова В.Назв. соч. С.185-187.

і пагадненні аб «эвакуацыі», падпісаныя ў верасні 1944 г. ПКНВ з БССР, УССР і ЛатССР. Гэтымі пагадненнямі І.Сталін дэманстраваў саюзнікам, што часовае пагадненне аб савецка-польскай мяжы для Савецкага Саюза не з'яўляецца часовым, а разглядаецца як аснова, і адступленняў ад гэтага не будзе. Перасяленне палякаў і яўрэяў, якое павінна было адбыцца з УССР, БССР, ЛатССР у Польшчу, а беларусаў, украінцаў і рускіх з Польшчы ў гэтыя ж рэспублікі пацвярджала на міжнародным узроўні законнасць гэтых тэрыторый для СССР і вышэйазначаных рэспублік, а таксама адыход Беласточчыны да Польшчы. Для заходніх палітыкаў, журналістаў, грамадскасці гэта стала зразумелым адразу ж. Так, на прэс-канферэнцыі для савецкіх і замежных карэспадэнтаў, якая адбылася 3 кастрычніка 1944 г. у прадстаўніцтве Польскага камітэта нацыянальнага вызвалення ў Маскве, амерыканскі карэспандэнт запытаў Э.Асубку-Мараўскага, ці не азначае пераход Беластоцкай вобласці ва ўпраўленне грамадзянскай адміністрацыі ПКНВ, што лінія Керзана ўступіла ў сілу як пагранічная лінія паміж Польшчай і СССР. На гэтае пытанне Э.Асубка-Мараўскі дыпламатычна адказаў, што пытанне аб дзяржаўнай мяжы яшчэ не вызначана, але лінія Керзана прынятая за аснову мяжы. У далейшым будзе створана камісія, якая і будзе займацца дакладным вызначэннем савецка-польскай мяжы[111]. Як бачым, амерыканскі журналіст адразу ж «сцяміў», што пытанне мяжы прынцыпова вызначана паміж Крамлём і «люблінцамі», і ў гэтае пагадненне магчыма ўнясенне толькі нейкіх карэктываў.

Беларуска-польскім пагадненнем Крэмль «выводзіў» і зацвярджаў на міжнароднай арэне ў якасці паўнапраўных удзельнікаў міжнародных адносін і ПКНВ і БССР, бо і для Камітэта нацыянальнага вызвалення, і для Беларусі гэтае пагадненне з'яўлялася першым міжнародна-прававым актам, з якім павінна была лічыцца міжнародная супольнасць.

Варта задацца пытаннем – ці ўдзельнічала беларускае кіраўніцтва і калі так, то на якіх этапах у выпрацоўцы і абмеркаванні такога кшталту задач знешнепалітычнага характару. Наўрад, нягледзячы на прадастаўленае ў лютым 1944 г. Беларусі права ажыццяўлення «самастойнай» знешнепалітычнай дзейнасці і стварэнне ў сакавіку гэтага ж года Наркамата замежных спраў БССР. Пакуль застаецца адкрытым пытанне, ці абмяркоўвалі, а калі абмяркоўвалі, то дзе, і хто прымаў удзел у абмеркаванні беларуска-польскага пагаднення ад 9 верасня 1944 г., якія і кім

[111] Звязда. 1944 г., 3 кастрычніка, С.4.

былі зроблены заўвагі, унесены прапановы, дапаўненні і г.д. Хутчэй за ўсё беларусам проста «падсунулі» выпрацаваны ў саюзным наркамаце замежных спраў тэкст пагаднення, які і быў падпісаны П.Панамарэнкам у Любліне ад імя Беларусі.

Пацверджаннем гэтага, нягледзячы на слабасць гэтай высновы, можа быць наступнае. Да цяперашняга часу ў Нацыянальным архіве і ў архіве Міністэрства замежных спраў РБ не знойдзены дакументальныя матэрыялы (стэнаграмы, пратаколы, дыпламатычная перапіска і г.д.), якія вяліся паміж беларускім і польскім бакамі пры абмеркаванні і заключэнні пагаднення ад 9 верасня 1944 г. Разам з тым у гэтых архівах знаходзяцца шматлікія дакументальныя матэрыялы (перапіска паміж Э.Асубка-Мараўскім і П.Панамарэнкам, Наркаматам замежных спраў БССР і Міністэрствам замежных спраў ПКНВ, а потым Часовага ўрада нацыянальнага адзінства Польшчы, пратакол перамоваў, якія вяліся ў Варшаве ў лістападзе 1945 г. паміж дэлегацыяй БССР і ўрадам Польшчы, пры абмеркаванні дадатковага беларуска-польскага пратакола да пагаднення ад 9 верасня 1944 г. і г.д.), якія даюць уяўленне аб беларуска-польскіх перамовах, што адбываліся ў Варшаве ў лістападзе 1945 г. Гэта па-першае. Па-другое, і гэта больш істотнае, што дае магчымасць сцвярджаць, што тэкст пагаднення ад 9 верасня 1944 г. выпрацоўваўся ў Маскве, з'яўляецца наступнае. 17 верасня 1944 г., г.зн. літаральна праз тыдзень, наркам унутраных спраў СССР Л.Берыя выдаў загад наркаму ўнутраных спраў БССР С.Бельчанку і начальніку пагранічных войскаў НКУС Беларускай акругі генерал-маёру К.Антонаву «Аб парадку эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі БССР", у якім пп. 5, 7, 17 загада Л.Берыі адзін да аднаго супадаюць з пп.2, 3, 4 а), б), в), г), д), е), ж), з) беларуска-польскага пагаднення[112]. Як вынікае з гэтага, з ведамствам Л.Берыі ці ўзгаднілі, ці яно з саюзным наркаматам замежных спраў «выпрацоўвала» ўмовы беларуска-польскага пагаднення. Аб гэтым жа сведчыць і наступны факт. У артыкуле 18 пагаднення пазначалася, што кантрольна-прапускнымі пунктамі (КПП), праз якія ажыццяўлялася праходжанне эшалонаў з перасяленцамі ў Польшчу, з'яўляліся наступныя КПП: Гальнка, Беляны, Стурубка, Сямёнаўка, Бaброўнікі, Качкі, Беламойск, Валкавіцэ, Навасёлкі, Калоднае, Брэст. Аднак у п.4 загада Л.Берыі вызначаны іншыя

---

[112] Гл. НАРБ, ф.788, воп.1, спр.1, арк.27, 32; Освобожденная Беларусь. Документы и материалы. В 2-х книгах. Кн.1. сентябрь 1943 – декабрь 1944 гг. / Сост.: В.И.Адамушко и др.- Мн.:НАРБ, 2004.-С.185, 186.

КПП: Ракавічы, Беляны, Кузніца, Адэльск, Крынкі, Баброўнікі, Габяты, Залешаны, Грудэк, Пацуеў-Груд, Голя, Тумін, Макар'ева, Няміраў, Галашава, Брэст, Владава, праз якія і ажыццяўлялася перасяленне ў Польшчу. Як бачна, змяненні ў колькасці і месцазнаходжанні КПП адбыліся значныя і прытым у адпаведнасці з загадам наркама ўнутраных спраў СССР, а не на аснове беларуска-польскіх дамоўленасцей. Такім чынам, вышэйазначанае дае магчымасць сцвярджаць, што ўдзел беларускага боку ў падрыхтоўцы тэкста пагаднення ад 9 верасня 1944 г. быў мінімальны.

Пры аналізе беларуска-польскага пагаднення ад 9 верасня 1944 г. неабходна вызначыць некалькі прынцыповых момантаў, якія таксама сведчаць аб мінімальным удзеле беларусаў у падрыхтоўцы ўмоў пагаднення. Пагадненне вызначала, што “эвакуацыя з’яўляецца добраахвотнай і таму прымус не можа быць прыменены ні прама, ні ўскосна”[113]. Аднак аб “добраахвотнасці” цяжка казаць, калі прааналізаваць наступны радок з артыкула № 1: “*прыступіць да эвакуацыі, пражываючых у заходніх абласцях БССР і жадаючых перасяліцца на тэрыторыю Польшчы ўсіх палякаў і яўрэяў, якія мелі польскае грамадзянства да 17 верасня 1939 г.*”[114] (выдзелена мной. – А.В.). Гэты радок забараняў перасяляцца ў Польшчу тым палякам і яўрэям, якія жылі, напрыклад, у Мінскай, Гомельскай, Віцебскай ды Магілёўскай абласцях. Як вядома, уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР выклікала хвалю бежанцаў, і больш за 100 тыс. бежанцаў, пераважна яўрэяў, былі расселены кіраўніцтвам рэспублікі ва ўсходніх абласцях. Дык вось яны былі пазбаўлены права перасялення ў Польшчу. Пад забарону папалі таксама татары і караімы, якія з’яўляліся грамадзянамі Польшчы да 17 верасня 1939 г. і пражывалі ў заходніх абласцях Беларусі. Забарона выезду татар і караімаў выклікала нязгоду польскага боку, і гэта стала прадметам дыскусій на лістападаўскіх перамовах у Варшаве, але беларускі бок катэгарычна адмовіўся “выпускаць” татар і караімаў у Польшчу.

Пагадненне ад 9 верасня 1944 г. прадугледжвала, што “абодва бакі, якія дамаўляюцца, абавязуюцца па падпісанню Пагаднення распачаць эвакуацыю *ўсіх* (выдзелена аўтарам – А.В.) грамадзян беларускай, украінскай, рускай і русінскай нацыянальнасцей, пражываючых у Беластоцкім, Аўгустоўскім, Сакольскім, Шчучынскім, Ломжынскім, Высока-Мазавецкім, Бельскім, Бяла-

[113] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.4, арк.2.
[114] Там сама, арк.1.

Падляскім паветах і іншых раёнах Польшчы, дзе могуць апынуцца грамадзяне беларускай, украінскай, рускай, русінскай нацыянальнасцяў, якія пажадаюць перасяліцца з тэрыторыі Польшчы ў Беларусь, і прыступіць да эвакуацыі *ўсіх* (выдзелена аўтарам – А.В.) палякаў і яўрэяў, якія знаходзіліся ў польскім грамадзянстве да 17 верасня 1939 г. і пражывалі ў заходніх абласцях Беларусі і жадалі перасяліцца на тэрыторыю Польшчы"[115]. Вось гэтае невялікае слова «ўсіх» магчыма патлумачыць як спробу татальнага перасялення людзей з тэрыторый, на якіх яны пражывалі спрадвеку. Тады паўстае пытанне, як гэта стасуецца з дэклараваным прынцыпам добраахвотнасці ?

Выкажам думку, нягледзячы на яе хісткасць, што савецкі бок пры абмеркаванні ўмоў беларуска-польскага пагаднення аб «эвакуацыі» скарыстаў у якасці ўзора савецка-германскае міжурадавае пагадненне аб абмене насельніцтвам паміж СССР і Германіяй, якое было падпісана гэтымі краінамі 16 лістапада 1939 г. Пры параўнанні кідаецца ў вочы ідэнтычнасць і падабенства многіх артыкулаў і палажэнняў. Так, чытач можа параўнаць артыкул 1 беларуска-польскага пагаднення, што прыведзены вышэй, з аналагічным артыкулам савецка-германскага пагаднення, які пазначаў: «Абодва бакі, якія дамаўляюцца, абавязуюцца па падпісанні сапраўднага Пагаднення ... распачаць эвакуацыю ўсіх грамадзян украінскай, беларускай, рускай, русінскай нацыянальнасцей, якія пражываюць на тэрыторыях былой Польшчы, што цяпер знаходзяцца ў межах дзяржаўных інтарэсаў Германіі, а таксама грамадзян нямецкай нацыянальнасці, якія пражываюць на тэрыторыях былой Польшчы, што цяпер знаходзяцца ў межах дзяржаўных інтарэсаў Саюза ССР». Як і ў савецка-германскім, так і ў беларуска-польскім пагадненні 2-гі абзац 1-га артыкула вызначаў, што «эвакуацыі належаць толькі тыя з пералічаных у абзацы 1-м асоб, якія выказалі жаданне эвакуіравацца...». Змянілася толькі заканчэнне гэтага абзаца. У савецка-германскім пагадненні яно гучыць наступным чынам: «... у адносінах прыняцця якіх маецца згода Галоўнага ці Раённага Упаўнаважаных адпадведнага боку», а ў беларуска-польскім: «... у адпаведнасці прыняцця якіх маецца згода Урада Беларускай ССР і Польскага Камітэта Нацыянальнага Вызвалення»[116].

У савецка-германскім пагадненні абумоўліваліся тэрміны пачатку і заканчэння перасялення, прызначаліся Галоўныя і

[115] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.4, арк.1.
[116] Гл. Иларионова Т. Назв. соч. С.56, НАРБ, ф.789, воп.1,спр.4, арк.1.

раённыя ўпаўнаважаныя і прадстаўнікі бакоў, месцы іх размяшчэння, КПП, праз якія ажыццяўлялася перасяленне, асобы, якія мелі права перасяляцца, маёмасць, якую дазвалялася ці забаранялася вывозіць і г.д. Фактычна гэтае ж самае, безумоўна перапрацаванае, утрымлівалася ў беларуска-польскім пагадненні ад 9 верасня 1944 г.

Пагадненне падзялялася на 3 раздзелы, якія ўключалі 22 артыкулы. Раздзел першы ўключаў 6 артыкулаў, якія вызначалі нацыянальнасць, пачатак і заканчэнне перасялення, ільготы, якія атрымлівалі перасяленцы, колькасць рухомай маёмасці, што дазвалялася браць з сабой, а таксама маёмасць, што забаранялася да вывазу, транспартныя расходы, памеры кампенсацыі за пакінутую рухомую і нерухомую маёмасць. Аналіз першага раздзела, асабліва 3-га артыкула сведчыць, што савецкая дзяржава ў апошні раз выкарыстала магчымасць абрабаваць ужо былых сваіх грамадзян. Паводле 3-га артыкула пункт 2, перасяленцы мелі права вывозіць: «Адзенне, абутак, бялізну, прадукты харчавання, рэчы хатняга побыту, сельскагаспадарчы інвентар і іншыя прадметы хатняга і гаспадарчага побыту агульнай вагой да 2 тон на адну сям'ю, а таксама жывёлу і птушак, якія належылі гаспадарцы»[117]. Калі з гэтым пунктам яшчэ неяк можна было пагадзіцца (хоць што такое 2 тоны на гаспадарку), то пункт 4-ы інакш як рабаўніцкім не назавеш. У адпаведнасці з ім забаранялася вывозіць наяўныя папяровыя, залатыя і сярэбраныя грошы, за выключэннем польскіх папяровых злотых у памеры 1000 злотых на аднаго чалавека ці савецкіх грошай не больш 1000 рублёў на аднаго чалавека. Таксама забаранялася вывозіць золата, плаціну, каштоўныя камені, прадметы даўніны і мастацтва, калі і тыя і другія ўяўлялі калекцыю ці ў асобных экзэмплярах не з'яўляліся сямейнай уласнасцю таго, хто перасяляецца, зброю (за выключэннем паляўнічых стрэльбаў), фотаздымкі (акрамя асабістых фотаздымкаў), планы, карты, аўтамабілі, матацыклы, мэблю[118].

«Падсаладзілі» рабаўніцтва тым, што перасяленцам спісалі ўсе нядоімкі па натуральных пастаўках, грашовых падатках, страхавых плацяжах. Перасяленцаў вызвалілі ў 1944-1945 гг. ад усіх дзяржаўных, грашовых падаткаў і страхавых плацяжоў, і ўрэшце рэшт кожная гаспадарка павінна была атрымаць грашовую ссуду ў месцах рассялення ў памеры 5 тыс. рублёў-

---

[117] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.4, арк.4.
[118] Там сама, арк.4

злотых, з выплатай на працягу 5-ці гадоў[119]. Па заканчэнні перасялення бакі палічылі неабходным вызначыць каштоўнасць выдадзенага перасяленцам хлеба за ўраджай, які яны здалі, прадастаўленых для іх пасеваў, кампенсацыю за пакінутую рухомую і нерухомую маёмасць і іншыя выдаткі, якія будуць мець бакі.

Раздзел другі ўтрымліваў 5 артыкулаў, вызначаўшых работнікаў, якія займаліся перасяленнем, іх службовыя абавязкі, правы. Агульнае кіраўніцтва перасяленнем ўскладвалася на Галоўнага ўпаўнаважанага Польшчы і Галоўнага прадстаўніка СНК БССР, а таксама іх прадстаўнікоў на месцах.

Раздзел трэці ўключаў 11 артыкулаў, якія рэгламентавалі працу па ўліку, рэгістрацыі і перасяленню, вызначалі кола грамадзян, якія мелі права на перасяленне, колькасць і месцазнаходжанне кантрольна-прапускных пунктаў (КПП), праходжанне транспартаў і г.д[120]. Упаўнаважаныя і прадстаўнікі бакоў складалі спіскі асоб, якія пажадалі перасяліцца. Яны павінны былі абвесціць праз друк і мясцовыя органы ўлады ўмовы перасялення, прымалі і належным чынам афармлялі заявы ад жадаючых перасяліцца. Артыкул 15 гэтага раздзела вызначаў, што «асобам, якія эвакуіруюцца на аснове Пагаднення, прадастаўляецца права ў парадку сумеснага выезду ўзяць з сабой сям'ю, прычым у склад сям'і, на аснове выказанага членамі сям'і жадання, могуць быць эвакуіраваны жонка, дзеці, маці, бацька, унукі, выхаванцы, а таксама іншыя дамачадцы, якія сумесна вядуць гаспадарку з эвакуіраваным»[121]. У першую чаргу «эвакуацыі» падлягалі: непрацаздольныя асобы, хворыя, інваліды, старыя, адзінокія жанчыны і дзеці, асобы, што знаходзіліся на дзяржаўным забеспячэнні, а таксама асобы, члены сямей якіх знаходзяцца на тэрыторыі другога боку.

У пагадненне неаднаразова ўносіліся дапаўненні і змяненні. Гэта тлумачыцца тым, што і ўрад Беларусі, і ўрад Польшчы дапусцілі шэраг сур'ёзных пралікаў пры яго падрыхтоўцы, што і абумоўлівала неабходнасць ўнясення паправак. Так, пагадненне ад 9 верасня 1944 г. прадугледжвала, што перасяленне павінна было пачацца 15 кастрычніка 1944 г. і скончыцца 1 лютага 1945 г. Аднак масавая рэгістрацыя палякаў на выезд у студзені-красавіку 1945 г. паказала, што ні польскія, ні беларускія ўлады не спрагназавалі, што дзясяткі тысяч палякаў выкажуць намер

[119] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.4, арк.3.
[120] Там сама, арк.1-11.
[121] Там сама, арк.9.

перасяліцца ў Польшчу. У студзені 1945 г. стала відавочным, што ў вызначаны тэрмін (да 1 лютага 1945 г.) не ўдасца зарэгістраваць і перасяліць у Польшчу ўсіх жадаючых. Адным з першых, хто зразумеў гэта, быў Галоўны ўпаўнаважаны СНК БССР у Польшчы І.Варвашэня. Яшчэ ў снежні 1944 г. у запісцы, накіраванай намесніку старшыні СНК БССР К.Кісялёву, ён адзначаў наступнае: "Улічваючы, што да 1 лютага 1945 г. перавезці ўсе зарэгістраваныя беларускія, рускія, украінскія гаспадаркі немагчыма, таму неабходна распачаць перамовы з польскім урадам аб прадоўжанні тэрміну пагаднення да 15 красавіка 1945 г."[122]. Пазней, 8 студзеня 1945 г., ён зноў накіроўвае К.Кісялёву ліст, у якім больш катэгарычна сцвярджае аб немагчымасці перасялення насельніцтва ў адзначаны ў пагадненні тэрмін і просіць К.Кісялёва хадайнічаць перад урадам БССР аб прадоўжанні гэтага тэрміну да 15 красавіка 1945 г.[123].

Іншага кшталту праблемы меў і польскі бок. Так, Генеральны ўпаўнаважаны часовага ўрада Польшчы В.Вольскі накіраваў 23 студзеня 1945 г. Галоўнаму ўпаўнаважанаму Польшчы ў Беларусі С.Вішнеўскай ліст, у якім паведамляў, што ў студзені 1945 г. няма ніякай магчымасці прыняць у Польшчы перасяленцаў з Беларусі. Ён прасіў С.Вішнеўскую не накіроўваць людзей у Польшчу, а наадварот, "за ўсялякі кошт затрымаць гэтую хвалю" (мелася на ўвазе хваля перасяленцаў - А.В.). Больш таго, В.Вольскі катэгарычна патрабаваў ад яе не адпраўляць без папярэдняй дамоўленасці з ім ніводнага транспарту, бо "так, як Вы да цяперашняга часу іх прысылаеце, то Вы іх прысылаеце не на жыццё, а на смерць"[124]. Ліст В.Вольскага цікавы яшчэ з аднаго пункту гледжання. У ім вызначалася тэрыторыя, на якую планавалася накіроўваць перасяленцаў з Беларусі. Перш за ўсё мелася на ўвазе заходняя частка Польшчы, яшчэ не вызваленая ад немцаў. Ён падкрэсліваў, што "ў цяперашні час пасылаць іх на захад не можам. Праз два-тры тыдні будзе зусім іншая сітуацыя, будзе патрэба ў вялікай колькасці людзей, і тады не паспееце прысылаць іх да нас". Як вынікае з гэтага ліста, часовы ўрад Польшчы ў дачыненні да перасяленцаў з БССР заняў выразна акрэсленую пазіцыю – не пакідаць іх на Беласточчыне, а перасяляць на захад Польшчы. Гэтая пацвярджаецца і К.Свордам, які адзначыў, што абсалютная большасць перасяленцаў з Беларусі рассялілася (або яе рассялілі - А.В.) у чатырох заходніх ваяводствах

---

[122] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1902, арк.73.
[123] НАРБ. ф.7, воп.3, спр.1905, арк.16.
[124] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1916, арк.10.

Польшчы - Гданьскім, Шчэцінскім, Познаньскім і Вроцлаўскім[125]. Газета беларускай дыяспары “Бацькаўшчына” таксама паведамляла, што “польскія ўлады параскідалі беларусаў ад Шчэціна па ўсім паўночным Паморї, але галоўную масу скіравалі на Ольштынскія багны і тапелі. ...Другі найвялікшы беларускі асяродак каланізацыі – ваколіцы Шчэціна, дзе шмат перасяленцаў з Віленшчыны, Слонімшчыны і Ваўкавышчыны”[126].

Улічваючы сітуацыю, якая склалася, 26 студзеня 1945 г. Старшыня СМ Польшчы Э.Асубка-Мараўскі накіраваў Старшыні СНК БССР П.Панамарэнку Ноту, у якой выказвалася жаданне прадоўжыць тэрмін перасялення да 1 мая 1945 г.[127] Беларускі бок, разгледзеўшы Ноту і ўлічыўшы жаданне польскага ўрада, накіраваў 19 лютага 1945 г. ліст на імя Э.Асубкі-Мараўскага, у якім паведамлялася аб згодзе "прадоўжыць да 1 мая 1945 г. эвакуацыю беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі БССР"[128].

Аналізуючы перапіску П.Панамарэнкі і Э.Асубкі-Мараўскага, неабходна ўсведамляць, што без дазволу ўрада СССР урад Беларусі не мог самастойна прыняць такое рашэнне. Гэта пацвярджае ліст наркама замежных спраў БССР К.Кісялёва, накіраваны 11 студзеня 1945 г. В.Молатаву. У ім ён прасіў урад СССР "разгледзець і прыняць адпаведнае рашэнне па пытанню дадатковага пагаднення паміж урадамі БССР і ПКНВ аб эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі БССР"[129]. Толькі атрымаўшы дазвол Цэнтра, урад Беларусі даў палякам згоду на прадоўжанне перасялення. Зварот К.Кісялёва, нягледзячы на той факт, што БССР мела свой наркамат замежных спраў, мела права ўступаць у прамыя дыпламатычныя адносіны з замежнымі краінамі, паказвае абмежаванасць Беларусі ў вызначэнні напрамкаў міжнароднай дзейнасці, яе падпарадкаванасць знешнепалітычнай дактрыне Масквы.

Улічваючы той факт, што не ўсе палякі паспелі зарэгістравацца на выезд у Польшчу і да 1 мая 1945 г., урад Польшчы прапанаваў ураду БССР "правесці абмен думкамі па гэтаму пытанню паміж Беларускім і Польскім урадам"[130]. Пасля дыпламатычнай перапіскі была дасягнута дамоўленасць аб сустрэчы ў Варшаве ўрадавых дэлегацый і абмеркаванні ўсіх

[125].Sword K, Ibid. S.183.
[126] Бацькаўшчына, 27 лістапада 1947 г., С.4.
[127] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.10, арк. 67.
[128] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.10, арк.69.
[129] Там сама, арк.1.
[130] Там сама, арк.148.

пытанняў, звязаных з прадаўжэннем тэрміну перасялення. Беларуская дэлегацыя, у склад якой уваходзіў і Галоўны прадстаўнік СНК БССР па эвакуацыі У. Царук, прыбыла ў Варшаву 23 лістапада 1945 г. На другі дзень, 24 лістапада, у савецкім пасольстве адбыліся беларуска-польскія перамовы, у якіх з польскага боку прымалі ўдзел віцэ-міністр, Генеральны ўпаўнаважаны польскага ўрада па справах рэпатрыяцыі А.Вольскі і Галоўны ўпаўнаважаны польскага ўрада па справах эвакуацыі ў Беларусі С. Вішнеўская[131].

Асноўнымі пытаннямі, якія вылучыў польскі бок, з'яўляліся наступныя: прадаўжэнне тэрміну рэгістрацыі да 31 студзеня 1946 г., стварэнне спрыяльных ўмоў для ад'езду тых, хто ўжо зарэгістраваўся, дазвол на перасяленне ў Польшчу татар і караімаў, якія раней з'яўляліся грамадзянамі Польшчы.

Перамовы ішлі даволі цяжка, асабліва спрэчнымі з'яўляліся першае і трэцяе пытанні. Польская дэлегацыя настойвала на прадоўжанні тэрміну рэгістрацыі да 31 студзеня 1946 г., матывуючы гэта тым, што ў сувязі з познім падпісаннем дадатковага Пратакола немагчыма будзе забяспечыць рэгістрацыю ўсіх жадаючых. Беларускі бок, наадварот, заняў жорсткую пазіцыю і настаяў, каб рэгістрацыя была прадоўжана толькі да 15 студзеня 1946 г., што і было зафіксавана ў дадатковым пратаколе[132]. Жорсткая пазіцыя беларускай дэлегацыі абумоўлівалася тым, што 11 лістапада 1945 г. быў падпісаны дадатковы пратакол паміж урадамі СССР і Часовым урадам нацыянальнага адзінства Польшчы аб прадаўжэнні тэрміну рэгістрацыі толькі да 15 студзеня 1946 г., і беларускі ўрад, ведаючы аб гэтым, не мог выйсці за яго межы[133].

Спрэчкі выклікала вылучанае польскім бокам пытанне аб беспярашкодным выездзе ў Польшчу татар і караімаў. Беларуская дэлегацыя адхіліла гэтыя патрабаванні польскага боку, як не маючыя ніякага дачынення да перасялення палякаў з БССР у Польшчу.

Цяжкасці выклікала абмеркаванне пытання аб рабоце прадстаўніцтва СНК БССР у Лодзі. У сувязі з тым, што яно пачало працаваць без згоды з польскім бокам, палякі выказалі рашучы пратэст супраць яго працы і патрабавалі яго закрыцця. Беларуская дэлегацыя, улічыўшы абгрунтаванае патрабаванне палякаў, пагадзілася з ім. Астатнія пытанні былі вырашаны па абаюднай

[131] Там сама, арк.119.
[132] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.10, арк. 120.
[133] Документы и материалы по истории советско-польских отношений. Т.8.- С.592.

згодзе, і 25 лістапада 1945 г. Старшыня Савета Міністраў Польшчы Э.Асубка-Мараўскі і намеснік Старшыні СНК БССР А.Шаўроў падпісалі дадатковы пратакол аб прадаўжэнні тэрміну перасялення да 15 чэрвеня 1946 г.[134].

Пагадненне мела шэраг недакладнасцей, на якія звярталі ўвагу прадстаўнікі СНК БССР па перасяленню. Так, начальнік аддзела рэпатрыяцыі пры СНК БССР А.Баркоў адзначаў, што "пагадненне было далёка не дасканалым. У ім, напрыклад, не быў прадугледжаны такі момант, як забеспячэнне эвакадакументаў фотаздымкам. Гэтая "дробязь" прывяла да значных непрыемнасцей, якія выразіліся ў тым, што некаторыя грамадзянне пачалі спекуляваць эвакадакументамі"[135].

Перасяленне насельніцтва ажыццяўлялі ўпаўнаважаныя ПКНВ і прадстаўнікі СНК БССР. Галоўнае прадстаўніцтва СНК БССР у Польшчы размяшчалася ў Беластоку, а яго прадстаўніцтвы ў Аўгустове, Бельску, Бяла-Падлясцы, Валілах, Замбраве, Кнышыне, Ломжы, Лапах, Саколцы, Семяцічах, Цэханаўцэ[136]. У БССР апарат Галоўнага ўпаўнаважанага ПКНВ знаходзіўся ў Баранавічах, а яго прадстаўніцтвы ў Навагрудку, Слоніме, Картуз-Бярозе, Пінску, Брэсце, Гродна, Ваўкавыску, Вілейцы, Глыбокім. Задача прадстаўнікоў СНК БССР і ўпаўнаважаных ПКНВ заключалася ў "выяўленні колькасці, месцазнаходжанні, нацыянальнасці асоб, а таксама іх рэгістрацыі; назіранне і кантроль за правільным ходам выканання Пагаднення; садзейнічанне арганізацыі і планамернаму ходу эвакуацыі"[137].

Упаўнаважаныя ПКНВ у большасці з'яўляліся мясцовым польскім насельніцтвам. Напрыклад, у апараце Навагрудскага райпрадстаўніцтва працавалі выключна мясцовыя палякі[138]. З пачаткам перасялення колькасць польскіх упаўнаважаных значна пераўзыходзіла колькасць прадстаўнікоў СНК БССР, што ў далейшым значна паўплывала на ўлік і рэгістрацыю польскага насельніцтва, бо прадстаўнікі СНК БССР не маглі дастаткова эфектыўна кантраляваць працу польскіх упаўнаважаных. Неабходна адзначыць, што гэтую дыспрапорцыю "стварыў" беларускі ўрад, які пастановай "Аб эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі Беларускай ССР" (21 верасня 1944 г.) зацвердзіў штаты

[134] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.10, арк.120.
[135] НАРБ. Ф.787, воп.1, спр.23, арк.18.
[136] НАРБ, ф.787, воп.1, сп.24, арк.59.
[137] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.1, арк.30.
[138] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.187.

прадстаўнікоў СНК БССР у колькасці 8 работнікаў, а ўпаўнаважаных ПКНВ - у колькасці 20[139]. У далейшым колькасць упаўнаважаных ПКНВ перавысіла гэтую лічбу, у той час як колькасць прадстаўнікоў СНК БССР практычна не змянілася. Напрыклад, калі па Навагрудскаму райпрадстаўніцтву, у якое ўваходзіла 14 раёнаў, польскі бок меў у штаце 41 работніка, то штат прадстаўнікоў СНК БССР складаў усяго 5 работнікаў[140]. У такім жа становішчы знаходзілася і Пінскае райпрадстаўніцтва, якое праводзіла рэгістрацыю насельніцтва ў 8 раёнах, і з пачаткам працы да заканчэння першага этапу (1 мая 1945 г.) у прадстаўніцтве працавала ўсяго 7 чалавек, у той час як штат польскіх упаўнаважаных складаў 30 работнікаў[141]. Параўнальныя дадзеныя аб колькасным складзе беларускіх і польскіх супрацоўнікаў, якія займаліся перасяленнем, дае наступная табліца:[142] (дадзеныя па стану на 5 лютага 1945 г.).

| | Прадстаўніцтвы | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Баранавіч | Брэст | Глыбокае | Слонім | Картуз-Бяроза | Гродна | Пінск | Вілейка | Навагруда | Ваўкавыс | Ўсяго |
| Прадстаўнікі СНК БССР | 27 | 7 | 7 | 7 | 7 | 8 | 7 | 7 | 7 | 8 | 92 |
| Упаўнаважаныя ПКНВ | 30 | 32 | 31 | 24 | 20 | 34 | 30 | 41 | 37 | 29 | 308 |

Улічваючы значны аб'ём працы, які быў звязаны з масавым запісам насельніцтва на выезд у Польшчу і дыспрапорцыю, якая склалася ў колькасці паміж польскімі і беларускімі прадстаўнікамі, урад БССР 8 сакавіка 1945 г. прыняў пастанову аб павелічэнні з 1 красавіка гэтага года штатаў Галоўнага і раённых прадстаўніцтваў на 23 штатныя адзінкі[143]. Аднак гэтае нязначнае павелічэнне не магло карэнным чынам змяніць сітуацыю, і на ўсім працягу перасяленчага працэсу колькасць упаўнаважаных ПКНВ пераўзыходзіла колькасць прадстаўнікоў СНК БССР.

[139] Занальны дзяржаўны архіў (ЗДА) г. Баранавічы, ф.184, воп.4, спр.3, арк.58,60.
[140] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.243.
[141] Там сама, арк.343.
[142] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1916, арк.44.
[143] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1916, арк.44.

Адзначым, што райпрадстаўніцтвы былі створаны не ў тэрытарыяльных межах абласцей, а ахоплівалі раёны сумежных абласцей. Так, частка раёнаў Пінскай вобласці была аднесена да Картуз-Бярозаўскага райпрадстаўніцтва, якое знаходзілася на тэрыторыі Брэсцкай вобласці. Гэтае ж самае датычылася і Слонімскага райпрадстаўніцтва, у сферу дзейнасці якога ўваходзілі Быценскі, Дзятлаўскі, Казлоўшчынскі раёны Баранавіцкай, Мастоўскі і Зельвенскі раёны Гродзенскай абласцей[144]. Гэтая акалічнасць уносіла пэўныя цяжкасці з вызначэннем дакладнай колькасці ад'язджаючых у межах той ці іншай вобласці. Дзейнасць апарата Галоўнага і раённых прадстаўнікоў СНК БССР па перасяленню, а таксама упаўнаважаных ПКНВ распаўсюджвалася на ўсе тэрытарыяльна-адміністрацыйныя раёны заходніх абласцей, размеркаваных паміж 10 райпрадстаўніцтвамі. У кожнае райпрадстаўніцтва ўваходзіла ад 5 да 14 раёнаў[145].

Заўважым, што вышэйазначаныя райпрадстаўніцтвы - гэта канчатковы варыянт, які быў замацаваны пагадненнем ад 9 верасня 1944 г. Аднак існаваў і іншы варыянт, які меў значныя адрозненні ад канчатковага. Так, на перамовах у Любліне было вызначана, што апарат Галоўнага ўпаўнаважанага ПКНВ будзе знаходзіцца ў Баранавічах, а Галоўны прадстаўнік СНК БССР у Польшчы ў Любліне. Прадстаўніцтвы ПКНВ планавалася стварыць у Лідзе, Гродне, Ваўкавыску, Слоніме, Пружанах, Брэсце, Картуз-Бярозе, Кобрыне, Пінску[146]. Аднак на нарадзе ў кастрычніку 1944 г. беларускі і польскі бакі пагадзіліся райпрадстаўніцтва з Пружан перанесці ў Глыбокае, з Кобрына - у Навагрудак, з Ліды – у Маладзечна, з адпаведным размеркаваннем раёнаў паміж гэтымі прадстаўніцтвамі[147]. Гэта было зроблена для таго, каб польскія ўпаўнаважаныя маглі больш эфектыўна праводзіць улік і рэгістрацыю насельніцтва.

Пагадненне вызначала, што "перавозку эвакуіруемых з тэрыторыі Беларускай ССР у Польшчу, а таксама з тэрыторыі Польшчы ў Беларускую ССР бярэ на сябе ўрад Беларускай ССР, па магчымасці выдзяляе транспартныя сродкі, а таксама прадастаўляе транспартныя сродкі для польскіх ўпаўнаважанных і прадстаўнікоў СНК БССР"[148]. Аналіз гэтага пункта пагаднення дазваляе выказаць меркаванне, што ён не адпавядаў эканамічным

---

[144] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.320.
[145] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.8, арк.159.
[146] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.1, арк.35.
[147] Архіў МЗС РБ, ф.907, воп.2, спр.5, арк.7.
[148] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.1, арк.2.

інтарэсам Беларусі, якая знаходзілася ў надзвычай складанай эканамічнай сітуацыі, абумоўленай вялізнымі стратамі, прычыненымі рэспубліцы вайной і акупацыяй. Хутчэй за ўсё ўрад Беларусі вымушаны быў узяць фінансавыя выдаткі па перавозцы насельніцтва з-за ціску саюзнага ўрада, які тым самым праявіў "інтэрнацыянальную дапамогу" і выказаў пачуцці салідарнасці прамаскоўскаму ўраду Польшчы за кошт БССР.

www.kamunikat.org

## Раздзел 2.
## З “Другой Рэчы Паспалітай” у камуністычную Польшчу

### Глава 1.
### "Ніякай складанай нацыянальнай сітуацыі ў заходніх абласцях няма..."

Перадача Беласточчыны Польшчы і абмен насельніцтвам, які ажыццяўляўся на аснове беларуска-польскага пагаднення ад 9 верасня 1944 г. і дадатковага пратакола да яго ад 25 лістапада 1945 г. з'явіліся аднымі з самых значных і складаных падзей у гісторыі беларуска-польскага памежжа ў другой палове 40-х гадоў XX ст. Перасяленне мела шмат аспектаў, аднак напэўна адным з самых складаных з'яўляўся нацыянальны. Прысутнасць палякаў у заходнім рэгіёне Беларусі, якія ў большасці варожа ці ў лепшым выпадку нейтральна ставіліся да савецкай улады, вымушала партыйна-савецкае кіраўніцтва рэспублікі шукаць шляхі рашэння праблемы “польскага элемента”. Аднак пошукі паказалі, што кіраўніцтва рэспублікі першапачаткова не ўяўляла ўсёй яе складанасці і даволі спрошчана і прамалінейна падыходзіла ў сваіх ацэнках да нацыянальнай сітуацыі, якая мела месца на захадзе Беларусі.

Спроба вызначэння пазіцыі палітычнага кіраўніцтва Беларусі да палякаў неаднаразова прадпрымалася партыйнымі органамі рэспублікі яшчэ ў час Другой сусветнай вайны. Ушчыльную гэтая праблема паўстала на V пленуме ЦК Кампартыі Беларусі (26-28 лютага 1943 г.). Сакратар Вілейскага абкама партыі І.Клімаў, выступаючы на пленуме, адзначыў, што ў Вілейскай вобласці існуе складаная нацыянальная сітуацыя. Аднак у адказ на яго выступленне сакратар ЦК КП(б)Б Ц.Гарбуноў рэзка запярэчыў яму: "Тут таварыш Клімаў выступіў і гаварыў аб нейкіх складаных пераплётах у Вілейскай вобласці. Ніякага складанага нацыянальнага пераплёту ў Вілейскай вобласці няма. Вілейская вобласць на 95 % складаецца з беларусаў. Які там можа быць складаны нацыянальны пераплёт, калі асноўная маса - 95 % насельніцтва беларусы. Ёсць там невялікі працэнт літоўцаў,

невялікі працэнт палякаў. Безумоўна, прымаць іх пад увагу неабходна, але ніякага складанага нацыянальнага пераплёту там няма"[149]. І.Клімаў не пярэчыў Ц. Гарбунову і не паспрабаваў больш грунтоўна і аргументавана адстаяць сваю пазіцыю. Хутчэй за ўсё сваю ролю тут адыграла партыйная субардынацыя і нежаданне спрачацца з Цімохам Гарбуновым, які з'яўляўся сакратаром ЦК КП(б)Б па прапагандзе. Аднак Іван Клімаў, як партработнік, які працаваў у Заходняй Беларусі з 1939 г., меў рацыю, калі казаў аб складанай нацыянальнай сітуацыі. Ён дакладна ведаў, што сцверджанне Ц.Гарбунова аб 95 % беларусаў у Вілейскай вобласці не адпавядае рэчаіснасці.

Неабходна аддаць належнае І.Клімаву, які праз два гады зноў вярнуўся да гэтай праблемы і паспрабаваў прыцягнуць увагу партыйнага кіраўніцтва рэспублікі да нацыянальнай сітуацыі ў Маладзечанскай вобласці і ўвогуле ў заходніх абласцях Беларусі. І.Клімаў, ужо ў якасці першага сакратара Маладзечанскага абкама партыі, на VI пленуме ЦК Кампартыі Беларусі (12-18 лютага 1945 г.) паўтарыў сваю думку, якую ён выказаў у лютым 1943 г. Ён падкрэсліў: "Я павінен звярнуць увагу пленума на адно пытанне, якое мела месца ў нашай працы і якое, безумоўна, неабходна разглядаць як памылку, якую зрабілі асобныя партыйныя арганізацыі. Гэта пытанне вельмі сур'ёзнае для работнікаў заходніх абласцей, у прыватнасці для работнікаў нашай вобласці - гэта пытанне аб вызначэнні нацыянальнасці. Справа ў тым, што беларусам-католікам, якія пражываюць у нашай вобласці, у час панавання Польшчы і ў перыяд акупацыі спрабавалі ўнушыць думку, што яны не беларусы, што яны палякі. У асобных раёнах партыйныя арганізацыі не адразу зарыентаваліся ў гэтым пытанні і таксама сталі сцвярджаць, што, скажам, у Ашмянскім раёне 80 % палякаў, у Іўеўскім - 75 % і г.д. Неабходна было правесці асобныя партыйныя сходы раённых партыйных арганізацый спецыяльна па гэтаму пытанню, каб растлумачыць таварышам іх памылку ў вызначэнні нацыянальнасці"[150].

І.Клімава падтрымаў А. Эльман - сакратар Гродзенскага абкама партыі. Ён заявіў: "Таварыш Клімаў у сваім выступленні, безумоўна, правільна казаў аб тым, што асобныя абласныя і раённыя работнікі пачынаюць гаварыць аб тым, што вакол нас усе палякі. Вось у нас некаторыя раённыя работнікі кажуць, што ў іх раёнах большасць палякаў. Дазвольце тады спытаць - навошта перасяляем тады палякаў у Польшчу ? Відавочна, калі больш

---

[149] НАРБ, ф.4, воп.20, спр.213, арк.171-172.
[150] НАРБ, ф,4, воп. 20, спр.217, арк.126.

палякаў, то нам самім неабходна перасяляцца ў БССР. На самай справе гэта не так. На самай справе большасць насельніцтва Гродзенскай вобласці і іншых заходніх абласцей - гэта беларускае насельніцтва"[151]. Аналагічнай думкі прытрымліваўся і сакратар Гродзенскага райкама партыі Ф.Масанін. Ён паведаміў, што "райкам партыі займаўся выяўленнем, якога насельніцтва болей у раёне - беларусаў ці палякаў. Аказваецца, што палякаў у раёне каля 25 %, астатнія - беларусы і частка апалячаных беларусаў"[152].

Як гэта ні парадаксальна гучыць, але ў поглядах на праблему палякаў у заходніх абласцях Беларусі супалі погляды зусім супрацьлеглых бакоў: беларускіх камуністаў і часткі беларускай эміграцыі. Так, вядомы эмігранцкі гісторык М.Волаціч значна пазней (у 1957 г.) пісаў: "Перасяленчая акцыя так званага "польскага" элементу з Заходняй Беларусі ў Польшчу наглядна выявіла ўсю фальшывасць польскіх даваенных статыстычных дадзеных аб колькасці Палякаў у Заходняй Беларусі, *якіх было толькі 5,9 % усяго насельніцтва*" (выдзелена мной. - А.В.). І далей: "Пасля адыходу немцаў і заняцця Заходняй Беларусі бальшавікамі, г. значыць у 1944 г., усіх Палякаў засталося каля 45 000 разам з Вільняй і Віленшчынай, якія былі перасэлены ў Польшчу згодна з перасяленчымі ўмовамі. Такім чынам, ад 1947 г. на ўсход ад савецкай "лініі Керзана" не засталося амаль зусім палякаў"[153].

Не "ўбачыла" палякаў на захадзе Беларусі і І. Царук, якая адзначыла, што "пад уплывам ілжывай прапаганды святарства, а таксама ў выніку пагроз і насілля з боку нацыяналістычных банд, якія дзейнічалі разам з каталіцкім духавенствам, некаторая частка беларускіх католікаў пасля вайны пачала заяўляць аб сваёй прыналежнасці да польскай нацыі"[154].

Калі Ц.Гарбуноў казаў аб 95% беларусаў, а М.Волаціч аб 5,9 % палякаў у заходніх абласцях Беларусі, то гэтых такіх розных людзей па выхаванню, палітычных поглядах, адукацыі - высокага партыйнага функцыянера і эмігранта - аб'ядноўвала адно - нежаданне бачыць складанасць нацыянальнай сітуацыі на захадзе БССР, недавер і неасэнсаваную варожасць да "польскага элемента", а таксама жаданне адным "махам" рашыць гэтую праблему.

---

[151] Там сама, арк.439.
[152] Там сама, арк.499.
[153] Волаціч М. Насельніцтва Заходняй Беларусі і яго перасяленні паміж сучаснай Польшчай і БССР // Беларускі зборнік. - Мюнхэн, 1956. Кн.4.- С.33.
[154] Царюк И.О. КПБ – организатор культурного строительства в западных областях Белоруссии (1939-1955 гг.). Минск.: Издательство БГУ им. В.И.Ленина, 1968.-С.81.

Аднак існаваўшая рэчаіснасць абвяргала такога кшталту выказванні абласных і раённых партработнікаў (асабліва гэта датычыць Гродзенскай вобласці). Фактычна яны ўводзілі ў зман удзельнікаў пленума і партыйна-савецкае кіраўніцтва рэспублікі. Нягледзячы на той факт, што дакладных звестак аб нацыянальным складзе ў заходнім рэгіёне на той час не мелася (1944-1946 гг. - А.В.), тым не менш прыблізныя ўсё ж існавалі. Гэта колькасныя дадзеныя, якія сумесна атрымалі прадстаўнікі СНК БССР і ўпаўнаважаныя Польшчы, калі праводзілі ўлік насельніцтва, якое пажадала перасяліцца ў Польшчу. Паводле іх дадзеных, у Гродзенскай вобласці (па стану на жнівень 1945 г.) пражывала 443 908 чалавек (без уліку насельніцтва Мастоўскага і Жалудоцкага раёнаў, бо звесткі аб колькасці насельніцтва гэтых раёнаў адсутнічалі. - А.В.). З іх беларусамі лічылі сябе 219 475 чалавек, палякамі - 208 754 чалавекі[155]. Па раёнах дыспрапорцыя паміж беларусамі і палякамі была яшчэ большая. Так, у Гродзенскім раёне з агульнай колькасці насельніцтва ў 51 422 чалавекі палякаў налічвалася 31 497, беларусаў - 19 607, у Воранаўскім з усяго насельніцтва ў 20 365 чалавек палякаў было 19 038, беларусаў - 331, Лідскім усяго насельніцтва 43 080, з іх палякаў - 30 456, беларусаў - 11 332. Іншая сітуацыя назіралася ў Поразаўскім раёне, дзе з 25 997 чалавек усяго насельніцтва 22 574 лічылі сябе беларусамі, і толькі 3319 - палякамі[156]. Значныя ваганні паміж колькасцю палякаў і беларусаў назіраліся і ў іншых раёнах вобласці.

Безумоўна, да лічбаў, што прыводзілі прадстаўнікі СНК БССР і ўпаўнаважаныя Польшчы, неабходна ставіцца дастаткова крытычна, улічваючы складаныя ўмовы, у якіх праводзіўся ўлік насельніцтва. Да таго ж, як падкрэслівалі прадстаўнікі СНК БССР па перасяленню, для іх саміх пытанне аб вызначэнні нацыянальнасці з'яўлялася вельмі цяжкім. Так, у справаздачы Ваўкавыскага райпрадстаўніцтва, у якое ўваходзілі Ваўкавыскі, Поразаўскі, Свіслацкі, Бераставіцкі, Ружанскі, Пружанскі, Шэрашаўскі раёны, адзначалася, што "вялікай цяжкасцю з'явілася тое, што ва ўсіх раёнах нашага дзеяння *адсутнічаў і адсутнічае ўлік насельніцтва па нацыянальнасці. Гэта асноўнае, што дало магчымасць зарэгістравацца на выезд у Польшчу беларусам-католікам"*[157] (выдзелена мной. – А.В.). Тым не менш справаздачы райпрадстаўнікоў СНК БССР усё ж больш дакладна адлюстроўвалі

---

[155] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.7, ч.1, арк.12-13.
[156] Там сама, арк.13.
[157] НАРБ, ф.788, воп. 1, спр. 11, арк.145.

рэчаіснасць, чым сцверджанне А.Эльмана аб тым, што "большасць насельніцтва Гродзенскай вобласці - беларусы".

Летам 1945 г. і мясцовыя ўлады “прызналі” наяўнасць палякаў. Так, у маі 1945 г. кіраўніцтва Ваўкавыскага раёна атрымала дадзеныя з сельсаветаў аб нацыянальным складзе насельніцтва раёна. Абагульняючыя дадзеныя паказалі, што ў раёне налічвалася 32 970 палякаў, 23 750 беларусаў, 1144 – рускіх і 270 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей. У верасні гэтага ж года ўлады Васілішкаўскага раёна таксама сабралі дадзеныя аб нацыянальным складзе насельніцтва. Паводле іх дадзеных, палякаў у раёне налічвалася 20 023 чалавекі, беларусаў – 10 415, рускіх – 50[158]. Ці ведала партыйнае кіраўніцтва вобласці і рэспублікі гэтыя дадзеныя ? Безумоўна, ведала, бо з вясны 1945 г. поўнасцю кантралявала працэс перасялення, і дадзеныя аб нацыянальным складзе насельніцтва заходніх абласцей, раёнаў дасылаліся ў партыйныя структуры ўсіх узроўняў: ад райкама партыі да ЦК КП(б)Б.

Усведамленне гэтага факта і той рэчаіснасці, што існавала ў беларуска-польскім памежжы, прывялі да маўклівага прызнання партыйным кіраўніцтвам рэспублікі наяўнасці значнай колькасці палякаў на захадзе БССР. Магчыма сцвярджаць, што гэта адбылося на VII пленуме ЦК Кампартыі Беларусі (7-12 ліпеня 1945 г.). Так, сакратар Сапоцкінскага райкама партыі Міронаў адзначыў, што Сапоцкінскі раён - "гэта пагранічны раён, у асноўным з польскім насельніцтвам. Калі мы маем 22 тысячы ўсяго насельніцтва, то 21 691 чалавек па нацыянальнасці палякі, беларусаў толькі 143 чалавекі. Гэта дадзеныя на сённяшні дзень"[159]. Як вынікае са слоў Міронава, абсалютная большасць насельніцтва раёна з’яўлялася палякамі. Характэрна, што ні адзін з удзельнікаў пленума не абверг і не аспрэчыў гэтыя лічбы, а таксама выказванне сакратара Сапоцкінскага райкама партыі: ні партыйныя кіраўнікі Гродзенскай вобласці, ні кіраўніцтва ЦК КП(б)Б. Нагадаем, што на лютаўскіх пленумах ЦК КП(б)Б (1943 і 1945 гг.) гучалі зусім іншыя думкі і сцверджанні.

Яшчэ адным пацвярджэннем прызнання наяўнасці значнай колькасці палякаў, а не беларусаў-католікоў, на захадзе Беларусі з'яўляецца "Даведка аб стане рымска-каталіцкага і сектанцкага культу ў Гродзенскай вобласці па стану на 16 жніўня 1946 г.", накіраваная летам 1946 г. Гродзенскім АК КП(б)Б у ЦК КП(б)Б. У

---

106 Tokc S. Zmiany struktury narodowosciowej na pograniczu bialorusko-polskim w BSSR (1945-1959) // Bialoruskie Zeszyty Historyczne. Bialystok.-2004.-S.117.

[159] НАРБ, ф.4, воп.20, спр.220, арк.329.

ёй, у прыватнасці, падкрэслівалася: "Гродзенская вобласць належыць да заходне-памежных абласцей Беларусі. Каля 45 % насельніцтва, якое адносіцца да рымска-каталіцкага культу: з іх 25-35 % карэнныя палякі, 15-20 % беларусы-каталікі"[160].

Вынікі перасяленчай акцыі таксама сведчаць, што ўлады "змірыліся" з наяўнасцю палякаў у заходнім рэгіёне Беларусі. Просты арыфметычны падлік даказвае гэта. На выезд у Польшчу з усіх заходніх абласцей зарэгістравалася 535 284 чалавекі, якія лічылі сябе палякамі[161]. Аднак у выніку працы змешаных камісій беларусамі-каталікамі палічылі ўсяго толькі 39 044 чалавекі[162]. Такім чынам, улада маўкліва прызнала, што 496 240 чалавек – палякі. Падкрэслім, што гэта тыя грамадзяне, якія зарэгістраваліся на выезд і лічылі, што яны палякі. Аднак, калі прыняць пад увагу, што частка людзей увогуле не зарэгістравалася, але лічыла сябе палякамі, то гэтая лічба істотна павялічыцца. Паўстае пытанне – наколькі ? Польскі гісторык П.Эберхардт лічыць: "Можна меркаваць, што непасрэдна пасля вайны ў заходняй частцы беларускай зямлі знаходзілася каля 1 млн. насельніцтва польскай нацыянальнасці"[163]. Калі прыняць за аснову яго разлікі і ўлічыць, што пацвердзілі сваю прыналежнасць да польскай нацыянальнасці ў час перасялення 535 284 чалавекі, то вынікае, што каля 460 тыс. чалавек свядома не заявілі, што яны палякі. Аднак гэта вельмі значная лічба, і цяжка паверыць, што каля паўмільёна грамадзян свядома ўстрымаліся зафіксаваць сваю польскасць. Мы звяртаем увагу на гэты момант з прычыны яго важнасці, бо рэгістрацыяй на выезд людзі дэманстравалі сваю прыналежнасць да польскай нацыянальнасці. П.Панамарэнка падкрэсліваў гэта ў лісце, які ён накіраваў І.Сталіну ў маі 1945 г. Першы сакратар ЦК КП(б)Б паведамляў І.Сталіну, што "пры праверцы пунктаў рэгістрацыі на эвакуацыю ў гэтым раёне (Браслаўскім Полацкай вобласці. – А.В.*) устаноўлена, што туды прыходзяць сяляне не столькі для таго, каб зарэгістравацца на выезд у Польшчу, а сколькі для таго, каб засведчыць сваю прыналежнасць да польскай нацыянальнасці*"[164] (выдзелена мной. – А.В.).

Значна, на наш погляд, завысіў колькасць палякаў на захадзе Беларусі Т.Кручкоўскі, які лічыць, што "пасля вайны ў заходняй частцы Беларусі знаходзілася 1,5 млн. насельніцтва польскай

[160] НАРБ, ф.4, воп.51, спр. 11, арк.160.
[161] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.23, арк.27.
[162] Там сама, арк.29.
[163] Эберхардт П. Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі:1889-1989. Менск: Бел.фонд Сораса. 1997.-С.154.
[164] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.828, арк.6.

нацыянальнасці"[165]. Аднак, у адрозненне ад П.Эберхардта, ён не прыводзіць ніякіх доказаў абгрунтаванасці гэтай лічбы, таму мы без каментараў пакідаем яго разважанні. Разам з тым у нашую задачу не ўваходзіць падрабязны аналіз дэмаграфічнай сітуацыі на захадзе Беларусі. Больш істотным і важным з'яўляецца змена пазіцыі партыйна-савецкага кіраўніцтва рэспублікі да гэтай праблемы. Адыход ад катэгарычных заяваў, што ў заходніх абласцях палякаў няма, да прызнання, што яны ўсё ж ёсць, сведчыць аб новых падыходах у гэтым пытанні, якія, аднак, цалкам знаходзіліся ў рэчышчы сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Прызнанне гэтага факта не азначала, што кіраўніцтва Беларусі змірылася і пагадзілася з прысутнасцю такой колькасці палякаў на захадзе рэспублікі. У 1945 г. палітычнае кіраўніцтва СССР і, зразумела, БССР на доўгія гады вызначыла сваё стаўленне да іх. 20 студзеня 1945 г. ЦК УсеКП(б) прымае пастанову "Аб палітычнай працы партыйных арганізацый КП(б)Б сярод насельніцтва заходніх абласцей БССР"[166]. Яе сутнасць магчыма звесці да двух тэзісаў: "саветызацыя" і "русіфікацыя" беларускіх палякаў. У адпаведнасці з ёй планавалася значна ўзмацніць агітацыйна-прапагандысцкую працу сярод палякаў, скіраваную на тое, каб выхаваць іх у духу "адданасці савецкай уладзе". Спецыяльна для школ заходніх абласцей Беларусі планавалася выданне звыш аднаго мільёна падручнікаў на беларускай і рускай мовах, арганізацыя перападрыхтоўкі настаўнікаў і г.д. Гэта рабілася для таго, каб знішчыць польскую школу як асяродак польскасці.

Курс на "саветызацыю" і "русіфікацыю" палякаў, як "рашэнне" польскага пытання, яскрава прасочваецца ў дзейнасці ЦК КП(б)Б. Так, першы сакратар ЦК КП(б)Б М.Гусараў падрыхтаваў і накіраваў у ліпені 1947 г. сакратару ЦК УсеКП(б)Б А.Жданаву запіску "Аб стане і мерах па паляпшэнню палітычнай працы сярод апалячанага беларускага насельніцтва і насельніцтва польскай нацыянальнасці ў заходніх абласцях БССР". М.Гусараў адзначаў, што, нягледзячы на праведзеную партыйнымі арганізацыямі значную агітацыйна-прапагандысцкую працу, палітычнае становішча ў заходніх абласцях застаецца "складаным". Ён падкрэсліў, што "за апошнія тры гады значна ўзрасла колькасць людзей, якія называюць сябе палякамі, нягледзячы на той факт, што колькасць польскага насельніцтва значна зменшылася ў

[165] Кручковски Т.Т. Назв. соч. С.139.
[166] КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК КПСС., М.: 1985.-Т.7. - 1938-1945, С.533.

выніку рэпатрыяцыі ў Польшчу"[167]. Улічваючы гэты і іншыя факты, ЦК КП(б)Б палічыў неабходным "весці лінію на беларусізацыю апалячанага беларускага насельніцтва і на шырокае развіццё беларускай і рускай савецкай культуры ў заходніх абласцях БССР з тым, *каб у бліжэйшыя гады далучыць да беларускай і савецкай культуры і апалячаных беларусаў, і польскае насельніцтва, якое засталося ў рэспубліцы"[168]* (выдзелена мной. – А.В.).

Асаблівую заклапочанасць М.Гусарава выклікала існаванне 22 польскіх школ, якія яшчэ засталіся ў заходніх абласцях. Ён падкрэсліваў, што ў рэспубліцы няма ні дастатковай колькасці падручнікаў на польскай мове, ні настаўнікаў, якія маглі б весці выкладанне на польскай мове. На яго думку, польскія настаўнікі не жадаюць і не здольныя выхаваць вучняў у "савецкім духу". Першы сакратар ЦК КП(б)Б выказаў меркаванне, што "неабходнасць далейшага існавання польскіх школ у гэтых умовах падаецца нам надта сумніўным". Аднак ён перасцерагаў, што "адначасовае іх закрыццё магло б вызваць адмоўную рэакцыю польскага насельніцтва і выклікаць непажаданыя водгукі сярод польскай замежнай грамадскасці"[169]. Тым не менш М.Гусараў прапанаваў наступнае: "З-за таго, што існаванне польскіх школ магло б быць шкодным савецкай дзяржаве, неабходна паступова пераўтварыць польскія школы ў беларускія і рускія шляхам замены некваліфікаваных палякаў-выкладчыкаў, падрыхтаванымі выкладчыкамі, рускімі і беларусамі"[170]. Гэты план М.Гусарава практычна ажыццявіўся ў 1948/1949 навучальным годзе. Калі ў 1947/1948 навучальным годзе ў Гродзенскай вобласці працавала 16 школ з польскай мовай навучання, у Брэсцкай – 1, то ў 1948/1949 г. усе польскія школы былі рэарганізаваныя ў рускія або беларускія[171]. Неабходна адзначыць, што "рэарганізацыя" польскамоўных школ у беларускамоўныя ці рускамоўныя ажыццяўлялася адміністрацыйным шляхам. Так, восенню 1944 г. у Шылавіцкім і Янышаўскім сельсаветах Ваўкавыскага раёна аддзел адукацыі "прапанаваў" адкрыць беларускамоўныя школы. Аднак большасць польскага насельніцтва з гэтым не пагадзілася і патрабавала адкрыць польскамоўныя школы з выкладаннем усіх прадметаў на польскай мове. Тым не менш райвыканкам не пагадзіўся з іх патрабаваннямі і жаданнямі. У Янышаўскім

[167] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.543, арк.40.
[168] Там сама, арк..48.
[169] Там сама, арк.42.
[170] Там сама, арк.43.
[171] Маржала Т. Польскія школы ў БССР у пасляваенныя гады (1945-1949 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс, № 4, 2003.- С.32.

сельсавеце не было адкрыта ні адной польскамоўнай школы. У Шылавіцкам сельсавеце былі адкрыты толькі беларускамоўныя школы. Аналагічнае становішча, як паведамляў Гродзенскі АК КП(б)Б, склалася і ў іншых сельсаветах Ваўкавыскага раёна[172]. Не лепшым было становішча ў Воранаўскім раёне, дзе, як паведамлялася ў даведцы "Аб стане працы Воранаўскага РК КП(б)Б Гродзенскай вобласці па перасяленню грамадзян польскай нацыянальнасці з Беларусі ў Польшчу" (чэрвень 1945 г.), "з восені 1944 г. з 30 школ 29 былі польскімі, зараз (г.зн. летам 1945 г. - А.В.) усе пераведзены на беларускую мову, за выключэннем рускай НСШ"[173].

Рэарганізацыя польскіх школ у беларускія ці рускія азначала замену "ненадзейных настаўнікаў-палякаў" "праверанымі і падрыхтаванымі" рускімі і беларускімі настаўнікамі. Аднак гэта неабходна разглядаць як агульную стратэгію партыйнага кіраўніцтва Беларусі ў адносінах да "польскага насельніцтва, якое засталося ў рэспубліцы", і якое неабходна было далучыць да беларускай і рускай культуры. Формы і метады "далучэння" таталітарнай дзяржавай былі адпрацаваныя, і ва ўмовах савецкай Беларусі нішто не перашкаджала яго ажыццяўленню.

Такім чынам, пункт гледжання партыйна-савецкага кіраўніцтва Беларусі ў дачыненні да нацыянальнай сітуацыі ў заходнім рэгіёне Беларусі і да палякаў перацярпеў значную эвалюцыю: ад спрошчанага падыходу і адмаўлення бачыць і разумець усю яе складанасць - да ўсведамлення і прызнання, а таксама пошукаў шляхоў яе рашэння. Аднак гэтае рашэнне цалкам ляжала ў рэчышчы сталінскіх падыходаў і поглядаў у нацыянальным пытанні.

[172] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.375, арк.96.
[173] НАРБ, ф.4, воп.51, спр.11, арк.59.

## Глава 2.
## Ехаць ці заставацца?

Беларуска-польскае пагадненне аб перасяленні, заключанае 9 верасня 1944 г., з'явілася асноўнай нарматыўна-прававой базай, якая рэгулявала ўсе напрамкі яго ажыццяўлення. Урад Беларусі, выконваючы яго, стварыў на тэрыторыі заходняга рэгіёна 10 прадстаўніцтваў (Баранавіцкае (там знаходзілася галоўнае прадстаўніцтва), Брэсцкае, Пінскае, Ваўкавыскае, Картуз-Бярозаўскае, Гродзенскае, Слонімскае, Маладзечанскае, Глыбоцкае, Навагрудскае), у якія ўваходзілі ўсе раёны заходніх абласцей[174]. Колькасць раёнаў, аб'яднаных у райпрадстаўніцтвы, вагалася ад 5 (Картуз-Бярозаўскае) да 14 (Маладзечанскае). Урад Беларусі аператыўна прызначыў Галоўнага і раённых прадстаўнікоў СНК БССР. 12 верасня 1944 г. бюро ЦК КП(б)Б разгледзела пытанне «Аб раённых упаўнаважаных па правядзенню эвакуацыі польскіх грамадзян з тэрыторыі Беларускай ССР і беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы» і даручыла П.Маліну, Л.Цанаве, М.Аўхімовічу, К.Кісялёву і С.Бельчанку «прадставіць на зацверджанне ЦК КП(б)Б кандыдатуры раённых упаўнаважаных па правядзенню эвакуацыі польскіх грамадзян з тэрыторыі Беларускай ССР і беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы. Тэрмін выканання - 13 верасня 1944 г.»[175]. Звернем увагу, што пасяджэнне бюро ЦК адбылося 12 верасня, а 13 верасня, гэта значыць на наступны дзень, павінны былі быць вызначаны і зацверджаны Галоўны і раённыя ўпаўнаважаныя па перасяленню. Як і было вырашана, 13 верасня 1944 г. бюро ЦК КП(б)Б зацвярджае І.Рыжыкава Галоўным прадстаўніком СНК БССР «пры Упаўнаважаным Польскага камітэта нацыянальнага вызвалення па эвакуацыі польскага насельніцтва з Беларусі ў Польшчу»[176]. Гэтым жа рашэннем раённымі прадстаўнікамі СНК БССР пры раённых упаўнаважаных ПКНВ былі зацверджаны: І.Друшчыц – у Ваўкавыскім раёне, С.Пархімовіч – у Слонімскім, Н.Бельскі – у Пружанскім, М.Траян – у Брэсцкім, І.Аўсейчык – у

---

[174] НАРБ, ф.787, воп.2, спр.5, арк.18.
[175] НАРБ, ф.4, воп.61, спр.70, арк.1.
[176] Там сама, арк.44.

Картуз-Бярозаўскім, Д.Бліноў – у Гродзенскім, Я.Захараў – у Кобрынскім, В.Герасімовіч – у Лідскім, С.Пацяруха – у Пінскім[177].

Хуткасць падбору і прызначэння работнікаў, якія павінны былі ажыццяўляць перасяленне, выклікае пытанне – чым жа абумоўлівалася такая, нават не хуткасць, а звышхуткасць, бо ўсяго за адзін дзень падабралі і прызначылі ўсіх работнікаў. Адказ на яго ўтрымліваецца ў прамове П.Панамарэнкі на гэтым жа пасяджэнні бюро. Ён падкрэсліў: «Прашу таварышаў не затрымліваць з-за надзвычайнай тэрміновасці і пажаданасці нам, як сказаў таварыш Сталін, з 15 кастрычніка пачаць (перасяленне. – А.В.)[178]. Улічваючы гэта, становіцца зразумелай тая звышхуткасць падбору і прызначэння работнікаў па ажыццяўленню перасялення, па-першае. Па-другое, і гэта больш істотнае і значнае: І.Сталін, як вынікае з слоў П.Панамарэнкі, быў зацікаўлены ў хутчэйшым пачатку перасяленчай акцыі і ў пэўнай ступені трымаў гэтае пытанне пад сваім кантролем.

Зазначым, што першапачатковы склад упаўнаважаных па перасяленню перацярпеў істотныя змяненні. Так, І.Рыжыкаў літаральна праз месяц быў заменены У. Царуком, які выконваў абавязкі Галоўнага ўпаўнаважанага да заканчэння перасялення. Значныя змены адбыліся і на раённым узроўні. Так, Слонімскае райпрадстаўніцтва ўзначаліў А.Сцепчанка, А.Іваноў – Картуз-Бярозаўскае, У.Пуцята - Гродзенскае, І.Дабрыян – Ваўкавыскае, Г.Дарожка – Пінскае. Такая «ратацыя» кадраў хутчэй за ўсё тлумачылася тым, што ў спешцы прызначылі работнікаў, якія па сваіх дзелавых якасцях не змаглі выканаць ускладзеныя на іх задачы. Тым не менш на пачатку кастрычніка 1944 г. апараты раённых упаўнаважаных СНК БССР па перасяленню пачалі ўлік і рэгістрацыю польскага насельніцтва[179].

Упаўнаважаныя ПКНВ прыступілі да працы значна пазней - у снежні 1944 г. Тлумачэнне гэтаму знаходзіцца ў запісцы П.Панамарэнкі “Аб перасяленні польскага насельніцтва з Беларусі”, накіраванай у лістападзе 1944 г. В.Молатаву. П.Панамарэнка паведамляў, што беларуска-польскае пагадненне не выконваецца па віне польскага боку, бо ўпаўнаважаныя ПКНВ, нягледзячы на распачатую беларускімі прадстаўнікамі працу, не прыступілі да яе. Ён адзначаў, што, па яго звестках, ПКНВ да вясны 1945 г. не маюць намеру займацца перасяленнем з-за адсутнасці неабходнай колькасці зямлі, патрэбнай перасяленцам. У сувязі з гэтым ён

[177] Там сама, арк.50.
[178] Там сама, арк.152.
[179] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.1.

прасіў В.Молатава “уздзейнічаць” на кіраўніцтва ПКНВ з тым, каб апошняе паскорыла працу па перасяленню[180]. Зварот П.Панамарэнкі не застаўся па-за ўвагай Саюзнага ўрада, бо ў снежні 1944 г. польскія ўпаўнаважаныя прыступілі да ўліку, рэгістрацыі і адпраўкі польскіх грамадзян ў Польшчу. Галоўным упаўнаважаным ПКНВ у БССР была прызначана Соф’я Вішнеўская.

Яе прызначэнне ў якасці Галоўнага ўпаўнаважанага ПКНВ мае пэўную дыпламатычную і нават палітычную “інтрыгу”. Да лістапада 1944 г. ПКНВ невядома з-за якой прычыны не “мог” вызначыць і падабраць кандыдатуру Галоўнага ўпаўнаважанага па перасяленню палякаў з БССР у Польшчу. Хутчэй за ўсё справа заключалася не ў тым, што ў палякаў не мелася адпаведнай кандыдатуры на гэтую пасаду, а ў тым, што Масква не давярала “люблінцам” і жадала бачыць на гэтай пасадзе “свайго” чалавека. Такім чалавекам, якога і ў Маскве і ў Мінску ведалі, цалкам давяралі, стала Соф’я Мікушка, актыўная дзяячка КПЗБ. Яе палітычная кар’ера пачалася ў 1932 г., калі яе накіравалі на вучобу ў Маскву, у Камуністычны універсітэт нацыянальных меншасцяў захаду (КУНМЗ). У 1935 г. пасля заканчэння КУНМЗа, адзначым, што яна была выдатніцай, яе накіроўваюць у распараджэнне Выканкама Камінтэрна. У сваю чаргу, Выканкам Камінтэрна, улічваючы яе здольнасці, у чэрвені 1935 г. накіроўвае яе на працу ў Заходнюю Беларусь у якасці сакратара Слонімскага абкама КПЗБ. Аднак у жніўні гэтага ж года яе арыштоўваюць і ў чэрвені 1936 г. прысуджаюць да 6- гадовага турэмнага зняволення, якое крыху пазней было зменшана да 4-х год. Турэмны тэрмін С.Мікушка адбывала ў Пружанскай і Фардонскай турмах, адкуль была вызвалена 2 верасня 1939 г. Пасля ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР працавала намеснікам старшыні Брэсцкага гарсавета. 27 снежня 1940 г. бюро ЦК КП(б)Б, разгледзеўшы яе справу і адзначыўшы, што “ў турме і на допытах вяла сябе вытрымана, як належыць камуністу”, а таксама, што яна з’яўлялася дэпутатам Нацыянальнага Сходу Заходняй Беларусі і працавала старшынёй часовага ўпраўлення Івацэвіч, аднаўляе яе ў шэрагах КП(б)Б[181].

З пачаткам вайны С.Мікушка знаходзілася ў партызанскай брыгадзе імя Молатава Пінскай вобласці ў якасці разведчыка, а з мая 1942 г. і да канца вайны з’яўлялася парторгам аднаго з партызанскіх атрадаў гэтай жа брыгады і ... ператварылася ў

[180] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1902, арк.7-8.
[181] НАРБ, ф.2, воп.23, спр.2933,арк.1.

Соф’ю Вішнеўскую. На жаль, аўтару не ўдалося дакументальна ўстанавіць, з чым гэта было звязана. У красавіку 1944 г. ужо не Соф’я Мікушка, а Соф’я Вішнеўская накіроўваецца ў распараджэнне Брэсцкага абкама партыі, а ў лістападзе 1944 г. “узнікае” ў якасці Галоўнага ўпаўнаважанага ПКНВ па перасяленню палякаў з Беларусі ў Польшчу. Безумоўна, такому “праверанаму і вытрыманаму” камуністу са стажам падпольнай працы ў Заходняй Беларусі, удзельніку савецкага партызанскага руху, Масква і Мінск маглі давяраць цалкам. Гэта з аднаго боку, з другога – С.Вішнеўская неаднаразова правераная органамі НКДБ разглядалася імі, выкажам меркаванне, як каштоўная крыніца інфармацыі наконт планаў ПКНВ у пытанні перасялення.

Прадстаўнікі СНК БССР, распачаўшы ўлік і рэгістрацыю польскага насельніцтва, сутыкнуліся з праблемай вызначэння кола грамадзян, якія мелі права на перасяленне. У адпаведнасці з пагадненнем яго мелі тыя грамадзяне, якія дакументальна маглі пацвердзіць факт пражывання на тэрыторыі Польшчы да 17 верасня 1939 г. і што па нацыянальнасці яны палякі. Дакументамі, пацвярджаючымі гэта, з’яўляліся: савецкі, польскі пашпарты, польскі ваенны білет, пасведчанне аб нараджэнні, прафсаюзны білет ды іншыя афіцыйныя польскія і савецкія дакументы. Спрэчным з'яўлялася пытанне аб прызнанні нямецкіх пашпартоў (аусвайс) у якасці дакументаў, якія давалі права на рэгістрацыю і перасяленне. Аднак наркам замежных спраў Беларусі К.Кісялёў, які адначасова з'яўляўся намеснікам Старшыні СНК БССР, на нарадзе райпрадстаўнікоў СНК БССР, што адбылася ў Мінску напрыканцы 1944 г., даў загад лічыць і іх у якасці юрыдычных дакументаў[182]. У сувязі з тым, што ў заходніх абласцях пашпартызацыю не паспелі правесці ні да вайны, ні пасля яе заканчэння, то значная частка насельніцтва заходніх абласцей, пераважна сельская, наогул не мела ніякіх пасведчанняў асобы. У запісцы «Аб выніках эвакуацыі польскага і яўрэйскага насельніцтва з тэрыторыі заходніх абласцей Беларускай ССР у адпаведнасці з беларуска-польскім пагадненнем ад 9 верасня 1944 г. аб узаемнай эвакуацыі» адзначалася, што «асаблівыя цяжкасці адчуваліся пры вызначэнні нацыянальнай прыналежнасці грамадзян у сувязі з тым, што старыя польскія дакументы грамадзян, а таксама грамадзянская дакументацыя ў органах ЗАГС знішчаны ў перыяд акупацыі, і сельскае насельніцтва зусім не мела ніякіх дакументаў»[183]. У гэтым выпадку нацыянальнасць вызначалі

[182] НАРБ, ф.788, спр.1, спр.4, арк.39.
[183] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.23, арк.23.

даведкі, што выдаваліся сельскімі саветамі, якія абавязкова павінны былі зацвярджацца рай/гарвыканкамамі.

Пагадненне прадастаўляла магчымасць рэгістрацыі і выезду ў Польшчу і на аснове вусных заяў. У такім выпадку рашэнне аб рэгістрацыі і перасяленні прымала сумесная камісія, у склад якой уваходзілі як польскія ўпаўнаважаныя, так і прадстаўнікі СНК БССР. Пры наяўнасці ў грамадзяніна ўсіх неабходных дакументаў упаўнаважаны польскага ўрада і прадстаўнік СНК БССР сумесна прымалі рашэнне аб яго рэгістрацыі і перасяленні у Польшчу[184].

Пачатак рэгістрацыі (верасень-снежань 1944 г.) характарызуецца тым, што большасць палякаў не верыла, што ўрад БССР і ПКНВ змогуць ажыццявіць перасяленне. Яны баяліся, што пад яго прыкрыццём органы НКДБ адправяць усіх зарэгістраваных палякаў не ў Польшчу, а ў аддаленыя раёны Сібіры, Далёкага Усходу, Поўначы. Так, калі служачы з Брэста С.Кучынскі прыйшоў рэгістравацца на выезд у Польшу, то заявіў польскім упаўнаважаным, што "трэба было б запісацца на транспарт, але неяк жахліва. Каб замест Буга не павезлі на Усход"[185]. У Баранавіцкай вобласці палякі заяўлялі ўпаўнаважаным ПКНВ: "Польскі камітэт нацыянальнага вызвалення не ў стане ажыццявіць перасяленне. Органы (НКДБ. - А.В.) праводзяць рэгістрацыю для таго, каб палякаў выслаць у Сібір"[186]. Ваўкавыскі райкам партыі 29 верасня 1944 г. паведамляў Гродзенскаму абкаму партыі, што сярод часткі палякаў пануюць "антысавецкія" гутаркі і недавер да падпісанага беларуска-польскага пагаднення аб перасяленні. Так, "21 верасня 1944 г. на кватэры грамадзянкі Казлоўскай некалькі палякаў абмяркоўвалі ўмовы пагаднення. Пры яго абмеркаванні жыхар Ваўкавыска Нароўскі адзначыў наступнае: "З перасяленнем нам маняць. Здарыцца так, нас усіх, палякаў, збяруць разам, а затым замест Польшчы адправяць у Сібір. Нам, усім палякам, трэба быць вельмі асцярожнымі. Я сам бачыў, як адсюль адыходзіць Чырвоная армія. Значыць, бальшавікі тут не будуць. Тут будзе Польшча, а раз Польшча, то нам трэба чакаць"[187]. Гродзенскае райпрадстаўніцтва таксама паведамляла У.Царуку, што насельніцтва Гродна "першапачаткова адносілася да гэтага мерапрыемства (перасялення. - А.В.) з вялікім недаверам, адзначаючы, што ў Польшчу не павязуць, а ўсіх зарэгістраваных

[184] НАРБ, ф.787, воп.1, спр.23, арк.16.
[185] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.22.
[186] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.140, арк.246.
[187] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.140, арк.370.

павязуць у Сібір"[188]. Частка польскага насельніцтва разглядала распачатую перасяленчую акцыю, як праслед палякаў. Начальнік Свіслацкага РА НКУС у дакладной запісцы за апошні квартал 1944 г. адзначаў, што ўмовы перасялення, аб'яўленыя ў раёне, разглядаюцца мясцовым насельніцтвам як праслед палякаў і іх прымусовае высяленне з Беларусі[189].

На самай справе польскае насельніцтва вельмі клапаціла і турбавала неакрэсленасць сітуацыі з вызначэннем мяжы, адносінамі уладаў да палякаў і г.д. У верасні 1944 г. Ваўкавыскі райкам партыі накіраваў у ЦК КП(б)Б запіску "Аб стане Ваўкавыскага раёна да вайны і пасля вызвалення ад нямецкіх акупантаў", у якой падкрэсліваў, што "на праводзімых у горадзе і раёне сходах насельніцтва задавала амаль адны і тыя ж пытанні: ці будзе тут Польшча, які ўрад у Польшчы, дзе праходзіць граніца па лініі Керзана, калі мы не паедзем у Польшчу, то пакінуць нас тут ці вывезуць у Сібір, ці будуць у раёне польскія школы, калі пачнецца перасяленне, ці будуць даваць транспарт для перасялення і г.д."[190].

Такога кшталту пытанні, выказванні і пазіцыя чакання насельніцтва ў значнай ступені былі "справакаваны" маланкавасцю падпісання беларуска-польскага пагаднення. Справа ў тым, што пагадненне паміж СССР і ПКНВ аб савецка-польскай мяжы, што было падпісана 27 ліпеня 1944 г., нягледзячы на "часовы" характар, прадвызначыла лёс Беласточчыны, а таксама лёс соцень тысяч людзей па абодва бакі Буга. Па загаду Масквы на пачатку верасня 1944 г., г.зн. літаральна праз месяц, урад БССР распачаў перамовы з ПКНВ аб абмене насельніцтвам з тэрыторый, якія адыходзяць да Польшчы. "Звязда" паведамляла, што "ў апошнія дні паміж ПКНВ і ўрадам БССР адбыліся перамовы аб заключэнні пагаднення аб узаемнай эвакуацыі польскага насельніцтва з тэрыторыі Беларускай ССР у Польшчу і беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы ў БССР. У выніку перамоваў, якія адбываліся ў абстаноўцы ўзаемаразумення, 9 верасня ў Любліне падпісана пагадненне аб узаемнай эвакуацыі"[191].

"Узаемаразуменне" і хуткасць, з якімі рыхтавалася і падпісвалася пагадненне, прывялі да значных пралікаў, якія выпраўляліся ўжо ў час перасялення. Сур'ёзным пралікам з'явілася тое, што ні беларускі, ні польскі бакі ў верасні не змаглі ўзгадніць тэкст аб'явы аб умовах перасялення. Яго ўзгадненне зацягнулася

188 НАРБ, ф.788, воп. 1, спр.11, арк.52.
189 Рыбак Н.А. К вопросу об общественно-политической ситуации ... С.221.
190 НАРБ, ф.4, воп.42, спр.140, арк.365.
191 Звязда, 1944. 10 верасня. - С.1

аж да канца лістапада, нягледзячы на той факт, што ўжо падпісанае пагадненне прадугледжвала пачаць улік і рэгістрацыю жадаючых перасяліцца з 15 верасня 1944 г. і скончыць іх да 15 кастрычніка гэтага ж года. Канчаткова тэкст аб'явы аб умовах пагаднення быў зацверджаны на сумеснай нарадзе выконваючага абавязкі Галоўнага ўпаўнаважанага ПКНВ і Галоўнага прадстаўніка СНК БССР, што адбылася 20 лістапада 1944 г. у Баранавічах. Бакі пагадзіліся: "1. Тэкст аб'явы на польскай і беларускай мовах аб эвакуацыі адпавядае патрабаванням пагаднення паміж урадамі БССР і ПКНВ ад 9 верасня 1944 г. 2. Абвясціць польскаму і яўрэйскаму насельніцтву аб эвакуацыі шляхам вывешвання аб'яў у гарадах і населеных пунктах на беларускай і польскай мовах, а таксама размясціць тэкст аб'явы на старонках мясцовых газет"[192].

Не менш значны пралік заключаўся і ў тым, што беларускія і польскія ўлады абсалютна нерэальна вызначылі тэрмін рэгістрацыі: з 15 верасня па 15 кастрычніка 1944 г. Ва ўмовах вайны, толькі распачатага аднаўленчага перыяду падабраць неабходны склад работнікаў, стварыць арганізацыйныя структуры, падрыхтаваць неабходную дакументацыю, растлумачыць насельніцтву мэты перасяленчай акцыі і ў рэшце рэшт улічыць усіх жадаючых перасяліцца не мелася ніякай магчымасці, улічваючы нават магутны адміністрацыйны і мабілізацыйны рэсурс улады. Рэчаіснасць адразу ж даказала гэта. Так, прадстаўнікі СНК БССР па перасяленню, накіраваныя ў Брэсцкае райпрадстаўніцтва, прыехалі ў Брэст 8 лістапада, да 1 снежня займаліся арганізацыйнымі справамі і толькі 5 снежня распачалі рэгістрацыю насельніцтва, а не 15 верасня, як гэта прадугледжвалася пагадненнем[193]. Да таго ж у снежні рэгістрацыя адбывалася толькі ў Брэсце, Брэсцкім і Высокаўскім раёнах. У Камянецкім, Дзівінскім, Дамачаўскім раёнах, якія ўваходзілі ў Брэсцкае райпрадстаўніцтва, рэгістрацыя не праводзілася з-за недастатковай колькасці работнікаў, якія павінны былі займацца гэтай справай. Праца ўскладнялася і адсутнасцю неабходнай колькасці дакументацыі. Брэсцкае райпрадстаўніцтва адзначала, што "ў цяперашні час заканчваюцца ўсе бланкі, іх засталося толькі на адзін транспарт. Пры іх адсутнасці далейшую працу працягваць немагчыма. Таму просім паскорыць выдачу бланкаў усіх узораў, бо

[192] Архіў МЗС РБ, ф.907, воп.2, спр.5, арк.1.
[193] НАРБ, ф.788, воп.1, спр. 11, арк.1.

гэта з'яўляецца асноўным тормазам эвакуацыі і ўскладняе працу"[194].

Гродзенскае райпрадстаўніцтва таксама паведамляла У. Царуку, што "афіцыйна аб пачатку эвакуацыі было абвешчана 17 снежня 1944 г. шляхам вывешвання абвестак на польскай і беларускай мовах па гарадах і населеных пунктах, дзе пераважала польскае насельніцтва, а таксама сябрамі польскай камісіі сумесна з органамі мясцовай улады даводзілася інфармацыя і тлумачэнне аб парадку і ўмовах эвакуацыі"[195]. Аналагічнае становішча назіралася і ў Ваўкавыскім райпрадстаўніцтве. Яго кіраўнік у снежні 1944 г. паведамляў У.Царуку: "Да цяперашняга дня на ўчастку няма паперы і бланкаў для адпаведнай працы па правядзенню эвакуацыі польскіх грамадзян"[196]. Пінскае райпрадстаўніцтва ў лістападзе 1944 г. інфармавала У.Царука, што "ў асноўным увесь тормаз у працы заключаецца ў адсутнасці тэксту аб'явы аб умовах перасялення"[197]. Адсутнасць у насельніцтва дакладнай інфармацыі аб умовах, мэтах перасялення, панаванне шматлікіх, часта супрацьлеглых чутак адыгралі ў першыя месяцы перасялення істотную ролю. Палякі, не давяраючы ўладзе, устрымліваліся ад рэгістрацыі, насцярожана і з недаверам ставіліся да распачатага працэсу перасялення.

Недавер і насцярожанасць яскрава праявіліся ў час адпраўкі першых эшалонаў з перасяленцамі ў Польшчу. Так, калі 27 снежня 1944 г. першы цягнік з 14 сем’ямі адпраўляўся з Брэста ў Польшчу, то на чыгуначным вакзале сабраўся вялікі натоўп палякаў, якія назіралі за напрамкам руху цягніка - на Захад ці на Усход[198]. Пераканаўшыся, што ў сапраўднасці цягнік накіраваўся ў Польшчу, палякі пачалі масава рэгістравацца на выезд. У выніку толькі за студзень 1945 г. з Брэсцкага райпрадстаўніцтва, у якое ўваходзіла 9 раёнаў (Брэсцкі, Высокаўскі, Камянецкі, Кобрынскі, Жабінкаўскі, Маларыцкі, Антопальскі, Дзівінскі, Дамачаўскі) на перасяленне зарэгістравалася звыш 1000 сем’яў[199].

Калі з Брэста першыя перасяленцы выехалі 27 снежня 1944 г., то адзін з самых першых эшалонаў у Польшчу адправіўся з Баранавіч 2 снежня 1944 г. Цягнік, які налічваў 36 вагонаў, накіроўваўся ў двух напрамках: 26 вагонаў, у якіх пераязджала 91 гаспадарка агульнай колькасцю 227 чалавек, адпраўляліся ў бок

---

[194] Там сама, арк.2.
[195] Там асама, арк.52.
[196] Там сама, арк.119.
[197] Там сама, арк.333.
[198] Там сама, арк.20.
[199] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.8, арк.191.

Любліна, 10 вагонаў з 38 гаспадаркамі, якія налічвалі 76 чалавек, накіроўваліся ў раён Беластока[200]. Эшалон быў падрыхтаваны да адпраўкі ў 20 гадзін вечара, аднак адправіўся з Баранавіч толькі ў 3 гадзіны ночы 3 снежня. У 17 гадзін цягнік прыбыў у Брэст і пасля належнага мытнага дагляду і праверкі дакументаў у палове сёмага вечара гэтага ж дня праз КПП Брэст перасек дзяржаўную савецка-польскую мяжу.

Вось так студзёным снежаньскім вечарам без усялякіх урачыстых провадаў, афіцыйных прамоваў ужо былыя грамадзяне БССР назаўсёды пакінулі так і не стаўшую для іх Радзімай Беларусь і накіраваліся на новую Радзіму. Што ў гэты час адчувалі перасяленцы ? Хваляванне ад сустрэчы з новай Радзімай, новымі мясцінамі ці тугу і смутак ад развітання са сваёй малой Бацькаўшчынай, магіламі продкаў, суседзямі, роднымі, сваякамі ? Шкадаванне аб збіранай і назапашанай гадамі цяжкай працы не аднаго пакалення маёмасці, большасць якой даводзілася пакідаць "саветам" ? Палеткамі, дзе руплівому і працавітаму гаспадару быў знаёмы кожны метр сваёй уласнай зямлі, домам, што быў пабудаваны ўласнымі рукамі і за ўласныя грошы ?

Ці, наадварот, адчуваліся радасць і палёгка ад таго, што назаўсёды пакідалі і пазбаўляліся ад камуністычнага рэжыму з яго бесчалавечнымі і здзеклівымі праявамі - масавымі арыштамі і дэпартацыямі, рэлігійным і нацыянальным пераследам ? Пачынаючымі ствараццa калгасамі і саўгасамі, у якіх, як у "чорных дзірках", знікала крывёю і ўласным мазалём назапашанае дабро ? Бясконцымі дзяржаўнымі пазыкамі, займамі, непамернымі падаткамі, якія непад'ёмным цяжарам ляглі на плечы аднаасобніка ? Прымусовымі наборамі і мабілізацыямі на працу ў Сібір, на Далёкі Усход, Урал, ад якіх прыходзілася хавацца ці самому, ці хаваць сваіх дачок і сыноў ?

Цяжка адказаць на гэтыя няпростыя пытанні, але хутчэй за ўсё была шматлікасць пачуццяў. Няпростасць выбару: ехаць ці заставацца, абумоўлівала іх - ад тугі і горычы, да радасці і палёгкі.

Калі з Брэста, Баранавіч, Стоўбцаў першыя эшалоны з палякамі адправіліся ў Польшчу ў снежні 1944 г., то, напрыклад, з Навагрудка першы цягнік адправіўся толькі 15 студзеня 1945 г. Гэта тлумачылася тым, што толькі ў студзені ў Навагрудак сталі паступаць вагоны для перавозкі насельніцтва і яго маёмасці[201]. За гэтымі першымі эшалонамі ў Польшчу накіраваліся тысячы

[200] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.4, арк.6.
[201] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.130.

эшалонаў з палякамі, якія не пажадалі жыць у камуністычнай Беларусі.

Такім чынам, снежань 1944 г. з'явіўся пераломным пакуль што для дзесяткаў тысяч палякаў, якія прынялі для сябе канчатковае рашэнне - рэгістравацца і ехаць. Псіхалагічна пайсці на прыняцце такога рашэння было надзвычай цяжка, бо наперадзе была невядомасць: яшчэ працягвалася Другая сусветная вайна, на календары быў снежань з маразамі і завеямі (вядома ж, летам лягчэй і пераязджаць і ўладкоўвацца на новым месцы), дакладна не было вядома, куды павязуць і як сустрэнуць на новым месцы. Дзе давядзецца жыць, якую і колькі атрымаюць зямлі. Бясконцыя пытанні, заданыя самому сабе, і такія ж бясконцыя разважанні - ехаць ці заставацца. У рэшце рэшт ваганні і сумненні былі адкінуты, цяжкасці не палохалі. Перамагло адно - рэгістравацца і ехаць у Польшчу. Выбар быў зроблены.

www.kamunikat.org

## Глава 3.
## Пад пільным чэкісцкім наглядам

Працэс перасялення адразу ж трапіў пад пільны кантроль НКДБ і НКУС БССР, супрацоўнікі якога неаднаразова праводзілі праверкі дакументаў, маёмасці і г.д. Падбор і прызначэнне прадстаўнікоў СНК БССР па перасяленню сведчылі аб гэтым. Большасць з іх раней працавала ў органах НКДБ і НКУС ці ўзначальвала асобыя аддзелы партызанскіх атрадаў у час вайны. Так, намеснікам Галоўнага прадстаўніка СНК БССР па перасяленню У.Царука з'яўляўся П.Алышаў, які раней працаваў старшым аператыўным упаўнаважаным 3 аддзялення 1 аддзела 2 упраўлення НКДБ БССР, а памочнікам М.Елісееў - намеснік начальніка аднаго з аддзелаў НКУС БССР[202]. Слонімскае райпрадстаўніцтва ўзначаліў А.Сцепчанка - былы начальнік асобага аддзела Стаўбцоўскага партызанскага межрайцэнтра. Памочнікамі Я.Захарава, кіраўніка Навагрудскага райпрадстаўніцтва, з'ўляліся І.Няверaў - аператыўны ўпаўнаважаны крымінальнага вышуку упраўлення НКУС рэспублікі і Р.Эверт - аператыўны ўпаўнаважаны Мірскага РА НКДБ. У Картуз-Бярозе перясяленнем "кіраваў" А.Іваноў - старшы ўпаўнаважаны 2 аддзялення 2 аддзела НКДБ. Брэсцкае райпрадстаўніцтва ўзначальваў М.Траян - начальнік 2 аддзялення 2 аддзела НКДБ Магілёўскай вобласці. Калі райпрадстаўніцтва ўзначальваў "цывільны", то ў "дапамогу" яму прызначалі супрацоўнікаў спецслужбаў. Гэта мела месца ў Ашмянскім райпрадстаўніцтве, якім кіраваў супрацоўнік апарата Галоўнага прадстаўніка СНК БССР па перасяленню І.Перфілаў. Аднак намеснікам ў яго з'яўляўся М.Саланцоў - намеснік начальніка 5 аддзялення 2 аддзела НКДБ Гомельскай вобласці. Глыбоцкае райпрадстаўніцтва таксама ўзначальваў "усходнік" І.Дружчыц, які працаваў намеснікам начальніка 3 аддзялення 2 аддзела Гомельскага НКДБ. Пэўным выключэннем з'ўляліся кіраўнікі Ваўкавыскага, Пінскага і Гродзенскага прадстаўніцтваў па перасяленню, якія раней працавалі: І.Дабрыян - старшынёй Слонімскага, У. Пуцята - старшынёй Кастрычніцкага райвыканкамаў, Г.Дарожка ў час вайны камандаваў партызанскім злучэннем[203].

[202] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1916, арк.105.
[203] Там сама, арк. 107-115.

Такая колькасць прадстаўнікоў спецслужбаў у апаратах упаўнаважаных па перасяленню, па-першае, была невыпадковай, па-другое – была ініцыявана не беларускім, а саюзным кіраўніцтвам. 17 верасня 1944 г. наркам НКУС СССР Л.Берыя выдаў загад наркаму НКУС БССР С.Бельчанку і начальніку пагранічных войскаў Беларускай акругі К.Антонаву аб парадку эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі БССР. У загадзе падкрэслівалася: "Для забеспячэння выканання пагаднення паміж Польскім Камітэтам Нацыянальнага Вызвалення і Урадам БССР аб эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі БССР загадваю: 1. Па ўзгодненасці з СНК БССР выдзеліць у якасці намесніка Галоўнага упаўнаважанага СНК БССР у Любліне Вашага намесніка ці другога адказнага работніка НКУС БССР, а таксама ў якасці намеснікаў раённых упаўнаважаных СНК БССР на тэрыторыі Польшчы вопытных аператыўных работнікаў НКУС БССР, прыдаўшы ім неабходную колькасць аператыўных работнікаў. На выдзеленых прадстаўнікоў НКУС БССР ускласці задачу – удзельнічаючы ў рэгістрацыі і адборы належачых эвакуацыі ў БССР асоб, не дапускаць пранікнення на тэрыторыю БССР удзельнікаў нацыяналістычных арганізацый, шпіёнаў і памагатых нямецкіх акупантаў, а таксама асоб, эвакуацыя якіх у Савецкі Саюз непажадана. 2. Аказваць прадстаўнікам СНК БССР пры польскіх упаўнаважаных на тэрыторыі БССР сіламі органаў НКУС неабходную дапамогу ў праводзімай імі працы па складанню спісаў грамадзян, якія належаць эвакуацыі ў Польшчу, былых да 17 верасня 1939 г. польскіх грамадзян, палякаў і яўрэяў, выдзеліўшы дзеля гэтай мэты раённым упаўнаважаным па аднаму аператыўнаму работніку НКУС БССР. Не дапускаць уключэння ў спіскі належачых да эвакуацыі ў Польшчу асоб, якія не маюць на гэта права, асоб, якія вышукваюцца органамі НКУС, НКДБ і СМЕРШ, а таксама ўсіх іншых асоб, выезд якіх з Савецкага Саюза па аператыўных меркаваннях будзе непажаданым"[204]. Як вынікае з загада Л.Берыі, на работнікаў НКУС, якія прызначаліся "на дапамогу" упаўнаважаным СНК БССР, ускладаліся важныя задачы: ад кантролю за ўлікам і рэгістрацыяй насельніцтва да правядзення аперацый па недапушчэнню пранікнення ў Беларусь «непажаданага элемента».

[204] Освобождённая Беларусь.… С.184.

Нягледзячы на пэўную прысутнасць "усходнікаў", абсалютную большасць супрацоўнікаў апаратаў Галоўнага і раённых прадстаўнікоў па перасяленню складалі работнікі, якія партызанілі ці раней працавалі ў заходніх абласцях. Гэта быў абгрунтаваны і лагічны падыход колішняй улады да падбору і прызначэння работнікаў, бо яны лепш ведалі і "разбіраліся" у спецыфіцы працы сярод насельніцтва заходняга рэгіёна Беларусі і маглі больш эфектыўна ажыццяўляць перасяленчую акцыю.

Значная "прысутнасць" работнікаў спецслужбаў у прадстаўніцтвах, з аднаго боку, тлумачылася тым, што таталітарная ўлада не магла пакінуць без кантролю працэс перамяшчэння соцень тысяч людзей, тым больш што яшчэ не скончылася вайна. У сувязі з гэтым на сілавыя органы была ўскладзена задача не толькі забеспячэння аховы насельніцтва, якое перасялялася ў абодвух накірунках, але і "ўзяцце на аператыўны ўлік тых, хто перасяліўся з Польшчы ў БССР, а таксама стварэння з іх ліку неабходнай колькасці агентуры з мэтай паўсядзённага назірання за імі" (перасяленцамі. - А.В.)[205].

З другога - няпростасцю грамадска-палітычнай сітуацыі, якая склалася ў заходнім рэгіёне Беларусі ў заключны перыяд Другой сусветнай вайны і першыя пасляваенныя гады. Галоўным чынам гэта было звязана з дзейнасцю польскага падполля, а таксама панаваннем ў значнай часткі насельніцтва, як палякаў так і беларусаў, антысавецкіх настрояў. Так, па афіцыйных дадзеных, у Заходняй Беларусі 70% вёсак з перавагай польскага насельніцтва былі негатыўна настроены да савецкай улады і знаходзіліся пад уплывам польскіх падпольных структур і ў першую чаргу Арміі Краёвай[206]. Аб тым, што гэта было на самай справе так, сведчыць паведамленне Жалудоцкага РК КП(б)Б, накіраванае у ЦК КП(б)Б 25 верасня 1944 г., у якім падкрэслівалася, што "75-80% палякаў з'яўляюцца праціўнікамі мерапрыемстваў савецкай улады. З прыходам ў раён часцей Чырвонай Арміі ваеннаабавязанае польскае насельніцтва ў большасці сышло ў лес і ўзброілася. Як толькі пачалася мабілізацыя ў армію, палякі рознымі шляхамі ўхіляюцца ад яе"[207]. Гэтае ж самае адзначаецца і ў паведамленні Л.Берыі, якое ён накіраваў у ліпені 1944 г. І.Сталіну, В.Молатаву і Г.Малянкову. Л.Берыя падкрэсліваў, што «значная колькасць палякаў адмоўна і варожа ставіцца да ўстанаўлення савецкай

---

[205] Рыбак Н.А. Деятельность Армии Крайовой и постаковских формирований в Западной Белоруссии в 1944-1954 гг. Дис...канд. ист. наук: 07.00.02.-Минск, 2001.-С.30.
[206] Рыбак Н. К вопросу об общественно-политической ситуации ...С.222
[207] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.140, арк.298.

улады на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці. Маюць месца варожыя праявы палякаў да польскага войска – да арміі Берлінга і да створанага Камітэта нацыянальнага вызвалення Польшчы»[208].

"Прысутнасць" супрацоўнікаў НКДБ і НКУС у прадстаўніцтвах СНК БССР па перасяленню абумоўлівалася таксама неабходнасцю каардынацыі працы спецорганаў па выяўленню і недапушчэнню легальнага выезду за мяжу ўдзельнікаў польскага падполля. Вось што адзначаў наконт гэтага начальнік пагранічных войскаў НКУС Беларускай ваеннай акругі генерал-маёр К. Антонаў у спецпаведамленні "Аб аператыўнай абстаноўцы ў пагранічных раёнах Беларускай пагранічнай акругі" (1.12.45 г.): "Акрамя прамых спроб банд узброеным шляхам прарвацца за мяжу, кіраўніцтвам АК шырока выкарыстоўваюцца легальныя магчымасці выезду ў Польшчу. Апошнія вельмі часта выязджаюць па фіктыўных дакументах, якія атрымоўваюць у савецкіх і польскіх органах па эвакуацыі і рэпатрыяцыі. Акрамя таго, жадаючы вывесці з-пад аператыўнага ўдара расканспіраваныя банды і кіраўнікоў АК, камандаванне АК у сваіх майстэрнях вырабляе фальшывыя эвакадакументы, па якіх яны легальна выязджаюць у Польшчу, дзе ўладкоўваюцца на жыхарства. Так, на КПП Ласосна ў жніўні-верасні гэтага года было затрымана 28 чалавек з такімі дакументамі, якія зроблены ў майстэрні Віленскага абводу АК. Усе затрыманыя з'яўляюцца жыхарамі Маладзечанскай вобласці БССР і Літоўскай ССР"[209]. У час перасяленчай акцыі - неаднаразовыя спробы падробкі дакументаў і праезду ў Польшчу па фальшывых дакументах выкарыстоўвала не толькі падполле, але і грамадзяне, якія ў выніку розных прычын не маглі легальна выехаць у Польшчу. Так, кіраўнік Гродзенскага райпрадстаўніцтва У.Пуцята ў лістападзе 1945 г. паведамляў У.Царуку, што з транспарту, які быў адпраўлены з Ліды 8 лістапада 1945 г., супрацоўнікі Лідскага РА НКДБ знялі з поезда 15 перасяленцаў з падробленымі дакументамі і без дакументаў[210]. Супрацоўнікі НКДБ таксама арыштоўвалі палякаў, якія ўжо мелі дакументы на выезд у Польшчу, але па нейкіх прычынах выклікалі падазрэнне ці на іх меўся кампраметуючы матэрыял. Не пазбягалі арыштаў і польскія ўпаўнаважаныя. Так, намеснік райпрадстаўніка ў Пінску ў кастрычніку 1945 г. паведамляў

---

208 Освобождённая Беларусь… С.144.
209 НАРБ, ф.4, воп. 29, спр.814, арк.196.
210 НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.66.

У.Царуку, што супрацоўнікі НКУС арыштавалі ўпаўнаважанага Польшчы па Ганцавіцкаму раёну[211].

Тыя, хто не быў упэўнены ў магчымасці легальнага пераходу, спрабавалі з боем прарвацца праз мяжу. К. Антонаў адзначаў, што “з тэрыторыі Літоўскай ССР і тылавых раёнаў БССР мела месца спроба 3 узброеных банд да прарыву за кардон. З іх ліку 2 банды былі разгромлены поўнасцю ў нашай пагранпаласе, а бандзе “Лялюс”, якая ішла з раёна Вільні, ўдалося прарвацца за кардон, але паблізу мяжы прынятымі мерамі з боку 16 і 84 пагранатрада банда часткова была разгромлена. Пры гэтым было забіта 13 і захоплена – 7 чалавек”[212]. Безумоўна, улічваючы гэты фактар, партыйна-савецкае кіраўніцтва БССР вымушана было пайсці на такі крок і літаральна “нашпігаваць” райпрадстаўніцтвы па перасяленню супрацоўнікамі спецслужбаў.

Не давяраючы і кантралюючы работу ўпаўнаважаных ПКНВ і прадстаўнікоў СНК БССР па перасяленню, супрацоўнікі НКДБ рэгулярна праводзілі праверкі дакументаў, маёмасці перасяленцаў. Неаднаразова такого кшталту праверкі заканчваліся арыштамі. Так, прадстаўнік СНК БССР па Брэсцкаму райпрадстаўніцтву І.Траян у лютым 1945 г. паведамляў У.Царуку, што "з боку органаў НКДБ былі дапушчаны наступныя ненармальнасці (так у тэксце. - А.В.). 1.12.44 г. арыштаваны член камісіі Пахасінская без наяўнасці матэрыялаў, якія з'яўляюцца асновай для яе арышту. На наступны дзень яна была вызвалена. 28.12 у эшалоне быў арыштаваны грамадзянін Турэцкі толькі за тое, што на яго была справа за самагонаварэнне. У г. Высокім працаваў механік Іосіф Васецкі, які ў сувязі з эвакуацыяй быў звольнены 25 снежня 1944 г. 2 студзеня 1945 г. перастала працаваць дынама-машына на млыне, дзе раней працаваў І.Васецкі. Начальнік райаддзела НКДБ Тарасаў даганяе эшалон на станцыі Чаромха і арыштоўвае Васецкага і адначасова арыштоўвае Паднасенскага і Гашэўскага, якія да эвакуацыі працавалі на іншых млынах".[213]

Праверкі дакументаў і арышты перасяленцаў сталі звычайнай практыкай работы супрацоўнікаў НКДБ. Так, супрацоўнікі транспартнага аддзела НКДБ Брэст-Літоўскай чыгункі, не паведаміўшы ўпаўнаважаных ПКНВ і прадстаўнікоў СНК БССР па перасяленню, у Баранавічах пачалі праверку дакументаў у ад'язджаючых. Больш таго, у час праверкі арыштавалі аднаго паляка, што выклікала масавае незадавальненне людзей. Вось што

[211] Там сама, арк.341.
[212] Там сама, арк.196.
[213] Там сама,, арк.4.

паведамляў К.Кісялёву Галоўны прадстаўнік СНК БССР па перасяленню У.Царук, рэагуючы на такога кшталту дзеянні супрацоўнікаў НКДБ: «2 снежня 1944 г. намі быў падрыхтаваны да адпраўкі за мяжу ў Польшчу эшалон з грамадзянамі польскай нацыянальнасці, якія пажадалі эвакуіравацца ў Польшчу. У час афармлення дакументаў, прыкладна ў 2-3 гадзіны ночы, без усялякага дазволу ў гэты эшалон з'явіліся ўзброеныя супрацоўнікі транспартнага аддзела НКДБ Брэст-Літоўскай дарогі на станцыі Баранавічы, пад кіраўніцтвам маёра дзяржбяспекі т. Ліпаўка, якія, не папярэдзіўшы майго памочніка т. Елісеява, які суправаджаў эшалон, самавольна пачалі праводзіць у вагонах праверку дакументаў. У адным з вагонаў арыштавалі грамадзяніна Трысцяня. Прычым гэта было зроблена дэманстратыўна і так няўмела і груба, што выклікала масавае незадавальненне палякаў. Даведаўшыся аб гэтым інцыдэнце, т. Елісеяў выйшаў да эшалона, дзе сустрэў супрацоўнікаў НКДБ. Ён далажыў, хто ён такі, і патрабаваў у іх дакументы на права праверкі эшалона. Аднак замест дакументаў маёр Ліпаўка, які ўзначальваў гэтую групу, заявіў яму наступнае: «Калі вы не пакінеце нас, то мы выкінем вас з вагона. Мы самі гаспадары і маем права правяраць кожны эшалон, і на гэта нам не патрэбны ніякія дакументы»[214]. Неабходна аддаць належнае прынцыповасці і, без перабольшання, смеласці памочніка Галоўнага прадстаўніка СНК БССР Елісеява, які актыўна ўмяшаўся ў гэты інцыдэнт і настаяў, каб супрацоўнікі НКДБ прыпынілі незаконныя дзеянні і пакінулі эшалон. Толькі пасля гэтага эшалон змог адправіцца ў дарогу[215].

Такога кшталту дзеянні вымусілі У.Царука накіраваць намесніку Старшыні СНК БССР К.Кісялеву запіску, у якой паведамлялася, што "ў нашай працы сустракаюцца неаднаразовыя факты, калі органы НКДБ і НКУС арыштоўваюць польскіх грамадзян, якія пажадалі выехаць у Польшчу і ўжо аформленых на эвакуацыю. Прычым, арышты праводзяцца ў эшалонах адкрыта, на вачах у другіх палякаў, якія падрыхтаваны да адпраўкі за мяжу"[216]. Ён прыводзіў факт арышту 2 студзеня 1945 г. супрацоўнікамі Брэсцкага райаддзела НКДБ на станцыі Чаромха трох палякаў, якіх праз суткі вызвалілі з-пад арышту з-за адсутнасцю віны. У. Царук паведамляў, што "супрацоўнікі НКДБ не паклапаціліся перакінуць іх (арыштаваных - А.В.) за мяжу, хоць усе яны мелі эвакадакументы, ці хоць бы паведаміць аб гэтым

[214] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.4, арк.10.
[215] Там сама, арк.10.
[216] Там сама, арк.18.

раённым прадстаўнікам СНК і ўпаўнаважаным ПКНВ, бо фактычна людзей пакінулі на волю лёсу"[217]. Аналагічнае адбывалася ў Слуцкім, Гродзенскім ды іншых раёнах. У.Царук настойліва прасіў К.Кісялёва аб тым, каб ён, як намеснік Старшыні СНК БССР, хадайнічаў перад кіраўніцтвам НКДБ аб забароне праводзіць арышты, бо яны "нервуюць людзей, негатыўна характарызуюць палітыку партыйных і савецкіх уладаў па перасяленню".

Сумесная праца прадстаўнікоў СНК БССР па перасяленню ажыццяўлялася і ў напрамку выкрыцця агентуры польскага падполля, вядзення агітацыі супраць перасялення і г.д. Так, кіраўнік Глыбоцкага райпрадстаўніцтва ў красавіку 1945 г. паведамляў У.Царуку, што "сумесна з органамі НКДБ намецілі шэраг мерапрыемстваў па выкрыццю контррэвалюцыйнай прапаганды і вярбоўкі з боку польскай агентуры"[218].

НКДБ таксама праводзіў рэгулярныя "аперацыі" па арышту палякаў, якія па розных прычынах хаваліся ў лясах і жадалі выкарыстаць перасяленне для легальнага выезду ў Польшчу або для прызыву ў Польскую армію. Памочнік С.Вішнеўскай паведамляў аб тым, што начальнік Глыбоцкага РА НКДБ патрабаваў ад намесніка акруговага ўпаўнаважанага ПКНВ па Глыбоцкаму райпрадстаўніцтву бланкі заяў з пячаткай польскага ўпаўнаважанага. Гэта патрабавалася для таго, каб накіраваць у лес, дзе хавалася значная колькасць "дэзерціраў", супрацоўніка НКДБ. Ён павінен быў пераканаць іх у тым, што калі яны выйдуць з лесу, то не будуць арыштаваныя, а адпраўленыя ці ў польскую армію, ці ім дадуць магчымасць бесперашкодна выехаць у Польшчу. Бланкі ўпаўнаважаных ПКНВ павінны былі гарантаваць гэта. Аднак у сапраўднасці "дэзерціраў" арыштавалі. Аналагічнае адбылося і ў Радашковічах. Калі падпаручык польскай арміі Ч.Садоўскі, па дамоўленасці з раённым ваенкаматам, вывеў з лесу каля 500 "дэзерціраў" для наступнай іх адпраўкі ў польскую армію, то замест накіравання на прызыўны пункт Ч.Садоўскі і ўсе выведзеныя ім людзі былі арыштаваны органамі НКДБ[219].

Аналагічная сітуацыя склалася ў Баранавічах. Так, райпрадстаўнік СНК БССР у Баранавічах паведамляў У.Царуку, што да яго з'явіліся тры прадстаўнікі "банды", якая знаходзілася ў Быценскім лесе і налічвала каля 200 чалавек. Прадстаўнікі "банды" патрабавалі прадаставіць ім гарантыі легальнага перасялення ў

[217] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.4, арк.18.
[218] Там сама, арк.280.
[219] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.5, арк.20.

Польшчу. У.Царук рэкамендаваў райпрадстаўніку даць такія гарантыі, аднак пры ўмове, што яны раззброяцца і выйдуць з лесу. Разам з тым ён настойліва параіў яму тэрмінова звязацца з кіраўніцтвам абласнога ўпраўлення НКДБ і "прапрацаваць" усе мерапрыемствы, звязаныя з узнікшай сітуацыяй[220]. Гісторыя з палякамі, якія хаваліся ў Быценскім лесе, пачаўшаяся вясной 1945 г. працягвалася аж да канца гэтага года. Намеснік кіраўніка Слонімскага райпрадстаўніцтва 23 лістапада 1945 г. паведамляў Галоўнаму прадстаўніку СНК БССР па перасяленню У.Царуку: "Паведамляю Вам, што ў камісію па эвакуацыі ў Быценскім раёне з'явіліся польскія грамадзяне, якія хаваліся ў лесе - Бутрым Б., Каласоўскі А., Шавель С. Па майму патрабаванню яны здалі зброю, і пасля гэтага я выпісаў дакументы на эвакуацыю і выдаў толькі аднаму С.Шавелю, які выехаў з транспартам 8 лістапада 1945 г. Астатнім не выдаў у сувязі з пратэстам Быценскага РА НКДБ у асобе малодшага лейтэнанта Камарова, які запратэставаў, і я ўстрымаўся ад выдачы дакументаў на эвакуацыю. У час праходжання эшалона з эвакуіраванымі, у якім ехаў С.Шавель, на станцыі Быцень эшалон быў правераны, бо шукалі С.Шавеля. Пасля адпраўкі транспарта, 18 лістапада 1945 г., да мяне прыехаў Камароў і прапанаваў, каб я гэтых дэзерціраў выклікаў да сябе на кватэру вечарам, і ён арыштуе іх у мяне на кватэры. На гэтую прапанову я не пагадзіўся. Прашу Вашага ўмяшальніцтва і прашу даць мне дакладныя ўказанні"[221]. На жаль, у Нацыянальным архіве РБ не ўдалося выявіць дакументы, якія б сведчылі аб далейшым лёсе тых, хто хаваўся ў Быценскім ды іншых лясах, раззброіўся і паспрабаваў выехаць у Польшчу, скарыстаўшы перасяленчую акцыю.

У лясах па розных прычынах і, у прыватнасці, каб пазбегнуць прызыву ў Чырвоную Армію, прымусовых аргнабораў на працу па-за межы рэспублікі, хавалася шмат палякаў. Так, па дадзеных Сапоцкінскага райваенкамата (Гродзенская вобласць), у кастрычніку 1944 г. з "700 прызыўнікоў на мабілізацыйны пункт з'явіліся толькі адзінкі, бо мужчыны, якія падлягаюць мабілізацыі, хаваюцца ў навакольных лясах, у сваякоў. Толькі з дапамогай 25 чырвонаармейцаў, якія прыбылі з Гродна, удалося з дапамогай зброі прывесці ў ваенкамат 200 чалавек"[222]. У спецпаведамленні ЦК КПб)Б "Аб палажэнні ў Іўеўскім і Юрацішскім раёнах Баранавіцкай вобласці" (жнівень 1944 г.) адзначалася, што "пад

[220] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.8, арк.123.
[221] НАРБ, 788, воп.1, спр.11, арк.325.
[222] НАРБ, ф.4, воп. 42, спр.375, арк.63.

уздзеяннем агітацыі (польскага падполля. - А.В.) з Іў'еўскага і Юрацішскага раёнаў ні адзін паляк у Чырвоную армію не пайшоў. З мястэчка Іўе ў першыя дні кастрычніка было мабілізавана 300 палякаў, аднак на шляху ў Ліду ўсе яны разбегліся". Тое ж самае назіралася ў Відзаўскім раёне Полацкай вобласці, у якім, па дадзеных раённага ваенкамата, у красавіку 1945 г. хавалася аб мабілізацый і прызываў у Чырвоную Армію каля 260 палякаў ва ўзросце да 50 год[223].

Адмаўляючыся служыць у Чырвонай Арміі, палякі масава выказвалі жаданне служыць у Войску Польскім. Так, Гродзенскі АК КП(б)Б паведамляў у ЦК КП(б)Б (лістапад 1944 г.), што "мабілізацыя ў Чырвоную Армію ў г. Гродна праходзіла нездавальняюча, галоўным чынам за кошт польскага насельніцтва. У шырокіх памерах мела месца нез'яўленне палякаў на мабілізацыйныя пункты. Аднак, калі мабілізаваных палякаў пачалі накіроўваць на фарміровачныя пункты ў Польшчы, адносіны палякаў да мабілізацыі рэзка змяніліся. Замест ухілення і дэзерцірства ў гарваенкамат сталі прыходзіць добраахвотна са зваротамі залічыць іх у польскую армію (да 50 штодзённа)"[224]. Аналагічная сітуацыя склалася і ў шэрагу раёнаў Маладзечанскай вобласці. Так, начальнік Свірскага РА НКДБ паведамляў, што "аб значным уплыве польскіх нацыяналістаў на насельніцтва сведчыць той факт, што большасць моладзі раёна пайшло ў польскую армію, а не ў Чырвоную. Значная частка прызыўнога кантынгенту наогул ухілілася ад мабілізацыі"[225].

У пэўнай ступені гэтую сітуацыю выкарыстала падполле. Так, сакратар Свірскага райкама партыі Д.Мартыненка ў лістападзе 1944 г. накіраваў сакратару Маладзечанскага АК КП(б)Б І.Клімаву запіску, у якой паведамляў, што "мужчыны прызыўнога ўзросту ў адзіночку і цэлымі групамі па 15-20 чалавек накіроўваюцца ў Вільню, дзе так званы "Саюз польскіх патрыётаў" у СССР накіроўвае іх у польскую армію. У выніку гэтага вялікая колькасць працаздольных мужчын Касцевіцкага, Каранецкага, Камялішскага і шэрагу іншых сельсаветаў адышла ў Вільню"[226]. На самай справе палякі прызыўнога ўзросту атрымлівалі з Вільні даведкі, якія былі выдадзеныя "Ваенным аддзелам рэспубліканскага праўлення СПП у ЛатССР"[227]. Аднак, як

[223] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.828, арк.41.
[224] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.375, арк.62.
[225] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.150, арк.99.
[226] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.375, арк.53.
[227] Там сама, арк.51-52.

высветлілі ў ЦК КП(б)Б, гэтыя даведкі, як і дзейнасць "СПП у Вільні", "з'яўлялася адным з метадаў работы контррэвалюцыйных груп польскіх нацыяналістаў, скіраваных на зрыў праводзімых палітычных мерапрыемстваў, стварэннем белапольскіх банд для барацьбы супраць савецкай улады"[228]. Улічваючы гэтую сітуацыю, ЦК КП(б)Б падкрэсліў, што мабілізацыю ў Чырвоную Армію і Войска Польскае на тэрыторыі БССР праводзяць толькі райваенкаматы, незалежна ад нацыянальнасці грамадзян, а СПП не мае права гэтага рабіць.

Разглядаючы гэты аспект перасялення, неабходна мець на ўвазе, што палякі прызыўнога ўзросту разумелі, што прызыў у Чырвоную Армію, а таксама мабілізацыі на працу па-за межы рэспублікі на неакрэслены тэрмін аддаляе іх выезд у Польшчу, а ў будучым, улічваючы абмежаванасць тэрміну перасялення, робіць гэтую магчымасць праблематычнай. Таму страх крымінальнай адказнасці за ўхіленне ад прызыву ў Чырвоную Армію вымушаў палякаў хавацца ў навакольных лясах, у сваякоў і блізкіх і ў такіх умовах шукаць магчымасці легальнага выезду ў Польшчу.

Наяўнасць значнай колькасці людзей, якія хаваліся ў лясах і разглядаліся спецслужбамі як "варожы элемент", якога аўтаматычна прылічвалі да польскага падполля, вымушала органы НКДБ і НКУС праводзіць супраць іх рэгулярныя карныя аперацыі. Так, у Брэсцкай вобласці ў снежні 1945 г. органы НКУС і НКДБ правялі "аперацыю па выяўленню і арышту варожага польскага элемента". Пасля яе правядзення прадстаўнікі СНК БССР па перасяленню адзначалі, што "настроі насельніцтва (польскага. - А.В.) рэзка змяніліся ў бок выезду"[229]. Аналагічную аперацыю НКУС і НКДБ таксама ў снежні правялі ў Пінскай вобласці[230].

Перасяленчая акцыя, што адбывалася ва ўмовах Другой сусветнай вайны, актыўнай дзейнасці польскага падполля, панавання сярод насельніцтва антысавецкіх настрояў, не магла застацца па-за ўвагай спецслужбаў. Літаральна ўсе бакі перасяленчага працэсу: падбор і прызначэнне работнікаў, праверка дакументаў і маёмасці перасяленцаў, аператыўны ўлік і назіранне за імі, барацьба з польскім падполлем, вярбоўка агентуры з ліку перасяленцаў і г.д. знаходзіліся "пад пільным чэкісцкім наглядам".

[228] Там сама, арк.48.
[229] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.193.
[230] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1918, арк.212.

## Глава 4.
## Выбар зроблены: у Польшчу

Польскае насельніцтва, пераканаўшыся ў цвёрдасці намераў урадаў БССР і Польшчы правесці перасяленне ў адпаведнасці з умовамі Пагаднення, на пачатку 1945 г. пачало масава рэгістравацца на выезд. Рэгістрацыя вызначыла сукупнасць фактараў, якія вымушалі палякаў ад'язджаць з Беларусі. Найбольш значнымі з'яўляліся сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя, этнічныя, канфесійныя, міжнародныя, роднасныя ды іншыя. Усе яны дзейнічалі адначасова як паасобку, так і сукупна.

Для аднаасобнага сялянства непрымальнай стала палітыка савецкай улады ў галіне сельскай гаспадаркі, скіраваная на правядзенне прымусовай калектывізацыі і стварэнне калгасна-саўгаснай сістэмы, высокія стаўкі падаткаў, штогадовыя дзяржаўныя пазыкі, прымусовыя аргнаборы на працу па-за межы рэспублікі і г.д. Нягледзячы на той факт, што ў 1944-1946 гг. прымусовая калектывізацыя яшчэ не распачалася, тым не менш аднаасобнік адчуваў яе непазбежнасць. Так, у дакладной запісцы брыгады Наркамзема СССР “Аб стане кадраў сельскіх саветаў у Дзятлаўскім, Ляхавіцкім і Лідскім раёнах Баранавіцкай вобласці” (11 жніўня 1944 г.) адзначалася, што “асабліва варожа насельніцтва ставіцца да калгасаў, палохаючыся, што ў бліжэйшай перспектыве яны павінны будуць аб’ядноўвацца ў калгасы, што іх індывідуальнай гаспадарцы прыходзіць канец”[231]. Гродзенскі райкам партыі паведамляў ў Гродзенскі АК КП(б)Б (ліпень 1945 г.), што "на выезд у Польшчу запісваюцца грамадзянне, якія разумеюць, што на тэрыторыі Савецкай дзяржавы будуць ствараюцца калгасы, а яны не жадаюць калгаснага ладу"[232].

Аднаасобнае сялянства пры рэгістрацыі адкрыта заяўляла аб сваім нежаданні працаваць ў калгасах. Так, сялянка вёскі Орцы Павяцкага сельсавета Міёрскага раёна М.Арцімовіч заявіла, што "многія з нас запісаліся палякамі таму, што тут жадаюць ствараць калгасы, а мы іх не жадаем, і калі ўсе пададуць заявы ў Польшчу, то тут будзе Польшча, а калгасаў не будзе"[233]. Не менш выразна сфармуляваў мэту свайго ад’езду ў Польшчу селянін вёскі Сялец

[231] Освобождение Беларуси… С.170.
[232] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.140, арк.92.
[233] НАРБ, ф.4, воп.51, спр.11, арк.51.

Картуз-Бярозаўскага раёна А.Бубніковіч: "Я ў Польшчу еду выключна таму, што ніколі не буду працаваць у калгасе. Няхай бы з мяне бралі колькі хацелі налогаў, але далі б магчымасць займацца аднаасобнай працай"[234]. Сялянка М.Капецкая з вёскі Камялішкі Свірскага раёна заявіла, што "калі б тут не было калгасаў, то ніхто адсюль не паехаў бы"[235]. Сугучную думку выказаў аднаасобнік з Бярозы П.Бялевіч. У асабістай размове з райпрадстаўніком у Картуз-Бярозе Івановым ён заявіў: "Ведаеш, т. Іваноў, нам тут было вельмі ясна бачна, калі восенню 1944 і вясной 1945 гг. з усходніх абласцей Савецкага Саюза з калгасаў прыязджалі калгаснікі да нас, аднаасобнікаў, па хлеб. Гэтыя людзі за любую колькасць хлеба наймаліся да нас на працу. Ад гэтага ў нас стварылася вельмі дрэннае ўражанне аб калгасах, яшчэ горшае было б, калі б самім давялося працаваць у калгасах"[236]. Сялянка С.Скурніцкая напісала свайму родзічу ў польскую армію, што "калі нічога не зменіцца, то абавязкова неабходна адсюль выязджаць, бо ўжо павінны ствараць грамадскія работы"[237].

Начальнік Свірскага РА НКДБ Маладзечанскай вобласці паведамляў у аргінструктарскі аддзел ЦК КП(б)Б (кастрычнік 1944 г.), што "ў выніку варожай дзейнасці кулацка-нацыяналістычных элементаў частка насельніцтва настроена адмоўна ў адносінах да калгаснага будаўніцтва. Выпадкаў адмоўных выказванняў у адносінах да калгаснага будаўніцтва агентурай фіксуецца вельмі многа"[238]. Аднаасобнік з хутара Падгур'е Індурскага сельсавета Гродзенскага раёна заявіў упаўнаважанаму па нарыхтоўках: "Я ведаю, чаму на нас накладваюць такія вялізныя падаткі - каб хутчэй загнаць у калгас"[239]. Гэтае ж самае меў на ўвазе і аднаасобнік Курганюк, які жыў у Драгічынскім раёне Пінскай вобласці і меў 18 га зямлі. Ён заявіў райпрадстаўніку СНК БССР па перасяленню наступнае: "Раней я не рэгістраваўся, таму што думаў застацца жыць у Савецкім Саюзе. Зараз тут заставацца няма ніякай магчымасці, бо бяруць вельмі многа падаткаў. У мяне ўжо не засталося чым плаціць падатак. Усё ў мяне вывезлі"[240]. Заўважым, што гэта былі не асобныя выказванні, а такія ж думкі і настроі панавалі ў большасці ад'язджаючага аднаасобнага сялянства.

---

234 НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1918, арк.219.
235 НАРБ, ф.4, воп.42, спр.150, арк.99.
236 НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.259.
237 НАРБ, ф.4, воп.42, спр.150, арк.99.
238 Там сама, арк.99.
239 НАРБ, ф.4, воп.42, спр.140, арк.101.
240 НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.263.

Частка палякаў рэгістравалася на выезд, каб пазбегнуць прымусовых аргнабораў на працу ў Сібір, на Далёкі Усход, Урал. Так, сялянка вёскі Павяцье Павяцкага сельсавета Міёрскага раёна Э.Масло тлумачыла прычыну пераезду ў Польшчу тым, што яна жадала пазбегнуць мабілізацыі на працу дзвюх дарослых дачок. Жыхар вёскі Картавыя Дворнасельскага сельсавета П.Мацюк таксама падаў заяву на выезд таму, што "надакучыла хаваць сваіх дачок ад мабілізацыі на працу на ўральскія заводы"[241]. Істотнасць гэтага фактара пацвярджае запіска намесніка загадчыка аддзелам агітацыі і прапаганды ЦК КП(б)Б І.Краўчанкі, камандзіраванага ў Відзаўскі раён для праверкі ходу перасялення. Ён адзначаў, што "ўвесь запіс  на выезд у раёне адбыўся на працягу другой паловы сакавіка і красавіка 1945 г. Масавы запіс тлумачыцца тым, што ў гэты час польска-нямецкія нацыяналісты разгарнулі сваю антысавецкую варожую прапаганду. Да таго ж супалі наступныя мерапрыемствы мясцовых улад, якія спрыялі масаваму запісу: быў абвешчаны ваенны пераўлік грамадзян да 55 год і мабілізацыя дарослага насельніцтва для работы на Урале. Насельніцтву масава рассылаліся павесткі аб прызыве ў армію і мабілізацыі на Урал"[242]. Аналагічная сітуацыя назіралася і ў Ашмянскім раёне, у якім насельніцтву разаслалі звыш 300 павестак аб мабілізацыі на працу. Аднак толькі адзін чалавек выказаў жаданне паехаць на працу, астатнія "не з'явіліся ў камісію, або зусім скрыліся"[243]. Прадстаўнік СНК БССР з Пружанскага раёна паведамляў намесніку  Галоўнага прадстаўніка СНК БССР па перасяленню П.Алышаву, што "некаторая частка зарэгістравалася, каб не трапіць на фронт, не быць адпраўленым на работы ў тыл па мабілізацыі і ўхіліцца ад падаткаў і паставак"[244].

Частка палякаў выязджала ў Польшчу, спадзяючыся на лепшыя ўмовы жыцця. Так, рабочы-паляк саўгаса "Станіслававa" Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці Б.Шагун у адказ на пытанне, што вымушае яго пераязджаць ў Польшчу, заявіў прадстаўнікам СНК БССР па перасяленню наступнае: "Я працаваў у памесці, атрымліваў 72 пуды хлеба  ў год і 30 злотых у месяц, і мне памешчык даваў морг зямлі. Любыя боты я мог купіць за 15 рублёў, а зараз я атрымліваю 140 рублёў ў месяц і 500 грамаў хлеба ў дзень і хаджу босы. Вось чаму я еду ў Польшчу"[245]. Гэтым жа

[241] НАРБ, ф.4, воп.51. спр.11, арк.52.
[242] НАРБ. ф.4, воп.29, спр.828, арк.45.
[243] НАРБ, ф.4, воп.51, спр.7, арк.162.
[244] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.123.
[245] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.140, арк.93.

самым тлумачыла сваё жаданне пераехаць у Польшчу і сялянка А.Лакеша Вярцялішскага сельсавета Гродзенскай вобласці. Яна заявіла работніку Гродзенскага райкама партыі, што "за палякамі я ў памешчыка ў памесці Станіслава на падзённай працы за два дні зарабляла на два добрых плацці, а зараз і за месяц не зарабляю на плацце, вось чаму я думаю, што лепш пераехаць у Польшчу"[246].

Пераехаць у Польшчу пажадала значная частка інтэлігенцыі, якую, у прыватнасці настаўнікаў, не задавальняла адкрыта дыскрымінацыйная палітыка савецкай улады ў галіне адукацыі. Так, у выніку пераўтварэння польскамоўных школ у рускія і беларускія іх колькасць са 114 у 1944 г. скарацілася да 22 у 1947 г. Разам са скарачэннем польскамоўных школ адбывалася "замена ненадзейных і некваліфікаваных выкладчыкаў-палякаў падрыхтаваннымі і праверанымі выкладчыкамі - рускімі і беларусамі"[247]. Зразумела, што тыя, хто трапляў у "разрад" ненадзейных і некваліфікаваных, гублялі працу і вымушаны былі перасяляцца ў Польшчу.

Ад'езд палякаў-настаўнікаў прывёў да значнай кадравай напружанасці ў шэрагу раёнаў заходніх абласцей. Асабліва вострая сітуацыя склалася ў Гродзенскай вобласці, у якой з 1640 настаўнікаў-палякаў налічвалася 756 чалавек. З іх 706 зарэгістравалася на выезд у Польшчу. Гродзенскі абкам партыі летам 1945 г. з трывогай адзначаў, што "на працягу навучальнага года па няпоўных дадзеных у Польшчу выехала 228 настаўнікаў. Яшчэ 250 зарэгістраваліся на выезд. У Гродна да пачатку вучэбнага года (1945/1946 гг. - А.В.) мелася 104 настаўнікі-палякі. На 1 чэрвеня 1945 г. засталося 68, з якіх 54 зарэгістраваліся на выезд. У Сапоцкінскім раёне з 68 настаўнікаў 30 выехала ў Польшчу і 30 зарэгістравалася на выезд. У Жалудоцкім і Зельвенскім раёнах большасць настаўнікаў-палякаў выехала ў Польшчу"[248].

Разам з настаўніцтвам выказалі жаданне перасяліцца ў Польшчу медыцынскія работнікі. Прытым ад'язджалі не толькі ўрачы, якія мелі вышэйшую адукацыю, але і сярэдні медыцынскі персанал. Напрыклад, з Гродзенскай дзіцячай бальніцы, у якой працавалі 24 работнікі, на выезд зарэгістравалася 13 медыкаў, з інфекцыйнай з 44 адпаведна - 24, з першай гарадской з 49 адпаведна - 22. Масавы ад'езд медыкаў прывёў да таго, што ў Гродзенскай вобласці закрыліся аптэкі ў Шчучынскім, Зельвенскім,

[246] Там сама, арк.93.
[247] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.543, арк.42.
[248] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.375, арк.100.

Мастоўскім, Свіслацкім, Жалудоцкім, Сапоцкінскім, Воранаўскім, Поразаўскім раёнах[249].

Разам з інтэлігенцыяй выязджалі работнікі прамысловасці, транспарту. Так, з 71 работніка Гродзенскага велазборачнага завода ў 1945 г. у Польшчу выехалі 25 рабочых і служачых, 9 зарэгістраваліся на выезд. З Беластоцкай чыгункі за гэты ж перыяд выехала ў Польшчу 2631 рабочы і служачы. У Лідзе з 146 рабочых і служачых завода сельскагаспадарчага машынабудавання 55 зарэгістраваліся на выезд, з 100 рабочых цвікавага завода выказала жаданне перасяліцца ў Польшчу 90, са 102 піваварнага пажадалі перасяліцца 60 чалавек[250].

Масавы ад'езд рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў прывёў да надзвычай напружанай сітуацыі на шэрагу прадпрыемстваў Гродзенскай вобласці. Кіраўнік Навагрудскага райпрадстаўніцтва В.Захараў у запісцы, накіраванай у маі 1945 г. У.Царуку, паведамляў наступнае: "Неабходна адзначыць, што становішча на шклозаводзе ("Нёман". - А.В.) пакуль напружанае ў тым сэнсе, што асноўныя спецыялісты хацелі б выехаць у Польшчу. Калі іх вывезці, то завод стане перад фактам адсутнасці кваліфікаванай рабочай сілы. Лічу неабходным паставіць пытанне перад СНК БССР аб іх затрымцы да падбору і падрыхтоўкі новых кадраў, якія б маглі замяніць ад'язджаючых"[251]. У верасні 1945 г. ён звяртаецца ўжо да наркама замежных спраў К.Кісялёва і падкрэслівае: "Да цяперашняга часу застаецца нявырашаным пытанне з рабочымі шклозавода "Нёман", дзе 70% майстраў-спецыялістаў высокай кваліфікацыі з'яўляюцца палякамі, якія зарэгістраваліся на выезд. Калі гэтую катэгорыю людзей эвакуіраваць у сучасны момант, не маючы ў наяўнасці рэзервовых кадраў шклоўшчыкаў, то завод спыніць працу. Неабходна зараз жа ўнесці пэўную яснасць, што рабіць з рабочымі шклозавода. Практычна вываз рабочых неабходна адкласці да мая 1946 г. з тым разлікам, каб да гэтага часу падрыхтаваць спецыялістаў, якія б замянілі ад'язджаючых"[252].

Важнай прычынай, вымушаючай палякаў перасяляцца, з'яўлялася рэпрэсіўная палітыка савецкай улады ў дачыненні да іх, а таксама адмоўныя адносіны асобных прадстаўнікоў мясцовых уладаў да палякаў. Напрыклад, сялянін вескі Лебедзева, Лебедзеўскага сельсавета С.Вярховіч тлумачыў сваё жаданне

[249] Там сама, арк.101.
[250] Там сама, арк.102.
[251] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.174.
[252] Там сама, арк.193.

пераехаць ў Польшчу тым, што дваіх яго сыноў беспадстаўна асудзілі на 10 год зняволення, зараз яны выйшлі з турмы, і таму ён не жадае болей жыць у Беларусі[253]. Сакратар Полацкага АК КП(б)Б Я.Жылянін паведамляў у ЦК КП(б)Б, што па 7 раёнах Полацкай вобласці (Глыбоцкім, Дунілавіцкім, Відзаўскім, Пліскім, Докшыцкім, Шаркаўшчынскім, Браслаўскім) «запісалася на выезд 376 сямей, рэпрэсаваных органамі савецкай улады»[254].

Незадаволенасць палякаў выклікала супрацьпраўная дзейнасць асобных прадстаўнікоў мясцовых уладаў, якія фактычна рабавалі насельніцтва, якое рэгістравалася на выезд. Так, Баранавіцкі абкам партыі паведамляў у ЦК КП(б)Б, што "маюцца выпадкі, калі работнікі мясцовых саветаў без усялякіх падстаў адбіралі асабістыя рэчы і маёмасць польскіх грамадзян. У сувязі з гэтым маюцца факты пратэсту з боку зарэгістраваных на выезд палякаў. Так, жыхар Карэліцкага раёна В.Сянкевіч заявіў упаўнаважаным па перасяленню наступнае: "Толькі б мне трапіць у Польшчу. Там праз польскую прэсу я буду ўсім распавядаць, што савецкая ўлада займаецца рабаўніцтвамі і творыць беззаконне над палякамі"[255]. Беззаконне мясцовых улад да палякаў адзначалі і высокапастаўленыя партыйныя работнікі. Так, загадчык сектара прапаганды ЦК КП(б)Б у дакладной запісцы «Аб фактах парушэння палітыкі ў пытанні перасялення польскага насельніцтва з тэрыторыі Беларусі ў Польшчу і надзялення беззямельных і малазямельных сялян зямлёй у Івянецкім раёне Баранавіцкай вобласці», накіраванай сакратару ЦК КП(б)Б Ц.Гарбунову, падкрэсліваў, што «Івянецкі райкам партыі і райвыканкам не зразумелі палітычнай сутнасці пытання перасялення польскага насельніцтва з тэрыторыі Беларусі ў Польшчу і дапускаюць грубыя нарушэнні ў гэтым пытанні. ... Работы з ад'язджаючымі палякамі ніякай не праводзіцца, і ў большасці людзі ад нас ад'язджаюць у дрэнным настроі»[256].

Разам з чыста прагматычнымі разлікамі і меркаваннямі (непрыняццем калгасна-саўгаснага ладу, спадзяваннямі на лепшыя ўмовы жыцця, ухіленне ад працы па-за межамі рэспублікі і г.д.) частку палякаў вымушала пераязджаць высокае пачуццё нацыянальнай самасвядомасці. Так, селянін вёскі Пад'ельцы Міёрскага сельсавета Полацкай вобласці Антон Сянкевіч заявіў упаўнаважаным: "Я польскі патрыёт і жадаю выехаць у

[253] НАРБ, ф.4, воп.51, спр.11, арк.52.
[254] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.111, арк.120-121.
[255] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.94, арк.248.
[256] НАРБ, ф.4, воп.47, спр.25, арк.432-433.

Польшчу"[257]. Цікавасць яго выказванню надае той факт, што А.Сянкевіч у 1939 г. з'яўляўся дэпутатам Народнага Сходу Заходняй Беларусі і нават уваходзіў у склад беларускай дэлегацыі, якая была накіравана ў Маскву, каб засведчыць факт уваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР. Магчыма толькі меркаваць, што вымусіла колішняга дэпутата Народнага Сходу, які з пункту гледжання савецкай улады з'яўляўся яе цвёрдым прыхільнікам, бо нават трапіў у Маскву, заявіць, што ён "польскі патрыёт", і выехаць у Польшчу.

Тысячы палякаў скарысталі магчымасць выехаць у Польшчу. Хутчэй за ўсё агульным, што аб'ядноўвала ўсіх, з'яўлялася непрыняцце савецкай улады і спадзяванні на тое, што ў Польшчы ўсё ж будзе лепей. Надзея і спадзяванне на лепшую будучыню для сябе, сваіх дзяцей аб'ядналі ўсіх, незалежна ад сацыяльнага статуса, адукацыі, палітычных поглядаў, маёмаснага становішча, нацыянальнай свядомасці. У кожнага былі свае матывы, абгрунтаванне прынятага рашэння, але выбар быў зроблены, і зроблены на карысць Польшчы.

[257] НАРБ, ф.4, воп.51, спр.11, арк.51.

## Глава 5.
## Армія Краёва ў Беларусі: за і супраць перасялення

Перасяленчы працэс, распачаты восенню 1944 г., ажыццяўляўся ў складанай грамадска-палітычнай сітуацыі, што мела месца ў заходнім рэгіёне Беларусі. Адным з найбольш складаных, неадназначна ўспрыманых, супярэчлівых фактараў, які істотна ўплываў на перасяленчы працэс на ўсім яго працягу, з'яўляўся фактар польскага падполля, якое падпарадкоўвалася лонданскаму эміграцкаму ўраду і падзяляла яго пазіцыю ў дачыненні да савецка-польскіх адносін і да абмену насельніцтвам. Падполле адразу ж негатыўна ўспрыняло падпісанае беларуска-польскае пагадненне аб перасяленні насельніцтва і пачало актыўна супрацьдзейнічаць яго ажыццяўленню. Формы, метады, тактыка, якія выкарыстоўваліся падполлем, былі разнастайнымі і залежалі ад указанняў і дырэктыў эміграцкага ўрада.

Партыйнае кіраўніцтва рэспублікі літаральна з першых дзён перасялення асэнсавала сур'ёзнасць і небяспеку з боку падполля. Так, у лістападзе 1944 г. П.Панамарэнка ў запісцы, накіраванай В.Молатаву, адзначаў, што "маюцца факты, якія сведчаць аб тым, што агенты лонданскага эміграцкага ўрада вядуць працу супраць перасялення, і ў часткі палякаў існуе нежаданне перасяляцца, аднак гэта не адлюстроўвае настрояў усяго польскага насельніцтва"[258]. П.Панамарэнка меў рацыю, калі згадваў аб "працы" падполля супраць перасялення. Так, калі ў ноч з 4 на 5 снежня 1944 г. у Брэсце вывесілі аб'явы аб умовах перасялення, то большасць з іх, нават на памяшканні райпрадстаўніцтва, была сарвана. На іх месцы былі наклеены лістоўкі з зваротам да палякаў байкатаваць перасяленне і не рэгістравацца на выезд у Польшчу, бо "усё роўна гэтая тэрыторыя адыдзе да Польшчы"[259]. У лістоўцы, што была наклееная на райпрадстаўніцтве, адзначалася наступнае: "Грамадзяне. Выезд за Буг ёсць выдумка ворага. Прэч з камісіі. Народ польскі ніколі не згодзен на гэтае. Прэч ворагаў з польскай зямлі ўсходняй"[260]. Аналагічная сітуацыя мела месца і ў Гродне. Гродзенскае райпрадстаўніцтва паведамляла У.Царуку: "Па г. Гродна абвесткі вывешваліся 7 дзён запар, і да раніцы кожнага

---

[258] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1902, арк.7.
[259] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.19.
[260] Там сама, арк.22.

дня ніводнай абвесткі не заставалася. З боку польскіх бандытаў былі пагрозы аб тым, што хто зарэгіструецца, будзе знішчаны"[261].

Частка палякаў у сапраўднасці падтрымлівала і падзяляла погляды "лонданцаў". Так, палякі Гродзенскага раёна заяўлялі прадстаўнікам СНК БССР па перасяленню, што "створаны нацыянальны ўрад - гэта савецкі ўрад, апрануты ў польскую форму. Сапраўдны ўрад - гэта той, што ў Лондане"[262]. Сакратар Жалудоцкага РК КП(б)Б паведамляў у ЦК КП(б)Б (лістапад 1944 г.), што "частка палякаў прытрымліваецца ўказанняў эміграцкага польскага ўрада. Яны з'яўляюцца ворагамі мерапрыемстваў савецкай улады"[263]. Наконт межаў падполле актыўна прапагандавала і адстойвала думку аб тым, што "польская нацыянальная дзяржава існавала і будзе існаваць з папярэднімі межамі, а не па лініі Керзана, як зараз устанаўліваюцца межы па дамоўленасці савецкага ўрада з В.Васілеўскай, якую польскі народ не прызнае, бо яна прадалася камуністам"[264].

Аднак неабходна пагадзіцца з меркаваннем П.Панамарэнкі аб тым, што такія выказванні і думкі не адлюстроўвалі настрояў усіх палякаў. Хутчэй за ўсё сярод бальшыні польскага насельніцтва панавала пачуццё нявызначанасці і неакрэсленасці становішча, у якім яно апынулася. Так, Карэліцкі РК КП(б)Б паведамляў у ЦК КП(б)Б (кастрычнік 1944 г.), што "сярод сялян распаўсюджваецца шмат чутак аб адыходзе Карэліцкага раёна да Польшчы. Распаўсюджваюцца чуткі, што каля Стоўбцаў ужо праводзіцца мяжа і ставяцца польскія пагранічныя слупы"[265]. Ляхавіцкі райкам партыі таксама ў кастрычніку 1944 г. адзначаў, што "з боку палякаў нелегальна вядзецца прапаганда аб тым, што зараз становішча няўстойлівае і тут будзе Польшча"[266]. Аналагічнага кшталту інфармацыя ўтрымлівалася ў запісцы Стаўбцоўскага РК КП(б)Б, накіраванай у ЦК КП(б)Б у гэты ж час. Райкам партыі падкрэсліваў, што "сярод часткі польскага насельніцтва маецца тэндэнцыя ўзнаўлення Польшчы на гэтай тэрыторыі. З гэтай мэтай рэшткі банд, а таксама кулацтва вядуць агітацыйную працу сярод польскага насельніцтва аб тым, што тут будзе польская дзяржава, а таму не трэба выконваць распараджэнні савецкага ўрада"[267].

---

[261] Там сама, арк.52.
[262] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.245, арк.119-120.
[263] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.140, арк.294.
[264] НАРБ, ф.4, воп.51, спр.7, арк.30-32.
[265] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.97, арк.115.
[266] Там сама, арк.210.
[267] Там сама, арк.280.

Трапна ахарактарызаваў сітуацыю, якая склалася ў гэты час, селянін вёскі Багушэўка Гродзенскага раёна, які ў жніўні 1944 г. заявіў: "Мы не ведаем зараз, каго слухаць: прадстаўнікі ад лонданскага ўрада прыходзяць і кажуць адно; ад Дуброўскага з Варшавы - другое; ад нацыянальнага камітэту - трэцяе; ад савецкай улады - чацвёртае"[268]. Той факт, што першым ён згадаў "прадстаўнікоў" эміграцкага ўрада, сведчыць аб тым, што восенню 1944 г. яго ўплыў на палякаў быў найбольш істотным і моцным. Аднак неабходна ўлічваць, што "ўплывовасць" падтрымлівалася добра ўзброенымі фарміраваннямі АК, якія сілай зброі "даводзілі" да палякаў пазіцыю лонданскага ўрада. Так, у даведцы арганізацыйна-інструктарскага аддзела ЦК КП(б)Б "Аб бандыцкім нападзе на Камялішскі сельсавет Свірскага раёна Вілейскай вобласці" (жнівень 1944 г.) паведамлялася, што 19 жніўня 1944 г. "узброеная бандгрупа ў колькасці 50 чалавек напала на Камялішскі с/с. Бандай знішчаны ўсе дакументы сельсавета, спіскі па ўліку насельніцтва, зямлі, жывёлы і г.д. Вызвалены з-пад варты арыштаваныя 18 жніўня органамі НКДБ арганізатары і кіраўнікі бандыцкіх груп на тэрыторыі Свірскага раёна"[269].

Уплывовасць і сіла АК восенню 1944 г. былі настолькі моцнымі, што падполле нават кантралявала тэрыторыі асобных сельсаветаў. Так, у Іўеўскім раёне ў жніўні 1944 г. "белабандыты" ў 8 сельсаветах выгналі мясцовыя органы ўлады і нясуць патрульную службу ў сёлах. Забілі двух старшынь і двух сакратароў сельсаветаў. Разрабавалі 4 будынкі, дзе размяшчаліся сельсаветы. Ёсць шмат прыкладаў, калі забіваюць мясцовых актывістаў з іх сем'ямі". Па дадзеных Іўеўскага РА НКДБ, у раёне дзейнічала "тры бандгрупы па 500-600 узброеных чалавек"[270]. У снежні 1944 г. сакратар Іўеўскага РК КП(б)Б паведамляў Маладзечанскаму абкаму партыі, што "за апошні час ускладнілася ўся праца ў раёне не таму, што насельніцтва не хоча выконваць дзяржаўныя мерапрыемствы, а таму, што раён насычаны рознага кшталту нацыяналістычнымі антысавецкімі і шпіёнска-дыверсійнымі групамі, якія дэзарганізуюць насельніцтва". Далей сакратар райкама партыі адзначаў, што "работнікі раённага савецкага, партыйнага актыву, атрымаўшы заданне ад райкама і райвыканкама па рабоце ў вёсцы, не ў стане яго выканаць, а ў некаторых з іх праяўляецца страх за ўласнае жыццё"[271]. Аналагічная інфармацыя

[268] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.245, арк.120.
[269] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.245, арк.117.
[270] Там сама, арк.123.
[271] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.150, арк.106.

ўтрымлівалася ў даведцы кіраўніка групы ЦК УсеКП(б) па хлебанарыхтоўках, якую ён накіраваў у верасні 1944 г. у ЦК КП(б)Б. Ён падкрэсліваў: «У Свірскім раёне ў выніку тэрору ўвесь партыйны актыў, які быў накіраваны ў сяло, вярнуўся ў раённы цэнтр, гэта прывяло да поўнага згортвання хлебанарыхтовак. Мы правялі ў Свіры нараду раённага партыйнага актыву, дзе ўстанавілі, што, як і ў Астраўцы, працаваць камуністам па аднаму стала немагчыма. Таму, пасля інструктажу таварышаў, якія выязджаюць у сельсаветы, рашылі пасылаць у сельсаветы не па аднаму таварышу, а групамі па 5-6 чалавек з тым, каб прадухіліць тэрор і аднавіць хлебанарыхтоўкі ў гэтых раёнах»[272]. Партыйны чыноўнік не перабольшваў сітуацыю. Калі ўначы і ўдзень гучалі стрэлы, гарэлі хаты, адбываліся напады, то ў першую чаргу стралялі і нападалі на партыйна-савецкі актыў. Ва ўжо згаданым паведамленні адзначалася, што з 28 лістапада па 18 снежня 1944 г. ў Іўеўскім раёне адбылося 5 нападаў на сельскі актыў - старшынь сельсаветаў, старшынь калгасаў, дэпутатаў раённых, абласных саветаў і г.д., якія непазбежна вялі да чалавечых ахвяр. Так, у вёсцы Жаптуны Іўеўскага сельсавета 14 снежня 1944 г. была забіта ўся сям'я дэпутата сельсавета.[273]

Не надта змянілася сітуацыя і на пачатку 1945 г. У лютым 1945 г. загадчык аргінструктарскага аддзела Маладзечанскага АК КП(б)Б паведамляў у Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі, што "за апошні час у шэрагу раёнаў Маладзечанскай вобласці, галоўным чынам у Юрацішскім, Іўеўскім, Валожынскім, Смаргонскім, Ашмянскім, актывізавалася тэрарыстычная дзейнасць банд белапалякаў. Банды тэрарызуюць раённы партыйна-савецкі актыў і актыў сельсаветаў. Так, у Юрацішскім раёне палякамі забіта 39 чалавек з раённага партыйна-савецкага актыву, работнікаў органаў НКУС і НКДБ. У Іўеўскім раёне за апошнія 20 дзён загінула ад банд белапалякаў 15 чалавек партыйна-савецкага актыву раёна. Дзейнасць белапалякаў у Ашмянскім, Іўеўскім і Юрацішскім раёнах паралізуе працу сельсаветаў. Некаторыя работнікі сельсаветаў у гэтых раёнах з'яўляюцца ў сябе толькі днём, з наступленнем ночы з усімі справамі хаваюцца ад бандытызму белапалякаў"[274].

Аналагічнае становішча склалася і ў Полацкай вобласці. Сакратар Полацкага АК КП(б)Б Я.Жылянін паведамляў у ЦК КП(б)Б (ліпень 1945 г.), што "ў Дунілавіцкім раёне аперыруюць банды ў 10

---

[272] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.812, арк.42.
[273] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.150, арк.106.
[274] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.150, арк.107-108.

сельсаветах. У Міёрскім раёне асабліва актыўна праяўляецца бандыцкая дзейнасць у Янчынскім, Павяцкім, Лебедзеўскім і Наўгародскім сельсаветах. Пачынаючы з 20 мая, бандыты ў некаторых з гэтых сельсаветаў ходзяць адкрыта. Бандыты пад пагрозай расправы прапаноўваюць старшыням і дэпутатам сельсаветаў прыпыніць работу па выкананню гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў. Тых, хто не выконвае гэтых распараджэнняў праследуюць і забіваюць"[275]. Безумоўна, ва ўмовах, калі падполле ўяўляла рэальную сілу і кантралявала сітуацыю, асабліва ў сельскай мясцовасці, то яно кантралявала і ход перасяленчага працэсу. Улічваючы сілу падполля і адчуваючы і слабасць, і няздольнасць улады абараніць насельніцтва, апошняе вымушана было падпарадкоўвацца патрабаванням падполля і рэгістравацца на выезд у Польшчу.

Сур'ёзнасць фактару польскага падполля вымусіла палітычнае кіраўніцтва рэспублікі абмеркаваць гэтую праблему на лютаўскім пленуме ЦК КП(б)Б (12-18 лютага 1945 г.). Удзельнікі пленума, прааналізаваўшы палітычнае, эканамічнае, сацыяльнае становішча ў заходнім рэгіёне Беларусі, адзначылі, што "ў заходніх абласцях арудуюць агенты лонданскага эміграцкага ўрада, якія распальваюць антысавецкія і нацыяналістычныя настроі польскага насельніцтва, арганізуюць банды з палякаў, забіваюць нашых работнікаў і адданых савецкай уладзе сялян, спрабуюць сарваць палітычныя, гаспадарчыя і культурныя мерапрыемствы савецкай улады"[276]. У сувязі з гэтым пленум патрабаваў ад партыйных і савецкіх органаў заходніх абласцей узмацніць сярод насельніцтва палітыка-выхаваўчую працу, скіраваную на выкрыццё "польска-фашысцкіх нацыяналістаў, як здраднікаў інтарэсаў польскага народа, саўдзельнікаў злачынстваў нямецка-фашысцкіх катаў"[277].

Аналіз дзейнасці польскага падполля і яго ўплыў на перасяленне дазваляе вылучыць два перыяды гэтай дзейнасці, якія кардынальна адрозніваліся адзін ад аднаго. Першы перыяд пачаўся з моманту абвяшчэння ўмоў пагаднення і пачатку рэгістрацыі насельніцтва (кастрычнік-снежань 1944 г.) і працягваўся да Крымскай канферэнцыі (люты 1945 г.), на якой была вызначана савецка-польская мяжа. Ён характарызуецца тым, што лонданскі ўрад і падполле не пакідалі надзеі на вяртанне ўсходняй мяжы, якая існавала напярэдадні 17 верасня 1939 г.

---

[275] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.111, арк.100.

[276] Коммунистическая партия Белорусии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Мн.,1984, Т.3. С.500.

[277] Там сама, С.503.

Падполле, выконваючы палітычны загад лонданскага ўрада, скіроўвае дзейнасць на забарону палякам рэгістравацца і выязджаць у Польшчу. Улічваючы рэальную сілу падполля, а таксама слабасць савецкай улады ў большасці раёнаў Маладзечанскай, Баранавіцкай, Гродзенскай, Полацкай абласцей, частка польскага насельніцтва пад пагрозай зброі вымушана была падпарадкавацца патрабаванням падполля і не рэгістравалася на выезд. Напрыклад, Гродзенскае райпрадстаўніцтва паведамляла У.Царуку, што "ў раёнах абсалютна ніхто не рэгіструваўся, ім (палякам. - А.В.) было сказана, што тут будзе Польшча, мяжа будзе праходзіць па Дняпру"[278]. У справаздачы Брэсцкага абкама партыі (24 лістапада 1944 г.) адзначалася, што "раскрытая некалькі дзён таму ў Бярозаўскім раёне арганізацыя польскіх нацыяналістаў АК паказвае, што АК з кожным днём усё больш і больш актывізуе сваю дзейнасць. Зараз перад АК Лонданскім польскім урадам пастаўлены наступныя задачы: 1. Прыняць актыўныя захады па мабілізацыі насельніцтва супраць выканання мерапрыемстваў савецкай улады; 2. Правесці агітацыю сярод насельніцтва за стварэнне "Вялікай Польшчы"; 3. Разгарнуць актыўную працу па павялічэнню шэрагаў Арміі Краёвай; 4. *Весці сярод насельніцтва растлумачальную працу, каб яно не выязджала ў Польшчу, бо ўсё роўна тут будзе Польшча* (выдзелена мной. - А.В.); 5. Весці агітацыю сярод ваеннаабавязаных за ўхіленне ад прызыву ў Чырвоную Армію"[279]. Паслядоўнае выкананне падполлем менавіта такой устаноўкі адзначае і англійскі гісторык К.Сворд, які піша, што "польскі ўрад у Лондане рэкамендаваў Арміі Краёвай рабіць усё магчымае, каб спыніць масавы ад'езд насельніцтва ў гэты час"[280].

Пасля Крымскай канферэнцыі, зразумеўшы, што межы канчаткова вызначаны і пераглядацца не будуць, тактыка падполля кардынальна мяняецца. Другі этап (люты 1945 г.-1946 г.) характарызуецца тым, што падполле, наадварот, прыкладае намаганні, каб усё польскае насельніцтва рэгістравалася і выязджала ў Польшчу. Ва ўжо згаданым паведамленні Гродзенскага райпрадстаўніцтва адзначалася, што "пасля Крымскай канферэнцыі, дзе было заяўлена, што мяжа Польшчы на ўсходзе будзе праходзіць па лініі Керзана... польскія белабандыты ўзяліся за новую агітацыю. Польскае насельніцтва пад пагрозай зброі вымушалі рэгістравацца і пераязджаць у Польшчу любым

[278] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.52.
[279] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.37, арк.32.
[280] Sword K. Ibid. S.181.

шляхам. Такія факты асабліва назіраліся ў Воранаўскім раёне, дзе зарэгістравалася на выезд амаль 100% усяго насельніцтва раёна"[281]. Намеснік Галоўнага ўпаўнаважанага СНК БССР па перасяленню П.Алышаў у чэрвені 1945 г. паведамляў Баранавіцкаму АК КП(б)Б, што "ў размовах з нашым райпрадстаўніком жыхары Дзятлаўскага раёна заяўлялі: "Мы зарэгістраваліся на эвакуацыю толькі з-за таго, што нам пагражалі расправаю". Гэта адбылося таму, як падкрэсліваў П.Алышаў, што "ўзмацнілася агітацыя агентаў польскага эмігранцкага ўрада за 100% рэгістрацыю ўсіх палякаў. Частка палякаў, а ў шэрагу выпадкаў і беларусаў, вымушаны былі зарэгістравацца на выезд у Польшчу. У супрацьлеглым выпадку ім пагражалі рэпрэсіямі"[282].

Сведчаннем таго, што прымус з боку падполля з'яўляўся адной з галоўных прычын рэгістрацыі палякаў на выезд, з'яўляецца даведка Гродзенскага РК КП(б)Б "Аб фактах бандытызма ў Гродзенскім раёне", накіраваная 28 красавіка 1945 г. у ЦК КП(б)Б. У ёй падкрэслівалася, што "ў выніку дзейнасці бандыцкіх груп, запалохвання насельніцтва ў Прывалкаўскім сельсавеце Гродзенскага раёна ўсё насельніцтва запісалася на выезд ў Польшчу. Кіруючы склад і актыў сельсавета вымушаны быў выехаць з яго тэрыторыі"[283]. Асабліва моцны прымус з боку падполля назіраўся ў Воранаўскім, Радунскім, Лідскім, Шчучынскім раёнах Гродзенскай вобласці, ў якіх групы ўзброеных "белабандытаў" абыходзілі хаты палякаў і загадвалі тым, хто не запісаўся на выезд, тэрмінова зарэгістравацца[284]. Прадстаўнік СНК БССР па прасяленню па Гродзенскаму райпрадстаўніцтву У.Пуцята паведамляў У.Царуку, што, напрыклад, у Воранаўскім, Лідскім, Радунскім раёнах Гродзенскай вобласці ў сакавіку-красавіку 1945 г. узмацнілася агітацыя за 100% рэгістрацыю палякаў на выезд у Польшчу пад пагрозай расстрэлу з боку фарміраванняў падполля[285].

Наколькі ўплывовым быў гэты фактар, сведчыць прыклад Воранаўскага раёна. У даведцы ЦК КП(б)Б "Аб стане працы Воранаўскага РК КП(б)Б Гродзенскай вобласці па перасяленню грамадзян польскай нацыянальнасці з БССР у Польшчу" (чэрвень 1945 г.) адзначалася, што "па ўліку польскага ўпаўнаважанага ў Воранаўскім раёне зарэгістравалася на выезд у Польшчу 5812

[281] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.52.
[282] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.8, арк.17.
[283] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.246, арк.279.
[284] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.53.
[285] Там сама, арк.52.

гаспадарак, у якіх налічвалася 22 217 чалавек". Гэта тлумачылася тым, што "рэгістрацыя амаль усяго насельніцтва раёна для выезду з БССР у Польшчу з'явілася вынікам слабай масава-палітычнай працы сярод насельніцтва з боку раённай партыйнай арганізацыі, уплыву антысавецкай агітацыі польскіх нацыяналістаў, *а галоўным чынам, як вынік запалохвання насельніцтва з боку польскіх нацыяналістычных банд*"[286] (выдзелена аўтарам. – А.В.). Аналагічная сітуацыя назіралася ў Навагрудскім, Любчанскім, Клецкім раёнах Баранавіцкай вобласці, а таксама ў Шаркаўшчынскім, Браслаўскім, Відзаўскім, Міёрскім раёнах Полацкай вобласці, у якіх польскае насельніцтва "знаходзілася пад значным уплывам фарміраванняў АК"[287].

Дынаміку і ваганні колькасці тых, хто рэгістраваўся ў першы і другі перыяды дзейнасці падполля як па асобных райпрадстаўніцтвах, так і ў цэлым, пацвярджаюць архіўныя дадзеныя. Так, калі па Навагрудскаму райпрадстаўніцтву з сярэдзіны кастрычніка па 31 снежня 1944 г. (чацвёрты квартал 1944 г.) зарэгістравалася на выезд толькі 642 гаспадаркі агульнай колькасцю 2150 чалавек, то з 1 студзеня па 1 красавіка 1945 г. (першы квартал 1945 г.) па ўсіх раёнах райпрадстаўніцтва зарэгістравалася на выезд ужо 16 093 гаспадаркі, у якіх налічвалася 67 755 чалавек[288]. Гэтае ж самае назіралася і ў Маладзечанскім райпрадстаўніцтве, у якім у снежні 1944 г. - лютым 1945 г., нягледзячы на агітацыйную працу, зарэгістравалася на выезд толькі 3645 польскіх гаспадарак, якія налічвалі 13 262 чалавекі. Аднак за сакавік-красавік 1945 г. зарэгістравалася 16 478 гаспадарак агульнай колькасцю 66 995 чалавек[289].

Тэндэнцыя павелічэння колькасці зарэгістраваных назіралася і па ўсіх райпрадстаўніцтвах. Так, калі за першыя тры месяцы пасля абвяшчэння пачатку перасялення (кастрычнік-снежань 1944 г.) зарэгістравалася 19 771 гаспадарак агульнай колькасцю 66 311 чалавек, то за тры месяцы 1945 г. (студзень - сакавік) лічбы выглядалі наступным чынам: на выезд зарэгістравалася 76 358 гаспадарак, якія налічвалі 254 103 чаоавекі[290]. Уздзеянне падполля на дынаміку рэгістрацыі насельніцтва адзначалі і афіцыйныя ўлады. У дакладной запісцы «Аб выніках эвакуацыі польскага і

---

[286] НАРБ, ф.4, воп.51, спр.11, арк.59.
[287] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.188-189, 294.
[288] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.8, арк.77.
[289] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1918, арк.172.
[290] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.4, арк.51.

яўрэйскага насельніцтва з тэрыторыі заходніх абласцей Беларускай ССР у адпаведнасці з беларуска-польскім пагадненнем ад 9 верасня 1944 г. аб узаемнай эвакуацыі насельніцтва», падрыхтаванай у СМ БССР у верасні 1946 г., падкрэслівалася, што «ў першы перыяд рэгістрацыі, па студзень 1945 г. пад уплывам антысавецкай агітацыі і хлусні, накіраванай на зрыў пагаднення аб эвакуацыі, польскае насельніцтва да камісій адносілася з недаверам, і рэгістраваліся адзінкі. За гэты перыяд усяго зарэгістравалася толькі 28 520 гаспадарак, якія налічвалі 95 652 чалавекі. У лютым-маі 1945 г., пасля рашэнняў Крымскай канферэнцыі кіраўнікоў 3 урадаў, устаноўка антысавецкіх элементаў рэзка мяняецца ў бок масавай рэгістрацыі на эвакуацыю. Зафіксаваны шэраг фактаў, калі «акаўцы» і ім падобная агентура Лонданскага эміграцкага польскага ўрада, асабліва ў Гродзенскай, Маладзечанскай і Полацкай абласцях ...прапаноўвалі ўсім, і беларусам-католікам, рэгістравацца ў Польшчу»[291].

Нягледзячы на тое, што 19 студзеня 1945 г. АК была афіцыйна распушчана, ад яе імя дзейнічаў шэраг узброеных атрадаў і груп, якія не падпарадкаваліся загаду аб роспуску. Калі на першым этапе дзейнасць падполля ў пэўнай ступені мела палітычны характар, то на другім яна пераўтварылася ў звычайны тэрор у адносінах як да польскага, так і да беларускага насельніцтва. Так, па дадзеных Гродзенскага абкама партыі, толькі ў Лідскім раёне з 2 жніўня па 17 лістапада 1944 г. падполлем было забіта 66 і паранена 7 чалавек партыйна-савецкага актыву, сялян, ваенных і г.д. Неабходна падкрэсліць, што найбольшыя страты нёс сельскі актыў, які быў меней абаронены і знаходзіўся літаральна "на перадавой" вайны падполля і ўлады ў мірны час. Так, з забітых 66 чалавек 32 прадстаўлялі сельскі актыў, 16 - раённы, 2 - абласны [292]. Усяго ж толькі ў Лідскім раёне з жніўня 1944 г. па май 1945 г. у выніку тэрору падполля было забіта 10 старшынь і 2 сакратары сельсаветаў, 27 дэпутатаў сельсаветаў і ўпаўнаважаных, 28 раённых актывістаў, 11 салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі і 34 мясцовыя жыхары[293].

Пра Армію Краёву ў Беларусі шмат напісана беларускімі і польскімі гісторыкамі. Але перасяленчая акцыя высветліла яшчэ адзін бок дзейнасці Арміі Краёвай, які магчыма ахарактарызаваць не толькі як антысавецкі, антыбеларускі, але і як антыпольскі.

[291] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.23, арк.21.
[292] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.375, арк.59.
[293] Там сама, арк.172.

Безумоўна, частка палякаў свядома падтрымлівала падполле і ідэі, за якія яно змагалася. Разам з тым была і другая частка палякаў, якая хацела проста жыць, не ўмешваючыся ў канфлікт падполля і ўлады. У час перасялення яны апынуліся на раздарожжы. Многія з іх пераязджалі ў Польшчу і без прымусу падполля, з-за высокага пачуцця нацыянальнай свядомасці, непрыняцця савецкай улады і г.д. Многія ж хісталіся: ехаць у Польшчу ці заставацца ў камуністычнай Беларусі ? У першую чаргу на іх абрынуўся прэс падполля, і супраць сваёй волі і жадання дзесяткі тысяч палякаў вымушаны былі падпарадкавацца патрабаванням падполля і супраць сваёй волі рэгістравацца на выезд у Польшчу. Наўрад ці гэта дадало сімпатыі і павялічыла колькасць прыхільнікаў Арміі Краёвай, наадварот, у шэрагу выпадкаў гэта выклікала незадавальненне і маўклівы пратэст. Разам з тым, нездольнасць савецкай улады поўнасцю нейтралізаваць дзейнасць падполля ў 1944-1946 гг. вымушала значную частку палякаў супраць сваёй волі і жадання выконваць патрабаванні падполля.

## Глава 6.
## Касцёл у час перасялення

Узаемаадносіны рымска-каталіцкага касцёла з савецкай уладай заўсёды былі складанымі і напружанымі. У першую чаргу гэта тлумачылася тым, што касцёл, які падпарадкоўваўся Ватыкану, варожа ставіўся да бальшавіцкай улады і асуджаў праслед рэлігіі ў СССР і, зразумела, у БССР. Аднымі з найбольш складаных перыядаў у дзейнасці касцёла з'яўляліся 30-я - 50-я гады XX стагоддзя. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР і распачатыя там сацыялістычныя пераўтварэнні не маглі не закрануць касцёл, які разглядаўся савецкай уладай як адзін з галоўных інстытутаў, праз які ажыццяўлялася паланізацыя і акаталічванне беларускага насельніцтва. Варожасць да касцёлу тлумачылася тым, што каталіцкае святарства негатыўна ўспрыняло савецкую ўладу, заставалася прыхільнікам польскай дзяржавы і спадзявалася на аднаўленне яе ў межах 1939 г.

Вызваленне Беларусі летам 1944 г. не ўнесла прынцыповых зменаў у адносіны дзяржавы і касцёла. Як і раней, працягваўся курс на ўзмацсннне кантролю за яго дзейнасцю і абмежаванне ўплыву на насельніцтва. У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе рымска-каталіцкае святарства ў заходнім рэгіёне Беларусі чакала новае выпрабаванне. Распачаты абмен насельніцтвам паміж БССР і Польшчай паставіў перад вернікамі і святарамі надзвычай складанае і цяжкае пытанне - заставацца ў атэістычнай Беларусі і працягваць выконваць свае святарскія абавязкі ці разам з вернікамі пераязджаць у Польшчу.

Цяжкасць выбару ў значнай ступені абумоўлівалася няпростасцю грамадска-палітычнай сітуацыі. Большасць рымска-каталіцкага святарства ўсё яшчэ спадзявалася, што Польшча пры дапамозе заходніх дзяржаў верне сабе мяжу, якая існавала да 1939 г. Ускосным пацверджаннем такіх настрояў ксяндзоў з'яўлялася іх адмова прызнаць сябе грамадзянамі СССР. Так, з 89 ксяндзоў Гродзенскай вобласці грамадзянінам СССР у 1945 г. лічыў сябе толькі ксёндз Радунскага касцёла Я.Валісеўскі. Красамоўна наконт грамадзянства СССР выказаўся ксёндз Парэцскага касцёла В.Раманоўскі: "З ваўка авечкі не зробіш, так з мяне таксама вы не зробіце грамадзяніна СССР. Я б жадаў быць грамадзянінам

Польшчы і не жыць у сацыялістычнай Беларусі"[294]. Настроі ксяндзоў і іх стаўленне да савецкай улады красамоўна ахарактарызаваў першы сакратар ЦК КП(б)Б М.Гусараў у запісцы, накіраванай у ліпені 1947 г. у ЦК УсеКП(б). Ён падкрэсліваў: "Аб адкрытай антысавецкай арыентацыі каталіцкага святарства сведчыць наступны факт. З 246 ксяндзоў і іншых служачых каталіцкага культу, якія запісаліся на выезд у Польшчу, але не выехалі, толькі 4 ксяндзы прызналі сябе савецкімі грамадзянамі, а ўсе астатнія лічаць сябе грамадзянамі Польшчы. Настаяцель касцёла Острына Васілішкаўскага раёна, Гродзенскай вобласці ксёндз Плева Іосіф у дзень выбараў у Вярхоўны Савет БССР адкрыта заявіў: "Я грамадзянін Рэчы Паспалітай і за саветы галасаваць не буду". Настаяцель касцёла ў Шчучыне Гродзенскай вобласці ксёндз Раек Станіслаў у адной з сваіх заяваў напісаў: "Што датычыць перамены майго грамадзянства, заяўляю, што пакуль я абавязаны клятваю Польскай Рэспубліцы, гэтую клятву з мяне можа зняць толькі Рымскі Папа, якому я падпарадкоўваюся"[295].

На рашэнне ксяндзоў, заставацца ў Беларусі ці выязджаць у Польшчу, істотна ўплывалі два фактары: пазіцыя кіраўніцтва Ватыкана і пазіцыя вернікаў. Трапна ахарактарызаваў пазіцыю рымска-каталіцкага святарства ў гэтым пытанні вядомы беларускі ксёндз А.Станкевіч. Ён зазначыў, што "бальшыні (ксяндзоў. - А.В.) сумленне не дазволіць пакінуць прыхаджан-католікаў на волю лёсу. На маё пытанне ксяндзам, чаму яны рэгістраваліся на выезд, яны адказвалі: "Мы гэта зрабілі на выпадак ад'езду нашых прыхаджан, аднак паколькі яны не выязджаюць, мы іх пакінуць не можам"[296]. Істотнасць гэтага фактару пацвярджаецца выказваннем ксяндза з Брэста, які на пытанне прадстаўніка СНК БССР па перасяленню, чаму ён не выязджае ў Польшчу, заявіў: "Мае прыхаджане не спяшаюцца выязджаць, адкладваюць выезд да вясны. Чаму мне спяшацца ? Я паеду, калі не будзе прыхаджан"[297]. Разам з тым пазіцыя ксяндзоў таксама істотна ўплывала на рашэнне вернікаў у пытанні перасялення. Так, кіраўнік Ваўкавыскага райпрадстаўніцтва паведамляў У.Царуку, што "той факт, што па Ваўкавыскаму райпрадстаўніцтву зарэгістраваліся на выезд усе ксяндзы (8 чалавек і тры арганісты) адыграла істотнае значэнне ў

[294] Ярмусік Э.С. Каталіцкі касцёл у Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны (1939-1945 гг.): Манаграфія.-Гродна.: ГрГУ, 2002.-С.157.
[295] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.543, арк.27.
[296] Станкевіч А. Праблемы каталіцкага касцёла ў БССР /Скарыніч. Літаратурна-навуковы гадавік. Вып.5: Мінск "Беларускі кнігазбор". 2002.- С.181-182.
[297] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.31.

патоку падачы заяваў грамадзянамі на выезд у Польшчу"[298]. Аб уплыве ксяндзоў на вернікаў у справе перасялення адзначалі і партыйныя ўлады. Загадчык ваеннага аддзела ЦК КП(б)Б М.Прохараў у красавіку 1945 г. адзначаў, што "польска-нацыяналістычныя агенты, ксяндзы, кулацкія элементы разгарнулі сваю агітацыю. Найбольш рэлігійную частку насельніцтва ксяндзы запалохваюць адлучэннем ад каталіцкай веры"[299]. Сакратар Полацкага АК КП(б)Б Я.Жылянін паведамляў у ЦК КП(б)Б (чэрвень 1945 г.), што "ва ўсіх касцёлах Браслаўскага раёна ксяндзы абвяшчалі вернікам, што ўсе каталікі з'яўляюцца палякамі і павінны запісвацца на перасяленне ў Польшчу. У Дзісне ксёндз пры правядзенні набажэнства ў касцёле заклікаў вернікаў выязджаць у Польшчу"[300]. Аб гэтым жа паведамлялася ў "Даведцы аб стане рымска-каталіцкага і сектанцкага культу па Гродзенскай вобласці", падрыхтаванай у ЦК КП(б)Б на пачатку 1946 г. У ёй падкрэслівалася, што "ксяндзы вядуць працу так, каб як мага болей грамадзян зарэгістравалася на выезд у Польшчу"[301]. Істотнасць гэтага фактару пацвярджаецца і дакладной запіскай “Аб выніках эвакуацыі польскага і яўрэйскага насельніцтва з тэрыторыі заходніх абласцей Беларускай ССР у адпаведнасці з беларуска-польскім пагадненнем ад 9 верасня 1944 г. аб узаемнай эвакуацыі насельніцтва”, якую СМ БССР накіраваў у верасні 1946 г. намесніку Старшыні СМ СССР А.Касыгіну. У ёй, у прыватнасці, адзначалася: “Асабліва ўплывовую аналагічную агітацыю (за перасяленне ў Польшчу. – А.В.) праводзілі ксяндзы сярод насельніцтва рымска-каталіцкага веравызнання, сутнасць якой зводзілася да наступнага: кожны грамадзянін рыма-каталіцкага веравызнання павінен абавязкова зарэгістравацца на выезд у Польшчу. Па Заходняй Беларусі праводзіцца патаемны плебісцыт, і калі ўсе палякі зарэгіструюцца, мяжа будзе перанесена”[302].

Што ж да пазіцыі кіраўніцтва касцёла да магчымасці выезду святароў у Польшчу, то яно, улічваючы той факт, што значная частка вернікаў застаецца ў Беларусі, рэкамендавала ім не выязджаць у Польшчу, а заставацца ў Беларусі. Так, у даведцы "Аб рабоце па перасяленню насельніцтва з тэрыторыі БССР у Польшчу і з тэрыторыі Польшчы ў БССР у адпаведнасці з беларуска-польскім пагадненнем ад 9 верасня 1944 г.", накіраванай

---

298 Там сама, арк.262.
299 НАРБ, ф.4, воп.29, спр.828, арк.28.
300 НАРБ, ф.4, воп.42, спр.111, арк.124.
301 НАРБ, ф.4, воп.51, спр.11, арк.164.
302 НАРБ, ф.788, воп.1, спр.23, арк.21.

міністрам замежных спраў БССР К.Кісялёвым у ЦК УсеКП(б) (ліпень 1946 г.), адзначалася: "Ёсць меркаванні, што вышэйшае кіраўніцтва каталіцкай царквы дало ўказанні аб астаўленні часткі ксяндзоў на тэрыторыі Беларусі. Напрыклад, у пагранічнай Гродзенскай вобласці на выезд зарэгістравалася 130 святароў, выехала ўсяго 69"[303]. Аб гэтым жа сведчыць і "Даведка аб стане рымска-каталіцкага і сектанцкага культаў па Гродзенскай вобласці", падрыхтаваная ў ЦК КП(б)Б на пачатку 1946 г. У ёй падкрэслівалася, што епіскап Гродзенскага дэканата А.Курыловіч у адносінах да перасяленчага працэсу заняў вельмі жорстую пазіцыю і даў указанне ўсім ксяндзам не пераязджаць у Польшчу, пакуль апошні католік не пакіне прыход[304].

Зазначым, што К.Кісялёў не ўдакладніў, адкуль у яго такія звесткі. Выкажам меркаванне, што такое ўказанне з боку кіраўніцтва касцёла магло мець месца, калі ўлічыць той факт, што ў заходнім рэгіёне засталася значная частка католікаў. Пакінуць вернікаў без ксяндзоў, без "нагляду" ні кіраўніцтва каталіцкіх епархій (у Беларусі існавалі Пінская і Віленская епархіі. - А.В.), ні тым больш Ватыкана, не маглі. Не маглі, нягледзячы на той факт, што кіраўніцтва Беларусі, праз падкантрольны і падначалены Камітэт упаўнаважанага па справах рэлігій пры СМ БССР, фактычна выштурхвала каталіцкае святарства ў Польшчу. А.Станкевіч адзначаў, што "ў апошні час (1945 г. - А.В.) дэканы ад савецкай улады (праз упаўнаважаных па справах культу) атрымалі штосці накштам рэкамендацый паведаміць ксяндзам-палякам, якія зарэгістраваліся на выезд, каб яны выязджалі ў Польшчу"арк[305]. Як і ў выпадку з паведамленнем К.Кісялёва ў ЦК КП(б)Б, А.Станкевіч не прыводзіў дакладных звестак аб "рэкамендацыях" - ці былі яны пісьмовыя, ці вусныя, ад каго і калі дэканы іх атрымалі. Аднак таксама магчыма меркаваць, што адпаведныя "рэкамендацыі" ў асцярожнай форме былі даведзены да ведама дэканаў Пінскай і Віленскай епархій. Савецкая ўлада небеспадстаўна бачыла ў ксяндзах моцнага праціўніка і ўсведамляла яго уплыў на вернікаў.

У час перасялення выразна наглядаецца дынаміка запісу ксяндзоў на перасяленне, а таксама вобласці і раёны, у якіх зарэгістравалася і выехала найбольшая і найменшая колькасць святароў. 1 мая 1945 г. па дамоўленасці беларускага і польскага ўрадаў рэгістрацыя на перасяленне часова спынілася. Уяўленне аб

---

303 НАРБ, ф.4, воп.29, спр.154, арк.284.
304 НАРБ, ф.4, воп.51, спр.11, арк.164.
305 Станкевіч А. ...С.181.

ксяндзах, якія зарэгістраваліся на выезд у Польшчу па ўсіх райпрадстаўніцтвах, дае наступная табліца[306].

| Райпрадстаўніцтвы | | | | | | | | | Усяго | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Навагрудскае | Слонімскае | Маладзечанскае | Гродзенскае | Глыбоцкае | Ваўкавыскае | Картуз - Бяроза | Брэсцкае | Пінскае | | |
| 39 | 17 | 44 | 30 | 102 | 5 | 6 | 26 | 16 | 285 | |

Як вынікае з табліцы, найбольшая колькасць святароў зарэгістравалася на выезд з Глыбоцкага, Маладзечанскага, Навагрудскага, Гродзенскага і Брэсцкага райпрадстаўніцтваў. Гэты факт магчыма патлумачыць тым, што ў гэтых райпрадстаўніцтвах на выезд у Польшчу зарэгістравалася найбольшая колькасць насельніцтва, якое ў пераважнай большасці з’яўлялася рыма-католікамі. Неабходна таксама адзначыць, што па стану на 1 мая 1945 г. зарэгістравалася крыху больш паловы святароў ад іх агульнай колькасці. Гэта сведчыць аб тым, што рыма-каталіцкае святарства пільна сачыла за рэгістрацыяй вернікаў у сваіх прыходах і ўлічвала колькасць тых, хто выехаў ці застаўся ў Беларусі. Зыходзячы з гэтай дынамікі, святары вызначалі сваю пазіцыю ў перасяленчым працэсе.

Не змянілася гэтае палажэнне і напрыканцы перасялення. Уяўленне аб колькасці святароў, якія зарэгістравался і выехалі ў Польшчу (па стану на 10 чэрвеня 1946 г.), дае наступная табліца[307].

| Вобласці | Баранавіцкая | Брэсцкая | Гродзенская | Маладзечанская | Полацкая | Пінская | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Зарэгістравалася | 86 | 74 | 148 | 80 | 136 | 28 | 552 |
| Выехала | 64 | 67 | 64 | 42 | 48 | 21 | 306 |

Як вынікае з прыведзеных дадзеных, у Польшчу выехала крыху болей паловы святароў ад усёй колькасці зарэгістраваных. Цікава адзначыць, што толькі з Полацкай, Гродзенскай і Маладзечанскай абласцей выехала найменшая колькасць святарства, у той час як з астатніх абласцей выехала большасць зарэгістраваных святароў. Аднак у гэтым не было нічога дзіўнага.

[306] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.7, Т.1, арк.10.
[307] НАРБ, ф.788, воп. 1, спр.23, арк.27-28.

Калі параўнаць лічбы тых, хто зарэгістраваўся і змог выехаць, то ўсё становіцца на сваё месца. Так, з Полацкай вобласці зарэгістравалася на выезд 73 077 чалавек, аднак змагло выехаць толькі 22 797 чалавек[308]. Просты разлік паказвае, што ў вобласці засталося 50 273 чалавекі, і магчыма меркаваць, што значная іх частка з'яўлялася рыма-католікамі. Гэтае ж самае мела месца і ў Гродзенскай вобласці, дзе з 192 859 зарэгістраваных на выезд змаглі выехаць усяго 67 118 чалавек[309]. 125 741 чалавек, таксама ў пераважнай большасці рыма-каталікі, засталіся ў вобласці. Паўстае рытарычнае пытанне: ці маглі святары пакінуць такую колькасць вернікаў "без нагляду" ? Безумоўна, не.

У той жа час супрацьлеглым прыкладам з'яўляецца Брэсцкая вобласць, у якой на выезд у Польшчу зарэгістравалася 46 311 чалавек і выехала 33 064 чалавекі[310]. Безумоўна, разам з большасцю вернікаў выехала і большасць святарства, якое не бачыла для сябе сэнсу заставацца ў атэістычнай Беларусі.

Больш цікавым з'яўляецца пытанне, ці па сваёй волі святары засталіся разам з вернікамі, ці ўсё ж яны атрымалі загад ад кіраўніцтва епархій застацца разам з вернікамі і, нягледзячы на цяжкасці працы, працягваць душпастырскую дзейнасць.

Партыйнае кіраўніцтва рэспублікі лічыла, што астаўшыяся ў Беларусі рыма-каталіцкія святары маюць прамое ўказанне Ватыкана не выязджаць з рэспублікі. Так, у запісцы першага сакратара ЦК КП(б)Б М.Гусарава, накіраванай у ЦК УсеКП(б) (ліпень 1947 г.), адзначалася, што "натхніцелямі антысавецкай барацьбы польскіх нацыяналістаў часцей за ўсё з'яўляліся прадстаўнікі рэакцыйнага каталіцкага духавенства - ксяндзы і кіруемы імі касцельны актыў"[311]. Далей ён паведамляў, што напрыканцы 1944 г. і ў 1945 г. 552 ксяндзы і іншыя святары выказалі жаданне пераехаць у Польшчу. Аднак у сапраўднасці пераехала толькі 306. Астатнія засталіся ў заходніх абласцях Беларусі. М.Гусараў падкрэсліваў: "Астатнія 246 ксяндзоў, а таксама многія іншыя служачыя рыма-каталіцкага культа засталіся на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі, адмовіліся ад выезду ў Польшчу, матывуючы гэта наяўнасцю вернікаў у іх прыходах. У сапраўднасці, як высветлілася з агентурных матэрыялаў і размоў супрацоўнікаў Міністэрства замежных спраў БССР з упаўнаважанымі польскага ўрада, астаўшыяся ў заходніх абласцях

[308] НАРБ, ф.788, воп. 1, спр.23, арк.30-31.
[309] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.23, арк.36-37.
[310] Там сама, арк.33-34.
[311] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.543, арк.27.

БССР ксяндзы маюць прамую забарону Папы Рымскага выязджаць з тэрыторыі Беларусі”[312].

Цяжка з упэўненасцю адказаць на пытанне – ці мелі святары прамое ўказанне Ватыкана застацца ў Беларусі, як меркавала партыйнае кіраўніцтва рэспублікі, ці па свайму жаданню яны засталіся ў сваіх прыходах і працягвалі сваю дзейнасць у атэістычнай Беларусі. Магчыма меркаваць, што размовы з кіраўніцтвам епархій святары мелі, і іх рашэнне выязджаць ці заставацца залежала як ад кіраўніцтва епархій, так і ад саміх святароў, якія заставаліся, ці выязджалі разам са сваімі прыхаджанамі.

Савецкая ўлада не магла пагадзіцца з тым, што нават такая нязначная колькасць рыма-каталіцкага святарства засталася ў заходніх абласцях Беларусі. Для нейтралізацыі іх дзейнасці ўлада выкарыстоўвала ўсе сродкі і найперш рэпрэсіўныя органы. Ва ўжо згаданай запісцы М.Гусарава прапанавалася наступнае “рашэнне” гэтай праблемы : “У выніку таго, што шэраг ксяндзоў, якія запісаліся польскімі грамадзянамі, але не выехалі ў Польшчу, не прызнаюць сябе савецкімі грамадзянамі і вядуць антысавецкую работу ў пагранічных з Польшчай раёнах, прыняць меры да высялення з БССР гэтых ксяндзоў, якія парушаюць савецкія законы. Дазволіць органам МДБ узмацніць рэпрэсіўныя меры ў адносінах да той часткі рыма-каталіцкага святарства, якая вядзе актыўную падрыўную работу супраць савецкай улады”[313]. Адным з дзейсных сродкаў аслаблення пазіцый касцёла ў заходнім рэгіёне Беларусі, акрамя рэпрэсіўных мер у дачыненні да рыма-каталіцкага святарства, з’яўлялася закрыццё саміх касцёлаў. У даведцы “Аб стане каталіцкай царквы на тэрыторыі Беларускай ССР”, падрыхтаванай ЦК КП(б)Б у 1954 г., адзначалася: “Па дадзеных каталіцкіх епархій, у заходніх раёнах Беларусі ў 1938 г. налічвалася 1082 тыс. католікаў, у тым ліку: у Брэсцкай вобласці мелася 99 касцёлаў, 140 ксяндзоў і 137 тыс. католікаў, у Гродзенскай вобласці – 151 касцёл, 162 ксяндзы і 492 тыс. католікаў, у Маладзечанскай –157 касцёлаў, 158 ксяндзоў і 496 тыс. католікаў. У момант правядзення рэгістрацыі каталіцкіх рэлігійных таварыстваў у 1947 г. дзейнічала 287 каталіцых рэлігійных таварыстваў, якія абслугоўваліся 203 ксяндзамі, а 37 касцёлаў, з-за выезду палякаў і святароў у Польшчу спынілі сваю дзейнасць і былі зачыненыя. На 1 ліпеня 1949 г. дзейнічалі 229 касцёлаў, якія абслугоўваліся 129 ксяндзамі. Да гэтага часу

312 НАРБ, ф.4 воп.29, спр.543, арк.27.
313 Там сама, арк.34.

рашэннямі Савета па справах рэлігійных культаў 28 касцёльных будынкаў было перададзена райвыканкамам для выкарыстання культурна-асветнымі ўстановамі, 27 касцёльных будынкаў у адміністрацыйным парадку былі занятыя пад зернасховішчы і для іншых мэтаў, 40 касцёлаў пуставала”[314].

Узаемаадносіны рымска-каталіцкага касцёла з савецкай уладай заўсёды былі складанымі. Такімі ж няпростымі, нават больш абвостранымі, яны заставаліся ў час перасялення. Жаданне ўлады скарыстаць перасяленчую акцыю і "выштурхнуць" рымакаталіцкае святарства з заходняга рэгіёна Беларусі не ажыццявілася. Большасць вернікаў і святароў праявілі аднадушша ў пытанні: пераязджаць ці заставацца. Калі большасць вернікаў прыходаў заставалася ў Беларусі, то разам з імі заставаліся і святары. У супрацьлеглым выпадку разам з вернікамі з Беларусі выязджалі і святары.

[314] НАРБ, ф.4, воп.62, спр.392, арк.363-364.

www.kamunikat.org

## Раздзел 3.
## Вясна 1945 г. Ад нейтралітэту да татальнага кантролю

### Глава 1.
### “Выкрасліць з рэгістрацыйных спісаў...”: адміністрацыйны рэсурс” у дзеянні

Працэс перасялення выявіў неадназначнае стаўленне мясцовых улад да польскага насельніцтва, якое выказала жаданне пераехаць у Польшчу. З аднаго боку, партыйна-савецкае кіраўніцтва разглядала частку зарэгістраваных на выезд у Польшчу як "варожы элемент". Так, сакратар Полацкага АК КП(б)Б Я.Жылянін паведамляў у ЦК КП(б)Б (чэрвень 1945 г.), што "ў выніку праведзенай райкамамі партыі працы ўстаноўлена, што значная частка зарэгістраваных на перасяленне ў Польшчу з'яўляецца элементамі з варожага асяроддзя. Так, па 7 раёнах (Глыбоцкім, Дунілавіцкім, Відзаўскім, Браслаўскім, Міёрскім, Дзісенскім, Плісскім, Докшыцкім, Шаркаўшчынскім) запісалася на выезд: сямей памешчыкаў - 29, нямецкіх памагатых адпаведна - 1001, дэзерціраў - 617, бандытаў - 208, кулакоў - 407, польскіх нацыяналістаў - 376, рэпрэсаваных органамі савецкай улады - 391, святароў - 8. Усяго - 3037 сямей"[315]. Зазначым, што з гэтых раёнаў на перасяленне ў Польшчу зарэгістравалася 17 583 сям'і. Такім чынам, 3037 сямей прылічылі да "варожага асяроддзя”.

З другога - мясцовае кіраўніцтва калі не адмоўна, то ў лепшым выпадку нейтральна ставілася да перасяленцаў. Адмоўнасць, у прыватнасці, праяўлялася ў тым, што раённыя ўлады, не прымаючы ў разлік артыкул № 3 беларуска-польскага пагаднення, які прадугледжваў вызваленне грамадзян, зарэгістраваных на выезд, ад усіх дзяржаўных падаткаў і страхавых плацяжоў, спісанне ўсіх недаімкаў па натуральных пастаўках у 1944-1945 гг., патрабавалі іх выканання, прымусова накіроўвалі людзей на працу па-за межы вобласці і г.д. Так, У.Царук 18 снежня 1944 г. паведамляў намесніку Старшыні СНК БССР К. Кісялёву аб тым, што “старшыня Слонімскага

[315] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.111, арк.120-121.

райвыканкама выклікае да сябе запісаных на эвакуацыю, адбірае ў іх дакументы на права выезду ў Польшчу і пад аховай накіроўвае на работу па-за межы БССР. Мелі месца і такія факты, калі па распараджэнню старшыні райвыканкама праводзіліся аблавы на рынку і ўсіх затрыманых з дакументамі на выезд у Польшчу забіралі і накіроўвалі на працу па-за межы раёна"[316]. На пачатку 1945 г. ён зноў адмоўна ахарактарызаваў дзеянні слонімскіх уладаў і падкрэсліў, што "начальнік аддзела кадраў Слонімскага райсавета разам з упаўнаважаным наркамчармета палякаў, якія запісаліся на выезд, мабілізуюць на працу па-за межы вобласці. У снежні яны мабілізавалі на працу палячак М.Галавач і Ю.Клачко, хаця апошнія мелі даведкі аб выездзе ў Польшчу ў першыя дні студзеня. Па звароту райпрадстаўнікоў СНК БССР іх вызвалілі ад працы, але ўначы яны паўторна былі схоплены, іх пагрузілі ў вагоны і адправілі. Па дарозе Галавач і Клачко збеглі і цяпер хаваюцца ў лесе"[317].

У Мастоўскім раёне старшыня райвыканкама даў загад сельскім саветам не выдаваць дакументы тым, хто поўнасцю не выканаў план лесанарыхтовак і лесавывазак. Старшыні сельскіх саветаў распараджэнні раённых уладаў выконвалі без усялякага сумневу. Вось што паведамляў старшыня Рагазніцкага сельсавета Мастоўскаму райвыканкаму: "Грамадзяніну Груяку Аляксандру Казіміравічу я выдам даведку тады, калі ён поўнасцю разлічыцца з 4-м ваенным займам у 7000 рублёў. Да таго ж ім не выканана 19 кг тытуню (па ўсёй бачнасці здача дзяржаве тытуню. – А.В.) і не вывезена 40 кубаметраў лесу. Таму, я яму даведку на выезд у Польшчу выдаць не магу"[318]. У Зельвенскім раёне ўпаўнаважаны па нарыхтоўках даў загад (хоць не меў на гэта права і паўнамоцтваў. - А.В.) не выдаваць перасяленцам неабходныя эвакадакументы, пакуль яны не разлічацца з нарыхтоўкамі за ўвесь год[319]. Прадстаўнік СНК БССР па Навагрудскаму райпрадстаўніцтву адзначаў, што ўсе зарэгістраваныя на выезд павінны былі прадставіць у райфінаддзел даведкі аб тым, што яны поўнасцю разлічыліся па ўсіх дзяржпастаўках, падатках і г.д.[320].

Справа даходзіла да таго, што нават тых, хто меў дакументы на выезд у Польшчу, прымусова накіроўвалі па аргнабору на працу. Так, У.Царук 2 красавіка 1945 г. звярнуўся з лістом да

---

[316] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.4, арк.11.
[317] НАРБ, ф.788, воп.1. спр.4, арк.13.
[318] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.8, арк.134.
[319] НАРБ, ф.7, воп.3,спр.1918, арк.36.
[320] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.161.

намесніка старшыні Баранавіцкага аблвыканкама, у якім адзначаў, што 30 сакавіка быў "мабілізаваны і накіраваны на працу ў Свярдлоўскую вобласць жыхар засценка Зубелевічы Падлескага сельсавета Ляхавіцкага раёна А.Раневіч, які зарэгістраваўся на выезд у Польшчу". Далей ён паведамляў, што "факт адпраўкі Вамі здзейснены, нягледзячы на тое, што А.Раневіч меў на руках даведку аб выездзе ў Польшчу"[321]. Улічваючы гэта, ён патрабаваў ад кіраўніцтва аблвыканкама тэрмінова адклікаць А.Раневіча з Свярдлоўскай вобласці і дазволіць яму выехаць у Польшчу. На жаль, па матэрыялах НАРБ не ўдалося высветліць лёс А.Раневіча і даведацца, ці змог ён вярнуцца з Свярдлоўскай вобласці ў Беларусь і выехаць у Польшчу. Аднак факты такога кшталту "мабілізацый" у дачыненні да тых, хто выказаў жаданне перасяліцца ў Польшчу, паказваюць, што такія дзеянні мясцовых уладаў былі досыць частымі і шматлікімі і назіраліся ў Картуз-Бярозаўскім, Глыбоцкім, Казлоўшчынскім ды іншых раёнах[322].

Негатыўнае стаўленне мясцовых уладаў да палякаў, якія зарэгістраваліся на выезд, адзначалі таксама польскія ўпаўнаважаныя. Так, памочнік С.Вішнеўскай у студзені 1945 г. паведамляў, што “мясцовыя ўлады Вілейскага і Глыбоцкага раёнаў тармозяць нармальную эвакуацыю. Старшыні сельскіх саветаў не выдаюць неабходных даведак аб польскай прыналежнасці, выганяюць палякаў з сельсаветаў"[323]. Аналагічныя прыклады прыводзілі ў сваіх паведамленнях польскія ўпаўнаважаныя з Воранаўскага, Радунскага, Радашковіцкага, Астравецкага раёнаў[324].

Такая пазіцыя мясцовых уладаў з'яўлялася невыкананнем распараджэння намесніка Старшыні СНК БССР К.Кісялёва. У снежні 1944 г. ён накіраваў старшыням усіх заходніх абласцей тэлеграму, у якой падкрэсліваў, што "польскіх грамадзян, якія выказалі жаданне вусна ці пісьмова эвакуіравацца ў Польшчу, вызваляйце ад мабілізацый на працу ў іншыя вобласці рэспублікі без прадастаўлення даведак Галоўнага ўпаўнаважанага і раённага прадстаўніка"[325]. Да таго ж К.Кісялёў рэкамендаваў старшыням аблвыканкамаў давесці яго распараджэнне да старшынь рай/гарвыканкамаў з тым, каб апошнія на мясцовым узроўні выконвалі яго. Аднак, як бачна, мясцовыя ўлады з маўклівай згоды

---

[321] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.8, арк.35.
[322] Там сама, арк.23, 36, 38, 45,79, 104, 113, 180.
[323] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.5, арк.20.
[324] Там сама, арк.45,79.
[325] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1902, арк.45.

абласнога партыйна-савецкага кіраўніцтва фактычна ігнаравалі распараджэнне К.Кісялёва. Улічваючы, што такія дзеянні парушалі ўмовы беларуска-польскага пагаднення, У.Царук прасіў К.Кісялёва патрабаваць ад мясцовых улад спынення такіх дзеянняў у адносінах да палякаў, якія запісаліся на выезд. У той жа час У.Царук станоўча характарызаваў працу раённых партыйных і савецкіх улад Стоўбцаў, Міра, якія "аказваюць паўсядзённую практычную дапамогу работнікам у іх працы. Заслугоўвае ўвагі арганізацыя працы і па раёнах Брэста"[326].

Вясной 1945 г. прынцыпова вызначыліся падыходы партыйнага кіраўніцтва рэспублікі да працэсу перасялення. Пазіцыя КП(б)Б ад нейтральнага стаўлення восенню-зімой 1944-1945 г. з вясны 1945 г. эвалюцыянуе ў бок жорсткага кантролю за дзейнасцю ўпаўнаважаных Польшчы. З боку цэнтральнай і мясцовых уладаў назіраецца тэндэнцыя па стварэнню перашкод пры рэгістрацыі, скіраваная на тое, каб па магчымасці меншая колькасць насельніцтва змагла выехаць з Беларусі. Кіраўніцтва рэспублікі, зразумеўшы, што ад'езд з заходняга рэгіёна гаспадарлівага і працаздольнага насельніцтва адмоўным чынам уплывае на яго сацыяльна-эканамічнае становішча, прымае захады па запаволенню перасялення. Гэты крок партыйнага кіраўніцтва рэспублікі з'яўляўся па-свойму лагічным і абгрунтаваным, бо, як адзначала В.Парсаданава, "апусцелыя ад вайны і фашысцкага разбою краіны імкнуліся прыцягнуць да сябе як мага больш людзей"[327].

Першым крокам, які азначаў змяненне адносін да працэсу перасялення, стаў разгляд на пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б 5 красавіка 1945 г. пытання "Аб недахопах у працы па перасяленню грамадзян польскай нацыянальнасці ў Польшчу". Па выніках яго абмеркавання СНК БССР і ЦК КП(б)Б накіравалі сумесны ліст старшыням аблвыканкамаў і сакратарам абкамаў партыі Брэсцкай, Пінскай, Гродзенскай, Баранавіцкай, Маладзечанскай і Полацкай абласцей, у якім адзначаліся недахопы ў працы па перасяленню[328]. ЦК КП(б)Б і СНК БССР выказвалі занепакоенасць тым, што значная колькасць беларусаў-католікаў запісалася на выезд у Польшчу. Гэта сведчыла аб "дрэннай пастаноўцы выхавання насельніцтва ў духу самаадданасці Савецкай Радзіме". Падкрэслівалася, што сярод польскага насельніцтва, што пажадала пераехаць у Польшчу, не вядзецца сур'ёзнай палітычнай працы,

[326] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.4, арк.12.
[327] Парсаданова В. Назв.соч. С.63-64.
[328] НАРБ, ф.4, воп.61, спр.141, арк.47.

скіраванай на тое, каб яны "пераехалі сябрамі Савецкага Саюза, а не ворагамі савецкай улады". ЦК КП(б)Б і СНК БССР прапанавалі ўсім аблвыканкамам заходніх абласцей абмеркаваць пытанне аб стане працы па перасяленню і вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па ліквідацыі адзначаных у лісце недахопаў[329].

Мясцовыя партыйныя і савецкія органы адразу ж пачалі "абмяркоўваць" ліст ЦК КП(б)Б. Аб тым, як яго "абмяркоўвалі", сведчыць запіска намесніка ўпаўнаважанага польскага ўрада ў Ашмянах С.Жалігоўскага, якую ён ў красавіку 1945 г. накіраваў С.Вішнеўскай. С.Жалігоўскі паведамляў, што на пачатку красавіка ў Ашмянах адбылася нарада ўпаўнаважаных польскага ўрада, на якой прысутнічалі намеснік старшыні Маладзечанскага аблвыканкама Ф.Маркаў і першы сакратар Маладзечанскага абкама партыі І.Клімаў, які выступіў з дакладам "Сяброўскія савецка-польскія адносіны". Аднак замест разважання пра "сяброўскія савецка-польскія адносіны" І.Клімаў абрушыўся з рэзкай крытыкай працы польскіх упаўнаважаных, якія быццам бы вядуць адкрытую агітацыю сярод палякаў, скіраваную на тое, каб зарэгістраваць як мага больш палякаў на выезд у Польшчу. Ён падкрэсліў, што сярод упаўнаважаных шмат "былых памешчыкаў і варожа настроеных да савецкай улады работнікаў". Па заканчэнні свайго выступлення І.Клімаў, звяртаючыся да прысутных пагрозліва і недвухсэнсоўна заявіў, што калі яны не зразумеюць сэнсу яго выказвання, то ў адносінах да іх будзе ўжывацца "подвал" (арышт. - А.В.)[330].

Яго выступленне, як адзначаў С.Жалігоўскі, выклікала вельмі цяжкае ўражанне ў прысутных, і многія з іх пакінулі сход, выказаўшы тым самым пратэст супраць такіх заяваў першага сакратара абкама партыі. Заўважым, што словы І.Клімава аб "подвале" не былі пустым гукам. Яшчэ да гэтага сходу 23 сакавіка 1945 г. супрацоўнікамі Іўеўскага РА НКДБ у Іўі быў арыштаваны сакратар польскага прадстаўніцтва па перасяленню У.Перліц. Нягледзячы на неаднаразовыя хадайніцтвы і звароты С.Жалігоўскага ў розныя дзяржаўныя органы аб вызваленні У.Перліца з-пад арышту, апошні так і не быў вызвалены з турмы[331]. Шматлікія арышты супрацоўнікаў апаратаў польскіх упаўнаважаных вымусілі польскі бок узняць гэтую праблему на беларуска-польскіх перамовах, якія адбыліся ў лістападзе 1945 г. Генеральны ўпаўнаважаны польскага ўрада В.Вольскі патрабаваў,

---

329 Там сама, арк.72.
330 НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1916, арк.53.
331 НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1916, арк.55.

каб у выпадку нейкіх парушэнняў ці злачынстваў, якія здзейснілі польскія ўпаўнаважаныя, яны б перадаваліся польскім уладам. Беларускі бок пагадзіўся з гэтым і абяцаў, што ў далейшым будзе ўзгадняць з польскім бокам пытанні "рэпрэсій ў адносінах да польскіх упаўнаважаных, якія здзейснілі злачынствы"[332].

Аднак галоўным вынікам ліста СНК БССР з'яўлялася канстатацыя ўрадам Беларусі факта, што "ў шэрагу раёнаў пад выглядам палякаў на выезд у Польшчу была зарэгістраваная значная колькасць беларусаў-католікаў. Выключэнне з рэгістрацыйных спісаў беларусаў-католікаў, якіх няправільна ўнеслі ў гэтыя спісы, праводзіцца марудна"[333]. Зыходзячы з гэтага, ўрад Беларусі прымае рашэнне аб перадачы права вызначэння нацыянальнасці, рэгістрацыі і выдачы дакументаў на выезд змешаным камісіям, у склад якіх уваходзілі работнікі райкамаў, райвыканкамаў, прадстаўнікі СНК БССР і ўпаўнаважаныя польскага ўрада. Старшынёй камісіі, як правіла, з'яўляўся прадстаўнік рай/гарвыканкама. У выпадку, калі змешаная камісія не прыходзіла да пагаднення ў пытанні вызначэння нацыянальнасці, справа павінна была перадавацца на разгляд Галоўнага прадстаўніка СНК БССР і Галоўнага ўпаўнаважанага польскага ўрада, рашэнне якіх прызнавалася канчатковым.

Ініцыятарам стварэння змешаных камісій з'яўляўся беларускі бок, а дакладней, Галоўны прадстаўнік СНК БССР У.Царук. 20 сакавіка 1945 г. ён накіраваў К.Кісялёву ліст, у якім прапанаваў стварыць змешаныя камісіі, у склад якіх уваходзілі б прадстаўнікі абодвух бакоў, а таксама мясцовых уладаў[334]. Прапанова У.Царука была абмеркавана ва ўрадзе Беларусі, а 7 красавіка 1945 г. СНК БССР прыняў пастанову аб іх стварэнні. У ёй адзначалася, што "Саўнарком БССР прапануе для рашэння спрэчных пытанняў аб нацыянальнай прыналежнасці асобных грамадзян, якія падалі заявы на перасяленне ў Польшчу, стварыць пры выканкамах рай/гарсаветаў, камісіі з удзелам прадстаўнікоў выканкамаў, райпрадстаўнікоў СНК БССР і ўпаўнаважаных часовага ўрада Польскай Рэспублікі"[335]. Ва ўсе аблвыканкамы заходніх абласцей разаслалі тэлеграмы, у якіх адзначалася, што "Савет Народных Камісараў абавязвае мясцовыя органы праз апарат Галоўнага прадстаўніка СНК БССР тэрмінова перагледзець рэгістрацыйныя лісты і выключыць з іх грамадзян няпольскай нацыянальнасці, якія

[332] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.10, арк.115.
[333] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.1, арк.48.
[334] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1916, арк.2.
[335] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1917, арк.47.

памылкова былі ўнесены ў рэгістрацыйныя спісы. Разгарнуць практычную працу па афармленню эвакуацыйных дакументаў і арганізацыі самой эвакуацыі"[336].

Выконваючы пастанову ўрада, на месцах тэрмінова пачалі ствараць змешаныя камісіі. Шэраг высокапастаўленых партыйна-савецкіх работнікаў выехалі ў раёны, каб на месцах "дапамагчы" іх стварэнню. Так, напрыканцы красавіка 1945 г. у Глыбоцкае прадстаўніцтва былі камандзіраваны загадчык аргаддзела ЦК КП(б)Б В. Закурдаеў і загадчык ваеннага аддзела М. Прохараў, якія прынялі актыўны ўдзел у стварэнні змешанай камісіі. 8 мая 1945 г. у Глыбокім адбылася нарада сакратароў РК КП(б)Б, на якой абмяркоўвалася пытанне аб працы мясцовых органаў улады па перасяленню насельніцтва. Па выніках нарады было прынята рашэнне аб тэрміновай праверцы спісаў тых, хто ўжо зарэгістраваўся на выезд у Польшчу[337].

Аналагічныя нарады адбыліся ва ўсіх раёнах заходніх абласцей. Так, сакратар Полацкага АК КП(б)Б Я.Жылянін напрыканцы красавіка 1945 г. паведамляў у ЦК КП(б)Б, што "для перагляду дакументаў, па якіх праводзілася рэгістрацыя для перасялення ў Польшчу, у кожным раёне былі створаны камісіі. Яны пачалі працу з 4-9 мая і да 22 мая 1945 г. закончылі разгляд заяў па ўсіх 9 раёнах"[338]. Фактычна з гэтага моманту працэс перасялення трапіў пад пільны і жорсткі партыйна-савецкі кантроль.

З пачаткам працы змешаных камісій узніклі істотныя разыходжанні ў падыходах беларускіх прадстаўнікоў і польскіх упаўнаважаных у пытанні аб вызначэнні нацыянальнасці. Справа ў тым, што кожны бок намагаўся прытрымлівацца ўказанняў вышэйстаячых органаў, што непазбежна вяло да супярэчнасцей. Так, разам з раней вызначанымі дакументамі (польскае пасведчанне асобы, польскі ваенны білет, выпіскі з валасных кніг, пасведчанне асобы і савецкія пашпарты ўзору 1939-1941 гг., даведкі сельсаветаў, завераныя райвыканкамам і іншыя афіцыйныя дакументы з адзнакай нацыянальнасці) польскі бок лічыў, што нямецкія пашпарты, а таксама вусныя заявы павінны ўлічвацца пры вызначэнні нацыянальнасці. Таму С.Вішнеўская дала вусны загад польскім упаўнаважаным рэгістраваць грамадзян па ўсіх дакументах, у тым ліку па нямецкіх пашпартах

---

[336] НАРБ, ф.788, воп.1, спр. 4. арк.73.
[337] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.282.
[338] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.111, арк.86.

ды вусных заявах[339]. Заўважыўшы гэты факт, Галоўны прадстаўнік СНК БССР У.Царук у катэгарычнай форме патрабаваў ад С.Вішнеўскай адмяніць гэты загад, аднак, як ён падкрэсліваў, С.Вішнеўская, не менш катэгарычна, адмовілася гэта зрабіць[340].

У сувязі з такой пазіцыяй польскага боку паўстае пытанне, чаму так упарта С.Вішнеўская настойвала на рэгістрацыі насельніцтва па нямецкіх пашпартах, іншых дакументах ды вусных заявах. Справа ў тым, што ў пасляваенны час у значнай часткі насельніцтва меліся пасведчанні асобы, выданыя акупацыйнымі ўладамі, або наогул не мелася ніякіх дакументаў. Напрыклад, па 7 раёнах (Глыбоцкім, Дунілавіцкім, Відзаўскім, Міёрскім, Дзісенскім, Докшыцкім, Шаркаўшчынскім) Полацкай вобласці па стану на 1 мая 1945 г. на выезд у Польшчу зарэгістравалася 11 605 сямей. Аднак у выніку працы змешанай камісіі вызначылася, што найбольшая колькасць насельніцтва зарэгістравалася менавіта па нямецкіх пашпартах і вусных заявах. Так, па савецкіх пашпартах 1940-1941 гг. зарэгістравалася 668 сямей, савецкіх пашпартах 1944-1945 гг. адпаведна - 704, даведках сельсаветаў - 986, польскіх пашпартах - 726, нямецкіх пашпартах і іншых нямецкіх дакументах - 3258, замежных пашпартах - 15, іншых дакументах - 167. 5091 сям'я зарэгістравалася без дакументаў па вусных заявах[341]. Зразумела, што выключэнне з рэгістрацыйных спісаў грамадзян, што зарэгістраваліся па нямецкіх пашпартах, вусных заявах ды іншых дакументах рэзка зніжала колькасць людзей, якія мелі права на выезд. Улічваючы вышэйадзначанае, становіцца зразумелай пазіцыя С.Вішнеўскай і яе загад аб рэгістрацыі грамадзян па нямецкіх пашпартах, іншых дакументах ды вусных заявах, якія не ўлічваліся беларускім бокам.

Пасведчанне асобы, выдадзенае акупацыйнымі нямецкімі ўладамі, у якіх пазначалася нацыянальнасць "паляк", прыносіла іх уладальнікам шмат непрыемнасцей і клопатаў. Райпрадстаўнікі СНК БССР з вясны 1945 г. гэтыя дакументы не прымалі пад увагу, у той час як у многіх людзей не было іншых дакументаў. Райпрадстаўнік з Пружан Р.Дарожка паведамляў у маі 1945 г. намесніку галоўнага прадстаўніка СНК БССР па перасяленню П.Алышаву: "Дакладваю Вам, што зарэгістраваныя на эвакуацыю ў Польшчу па нямецкіх пашпартах грамадзяне мною на выезд у Польшчу дапушчаныя не будуць з-за таго, што гэтыя нямецкія

[339] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.243.
[340] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.4, арк.26.
[341] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.111, арк.121.

пашпарты не з'яўляюцца законнымі дакументамі. Для падтрымкі маіх дзеянняў прашу пацвярджаючых указанняў мне і тэрміновых указанняў польскаму боку праз іх галоўнага ўпаўнаважанага"[342].

У шматлікіх выпадках прадстаўнікі мясцовых уладаў забіралі нямецкія пасведчанні асобы (аусвайс), а ўзамен іх выдавалі савецкія пашпарты, у якіх палякі "пераўтвараліся" ў беларусаў. Як прадстаўнікі ўладаў ставіліся да ўладальнікаў нямецкіх пашпартоў, сведчыць, напрыклад, скарга жыхара Жыровіч І.Світала, якую ён накіраваў упаўнаважанаму польскага ўрада ў Слоніме. Ён паведамляў, што да яго прыйшоў участковы райаддзела НКУС і пад выглядам праверкі дакументаў забраў нямецкі пашпарт і прама на вачах парваў яго[343]. Улічваючы, што гэта быў адзіны дакумент, у якім пазначалася, што па нацыянальнасці ён паляк, І.Світала прасіў упаўнаважанага пацвердзіць яго нацыянальнасць, бо толькі гэта давала яму магчымасць зарэгістравацца на выезд у Польшчу.

Неабходна заўважыць, што масавы запіс насельніцтва на выезд у Польшчу таксама быў "справакаваны" недасканаласцю нарматыўна-прававой базы. Так, артыкул 14, пункт 3 "б" беларуска-польскага пагаднення вызначаў, што "польскія ўпаўнаважаныя ў пунктах іх дзейнасці, сумесна з прадстаўнікамі СНК БССР, у вызначаныя дні атрымоўваюць заявы жадаючых эвакуіравацца (*у пісьмовай або вуснай форме*), *па магчымасці з дакументамі аб нацыянальнасці* (выдзелена аўтарам. – А.В.), не пазней чым у трохмесячны тэрмін з дня публікацыі"[344]. Безумоўна, недакладнасць гэтай фармулёўкі давала шырокую прастору дзейнасці ўпаўнаважаным Польшчы пры рэгістрацыі ўсіх, хто жадаў гэта зрабіць.

Прадстаўнікі СНК БССР у адрозненне ад упаўнаважаных часовага польскага ўрада прызнавалі ў якасці асноўных дакументаў толькі савецкія пашпарты 1939-1945 гг., даведкі, якія выдаваліся сельсаветамі і былі завераныя райвыканкамамі, польскія пашпарты, польскія ваенныя білеты. Вызначэнне беларускім бокам менавіта гэтых дакументаў рэзка звужала колькасць грамадзян, якія мелі права на рэгістрацыю, выклікала шматлікія скаргі палякаў, якіх выкрэслівалі з рэгістрацыйных спісаў.

Змешаныя камісіі, выконваючы пастанову СНК БССР, пачалі масава выкрэсліваць беларусаў-католікаў і тых грамадзян,

---

342 НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.124.
343 НАРБ, ф.788, воп.1, спр.12, арк.86.
344 НАРБ, ф.788, воп.1, спр.1, арк.32.

якія зарэгістраваліся не па вызначаных беларускім бокам дакументах. Так, у выніку працы змешанай камісіі па Глыбоцкаму райпрадстаўніцтву з 17 583 зарэгістраваных сямей 10 932 прызналі беларускімі, што склала 65 % ад усёй колькасці зарэгістраваных. Толькі 6651 сям'я была прызнана польскай, а значыць, мела права на перасяленне[345]. Грамадзян, якія не з'явіліся на пасяджэнне змешанай камісіі для разгляду іх пытання аб нацыянальнасці, аўтаматычна прызналі беларусамі[346]. Па Вілейскаму райпрадстаўніцтву толькі ў ліпені 1945 г. былі разгледжаны заявы ад 2597 грамадзян, з якіх палякамі прызналі 1961, а астатніх палічылі беларусамі-каталікамі і выкраслілі са спісаў[347]. У Міёрскім раёне Полацкай вобласці на выезд зарэгістравалася звыш 4 тыс. гаспадарак з 9384, якія меліся ў раёне. Аднак змешаная камісія праверыўшы 2321 заяву "з яўна падазронымі звесткам аб іх сапраўднай нацыянальнай прыналежнасці" прызнала польскімі ўсяго 20 гаспадарак[348].

Разглядаючы гэты аспект перасялення, неабходна адзначыць наступнае. Змешаныя камісіі, пераправяраючы рэгістрацыйныя спісы, якія былі складзены да 1 мая 1945 г., грамадзян, што не з'явіліся на камісію, адразу ж прызнавалі беларусамі і выкрэслівалі са спісаў. Так, Глыбоцкае райпрадстаўніцтва адзначала, што "ў працэсе працы змешанай камісіі па вызначэнню нацыянальнасці з ліку зарэгістраваных на эвакуацыю ў Польшчу працэнтаў 40-50 на праверку дакументаў у сельскія саветы не з'явілася. У сувязі гэтым нацыянальнасць вызначаюць праз мясцовы сельскі актыў і старажылаў"[349]. Безумоўна, у такіх выпадках пры вызначэнні нацыянальнасці суб'ектыўны фактар, асабістыя меркаванні "старажылаў" і г.д. адыгрывалі вельмі істотную ролю.

Прадузятасць мясцовых уладаў, якія фактычна выконвалі палітычны загад, прыводзіла да таго, што, як адзначаў памочнік Галоўнага прадстаўніка СНК БССР А.Карпаў, "асабістая праверка сумесна з упаўнаважанымі польскага ўрада па Глыбоцкаму райпрадстаўніцтву паказала, што зроблена шмат памылак. Ва ўсіх раёнах грамадзян, якія не з'явіліся на пасяджэнне змешаных камісій, па важных альбо без прычын прызналі беларусамі"[350]. У сувязі з гэтым ён даў распараджэнне дэталёва і ўважліва

[345] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.287.
[346] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.8, арк.100.
[347] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.243.
[348] НАРБ, ф.4, воп.51, спр.11, арк.27.
[349] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк. 291.
[350] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.8, арк.103.

правяраць усе спісы і беспадстаўна выключаных зноўку ўключыць у іх.

Аб выніках працы змешанай камісіі па Глыбоцкаму райпрадстаўніцтву (па стану на 17 мая 1945 г.), дае ўяўленне наступная табліца[351].

| Раёны, якія ўваходзілі ў Глыбоцкае райпрадстаўніцтва | Падана заяў на перасяленне | Разгледжана заяў | Прызналі палякамі |
|---|---|---|---|
| Пліскі | 1799 | 503 | 43 |
| Дунілавіцкі | 1678 | 1446 | 47 |
| Браслаўскі | 1678 | 1638 | 43 |
| Міёрскі | 2900 | 2300 | 21 |
| Відзаўскі | 577 | 417 | 22 |
| Шаркоўшчынскі | 1780 | 350 | 1 |
| Дзісенскі | 226 | 226 | 15 |
| Глыбоцкі | 623 | 623 | 55 |
| Докшыцкі | 644 | 405 | 37 |
| Усяго: | 11 284 | 7638 | 284 |

Чым жа абгрунтоўвалі сваё рашэнне члены змешанай камісіі, якія вызначалі падаўшага заяву беларусам-каталікам, беларусам ці палякам. Бадай найгалоўнейшым у прыняцці рашэння аб вызначэнні нацыянальнасці з'яўлялася канфесійная прыналежнасць. Красамоўна аб гэтым сведчыць ужо згаданая запіска І.Карпава, які адзначаў: "Насельніцтва пытанне нацыянальнасці блытае з рэлігійным. На першае пытанне – "якой нацыянальнасці" - адказваюць: "Я каталік, мой бацька, маці, мае дзяды і прадзеды былі каталікамі". Калі ж пытаеш дэталёва і даведваешся ад старажылаў, то вынікае, што беларус-каталік"[352]. І.Карпаў паведамляў, што ў дакументах, якія былі выдадзеныя нямецкімі акупацыйнымі ўладамі, а таксама ў савецкіх пашпартах і ваенных білетах, выдадзеных у 1944-1945 гг., графа "нацыянальнасць" запаўнялася менавіта на аснове веравызнання, і беларус-каталік пераўтвараўся ў паляка. У выказванні І.Карпава маецца сэнс, але ў дадзеным выпадку "сутыкнуліся" зусім процілеглыя падыходы. Мясцовае насельніцтва, зыходзячы з таго, што яны каталікі і "бацькі і дзяды былі каталікі", атаесамляла веравызнанне з польскасцю і лічыла сябе палякамі. Для

[351] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.282.
[352] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.283.

прадстаўнікоў змешаных камісій веравызнанне, і ў гэтым была свая рацыя і логіка, не атаясамлялася з нацыянальнасцю, а фактар пражывання на беларускіх землях даваў аснову лічыць католікаў беларусамі. Як гэта ні дзіўна, але высновы прадстаўнікоў змешаных камісій, ды і ўвогуле пункт гледжання партыйна-савецкага кіраўніцтва рэспублікі на гэтую праблему супадаў з пунктам гледжання шэрагу прадстаўнікоў беларускай дыяспары, якія “не бачылі палякаў” ці не хацелі бачыць іх на захадзе рэспублікі. Так, М.Волаціч у артыкуле, прысвечаным перасяленню, што адбывалася ў 1944-1946 гг., піша: “У 1944-1945 гг. па вёсках Заходняй Беларусі, што знаходзяцца на ўсход ад новай савецка-польскай мяжы, *не было зусім польскага насельніцтва* (падкрэслена М.Волацічам. – А.В.). Вёска Заходняй Беларусі засталася чыстай і аднароднай паводле этнічнага складу, пайменна – беларускай. Такім чынам, 90 % перасяленцаў – гэта беларусы-католікі, што меркавалі вырвацца з–пад бальшавіцкага ярма, выкарыстоўваючы перасяленчую ўмову. Палякаў было прыблізна каля 45 000 у гарадах Заходняй Беларусі на ўсход ад “лініі Керзана” і столькі ж выехала ў Польшчу”[353]. Аднак наўрад ці магчыма пагадзіцца з высновай М.Волаціча, асабліва ў дачыненні пытання аб беларусах-католіках, тым больш што ўжо адзначалася, як ставіліся змешаныя камісіі да тых, каго лічылі беларусамі-католікамі. Неабходна толькі пагадзіцца з думкай М.Волаціча, што тыя, хто рэгістраваўся на перасяленне, на самай справе жадалі вырвацца з “бальшавіцкага ярма”.

Увогуле да праблемы беларусаў-католікаў змешаныя камісіі падыходзілі даволі спрошчана і прамалінейна. Вось як, напрыклад, рашылі яе ў Навагрудскім райпрадстаўніцтве. Памочнік райпрадстаўніка СНК БССР па перасяленню паведамляў У.Цаpуку (ліпень 1945 г.), што "сярод зарэгістраваных сялян ёсць вялікая колькасць тых, якія не маюць дакументаў і з'яўляюцца мясцовымі ўраджэнцамі, а таму значная колькасць з іх з'яўляецца беларусамі-католікамі"[354]. Такі падыход прывёў да таго, што пры пераглядзе рэгістрацыйных спісаў толькі летам 1945 г. было пераправерана звыш 30 тыс. заяў, з якіх змешаныя камісіі палякамі палічылі толькі каля 15%, астатнія ж разглядаліся як беларусы-католікі, “трапіўшыя пад ўплыў нацыяналістычных элементаў” і таму не мелі права на перасяленне[355].

[353] Волаціч М. Насельніцтва Заходняй Беларусі ...С.27.
[354] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.171.
[355] НАРБ, ф.4, воп.51, спр.13, арк.52.

Пераправерка рэгістрацыйных спісаў, што ажыццяўлялася вясной-летам 1945 г., з'яўлялася не проста адміністрацыйна-бюракратычнай працэдурай, а набыла формы шырокамаштабнай палітычнай кампаніі. Сведчаннем гэтага можа быць запіска Полацкага абкама партыі, накіраваная ў чэрвені 1945 г. у ЦК Кампартыі Беларусі, у якой падкрэслівалася, што "ў сувязі з працай па перасяленню палякаў у Польшчу абкам партыі, райкамы правялі сярод насельніцтва заходніх раёнаў вялікую масава-палітычную працу. За красавік-май ва ўсіх населеных пунктах праведзена па 3-4 сходы сялян, на якіх рабіліся даклады аб міжнародным становішчы СССР, аб заключэнні пагаднення Савецкага Саюза з Польшчай і іншыя. У дапамогу райкамам партыі з абкама былі накіраваны адказныя работнікі і прапагандысцкія групы для правядзення сярод насельніцтва палітычнай працы"[356].

Пачатак працы змешаных камісій засведчыў, што польскія ўпаўнаважаныя фактычна былі адхілены ад працы ў змешаных камісіях і не маглі ўплываць на прыняцце канчатковага рашэння. Так, супрацоўнік апарата Галоўнага ўпаўнаважанага польскага ўрада Д.Вайцаховіч, які 29 чэрвеня 1945 г. прысутнічаў на пасяджэнні змешанай камісіі ў Гальшанах, склаў рапарт аб значных парушэннях з беларускага боку пры вызначэнні нацыянальнасці грамадзян. Ён паведамляў, што са спісаў выкрэслівалі нават тых, хто меў польскія дакументы, а таксама савецкія пашпарты 1940 г. і даведкі з сельскіх саветаў. Як вызначалі нацыянальнасць прадстаўнікі сельсаветаў у змешаных камісіях, ён паведамляў наступнае: "Так, дэпутат сельсавета (Гальшанскага. - А.В.) Юрэвіч адзначыў: "Тутэйшы", і паляка, нягледзячы на мае энергічныя пратэсты, запісалі беларусам"[357]. Д.Вайцаховіч  адзначаў, што яго прысутнасць на пасяджэннях змешанай камісіі ў Гальшанах была “не толькі безвыніковай, але і зусім непатрэбнай”[358].

Упаўнаважаны польскага ўрада ў Лідзе накіраваў С.Вішнеўскай рапарт, у якім адзначаў немэтазгоднасць працы з беларускімі прадстаўнікамі, бо апошнія ў аднабаковым парадку выкрэслівалі палякаў са спісаў, што з'яўлялася незаконным, бо ў такіх выпадках павінна была быць двухбаковая згода як прадстаўнікоў СНК БССР, так і ўпаўнаважаных Польшчы[359].

[356] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.111, арк.127.
[357] НАРБ, ф.788,воп.1, спр.5, арк.91.
[358] Там сама, арк.91.
[359] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1905, арк.98.

Рапарты і дакладныя аналагічнага зместу паступалі на імя С.Вішнеўскай з Пружан, Свіры, Ашмян ды іншых раёнаў[360].

Вынікі працы змешаных камісій выклікалі ў палякаў нязгоду і энергічныя пратэсты з-за таго, што іх палічылі беларусамі ці беларусамі-каталікамі і таму адмовілі ў праве рэгістрацыі на выезд у Польшчу. Сакратар Полацкага АК КП(б)Б Я.Жылянін паведамляў у ЦК КП(б)Б (чэрвень 1945 г.), што "ў час працы змешаных камісій у асобных сельсаветах адбываліся антысавецкія выступленні, арганізаваныя класава-варожымі элементамі. Так, у Біндзючанскім сельсавеце Шаркаўшчынскага раёна ў камісію з'явілася каля 100 чалавек (пераважна жанчыны). Грамадзянка Васюцёнак з натоўпу крычала: "Жанчыны, усе падымайце рукі, мы ўсе палякі і павінны выехаць у Польшчу". У Быстромскім сельсавеце Браслаўскага раёна да прыезду камісіі ў сельсавеце сабралася каля 80 жанчын, і калі камісія папрасіла іх выйсці і не перашкаджаць працы, то ў натоўпе закрычалі: "Мы палякі і жадаем паехаць у Польшчу", а пасля запелі польскі гімн. У Тумашэўскім сельсавеце Глыбоцкага раёна з 25 зарэгістраваных камісія прызнала палякамі толькі 5, а астатніх палічылі беларусамі. Аднак усе сабраўшыяся ўварваліся ў памяшканне будынка сельсавета, дзе працавала камісія. Многія сталі крычаць, што зараз разнясуць сельсавет, калі іх не запішуць палякамі"[361].

Кардынальныя змены палітычнага кіраўніцтва рэспублікі ў адносінах да перасялення, эвалюцыя ў бок яшчэ больш жорсткага адміністрацыйнага кантролю за яго ходам звязаны з разглядам 22 мая 1945 г. на бюро ЦК КП(б) пытання “Аб недахопах у працы партыйных арганізацый заходніх абласцей БССР па перасяленню грамадзян польскай нацыянальнасці з Беларусі ў Польшчу”. Па выніках абмеркавання гэтага пытання ЦК КП(б)Б прыняў пастанову, якая па зместу значна адрознівалася ад красавіцкага ліста ЦК КП(б)Б і СНК БССР, накіраванага ва ўсе аблвыканкамы заходніх абласцей. У ёй жорстка крытыкавалася абласное і раённае партыйнае і савецкае кіраўніцтва за тое, што “абкамы і райкамы, аблвыканкамы і райвыканкамы пры правядзенні працы па перасяленню польскага насельніцтва з БССР у Польшчу, самаадхіліліся ад гэтай працы, цалкам пераклаўшы працу па эвакуацыі на раённых прадстаўнікоў СНК БССР па эвакуацыі, што прывяло да сур'ёзных памылак у правядзенні гэтага важнага палітычнага мерапрыемства”[362].

[360] Там сама, арк.112, 122, 125.
[361] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.111, арк.126.
[362] НАРБ, ф.4, воп.61, спр.157, арк.12.

Разам з канстатацыяй факта “адхіленне” ад працы кіраўніцтва заходніх абласцей не менш жорстка крытыкавалася за тое, што дазволіла “правядзенне антысавецкай агітацыі польскіх нацыяналістаў, ксяндзоў і кулакоў” сярод насельніцтва заходніх абласцей, скіраванай на выезд у Польшчу, бескантрольнасць за дзейнасцю польскіх упаўнаважаных, якія, праводзячы рэгістрацыю на выезд, прылічалі беларусаў-католікаў да палякаў па нямецкіх пашпартах ды даведках, якія былі выдадзеныя ксяндзамі, і іншых дакументах, якія не мелі юрыдычнай сілы. Аднак самым галоўным у гэтай пастанове з'яўляўся пункт № 1, у якім ЦК КП(б)Б патрабаваў ад абкамаў і рай/гаркамаў "пераглядзець спісы зарэгістраваных на выезд з Беларусі ў Польшчу і асоб, якія няправільна ўнесены ў спісы на аснове нямецкіх пашпартоў і іншых дакументаў, што не маюць юрыдычнай сілы, выключаць з рэгістрацыйных спісаў"[363].

Мясцовыя ўлады да рашэння бюро ЦК КП(б)Б ад 22 мая 1945 г. у сапраўднасці нейтральна ставіліся да працэсу перасялення і актыўна не ўмешваліся ў яго ход. Так, намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б І.Краўчанка, які правяраў арганізацыю працэсу перасялення ў Відзаўскім раёне Полацкай вобласці, адзначаў, што “абкам партыі стаяў збоку ад усёй працы па перасяленню і толькі ў сярэдзіне красавіка (1945 г.) Полацкі абкам КП(б)Б і аблвыканкам прынялі рашэнне па пытанню перасялення. Райкам партыі настойваў на новай перарэгістрацыі, аднак адказу на гэтае пытанне з боку абкама партыі не атрымаў. Яно было вырашана пазней – у маі, у сувязі з прыездам работнікаў ЦК у Полацкую вобласць”. Ён падкрэсліваў, што “зараз абкам партыі і мясцовыя партыйныя арганізацыі надаюць значную ўвагу перасяленню і ўзялі гэтую справу ў свае рукі”[364]. Выснову І.Краўчанкі пацвердзіў загадчык ваеннага аддзела ЦК КП(б)Б М.Прохараў, які ў красавіку 1945 г. правяраў працу Глыбоцкага райпрадстаўніцтва. Ён падкрэсліў: “Страшэнна здзіўляе тое, што раённыя камітэты партыі і райвыканкамы зусім не займаюцца гэтым пытаннем, не цікавяцца ходам рэгістрацыі і не выяўляюць прычын, якія выклікалі такія вялізныя патокі сялян на рэгістрацыю для эвакуацыі ў Польшчу. У Браслаўскім раёне прадстаўнік райвыканкама пачаў працаваць толькі некальні дзён назад у складзе камісіі. У Відзаўскім раёне, Міёрах і іншых раёнах, як гэта заяўляе райупаўнаважаны Дружкевіч, таксама прадстаўнікоў партыйных і савецкіх органаў раёна ў камісіях няма

[363] НАРБ, ф.4, воп.61, спр.157, арк.13.
[364] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.828, арк.46.

і рэгістрацыя праводзіцца без нашага кантролю. Полацкі абкам КП(б)Б і аблвыканкам прагледзелі праводзімую ў гэтых раёнах варожымі элементамі працу, і зараз ніякіх мер да выпраўлення не прымаецца"[365].

Аналагічнае становішча назіралася ў Баранавіцкай, Маладзечанскай ды іншых абласцях, у якіх абласное і раённае партыйна-савецкае кіраўніцтва не надавала значнай увагі перасяленню. Так, за 4 квартал 1944 г. Баранавіцкі аблвыканкам ні разу не разглядаў на сваіх пасяджэннях пытання аб перасяленні польскіх грамадзян з вобласці[366]. Гэта пацвярджаецца і выказваннем прадстаўніка СНК БССР па Баранавіцкаму райпрадстаўніцтву, які адзначыў, што "да рашэння ЦК КП(б)Б ад 22 мая 1945 г. мясцовыя партыйныя і савецкія ўлады ў раёнах Баранавіцкай вобласці не цікавіліся рэгістрацыяй польскага насельніцтва ў сваіх раёнах, не надавалі належнага палітычнага значэння гэтаму мерапрыемству"[367]. У Маладзечанскай вобласці за аналагічны перыяд аблвыканкам толькі адзін раз абмеркаваў пытанне аб перасяленні, прычым галоўная ўвага звярталася на прыём перасяленцаў, якія пераехалі ў вобласць з Польшчы[368].

Як гэта ні парадаксальна гучыць, але да рашэння ЦК КП(б)Б мясцовыя партыйна-савецкія органы на самай справе "самаўхіліліся" ад кантролю за ходам перасялення. Тлумачэнне гэтаму факту можа быць наступнае. Па-першае, мясцовае кіраўніцтва насельніцтва, якое зарэгістравалася на выезд, ужо не лічыла грамадзянамі Беларусі і не надавала значнай увагі працы сярод іх. Маўляў, і так ад'язджаюць. Так, кіраўнік Брэсцкага райпрадстаўніцтва паведамляў У.Царуку, што адной з сур'ёзных перашкод у працы з'яўляецца тое, што "мясцовыя органы ўлады надаюць мала ўвагі гэтаму пытанню (перасяленню. - А.В.). Лічаць, што ўсю працу павінны рабіць камісіі і, у прыватнасці, не аказваюць дапамогі транспартам для падвозкі перасяленцаў да чыгункі"[369]. Намеснік райпрадстаўніка СНК БССР па перасяленню Малікаў у верасні 1945 г. ахарактарызываў пазіцыю сакратара Казлоўшчынскага райкама партыі наступным чынам: "Сакратар РК КП(б)Б Т.Нікіцін заяўляе: "Эвакуацыя польскіх грамадзян для мяне не з'яўляецца партыйнай задачай, у мяне ў раёне палякаў няма. Пытаннем іх эвакуацыі займацца я не жадаю, у мяне для

365 Там сама, арк.29.
366 ЗДА г. Баранавічы, ф.188, воп.1, спр.80, арк.1-345.
367 НАРБ, ф.788, воп.1, спр.8, арк.78.
368 ЗДА г. Маладзечна, ф.237, воп.4, спр.2, арк.110.
369 НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.3.

гэтага няма часу. Усіх вашых палякаў прымушу працаваць, а калі спатрэбіцца, вывезем іх у Сібір, а не ў Польшчу"[370]. Не "адставаў" ад сакратара райкама партыі і сакратар Яворскага сельсавета Казлоўшчынскага раёна: "Адкуль у мяне могуць быць палякі, калі яны нарадзіліся тут. Калі б яны нарадзіліся ў Беластоку ці ў Варшаве, то маглі б ехаць, а гэтых палякаў я нікуды не пушчу. Не трэба ім прыходзіць да мяне ні за якімі даведкамі, выдаваць іх я ім не буду"[371].

Па-другое, і, напэўна, самае галоўнае, такое стаўленне мясцовых уладаў да палякаў, якія зарэгістраваліся на выезд у Польшчу, з'яўлялася адлюстраваннем пазіцыі партыйнага кіраўніцтва Беларусі да палякаў у час перасялення. На VIII пленуме ЦК КП(б)Б (12 снежня 1945 г.) П.Панамарэнка заявіў наступнае: "Паступіла пытанне - ці будуць галасаваць і ўдзельнічаць у выбарах палякі, якія запісаліся на выезд у Польшчу (П.Панамарэнка меў на ўвазе маючыя адбыцца ў 1946 г. выбары ў Вярхоўны Савет СССР. - А.В.). Палякі, якія запісаліся на выезд у Польшчу, галасаваць, прымаць удзел у выбарах не будуць, бо яны выязджаюць з Беларусі для таго, каб стаць грамадзянамі іншай дзяржавы, таму нам іх галасы непатрэбныя. З выбарчых спісаў, там, дзе яны ўключаны, неабходна іх выключыць. Пры гэтым мае вялікае значэнне той характар, які вы нададзіце гэтай справе. У працы з польскім насельніцтвам патрэбна засвоіць адно, каб палякі, па магчымасці большая колькасць з тых, хто запісаўся на выезд у Польшчу, выехалі сябрамі Савецкага Саюза. Мы павінны гэта разумець і ў вядомай гістарычнай перспектыве. Калі хто з іх зараз нават злосны ці настроены супраць нас, ці мае нейкую прадузятасць пад уплывам чаго-небудзь, тым не менш мы павінны з імі быць да апошняга лаяльнымі. У адносінах да палякаў, якія ад'язджаюць у Польшчу, усё павінна адпавядаць закону. Таму выключэнне іх са спісаў выбаршчыкаў не павінна насіць зневажальнага характару, дыскрымінацыі. Неабходна растлумачыць палякам, якія запісаліся на выезд у Польшчу, чаму яны пазбаўлены права галасавання"[372]. Як вынікае са слоў П.Панамарэнкі, і ён ужо не лічыў палякаў грамадзянамі Беларусі, бо яны "становяцца грамадзянамі іншай дзяржавы".

Па-трэцяе, як у партыйных, так і савецкіх органах катастрафічна не хапала неабходнай колькасці работнікаў, якія б ведалі польскую мову, умовы жыцця, побыту, звычаі польскага

---

[370] Там сама, арк.318.
[371] Там сама, арк.319.
[372] НАРБ, ф.4, воп.20, спр.224, арк.131-132.

насельніцтва і маглі б дастаткова эфектыўна весці сярод яго працу. Красамоўным сведчаннем таго, як "працавалі" партыйна-савецкія органы сярод насельніцтва заходніх абласцей, з'яўляецца запіска Гродзенскага абкама партыі, накіраваная ў ЦК КП(б)Б на пачатку кастрычніка 1944 г. У ёй паведамлялася, што "з боку насельніцтва маюцца цалкам абгрунтаваныя скаргі на тое, што мы (работнікі парторганаў. - А.В.) вельмі мала растлумачвалі, а часцей за ўсё прыязджалі для таго, каб патрабаваць выканання рознага кшталту дзяржаўных заданняў. Таму выкананне гаспадарчых заданняў не заўсёды стасавалася з палітычнай работай. Даклады і выступленні носяць абстрактны характар і не звязаны з мясцовым жыццём і мясцовымі справамі"[373].

Для таго каб, “выправіць” становішча з партыйна-савецкім актывам у заходніх абласцях Беларусі, ЦК Кампартыі Беларусі быў вымушаны накіраваць на працу туды вялікую колькасць партыйнага чынавенства. На бюро ЦК КП(б)Б, якое адбылося 31 кастрычніка 1944 г., адзначалася, што “партыйныя і савецкія органы заходніх абласцей і раёнаў укамплектаваны работнікамі надзвычай слаба. Апарат абкамаў і райкамаў КП(б)Б на 25 кастрычніка 1944 г. укамплектаваны ўсяго на 38 %, па абкамах на 29 % , па райкамах на 40 %. Таксама недастаткова ўкамплектаваныя савецкія органы, асабліва па райвыканкамах. Не хапае 120 намеснікаў старшынь райвыканкамаў, 49 старшынь раённых планавых камісій, 15 загадчыкаў раённых аддзелаў аховы здароўя. Не хапае таксама многіх кіруючых работнікаў і па іншых раённых арганізацыях. Слабая ўкамплектаванасць партыйных і савецкіх органаў зніжае агульны ўзровень працы ў абласцях і раёнах і з’яўляецца сур’ёзнай перашкодай паспяховага выканання гаспадарча-палітычных задач, якія стаяць перад партыйнымі і савецкімі органамі гэтых абласцей”[374].

Улічваючы гэты фактар, ЦК КП(б)Б палічыў неабходным накіраваць у партыйна-савецкія органы заходніх абласцей з Мінскай, Магілёўскай, Гомельскай, Віцебскай і Палескай абласцей у 10-дзённы тэрмін 25 сакратароў РК КП(б)Б, 30 загадчыкаў аддзелаў райкамаў, 100 інструктараў райкамаў і прапагандыстаў, 100 намеснікаў старшынь райвыканкамаў, 40 старшынь планавых камісій, 100 старшынь сельскіх саветаў[375]. Акрамя гэтага, ЦК КП(б)Б палічыў неабходным “прасіць ЦК УсеКП(б) накіраваць у Беларусь для працы ў партыйных арганізацыях заходніх абласцей

[373] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.33, арк.51.
[374] НАРБ, ф.4, воп.61, спр.91, арк.5.
[375] Там сама, арк.5.

20 загадчыкаў аддзелаў абкамаў і іх намеснікаў, 80 інструктараў абкамаў партыі, 20 сакратароў абкамаў; для працы ў гаркамах і райкамах: 10 першых сакратароў і 25 другіх сакратароў, 15 сакратароў па кадрах, 30 загадчыкаў арганізацыйна-інструктарскіх аддзелаў, 30 загадчыкаў аддзелаў агітацыі і прапаганды, 50 інструктараў, 100 прапагандыстаў і 20 рэдактараў гарадскіх і раённых газет"[376].

Па партыйных накіраваннях "армада" партыйна-савецкага чынавенства, у большасці не ведаючы і не задумваючыся пра складанасці працы, хлынула ў заходні рэгіён рэспублікі. "Вынік" іх працы праявіўся літаральна праз месяц. 21 лістапада 1944 г. бюро ЦК КП(б)Б разглядае пытанне "Аб працы Лідскага гаркама КП(б)Б Беларусі" і канстатуе, што "Лідскі райкам КП(б)Б і яго першы сакратар т. Пракуда не разабраліся ў складанай палітычнай абстаноўцы, не ўлічылі складанасці і асаблівасці палітычных, эканамічных і нацыянальных умоў у раёне, недаацанілі, што выкананне ўсіх палітычных і ваенна-гаспадарчых задач ва ўмовах, калі вёска з'яўляецца аднаасобнай, непазбежна будзе адбывацца ў абстаноўцы абвастрэння класавай барацьбы... Райкам КП(б)Б не прыняў рашучых захадаў па ўзмацненню барацьбы супраць польскіх нацыяналістычных элементаў, якія сваімі бандыцкімі дзеяннямі тэрарызуюць насельніцтва. Райкам КП(б)Б абапіраўся ў барацьбе супраць рэакцыйных польскіх груп толькі на дзеянні воінскіх часцей і карных органаў, недастаткова праводзіў працу па выкрыццю польскіх нацыяналістаў, якія з'яўляюцца злейшымі ворагамі народа"[377].

На самай справе, "прышлыя", асабліва накіраваныя на працу ў заходнія вобласці з цэнтральных раёнаў Расійскай Федэрацыі, у сваёй працы абапіраліся пераважна на карныя органы і з іх дапамогай "вырашалі" пастаўленыя задачы. Красамоўным сведчаннем менавіта такіх падыходаў у "працы" з'яўляецца запіска першага сакратара Юрацішскага райкама партыі Баранавіцкай вобласці А.Кузняцова, якую ён накіраваў у кастрычніку 1945 г. І.Сталіну. А.Кузняцоў адзначыў, што раён насычаны "бандыцкімі групамі" (мелася на ўвазе польскае падполле. – А.В.), якія падтрымлівае мясцовае насельніцтва. "Барацьба з бандытамі – вельмі складаная" - падкрэсліваў ён, "вынікі дае малыя, таму што яны маюць вялікую падтрымку сярод насельніцтва, асабліва кулацка-заможнай часткі насельніцтва

[376] НАРБ, ф.4, воп.61, спр.91, арк.6.
[377] НАРБ, ф.4, воп.61, спр.101, арк.5.

вёскі, тым больш што наш раён выключна хутарскі"[378]. Зыходзячы з гэтага, вось як прапанаваў змагацца з падполлем першы сакратар райкама партыі: "З сем'ямі бандытаў неабходна бязлітасна распраўляцца. Усе гэтыя сем'і неабходна выселіць з раёна, канфіскаваць іх маёмасць, а саміх бандытаў, якіх зловяць, хоць бы і без зброі, бязлітасна расстрэльваць ці высылаць на самыя цяжкія работы. Чаго яго мілаваць, якую карысць ён можа прынесці грамадству, калі да цяперашняга часу бадзяецца па лесе, як драпежны шакал, забівае нашых савецкіх людзей і марыць аб Польшчы да Смаленска. Гэта не заблытаўшыйся чалавек, не, гэта вораг, а "калі вораг не здаецца, яго знішчаюць"[379].

Гэтыя словы належаць А.Кузняцову, які да студзеня 1945 г. працаваў першым сакратаром Сярэдскага райкама партыі Яраслаўскай вобласці РСФСР. З 15 студзеня па 6 лютага 1945 г. – вучыўся на ленінскіх курсах УсеКП(б), а 8 сакавіка 1945 г. яго прызначылі першым сакратаром Юрацішскага райкама партыі. Звяртаючыся да І.Сталіна, ён прызнаецца: "Ва ўмовах Юрацішскага раёна, раёна Заходняй Беларусі, у мяне маюцца вялізныя недахопы, і я не магу зразумець, у чым прычына"[380]. Прычына была ў тым, не ўдаючыся ў падрабязнасці, што Юрацішскі раён Баранавіцкай вобласці гістарычна, этнічна, нацыянальна, эканамічна, сацыяльна прынцыпова адрозніваўся ад Сярэдскага раёна Яраслаўскай вобласці РСФСР. Вось чаго не разумеў прысланы па партыйнай разнарадцы на працу ў Заходнюю Беларусь колішні партыйны кіраўнік аднаго з раёнаў Яраслаўскай вобласці. Колькі іх такіх было, не разумеючых, ды, напэўна, і не жадаючых разумець, у чым былі "прычыны" іх слабай працы.

Запіска А.Кузняцова разглядалася і ў ЦК КП(б)Б. Неабходна аддаць належнае былому партыйна-савецкаму кіраўніцтву рэспублікі, якое не падзяляла і не падтрымлівала такога кшталту прапановы. Калі б быў прыняты курс толькі на "сілавое" рашэнне гэтай праблемы, то гэта непазбежна выклікала б яшчэ большы рост сацыяльнай напружанасці, актывізацыі руху польскага супраціўлення ў заходнім рэгіёне. Партыйна-савецкае кіраўніцтва Беларусі больш гнутка, асцярожна і ўзважліва, наколькі гэта было магчыма ва ўмовах сталінскага рэжыму, падыходзіла да разгортвання партыйна-савецкай працы ў заходніх абласцях. На ўжо згаданым бюро ЦК КП(б)Б, якое абмяркоўвала працу Лідскага райкама партыі, кіраўніцтву раёна прапаноўвалася: "Лічыць

[378] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.470, арк.480.
[379] Там сама, арк.481.
[380] Там сама, арк.478.

галоўнай задачай пашырэнне сувязяў з масамі, усебаковага ўмацавання ідэйна-палітычнага ўплыву на бядняцкую і серадняцкую часткі вёскі, стварэнне шырокага беспартыйнага актыву вакол мясцовых саветаў і партыйных арганізацый і далучэння яго да практычнай працы па правядзенню палітычных і гаспадарчых мерапрыемстваў і ў барацьбе з варожымі антысавецкімі элементамі"[381]. Безумоўна, усё гэта выцякала з таго палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага курсу, які праводзіла правячая партыя. Аднак і тактычна і стратэгічна гэты курс быў больш перспектыўны і меў мэтай стварэнне сацыяльнай апоры рэжыму не шляхам расстрэлаў і высылкамі, гэтага і так дастаткова хапала, а шляхам паступовага "перацягвання" на свой бок лаяльнага да савецкай улады насельніцтва і "пашырэння сувязей з масамі".

Новае, больш жорсткае стаўленне ўлад да перасялення не засталося па-за ўвагай як упаўнаважаных ПКНВ, так і прадстаўнікоў СНК БССР. У запісцы раённага ўпаўнаважанага польскага ўрада ў Лідзе, накіраванай наркаму замежных спраў Беларусі К.Кісялёву, адзначалася, што "да чэрвеня 1945 г. усё было інакш: польскія камісіі сапраўды выконвалі сваю ролю і высылалі палякаў, аднак у чэрвені па распараджэнню СНК БССР для атрымання эвакадакументаў стала неабходным прадстаўляць даваенныя дакументы (да 1939 г.) ці даведку мясцовых уладаў, пацвярджаючых нацыянальнасць. З гэтага моманту эвакуацыя перайшла ў рукі рай - і гарвыканкамаў. Польскай камісіі засталася толькі роля тэхнічнага работніка, а прадстаўніку СНК БССР роля кантралёра па выкананню распараджэнняў мясцовых уладаў"[382]. Намеснік Галоўнага прадстаўніка СНК БССР П.Алышаў у чэрвені 1945 г. паведамляў, што "да нас паступаюць скаргі ад упаўнаважаных Польшчы. Апошнія просяць вызваліць іх ад працы, бо ўсю працу ўзялі на сябе мясцовыя ўлады, а іх, як прадстаўнікоў польскага ўрада, цалкам ігнаруюць"[383].

На месцах абкамы, райкамы і гаркамы партыі адразу ж прыступілі да выканання рашэння ЦК КП(б)Б. Так, у канцы мая 1945 г. Гродзенскі АК КП(б)Б абавязаў ГК, РК КП(б)Б, райвыканкамы і гарвыканкамы "ўзмацніць кантроль за працай па перасяленню грамадзян польскай нацыянальнасці"[384]. Баранавіцкі АК КП(б)Б двойчы, у красавіку і маі 1945 г., абмеркаваў гэтае

[381] НАРБ, 4, воп.61, спр.101, арк.12.
[382] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.8, арк.77.
[383] Там сама, арк.79.
[384] ДАГА Гродненскай вобласці, ф.1, воп.1, спр.25, арк.116-117.

пытанне на абласных нарадах сакратароў РК, ГК КП(б)Б і старшынь райвыканкамаў. Акрамя гэтага, пытанне аб перасяленні было абмеркавана і на абласной нарадзе старшынь сельскіх саветаў. Абкам партыі накіраваў ва ўсе райкамы і райвыканкамы ліст, у якім абавязаў партыйнае і савецкае кіраўніцтва ўзмацніць палітыка-выхаваўчую працу сярод грамадзян польскай нацыянальнасці і асабліва звярнуць увагу на "недапушчэнне выезду ў Польшчу грамадзян няпольскай нацыянальнасці"[385].

Маладзечанскі АК КП(б)Б у чэрвені 1945 г. паведамляў у ЦК КП(б)Б, што абкам і райкамы "камандзіравалі ў сельсаветы абласны партыйна-савецкі актыў для правядзення масава-палітычнай працы сярод грамадзян польскай нацыянальнасці і асабліва сярод беларусаў-каталікаў". Заўважым, што “праца” актыву не была безвыніковай. Так, з 470 гаспадарак Пастаўскага раёна, якія зарэгістраваліся на выезд, 399 пад уздзеяннем "прапагандысцкай працы" адмовіліся ад выезду. У Ільянскім раёне з 280 гаспадарак 240 таксама адмовіліся ад выезду. У Радашковіцкім з 438 зарэгістраваных забралі заявы 213[386]. У чэрвені 1945 г. Гродзенскі абкам партыі паведамляў у ЦК КП(б)Б, што "ў Шчучынскім раёне пры правядзенні перарэгістрацыі 2500 гаспадарак адмовіліся ад перасялення. Толькі 500 выказалі цвёрдае жаданне выехаць у Польшчу. У Баранавіцкам раёне з 270 зарэгістраваных гаспадарак 243 адмовіліся ад перасялення. У Сапоцкінскім раёне, дзе пераважае польскае насельніцтва, з 306 зарэгістраваных гаспадарак 228 адмовіліся ад рэгістрацыі"[387]. На жаль, у Нацыянальным архіве не ўдалося выявіць дакументы аб формах і метадах “масава-палітычнай працы”, вынікам якой стала масавая адмова палякаў ад пераезду ў Польшчу. Магчыма толькі меркаваць, ці на самай справе гэта была эфектыўная, пераканаўчая агітацыя, ці палякаў проста запалохалі, што замест выезду на захад, яны могуць паехаць на ўсход. Назапашаны савецкай уладай “вопыт” правядзення такога кшталту агітацыі мог з’явіцца пераканаўчым і дастатковым, каб людзі пачалі адмаўляцца ад выезду ў Польшчу.

У канцы мая - пачатку чэрвеня 1945 г. адбыліся пасяджэнні райкамаў, гаркамаў партыі заходніх абласцей (Васілішкаўскага, Гродзенскага, Навагрудскага, Відзаўскага, Дзісенскага і іншых), на якіх абмяркоўвалася пастанова бюро ЦК КП(б)Б. Так, Васілішкаўскі РК КП(б)Б, 15 чэрвеня 1945 г. разгледзеўшы пытанне “Аб рабоце па перасяленню грамадзян польскай нацыянальнасці”, падкрэсліў,

---

[385] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.94, арк.245.
[386] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.150, арк.120.
[387] НАРБ, 4, воп.42, спр.375, арк.152.

што ў гэтай працы меўся шэраг недахопаў: запіс грамадзян праводзіўся па нямецкіх пашпартах і даведках сельсаветаў, не завераных райвыканкамамі; не вялася барацьба супраць “антысавецкай агітацыі польскіх нацыяналістаў” і г.д. РК КП(б)Б сумесна з райвыканкамам прынялі рашэнне аб стварэнні раённай камісіі ў складзе намесніка старшыні райвыканкама, старшыні планавага аддзела райвыканкама, загадчыка аддзела агітацыі і прапаганды райкама партыі, якая б “дапамагала раённаму прадстаўніку СНК БССР весці працу па ўліку і перагляду спісаў грамадзян, якія падалі заявы на выезд”. Да таго ж камісіі даручалася да 20 чэрвеня “перагледзець усе спісы зарэгістраваных на выезд у Польшчу і асоб, унесеных на аснове нямецкіх пашпартоў і іншых дакументаў, якія не маюць юрыдычнай сілы, выключаць з рэгістрацыйных спісаў”[388].

Відзаўскі райкам партыі, адзначыўшы, што “на 15 красавіка 1945 г. 50 % усяго насельніцтва раёна запісалася на выезд, прыняў рашэнне: “Лічыць рэгістрацыю грамадзян, якая праводзілася ўпаўнаважанымі польскага ўрада, няправільнай, бо яны пераўтварылі сваю працу ў вярбоўку”[389]. Райкам партыі патрабаваў, каб змешаная камісія перагледзела ўсе спісы і правяла перарэгістрацыю ўсіх грамадзян, якія запісаліся на выезд у Польшчу. Ваўкавыскі РК КП(б)Б паведамляў Гродзенскаму абкаму партыі, што пасля рашэнняў ЦК КП(б)Б "праводзіцца праца па перагляду спісаў зарэгістраваных"[390]. Аналагічныя рашэнні прынялі Браслаўскі, Навагрудскі і іншыя райкамы партыі заходніх абласцей[391].

Улічваючы склаўшуюся сітуацыю, Галоўны ўпаўнаважаны Польшчы С.Вішнеўская ў канцы ліпеня 1945 г. накіравала намесніку старшыні СНК БССР К.Кісялёву запіску, у якой звяртала яго ўвагу на тое, што польскія ўпаўнаважаныя адхілены ад працы. Яна падкрэслівала, што “ў той абстаноўцы, якая склалася ў цяперашні час, работу па эвакуацыі праводзіць немагчыма. Зараз справай эвакуацыі займаюцца не змешаныя польска-беларускія камісіі, а райкамы і райвыканкамы. У Гарадзішчанскім раёне Баранавіцкай вобласці два разы па загаду старшыні райвыканкама зрываўся транспарт з-за таго, што старшыня не паспеў праверыць усіх людзей, якіх прывезлі на пагрузку. У выніку ён даў загад начальніку станцыі не падаваць вагонаў, пакуль людзі не будуць

[388] НАРБ. ф.4 воп.6, спр.1999, арк.191-192.
[389] НАРБ. ф.4, воп.6, спр.2105, арк.40.
[390] ДАГА Гродненскай вобласці, ф.1, воп.1, спр.37, арк.65.
[391] НАРБ, ф.4, воп.6, спр.2103, л.120; спр.1919, арк.186; спр.1952, арк.106; спр.2107, арк.191.

правераны"[392]. Наколькі моцным з'яўляўся адміністрацыйны рэсурс, сведчыць прыклад Пінскага райпрадстаўніцтва, у якім "эвакуацыя ў Польшчу праводзіцца па ініцыятыве абласных і раённых партыйных арганізацый. Ініцыятыва і вядучая роля эвакуацыйнай камісіі падаўлена. Інструкцыі і пагадненні аб эвакуацыі з-за гэтага не выконваюцца ці выконваюцца недакладана"[393].

С.Вішнеўская слушна заўважала, што складанасць сітуацыі абумоўлівалася адсутнасцю сумесна выпрацаванай інструкцыі, якая б вызначыла ўмовы працы змешанай камісіі. Так, польскія ўпаўнаважаныя карыстаюцца інструкцыяй, якая даслана Галоўным упаўнаважаным Польшчы, з якой мясцовыя ўлады і беларускія прадстаўнікі не лічацца, а прадстаўнікі СНК БССР бяруць за аснову пастанову ЦК КП(б)Б ад 22 мая 1945 г., з якой, зразумела, лічацца ўсе. С.Вішнеўская звярталася да К.Кісялёва, каб ён, як прадстаўнік вышэйшай выканаўчай улады Беларусі, паспрыяў нармалізацыі працы змешаных камісій. Да таго ж С.Вішнеўская ўнесла на яго разгляд прапанову аб тым, каб праверка спісаў ужо зарэгістраваных на выезд, праводзілася толькі па загадах Галоўнага ўпаўнаважанага Польшчы і Галоўнага прадстаўніка СНК БССР, што ўнесла б яснасць і зняло супярэчнасці, якія ўзнікалі пры разглядзе скарг грамадзян[394]. Аднак запіска С.Вішнеўскай засталася без адказу, а яе прапановы не разглядаліся ні К.Кісялёвым, ні іншымі службовымі асобамі. Да канца абмену насельніцтвам права рашаючага голасу пры вызначэнні нацыянальнасці, рэгістрацыі і прыняцця рашэння аб выездзе належала прадстаўнікам мясцовых уладаў, а не ўпаўнаважаным Польшчы і прадстаўнікам СНК БССР па перасяленню.

Факты адмоўных адносін да польскага насельніцтва, якое зарэгістравалася на выезд у Польшчу, набылі такую вядомасць, што сталі прадметам абмеркавання ў ЦК УсеКП(б). Так, арганізацыйна-інструктарскі аддзел ЦК УсеКП(б) падрыхтаваў і абмеркаваў інфармацыйную даведку "Аб памылках партыйных і савецкіх органаў заходніх раёнаў Беларусі ў рабоце па перасяленню польскага насельніцтва ў Польшчу". Яе абмеркаванне ў ЦК УсеКП(б) прывяло да аналагічнага разгляду гэтага пытання на пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б 31 чэрвеня 1945 г. У пастанове ЦК КП(б)Б, прынятай па выніках абмеркавання, падкрэслівалася, што "прыведзеныя ў інфармацыйнай запісцы факты грубых парушэнняў сацыялістычнай законнасці ў асобных раёнах Беларусі

392 ЗДА г. Баранавічы, ф.188, воп.1, спр.436, арк.10.
393 НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.337.
394 НАРБ. ф.7, воп.3, спр.1905, арк.108.

і матэрыялы аб памылках партыйных і савецкіх органаў, зробленых пры перасяленні польскага насельніцтва ў Польшчу, у сапраўднасці мелі месца ў працы партыйных і савецкіх органаў. Па ўсіх гэтых фактах Цэнтральны Камітэт КП(б)Б выносіў адпаведныя рашэнні, прыцягваючы вінаватых да суровай партыйнай адказнасці. У красавіку-маі 1945 г. ЦК КП(б)Б былі ўскрыты грубейшыя парушэнні сацыялістычнай законнасці, дапушчаныя кіруючымі партыйнымі і савецкімі работнікамі ў Браслаўскім, Жалудоцкім раёнах. Вінаватыя ў насіллі ў адносінах да насельніцтва былі выключаны з партыі і прыцягнуты да крымінальнай адказнасці"[395].

На самай справе ЦК КП(б)Б яшчэ да атрымання запіскі з ЦК УсеКП(б), рэагуючы на факты беззаконня з боку мясцовых уладаў да палякаў, якія пажадалі выехаць у Польшчу, прыцягнуў да партыйнай і адміністрацыйнай адказнасці шэраг мясцовых работнікоў. Так, у Браслаўскім раёне выключылі з партыі і знялі з працы сакратара райкама партыі, начальніка раённага аддзела НКДБ, старшыню гарвыканкама, райпракурора і нарсуддзю. У Докшыцкім раёне сакратару райкама партыі і старшыні райвыканкама былі аб'яўлены вымовы, а сакратара райкама па кадрах выключылі з партыі. У Картуз-Бярозаўскім раёне пастановай Брэсцкага абкама партыі быў зняты з працы другі сакратар райкама партыі[396].

Жорсткасць падыходаў у дачыненні да асобных мясцовых партыйных і савецкіх работнікаў вясной 1945 г. неабходна разглядаць як рэакцыю партыйнага кіраўніцтва рэспублікі на факт абмеркавання пытання аб перасяленні ў аргаддзеле ЦК УсеКП(б). Сумесная пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР (красавік 1945 г.), рашэнне ўрада Беларусі аб стварэнні змешаных камісій, а таксама пастанова бюро ЦК КП(б)Б ад 22 мая 1945 г. сведчылі, што партыйнае кіраўніцтва рэспублікі не мела намеру мяняць сваю пазіцыю ў дачыненні да перасялення.

У канцы 1945 г. адбылася падзея, якая яшчэ раз пацвярджае выснову аб узмацненні адміністрацыйнага кантролю за ходам перасялення. СНК СССР 10 лістапада 1945 г. прыняў пастанову "Аб мерапрыемствах па эвакуацыі з СССР у Польшчу асоб польскай і яўрэйскай нацыянальнасцей, былых польскіх грамадзян", якая прадугледжвала стварэнне пры аблвыканкамах камісій па перасяленню. СНК БССР 3 снежня 1945 г. прымае аналагічную пастанову, у адпаведнасці з якой пры аблвыканкамах ствараліся адпаведныя камісіі з шырокімі паўнамоцтвамі – ад зацвярджэння

395 НАРБ, ф.4, воп.51, спр.13, арк.81.
396 Там сама, арк.51.

рэгістрацыйных спісаў да афармлення эвакуацыйных дакументаў і г.д. [397].

Аднак самае галоўнае ўтрымлівалася ў лісце СНК БССР (меўшым грыф "Зусім сакрэтна"), які быў накіраваны 24 студзеня 1946 г. усім старшыням створаных камісій. У ім падкрэслівалася, што "упаўнаважаны польскай дэлегацыі не мае права ўмешвацца ў якія б то ні было распараджэнні абласной камісіі і ў асаблівасці прад'яўляць прэтэнзіі да рашэння камісіі аб прызнанні права на перасяленне асоб, якія падалі заявы"[398]. Іх роля і абавязкі зводзіліся толькі да "сувязі з упаўнаважанымі савецкай дэлегацыі па ўсіх пытаннях, звязаных з арганізацыяй і парадкам эвакуацыі". Фактычна гэты абзац пераўтвараў упаўнаважанага Польшчы ў тэхнічнага работніка, які ажыццяўляў перасяленне тых грамадзян, якім беларускія ўлады дазволілі выехаць у Польшчу.

Стварэнне абласных камісій не азначала ліквідацыю структур раённых прадстаўнікоў СНК БССР і ўпаўнаважаных Польшчы, а прывяло да пераразмеркавання ўладных паўнамоцтваў. Так, абласная камісія не толькі "разглядала заявы ад усіх грамадзян польскай і яўрэйскай нацыянальнасці, якія жадалі выехаць на жыхарства ў Польшчу", але "канчаткова вырашала пытанне аб выездзе гэтых грамадзян з СССР у Польшчу". Гэты пункт пастановы ўрада БССР фактычна скасоўваў пункт 3"б" артыкула 14 пагаднення ад 9 верасня 1944 г., які пазначаў, што "зацверджанне спісаў раённымі прадстаўнікамі аднаго Боку і ўпаўнаважанымі другога Боку з'яўляецца дастатковым для ажыццяўлення эвакуацыі асоб, якія адзначаны ў спісах"[399].

Пастанова СНК БССР дае ўяўленне не толькі аб стаўленні ўрада Беларусі да перасялення і працы польскіх упаўнаважаных, але характарызуе ўзаемаадносіны нацыянальнай рэспублікі і Цэнтра. Пастанову СНК БССР ад 3 снежня 1945 г. нельга разглядаць як аднабаковы крок беларускага кіраўніцтва, здзейснены па ўласнай ініцыятыве. Справа ў тым, што яшчэ 10 лістапада 1945 г. СНК СССР прызнаў неабходным і абавязаў СНК БССР стварыць абласныя камісіі, а 10 студзеня 1946 г. даслаў (пад грыфам "Зусім сакрэтна") указанні аб іх працы. СНК БССР адпаведна 3 снежня 1945 г. і 24 студзеня 1946 г. прыняў без змяненняў саюзную пастанову аб стварэнні адпаведных камісій і даслаў іх старшыням указанні аб працы. *Такім чынам, гэта быў аднабаковы крок і*

---

[397] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.828, арк.70.
[398] НАРБ, ф.787, воп.1, спр.19, арк.2.
[399] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.1, арк.36.

*рашэнне Саюзнага, а не беларускага кіраўніцтва, якое толькі "добрасумленна" яго выканала* (выдзелена мной. – А.В.).

Адзначым, што частка палякаў вясной-летам 1945 г. пачала добраахвотна адмаўляцца ад пераезда ў Польшчу. Аднымі з асноўных фактараў, якія вымушалі палякаў заставацца ў Беларусі, з'яўляліся наступныя. Па-першае, вясной-летам 1945 г. знізілася актыўнасць польскага падполля ў адносінах да перасяленцаў. Па-другое, і гэта больш важнае: палякі ўжо зразумелі, што Польшча трапіла ў залежнасць ад Масквы, і ў ёй пачынае ўсталёўвацца камуністычны рэжым, які не надта адрозніваўся ад рэжыму, што панаваў у Беларусі. Так, Гродзенскі райкам партыі ў ліпені 1945 г. паведамляў Гродзенскаму абкаму партыі, што "у Сабалянах Калеснік В. зарэгістраваўся на выезд у Польшчу, а потым передумаў. Ён заявіў, што "мне і тут будзе добра, усё роўна Польшча будзе падпарадкоўвацца Савецкаму Саюзу". У Путрышскім сельсавеце на выезд у Польшчу запісалася 26 гаспадарак, з якіх 4 выехалі, 10 адмовіліся выязджаць у сувязі з ліквідацыяй банд. Пануюць і такія настроі, што пераязджаць няма сэнсу, усё роўна ў Польшчы будзе савецкая ўлада, а таксама будзе НКУС. Лепей жыць тут і не разарацца"[400]. Кіраўнік Брэсцкага райпрадстаўніцтва М.Траян паведамляў У.Царуку, што "адзін з польскіх грамадзян г. Кобрына, выходзячы з памяшкання камісіі, сказаў: "Навошта ехаць у Польшчу, там партрэтаў савецкіх правадыроў больш, чым тут, так што няма ніякай розніцы[401].

Масавая рэгістрацыя польскага насельніцтва на выезд у Польшчу вымусіла кіраўніцтва БССР прыняць захады па запаволенню яго ад'езду з рэспублікі. Пазіцыя партыйнага кіраўніцтва рэспублікі ў адносінах да перасяленчага працэсу перацярпела значную эвалюцыю: ад нейтральнага стаўлення з восені-зімы 1944-1945 гг., да жорсткага адміністрацыйнага кантролю з вясны 1945 г. Стварэнне змешаных камісій, пераправерка рэгістрацыйных спісаў вясной-летам 1945 г., стварэнне восенню 1945 г. камісій па перасяленню пры аблвыканкамах сведчылі аб татальным кантролі з боку ўладных структур усіх узроўняў за ходам рэгістрацыі і перасялення палякаў з БССР у Польшчу. Галоўнай мэтай кантролю з'яўлялася недапушчэнне выезду ў Польшчу працаздольнага і гаспадарлівага насельніцтва, якое разглядалася як танная рабочая сіла ў аднаўленні разбуранага вайной гаспадарчага комплекса Беларусі.

---

[400] НАРБ, ф.4, воп.42, спр.140, арк.93.
[401] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.23.

## Глава 2.
## Цяжкая дарога дадому

Адной з найбольш складаных праблем, якая паўстала перад беларускім і польскім бакамі ў час перасялення, з'яўлялася праблема перавозкі тысяч людзей і іх маёмасці. Яна абцяжарвалася тым, што яшчэ не скончылася Другая сусветнай вайна і прадастаўляць транспарт для перавозкі насельніцтва было надзвычай складанай і цяжкай задачай. Хоць у пагадненні канкрэтна не быў вызначаны асноўны транспартны сродак, усім было зразумела, што толькі чыгункай было магчыма перавезці такую значную колькасць людзей і іх маёмасць. Аднак літаральна з першых дзён перасялення вызначылася, што перавозка - адно з самых «слабых» месцаў перасяленчага працэсу.

Бадай самым адмоўным момантам у працы чыгункі з'яўлялася бясплanавасць пастаўкі вагонаў. Так, прадстаўнік Брэсцкага райпрадстаўніцтва СНК БССР М. Траян адзначаў, што “адмоўным бокам у рабоце па эвакуацыі польскага насельніцтва ў Польшчу з Картуз-Бярозаўскага прадстаўніцтва з‘яўлялася бясплanавасць тэхнікі эвакуацыі. Складзены намі план падачы вагонаў на станцыі пагрузкі сістэматычна зрываецца. У сувязі з гэтым маюцца выпадкі, калі падвезенае на станцыю насельніцтва знаходзіцца ў чаканні вагонаў пад адкрытым небам да двух месяцаў. Так, падвезенае на станцыю Бяроза 25 студзеня 1945 г. насельніцтва ў колькасці 40 сям’яў, якое павінна было ад’ехаць у Польшчу 30 студзеня, у сапраўднасці ад’ехала толькі 27 сакавіка 1945 г”[402].

Прадстаўнік СНК БССР па Навагрудскаму райпрадстаўніцтву Я. Захараў у справаздачы, накіраванай Галоўнаму прадстаўніку СНК БССР, паведамляў, што ўпраўленне Брэст-Літоўскай чыгункі сістэматычна зрывае падачу вагонаў пад перавозку людзей. У выніку ад'язджаючыя "знаходзяцца на станцыях пагрузкі ад 5 да 20 дзён". Ён адзначаў, што ў красавіку 1945 г. звыш 300 польскіх сем'яў знаходзіліся на станцыі больш за 30 дзён[403]. Аналагічная сітуацыя назіралася ў Глыбоцкім ды іншых райпрадстаўніцтвах, дзе людзі знаходзіліся на станцыях пагрузкі ў

[402] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.217.
[403] Там сама, арк.192.

чаканні вагонаў ад 2 тыдняў да паўтара месяцаў[404]. Дрэнная праца чыгункі прыводзіла да таго, што, як паведамляў польскі ўпаўнаважаны ў Баранавічах Д.Вайцаховіч, “людзі былі настолькі расчараваныя, што нікому не верылі, нават і польскім упаўнаважаным, якія запэўнівалі іх аб хуткім выездзе ў Польшчу”[405].

Першыя месяцы перасялення, якія прыпалі на восень-зіму 1944/1945 гг., абцяжарваліся зімовымі халадамі. Практычна ўсе вагоны не былі па- зімоваму абсталяванымі і падрыхтаванымі для перавозкі людзей. У першую чаргу, у вагонах не былі ўстаноўлены ацяплялььныя грубкі. На патрабаванне Галоўнага прадстаўніка СНК БССР па перасяленню аб усталяванні ў вагонах грубак упраўленне чыгуначнага транспарту адказала, што ў наяўнасці няма такой колькасць грубак, таму ў большасці вагонаў яны так і не былі ўсталяваны. Улічваючы такое становішча, У.Царук быў вымушаны звярнуцца ва ўрад БССР, каб на ўрадавым узроўні вырашыць гэтае пытанне. Аднак ні ў зіму 1944/1945 гг., ні ў зіму 1945/1946 гг. у большасці вагонаў яны так і не былі ўсталяваныя. Што гэта значыла для перасяленцаў, сведчыць, без перабольшання, ліст адчаю, які накіраваў польскі ўпаўнаважаны 12 сакавіка 1945 г. у Глыбоцкае райпрадстаўніцтва з Варапаева. З горыччу ён паведамляў: “Людзі, якія чакаюць транспарт з 22 студзеня гэтага года ў Варапаеве, сядзяць на рампе пад адкрытым небам з сем’ямі, жывёлай і рэчамі. Запасы харчавання для людзей і корм для жывёлы скончыліся, людзі хварэюць, з-за холаду і голаду, ёсць выпадкі смерці”[406]. Асабліва пакутавалі перасяленцы ў зімовыя халады 1945/1946 г. У лютым 1946 г. начальнік этапнага пункту станцыі Ласосна Ф.Заянчкоўскі паведамляў упаўнаважанаму польскага ўрада ў Гродна: "20 лютага 1946 г. прыбыў транспарт са станцыі Зябкі Полацкай вобласці ў колькасці 56 вагонаў, паміж якімі на 5-і платформах былі пагружаны людзі разам з вазамі сена ды іншым сельскагаспадарчым інвентаром. У выніку вялікіх марозаў і завей захварэлі два дзіцяці і па дарозе памерлі. Што датычыць жывога інвентару (мелася на ўвазе жывёла. - А.В.), то таксама былі выпадкі захворванняў і гібелі. 23 лютага 1946 г. прыбыў транспарт са станцыі Ражанка ў колькасці 23 вагонаў, сярод якіх было 5 платформаў, акрамя гэтага, два вагоны былі зусім разбітыя. Таксама з прычыны вялікіх маразоў і завеі памерла адно дзіця і здохлі дзве каровы. Паведамляючы аб гэтым,

[404] Там сама, арк.295.
[405] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.5, арк.80.
[406] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1916, арк.58.

хадайнічаю перад чыгуначным кіраўніцтвам, каб у будучым такога кшталту здарэнняў не паўтаралася"[407].

Каб у вызначаны тэрмін ажыццявіць перасяленне і задаволіць жаданне людзей як мага хутчэй перасяліцца, у раёнах, што межавалі з Польшчай, райпрадстаўніцтвы арганізавалі адпраўку людзей гужавым транспартам. Напрыклад, у Брэсцкім райпрадстаўніцтве за люты - красавік 1945 г. такім шляхам было адпраўлена 1525 сем’яў, у той час як чыгункай - толькі 25[408]. Акрамя гэтага, зімой 1945-1946 гг. Брэсцкае райпрадстаўніцтва, па дамоўленасці з пагранічнымі войскамі, каля вёскі Матыкалы Брэсцкага раёна арганізавала пераправу людзей па зімоваму лёду, а вясной была спецыяльна пабудаваная паромная пераправа, і звыш 400 сем’яў такім шляхам змаглі перасяліцца ў Польшчу. У Дамачаўскім раёне праз Буг быў пабудаваны часовы мост, праз які таксама ажыццяўлялася пераправа польскага насельніцтва з Дамачаўскага і Маларыцкага раёнаў Брэсцкай вобласці.

Немагчымасць ва ўмовах вайны прадастаўляць неабходную колькасць вагонаў для перавозкі перасяленцаў прывяла да таго, што да 1 мая 1945 г., калі рэгістрацыя часова спынілася, у Польшчу было перавезена толькі 44 тысячы чалавек, у той час як зарэгістравалася 320 тысяч[409]. Вось што паведамляў наркаму шляхоў зносін СССР у маі 1945 г. Галоўны прадстаўнік СНК БССР па перасяленню У.Царук, аналізуючы сітуацыю, што склалася з перавозкай насельніцтва: «Па нашаму патрабаванню за перыяд снежань 1944 – май 1945 гг. у адпаведнасці з Вашымі ўказаннямі, пад перавозку эвакуіруемага насельніцтва з тэрыторыі Беларусі ў Польшчу, па Брэст-Літоўскай чыгуначнай дарозе павінна было быць выдзелена 7150 вагонаў. Адзначаная колькасць забяспечвала нашую патрэбу на 75-80%. Аднак Вашых загадаў аб прадастаўленні вагонаў пад перавозку эвакуіруемых кіраўніцтва Брэст-Літоўскай дарогі не выконвае. За ўвесь перыяд эвакуацыі, гэта значыць за 6 месяцаў, Упраўленне Брэст-Літоўскай дарогі прадаставіла толькі 1800 вагонаў, што складае 25% зацверджанага Вамі плана. У цяперашні час (чэрвень 1945 г. – А.В.) вагоны зусім не падаюцца... У выніку гэтага на станцыях Косава, Гарадзея, Клецк, Стоўбцы, Лясная, Слонім, Новаельня, Аранчыцы і іншых эвакуіруемае насельніцтва ў чаканні вагонаў знаходзіцца ад 10 да 40 дзён. Прадукты харчавання выйшлі, людзі жывуць у антысанітарных умовах, маюцца хворыя. Вярнуць гэтыя сем'і ў

---

[407] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк..80.
[408] Там сама, арк. 191.
[409] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1916, арк.70.

свае гаспадаркі, адкуль яны выехалі, няма магчымасці, бо іх кватэры і гаспадарчыя пабудовы занятыя беларусамі, якія прыехалі з Польшчы. З раёнаў, якія прылягаюць да Брэст-Літоўскай чыгункі, належыць вывезці ў Польшчу 106 тысяч чалавек. З раёнаў, якія прылягаюць да Беластоцкай чыгункі, – 170 тысяч чалавек»[410].

Улічваючы нездавальняючую працу чыгункі, у верасні 1945 г. намеснік Старшыні СНК БССР К.Кісялёў накіраваў у Народны камісарыят шляхоў зносін (НКШЗ) СССР тэлеграму, у якой падкрэсліваў, што "на працягу ўсяго перыяду эвакуацыі польскага насельніцтва з тэрыторыі БССР у Польшчу Брэст-Літоўская і Беластоцкая чыгункі сістэматычна не выконваюць устаноўленага плана падачы вагонаў пад перавозку эваканасельніцтва, матывуючы гэта адсутнасцю вагонаў". У гэтай жа тэлеграме ён прапанаваў арганізаваць спецыяльныя "паязды-вяртушкі": 5 на Брэст-Літоўскай і 8 на Беластоцкай з 40-50 вагонамі, якія б знаходзіліся выключна ў распараджэнні Галоўнага прадстаўніка СНК БССР і займаліся толькі перавозкай насельніцтва[411]. Гэтую слушную прапанову беларускі бок прапанаваў ажыццявіць яшчэ ў маі 1945 г., і НКШЗ СССР 4 чэрвеня 1945 г. нават выдаў спецыяльны загад аб стварэнні такіх паяздоў, аднак на момант звароту К.Кісялёва (верасень 1945 г.) гэты загад так і не быў выкананы[412].

Аб тым, што кіраўніцтва Беластоцкай і Брэст-Літоўскай чыгунак не рэагавала на неаднаразовыя звароты НКШЗ і не арганізавала спецыяльных паяздоў, сведчыць ліст К.Кісялёва, накіраваны 7 сакавіка 1946 г. начальніку Брэст-Літоўскай дарогі. У ім адзначалася, што, нягледзячы на загады НКШЗ СССР ад 2 і 28 лютага 1946 г. аб стварэнні 4 спецыяльных "паяздоў-вяртушак" для перавозкі насельніцтва, яны так і не былі створаны. К.Кісялёў патрабаваў ад начальніка дарогі па магчымасці арганізаваць два паязды і прыняць неабходныя захады для "хутчэйшай перадачы паражняка пад перавозку людзей"[413]. Аднак гэты, як і папярэднія звароты К.Кісялёва, былі безвыніковымі, і адсутнасць дастатковай колькасці вагонаў значна ўскладняла працэс перасялення.

Праблема перавозкі насельніцтва чыгуначным транспартам так і засталася адным з самых слабых месц у арганізацыі перасялення. Нездавальняючая праца чыгуначнага

[410] Там сама, арк.69-70.
[411] НАРБ. ф.7, воп.3, спр.1915, арк.50.
[412] Там сама, арк.52.
[413] НАРБ, ф.7. воп.3, спр.1922, арк.12, 14.

транспарту абумоўлівалася аб'ектыўнымі прычынамі. Галоўнай з'яўлялася тое, што перасяленне ажыццяўлялася ў час, калі яшчэ не скончылася Другая сусветная вайна, і чыгунка працавала выключна на патрэбы фронту, перавозячы вайсковыя фарміраванні, боепрыпасы, тэхніку, зброю і г.д. Пасля заканчэння вайны пачалася перадыслакацыя войскаў з захаду на ўсход, і чыгуначны транспарт у першую чаргу выдзяляўся на гэтыя патрэбы. Толькі са студзеня 1946 г., калі чыгунка вызвалілася ад масавых воінскіх перавозак, стала магчымым прадастаўляць неабходную колькасць вагонаў для перавозкі перасяленцаў.

Намеснік Старшыні СМ БССР П.Лявіцкі паведамляў у верасні 1946 г. намесніку Старшыні СМ СССР М.Касыгіну, што "ў пачатку эвакуацыі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны надзвычай адчуваўся недахоп у прадастаўленні вагонаў для перавозкі эвакуіруемага насельніцтва. НКШЗ да студзеня 1946 г. не поўнасцю задавальняў заяўкі на чыгуначныя вагоны. Са студзеня 1946 г. па вызваленню чыгуначнага транспарту ад масавых воінскіх перавозак, калі перавозкі эваканасельніцтва сталі планавацца Дзяржпланам на патрэбы эвакуацыі, вагоны прадастаўляліся ў дастатковай колькасці"[414].

Вынікі працы чыгуначнага транспарту з'яўляліся наступнымі: усяго для перавозкі насельніцтва і маёмасці было выкарыстана 25 912 вагонаў. Чыгункай было перавезена 233 130 чалавек, 71 869 галоў буйнай і 91 173 галавы дробнай жывёлы. У сярэднім у адным вагоне перавозілася 14-15 чалавек і для іх перавозкі спатрэбілася 15 412 вагонаў. 8900 вагонаў спатрэбілася, каб перавезці буйную рагатую жывёлу (8 галоў у адным вагоне) і звыш 1600 вагонаў для перавозкі дробнай жывёлы (да 60 галоў у адным вагоне)[415]. Тыя, хто па розных прычынах не змог выехаць чыгуначным транспартам, выязджалі ў Польшчу самастойна, гужавым транспартам і з той маёмасцю, якую яны былі ў стане ўзяць з сабой.

[414] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.23, арк.25.
[415] Там сама, арк.25.

## Глава 3.
## Зыход

Масавае жаданне людзей зарэгістравацца ў апошнія дні рэгістрацыі, якая заканчвалася 15 студзеня 1946 г., набыло лавінападобны характар, якога, па ўсёй бачнасці, не чакалі ўлады. Справа даходзіла да таго, што цэлыя вёскі рэгістраваліся на выезд. Безумоўна, не ўлічваць гэтага факта ні мясцовыя, ні цэнтральныя ўлады не маглі. Рэакцыя цэнтральнай улады на такога кшталту факты была даволі нервовай і жорсткай. 8 студзеня 1946 г. бюро ЦК КП(б)Б, разгледзеўшы пытанне аб перасяленні, прымае пастанову "Аб фактах масавага запісу насельніцтва на выезд у Польшчу па Васілішкаўскаму і Радунскаму раёнах Гродзенскай вобласці", у якой адзначалася, што "за дзесяць дзён студзеня 1946 г. у Васілішкаўскім раёне па выбарчаму участку (у гэты час праходзілі выбары ў Вярхоўны Савет БССР. - А.В.) № 21 з 431 выбаршчыка 400 запісаліся на выезд у Польшчу, на выбарчым участку № 26 (в. Васілішкі) гэтага ж раёна з 686 выбаршчыкаў на выезд у Польшчу запісалася 636 чалавек. Насельніцтва вёскі Пескі Нарашанскага сельсавета ў колькасці 120 гаспадарак поўнасцю запісалася на выезд"[416]. ЦК КП(б)Б таксама быў незадаволены дзейнасцю ўпаўнаважаных польскага ўрада, якія на "аснове вусных заяў уключаюць у спіскі на выезд пад выглядам палякаў беларусаў-католікаў, парушаючы тым самым Пагадненне паміж урадамі БССР і Польскай рэспублікі"[417].

На пачатку студзеня 1946 г. у сапраўднасці адбыўся масавы запіс польскага насельніцтва на выезд у Польшчу. Ён прыняў такі характар, што, як паведамляў прадстаўнік Гродзенскага райпрадстаўніцтва У. Пуцята Галоўнаму прадстаўніку СНК БССР, жадаючых запісацца на выезд было столькі, што "апошнія дні рэгістрацыі выліліся у цэлы працэс. У камісіі не вытрымлівалі ні вокны, ні дзверы. Узброеная група міліцыі не змагла забяспечыць парадку. Натоўп ламаўся дзень і ноч". Усяго з 1 снежня 1945 г. па 15 студзеня 1946 г., па Гродзенскаму райпрадстаўніцтву запісалася на выезд 11 429 гаспадарак агульнай колькасцю 41 136 чалавек[418]. У выніку такога становішча бюро ЦК КП(б)Б прымае

[416] НАРБ, ф.4, воп.61, спр.237 арк.21.
[417] Там сама, арк.21.
[418] НАРБ, ф.788, воп.1.спр.11, арк.71.

жорсткую пастанову – абавязвае Гродзенскі абкам партыі тэрмінова накіраваць у Васілішкаўскі і Радунскі раёны групу адказных партыйна-савецкіх работнікаў з мэтай спынення запісу насельніцтва. Галоўнаму Прадстаўніку СНК БССР У.Царуку загадвалася ўзяць пад асабісты кантроль ход рэгістрацыі і спыніць запіс па вусных заявах. Акрамя гэтага, ЦК КП(б)Б абавязаў Наркаматы ўнутраных спраў і НКДБ прыняць неабходныя захады па выяўленню "варожых правакацыйных элементаў у Васілішкаўскім і Радунскім раёнах".

Аналізуючы рашэнні бюро ЦК па гэтаму пытанню, магчыма заўважыць, што масавая рэгістрацыя польскага насельніцтва была абумоўленая не толькі антысавецкай прапагандай з боку "польскіх нацыяналістычных элементаў". Людзі ведалі, што 15 студзеня 1946 г. канчаўся тэрмін рэгістрацыі, і больш прадаўжаць яго ні польскі, ні беларускі бакі не будуць. Таму становіцца зразумелым жаданне насельніцтва хаця б у апошні момант зарэгістравацца на выезд.

Для змяншэння хвалі жадаючых зарэгістравацца і ад'ехаць у Польшчу партыйныя і савецкія ўлады Гродзеншчыны і іншых абласцей выкарыстоўвалі адміністрацыйны рэсурс дзяржаўнага апарату. Адным з дзейсных сродкаў з'яўлялася патрабаванне ад польскага насельніцтва, асабліва ад сялян, прадстаўлення даведак аб выкананні планаў дзяржпаставак сельскагаспадарчай прадукцыі, лесанарыхтовак, выплаты ўсіх падаткаў. Калі ад'язджаючыя не маглі прадставіць у камісію ўсе неабходныя даведкі, ім не дазваляўся выезд, нягледзячы на тое, што ўсе астатнія дакументы былі ў поўным парадку. У некаторых выпадках справа даходзіла да таго, што асобных грамадзян, якія мелі дакументы, арыштоўвалі, з-за невыканання падаткаў, лесанарыхтовак, лесавывазак і г.д. Так, райпрадстаўнік з г. Дзятлава Баранавіцкай вобласці звярнуўся да Галоўнага прадстаўніка СНК БССР па перасяленню У.Царука з лістом наступнага зместу: "Прашу аказаць садзейнічанне грамадзяніну Вікенцію Касцюку ў эвакуацыі яго з сям'ёй у Польшчу. В.Касцюк атрымаў у нас дакументы на выезд у Польшчу 15 студзеня 1946 г. і павінен быў выехаць 24 студзеня 1946 г. Аднак за невыкананне лесавывазак 21 студзеня быў арыштаваны і асуджаны на 3 гады. 23 студзеня 1946 г. яго справа будзе разглядацца ў Баранавіцкім народным судзе. Прашу разабрацца ў гэтай справе. У Зельвенскм раёне двое грамадзян - С.Бурдзік і М.Банасік - таксама былі

арыштаваныя з-за таго, што не выканалі плана лесанарыхтовак"[419].

У Лідскім раёне Гродзенскай вобласці, як адзначалі польскія ўпаўнаважаныя, па гэтай прычыне "эвакуацыя польскага насельніцтва мясцовымі адміністрацыйнымі ўладамі была практычна паралізавана", бо для таго, каб атрымаць неабходныя эвакадакументы, зарэгістраваныя павінны былі мець, апрача дакументаў аб нацыянальнасці, наступныя даведкі: 1. аб колькасці членаў сям'і; 2. аб тым, што разлічыўся з дзяржавай па дзяржаўных пастаўках і падатках; 3. сельсавета аб выкананні лесанарыхтовак; 4. сельсавета аб тым, што гаспадарчыя пабудовы прынятыя сельсаветам; 5. сельсавета аб колькасці зямлі і пасеваў "[420]. Заўважым, што такія дзеянні раённых уладаў былі санкцыянаваны абласным партыйным кіраўніцтвам. Так, на нарадзе ў Гродзенскім абкаме партыі 24 студзеня 1946 г. першы сакратар абкама партыі П.Калінін і старшыня аблвыканкама П.Ратайка далі вусную дырэктыву сакратарам райкамаў партыі і старшыням райвыканкамаў не выдаваць зарэгістраваным эвакадакументаў, пакуль яны не выканаюць усе неабходныя дзяржпастаўкі і плацяжы[421].

Аналізуючы гэтую сітуацыю, неабходна ўлічваць цяжкае эканамічнае становішча, у якім апынулася рэспубліка ў першыя пасляваенныя гады. Штогадовыя планы дзяржпаставак сельскагаспадарчай прадукцыі абумоўлівалі паводзіны як абласнога, так і раённага партыйнага і савецкага кіраўніцтва. На вышэйадзначанай нарадзе старшыня аблвыканкама П.Ратайка і сакратар абкама партыі П.Калінін у асабістай размове з кіраўніком Гродзенскага прадстаўніцтва СНК БССР У.Пуцятам заявілі яму, што яны ведаюць аб умовах пагаднення, якія вызваляюць перасяленцаў ад усіх дзяржпаставак і падаткаў. Аднак яны падкрэслілі, што з вобласці ў 1946 г. не «знялі» ні аднаго кілаграма дзяржпаставак збожжа. Больш таго, на вобласць быў даведзены дадатковы план здачы збожжа і іншай сельскагаспадарчай прадукцыі, таму яны настойліва патрабуюць, каб усім ад'язджаючым у Польшчу не выдавалі неабходных дакументаў, пакуль яны не разлічацца з дзяржавай па ўсіх пастаўках, плацяжах, падатках, лесанарыхтоўках і г.д.[422]. Вось як тлумачыў пазіцыю П.Калініна і П.Ратайка кіраўнік Гродзенскага

[419] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.330-331.
[420] Там сама, арк.98.
[421] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.84.
[422] Там сама, арк.106.

райпрадстаўніцтва У.Пуцята: "Вельмі цяжка супрацоўнічаць з т. Калініным. Сутнасць справы ў наступным. Я неаднаразова быў у т.т. Калініна і Ратайкі па гэтых пытаннях з дадатковым пратаколам, падпісаным у Варшаве 25 лістапада 1945 г., але яны мне ставілі такое пытанне: "Добра, але ўлічвай, што ні аднаго кілаграма хлеба не знялі з вобласці, а, наадварот, яшчэ дабавілі. Лесу не здымаюць ні аднаго кубаметра, а план павінен быць выкананы. Зарэгістраваўся вялікі працэнт па вобласці, а ехаць не жадаюць і сабатуюць урадавыя заданні. Ад каго лепей патрабаваць: ці ад таго, хто мае 2-3 кані, 3-4 каровы і г.д., ці з калгаснікаў усходніх абласцей, якія жывуць у зямлянках, недастаткова маюць хлеба, бо зямлю не было чым узараць і пасеяць"[423]. Такога кшталту меркаванні і разважанні партыйна-савецкага кіраўніцтва былі дастаткова абгрунтаванымі, улічваючы, што яны асабіста адказвалі перад дзяржавай за выкананне ўсіх паставак дзяржаве. Так, у дакладной запісцы, якую накіраваў У.Царуку яго намеснік І.Карпаў у маі 1945 г., падкрэслівалася, што "з Міёрскага і Браслаўскага раёнаў 70-80% насельніцтва падалі заявы на эвакуацыю. Выкананне плана дзяржаўных паставак у шэрагу раёнаў апынулася пад пагрозай зрыву"[424].

Дададзім, што літаральна праз месяц, у красавіку 1946 г., кіраўніцтва Брэсцкага і Гродзенскага аблвыканкамаў дало загад выканкамам райсаветаў "устрымацца" ад перасялення тых сялян, якія не правядуць веснавога севу і не засеюць палеткі. К.Кісялёў, як намеснік Старшыні СМ БССР, патрабаваў ад вышэйазначаных аблвыканкамаў адмяніць гэтую пастанову, як не адпавядаючую ўмовам беларуска-польскага пагаднення і скіраваную на зрыў перасялення[425].

У некаторых выпадках мясцовыя ўлады, зыходзячы са сваіх меркаванняў, адмаўлялі ў праве на выезд ужо зарэгістраваным грамадзянам. Так, упаўнаважаны польскага ўрада ў Картуз-Бярозе Сурвіла паведамляў С.Вішнеўскай наступнае: "На 15.03.46 г. я прызначыў на транспарт зарэгістраваных грамадзян з Драгічынскага раёна. Калі я даслаў людзям паведамленне праз райвыканкам, то даведаўся, што старшыня райвыканкама т. Падкарытаў разам з першым сакратаром РК КП(б)Б т. Казімеруком і намеснікам старшыні аблвыканкама т. Буевічам не дазволілі эвакуіраваць усіх зарэгістраваных на выезд грамадзян польскай

423 Там сама, арк.84.
424 Там сама, арк.282.
425 НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1922, арк.38.

нацыянальнасці, сцвярджаючы, што яны з'яўляюцца беларусамі, і з 140 сямей прызналі польскімі толькі 7 сямей. Дадатакова паведамляю, што кіраўнікі мясцовых уладаў не прызнаюць ніякіх дакументаў, якія пацвярджаюць польскую нацыянальнасць, і вызначаюць яе на свой погляд"[426].

Апошія месяцы перасялення (красавік – май 1946 г.) характарызаваліся значна ўзрослай інтэнсіўнасцю і напружанасцю працы па перасяленню. Вясной 1946 г. польскія ўпаўнаважаныя і прадстаўнікі СМ БССР сумесна падрыхтавалі "Мерапрыемствы па ўзмацненню эвакуацыі на красавік-май 1946 г."[427]. Для паскарэння перасялення і сканчэння яго ў вызначаны тэрмін Гродзенскаму, Брэсцкаму і Ваўкавыскаму райпрадстаўніцтвам рэкамендавалася ажыццяўляць перасяленне "сваім ходам", праз вызначаныя КПП. У мэтах павышэння эфектыўнасці працы чыгуначнага транспарту бакі пагадзіліся адысці ад першапачатковых нормаў, якія прадугледжвалі перавозку ў вагонах 9-10 чалавек, і прынялі рашэнне "дабівацца ўмяшчальнасці не менш 15-20 чалавек". Жывёлу рэкамендавалася збіраць у гурты і адганяць сваім ходам да мяжы[428].

Ва ўсіх райпрадстаўніцтвах у красавіку-маі 1946 г. адбыліся заключныя нарады прадстаўнікоў СМ БССР і ўпаўнаважаных Польшчы, на якіх падкрэсліваліся мэты і значэнне "Мерапрыемстваў". Напрыклад, 2 красавіка 1946 г. адбылася сумесная нарада беларускіх і польскіх работнікаў Слонімскага райпрадстаўніцтва, на якой прысутнічалі Галоўны прадстаўнік СМ БССР У.Царук і Галоўны ўпаўнаважаны ўрада Польшчы С.Вішнеўская.[429] Беларускія і польскія работнікі пагадзіліся з тым, што ні ў аднаго з бакоў няма сур'ёзных прэтэнзій адзін да аднаго і да мясцовых улад на завяршальным этапе працы. Падсумоўваючы выступленні работнікаў, і У.Царук і С.Вішнеўская адзначылі іх плённую амаль двухгадовую працу і выказалі ўпэўненасць, што тая колькасць зарэгістраваных, якая засталася яшчэ ў Беларусі, зможа выехаць у вызначаныя тэрміны[430].

У чэрвені 1946 г. адбыліся заключныя сумесныя нарады прадстаўнікоў СМ БССР і ўпаўнаважаных Польшчы, на якіх былі падведзены канчатковыя вынікі працы па перасяленню. Так, кіраўнік Глыбоцкага райпрадстаўніцтва І.Ярашэнка 12 чэрвеня

[426] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11, арк.267.
[427] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.8, арк.204.
[428] Там сама, арк.204-205.
[429] НАРБ, ф.788, воп.2, спр.210, арк.7.
[430] НАРБ, ф.788, воп.2, спр.210, арк.10.

1946 г. паведамляў У.Царуку, што "Глыбоцкае райпрадстаўніцтва эвакуацыю польскага насельніцтва з тэрыторыі БССР у Польшчу скончыла. Апошні транспарт адпраўлены 12 чэрвеня 1946 г. Усяго эвакуіравана 6342 гаспадаркі, у якіх 22 748 чалавек: яўрэйскіх гаспадарак 212, у якіх 513 чалавек"[431]. Такім чынам, гэтыя некалькі радкоў афіцыйнага пратакола падвялі рысу той напружанай працы, якую правялі ў 9 адміністрацыйных раёнах (Глыбоцкім, Дунілавіцкім, Шаркаўшчынскім, Відзаўскім, Браслаўскім, Міёрскім, Дзісенскім, Пліскім, Докшыцкім) Полацкай вобласці прадстаўнікі беларускага і польскага бакоў з кастрычніка 1944 па чэрвень 1946 гг.

Аналагічныя сумесныя нарады прайшлі ў кожным райпрадстаўніцтве, на якіх былі падсумаваныя вынікі амаль двухгадовай працы, а напрыканцы чэрвеня 1946 г. прадстаўнікі СМ БССР і ўпаўнаважаныя польскага ўрада падпісалі выніковыя пратаколы, у якіх была зафіксавана дакладная колькасць ад'ехаўшых, тых, хто адмовіўся ад выезду, каму адмовілі ў выездзе і г.д.

Такім чынам, у чэрвені 1946 г. амаль двухгадовая праца па перасяленню была скончана. Выніковыя пратаколы сведчаць, што агульныя тэндэнцыі, якія склаліся з пачаткам перасялення і характэрныя для вынікаў па стану на 1 мая 1945 г., захаваліся і былі ўласцівы вынікам па стану на 15 чэрвеня 1946 г. з нязначнымі змяненнямі. Так, калі па стану на 1 мая 1945 г. у першую групу райпрадстаўніцтваў, у якіх зарэгістравалася найбольшая колькасць насельніцтва, уваходзілі Гродзенскае, Маладзечанскае і Глыбоцкае, то па стану на 15 чэрвеня 1946 г. у гэтую групу, як і раней, увайшлі Гродзенскае - 47 053 сям'і, якія налічвалі 148 727 чалавек, Маладзечанскае - адпаведна 225 618 і 101 241, а замест Глыбоцкага ў гэтую групу ўвайшло Навагрудскае - 23 780 і 78 619. Другую групу склалі Глыбоцкае - 19 656 і 73 077, Ваўкавыскае - 13 282 і 42 702 і замест Брэсцкага ў гэтую групу ўвайшло Слонімскае - 9161 і 32 665. Трэцюю групу склалі Брэсцкае - 8772 і 27 590, Пінскае - 5467 і 17 525, Картуз-Бярозаўскае - 3704 і 13 149. Па ўсіх райпрадстаўніцтвах агульныя лічбы выглядалі наступным чынам: усяго зарэгістравалася 156 497 сямей, якія налічвалі 535 284 чалавекі.

Аднак паміж зарэгістраванымі і тымі, хто змог выехаць у Польшчу, існавала значная дыспрапорцыя: 10 486 сямей (ці 7, 29%), агульнай колькасцю 39 044 чалавекі палічылі беларусамі-

[431] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.21, арк.1.

каталікамі і выкраслілі з рэгістрацыйных спісаў, бо яны не мелі права на перасяленне. Па розных прычынах адмовілася ад перасялення 73 500 сямей (49,52%), якія налічвалі 265 088 чалавек. Толькі 72 511 сямей (45,05%), агульнай колькасцю 241 152 чалавекі назаўсёды пакінулі Беларусь і пераехалі ў Польшчу[432].

Аналіз колькасных дадзеных паказвае, што калі адбыліся нязначныя змяненні зарэгістраваных па райпрадстаўніцтвах, то прынцыповых змяненняў не адбылося сярод сацыяльнага, прафесійнага, узроставага складу перасяленцаў. Як і раней, абсалютную большасць зарэгістраваных і пераселеных склалі сялянне - 55 554 (дадзеныя аб пераселеных), другую групу склалі рабочыя - 12 678, трэцюю - саматужнікі - 8791. Далей па ўбываючай: служачыя - 6561, чыгуначнікі - 2380, настаўнікі - 2233, інжынерна-тэхнічныя работнікі - 732, урачы - 484, святары - 313, іншыя - 58 492[433].

Не адбылося змяненняў і па полу. Большасць перасяленцаў склалі жанчыны, якіх налічвалася 87 915, мужчын адпаведна - 60 303. Значную частку ад'ехаўшых склалі дзеці да 16-гадовага ўзросту - 90 564.

У сувязі з масавым ад'ездам польскага насельніцтва з заходняга рэгіёна Беларусі нельга пагадзіцца з эмацыянальнымі, не зусім абгрунтаванымі высновамі шэрагу вядомых польскіх гісторыкаў. Так, П.Эберхардт сцвярджае, што ў час перасялення "выязджалі людзі з найвышэйшым узроўнем адукацыі і больш моцным нацыянальным пачуццём. *Пакінула свае родныя мясціны ўся польская інтэлігенцыя і рэшта зямельных уладальнікаў. Болей за тое, выехала гарадское насельніцтва* (выдзелена мной. – А.В.). Падчас рэпатрыяцыі выехала і пераважная частка каталіцкага святарства. Гэта было звязана з тым, што касцёлы закрываліся. Засталося самае беднае насельніцтва з вельмі нізкім узроўнем адукацыі, якое было пазбаўлена сваіх вышэйшых колаў і лідэраў. Яно папала пад татальную дыскрымінацыю"[434]. Аднак выказванні аўтарытэтнага гісторыка больш абапіраюцца на эмоцыі, чым на грунтоўны навуковы аналіз. Так, другі не менш вядомы польскі гісторык Я.Чарнякевіч, абапіраючыся на вялізны дакументальны матэрыял з польскіх архіваў, сцвярджае, што ў Польшчу пераехала 23,19% работнікаў разумовай працы, 0,84% - настаўнікаў, 0,03 - вайскоўцаў, 0,19% - медыцынскіх работнікаў, 0,02% - работнікаў

[432] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1922, арк.56.
[433] НАРБ, ф.787. воп.2, спр.5, арк.22.
[434] Эберхардт П. Дэмаграфічная сітуацыя ў Беларусі: 1898-1989. Менск: Бел.фонд. Сораса, 1997. С.161.

культуры, 0,12% - святароў, 0,04% - грамадскіх дзеячаў, 0,47% - іншых прадстаўнікоў інтэлігенцыі[435]. Такім чынам, нават з гэтых лічбаў вынікае, што не "ўся польская інтэлігенцыя" выехала ў Польшчу. Разам з тым неабходна пагадзіцца з П.Эберхардтам, што ў Польшчу ў сапраўднасці выязджалі людзі з больш моцным польскім пачуццём, што ў дачыненні да палякаў як нацыянальнай меншасці ўжываўся ціск з боку улад у выглядзе закрыцця польскамоўных школ, касцёлаў, культурна-асветных устаноў і г.д.

Пасля 15 чэрвеня 1946 г. пачалося скарачэнне апаратаў упаўнаважаных Польшчы і прадстаўнікоў СМ БССР. Так, у чэрвені 1946 г. СМ БССР прымае пастанову "Аб скарачэнні апарату Галоўнага ўпаўнаважанага і Галоўнага прадстаўніка СМ БССР па эвакуацыі". Згодна з ёй з 1 ліпеня 1946 г. спынялі працу Брэсцкае, Пінскае, Картуз-Бярозаўскае, Слонімскае, Навагрудскае, Ваўкавыскае, Маладзечанскае і Глыбоцкае райпрадстаўніцтвы. Разам з тым для заканчэння працы да 1 студзеня 1947 г. заставалася працаваць група Галоўнага ўпаўнаважанага Польшчы ў Баранавічах і Гродне[436].

15 чэрвеня 1946 г. афіцыйна скончыўся тэрмін перасялення, аднак у заходніх абласцях БССР заставалася яшчэ нязначная колькасць грамадзян, якія ў выніку розных абставін не змаглі пераехаць у Польшчу. Галоўным чынам гэта былі ваеннаслужачыя польскага войска і члены іх сямей, а таксама члены сямей, якія засталіся ў Беларусі ў той час як іх бацькі пераехалі ў Польшчу. Рэгістрацыя гэтай групы насельніцтва праводзілася ў індывідуальнам парадку ў двух пунктах - Баранавічах і Гродне да 31 снежня 1946 г. Усяго з 15 чэрвеня па 31 снежня 1946 г. зарэгістравалася і перасялілася ў Польшчу 2934 гаспадаркі агульнай колькасцю 7630 чалавек[437].

Снежань 1946 г. канчаткова падвёў рысу пад двума гадамі працы па перасяленню. Так, 13 мая 1947 г. на сумесным пасяджэнні Упаўнаважаных польскага ўрада па справах эвакуацыі і Галоўнага прадстаўніка СМ БССР па эвакуацыі быў падпісаны выніковы Пратакол аб сканчэнні перасялення. У §1 Пратакола адзначалася, што "эвакуацыя польскіх грамадзян з тэрыторыі заходніх абласцей Беларускай ССР у Польшчу, пачатая 15 верасня 1944 г., поўнасцю скончана 31 снежня 1946 г. Уся праца па перасяленню польскіх грамадзян праводзілася ў строгай адпаведнасці з умовамі і канкрэтнымі патрабаваннямі азначанага

---

435 Czerniakiewicz J. Ibid. S. 116-117.
436 НАРБ, ф.788, воп.1, спр.21, арк.21.
437 НАРБ, ф.788, воп.1, спр.24, арк.26.

Пагаднення і дадатковага Пратакола ад 25 лістапада 1945 г. "Аб прадоўжанні тэрміну эвакуацыі да 15 чэрвеня 1946 г.", а таксама дазволу ўрада Беларускай ССР прадоўжыць эвакуацыю да 1 студзеня 1947 г."[438].

Аналіз пратакола выклікае шэраг пытанняў, на якія даволі складана адказаць. Па-першае, існуе істотная разніца ў лічбах, прыведзеных у §1 Пратакола, і выніковых лічбах, якія былі прадстаўлены ў СМ БССР Галоўным прадстаўніцтвам па эвакуацыі. Так, у Пратаколе пазначана, што вусных і пісьмовых заяў на перасяленне паступіла ад 146 808 гаспадарак, у якіх налічвалася 499 648 чалавек[439]. У той жа час, па дадзеных Галоўнага прадстаўніцтва СМ БССР па стану на 10 чэрвеня 1946 г., зарэгістравалася 156 494 гаспадаркі агульнай колькасцю 535 284 грамадзяніны[440]. Аднак, калі ў гэты лік уключыць яшчэ 7630 чалавек, якія зарэгістраваліся на выезд і выехалі з 15 чэрвеня па 31 снежня 1946 г., то агульная лічба зарэгістраваных складае 542 914 чалавек. Такім чынам, розніца ў лічбах зарэгістраваных на выезд складае 43 266 чалавек. У той жа час колькасць пераехаўшых на сталае месца жыхарства ў Польшчу як у Пратаколе, так і ў дадзеных Галоўнага прадстаўніцтва поўнасцю супадае: 238 782 чалавекі назаўсёды пакінулі Беларусь. Такім чынам, пытанне, чаму і хто "згубіў" з ліку зарэгістраваных больш за 40 тыс. чалавек, застаецца адкрытым.

Па-другое, існуе значная розніца ў абагульняючых лічбах, прыведзеных у афіцыйных беларускіх дакументах, і лічбах, якія прыводзяць польскія гісторыкі. Напрыклад, Я.Чарнякевіч сцвярджае, што ў час перасялення 1944-1947 гг. у Польшчу пераехала 274 163 чалавекі[441]. Калі параўнаць гэтую лічбу з той, якая прыведзена ў выніковым Пратаколе, падпісаным С.Вішнеўскай і У.Царуком, то атрымліваецца розніца ў 35 378 чалавек. Зноўку ж няма прамога адказу на пытанне аб такіх даволі істотных ваганнях у лічбах.

Па-трэцяе, § 4 Пратакола, які сцвярджае, што "ўся работа па эвакуацыі праходзіла і закончана ў атмасферы ўзаемаразумення і згоды", носіць у большай ступені спалітызаваны характар і адлюстроўвае больш савецка-польскія ўзаемадносіны, чым беларуска-польскія. У савецка-польскіх адносінах Польшча разглядалася як бліжэйшы сатэліт Масквы, і ў іх ніякіх

---

[438] Там сама, арк.22.
[439] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.22, арк.19.
[440] НАРБ, ф.788, воп.1. спр.23, арк.27.
[441] Czerniakiewicz J. Ibid. S.131.

непаразуменняў і недарэчнасцяў не павінна было быць. Аднак "работа па эвакуацыі" ў пэўныя моманты была далёкай ад атмасферы ўзаемаразумення і згоды. У прыватнасці, перапіска паміж К.Кісялёвым і У. Царуком з беларускага боку і С.Вішнеўскай - з польскага яскрава сведчыць аб складанасці, супярэчнасці падыходаў як беларускага, гэтак і польскага бакоў да тых ці іншых пытанняў. "Атмасферы ўзаемаразумення і згоды" не магла таксама спрыяць дзейнасць польскага падполля, а таксама шматлікіх бандыцкіх груповак, якія тэрарызавалі беларускае і польскае насельніцтва як у Беларусі, так і ў Польшчы. Тым не менш, нягледзячы на спрэчнасць многіх пытанняў, апараты прадстаўнікоў СМ БССР і ўпаўнаважаных Польшчы знаходзілі паразуменне і выканалі тую задачу, якая была ўскладзена на іх урадамі абедзвюх краін.

Неабходна адзначыць, што польскі бок паспрабаваў ініцыяваць перад беларусамі пытанне аб працягу перасялення і ў 1947 г. Так, на пачатку сакавіка 1947 г. Старшыня СМ Польшчы Ю.Цыранкевіч накіраваў намесніку міністра замежных спраў СССР А.Вышынскаму ліст, у якім паведамляў, што польскі бок абмеркаваў пытанні аб прадаўжэнні тэрміну перасялення паміж Польшчай і БССР. Аднак МЗС СССР палічыла немэтазгодным працягваць перасяленне далей, аб чым і паведаміла Ю.Цыранкевічу. Неабходна падкрэсліць, што адказ МЗС СССР грунтаваўся на інфармацыі ўрада Беларусі. На пачатку лютага 1947 г. П.Панамарэнка паведаміў А.Вышынскаму аб тым, што на пачатку 1947 г. у камісіі па перасяленню паступаюць адзінкі заяваў ад палякаў, якія жадаюць перасяліцца ў Польшчу. У сувязі з гэтым П.Панамарэнка зрабіў выснову, што неабходна "ўнесці (ва ўрад СССР. – А.В.) прапанову аб спыненні працы па эвакуацыі, у дыпламатычным парадку паставіць перад польскім урадам пытанне аб адазванні польскага прадстаўніка з тэрыторыі Беларускай ССР і падпісанні двухбаковага акта аб сканчэнні працы па перасяленню"[442].

Такім чынам, перасяленне польскага насельніцтва з БССР у Польшчу ў 1944-1947 гг. ажыццяўлялася ў складаных абставінах ваеннага і пасляваеннага развіцця рэспублікі, абумоўленых змяненнем яе межаў і перадачай на карысць Польшчы часткі тэрыторыі Беларусі. Першыя месяцы паказалі, што сотні тысяч палякаў зарэгістраваліся на выезд у Польшчу. Найбольшы адток польскага насельніцтва назіраўся з Гродзенскай вобласці і асабліва

[442] Архіў МЗС РБ, ф. 907, воп.2, спр.400, арк.1.

з Шчучынскага, Воранаўскага, Лідскага, Ваўкавыскага, Гродзенскага раёнаў, Маладзечанскай - Ашмянскага, Іўеўскага, Астравецкага, Смаргонскага, Баранавіцкай - Івянецкага, Стаўбцоўскага, Нясвіжскага, Навагрудскага, Полацкай - Браслаўскага, Відзаўскага, Дунілавіцкага. Аднак гэтая тэндэнцыя адлюстроўвала асаблівасці нацыянальнага складу гэтых раёнаў. У іх лічбы польскага насельніцтва вагаліся ад 30 да 70%. Разам з колькаснымі паказчыкамі вызначыўся сацыяльны, прафесійны, узроставы склад перасяленцаў.

Перасяленчы працэс выявіў сукупнасць фактараў, якія вымушалі палякаў змяняць грамадзянства і пераязджаць на сталае месца жыхарства ў Польшчу. Найбольш важнымі, улічваючы асаблівасці пасляваеннага развіцця заходняга рэгіёна Беларусі, з'яўляліся сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя, этнічныя, канфесійныя, міжнародныя, роднасныя ды іншыя. Усе яны дзейнічалі адначасова, як паасобку, так і сукупна. Аднак асноўнымі дэтэрмінантамі неабходна лічыць сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя, бо складанасці развіцця заходняга рэгіёна (палітыка савецкай улады па паглыбленню сацыялістычных пераўтварэнняў у сельскай гаспадарцы, высокія стаўкі падаткаў на аднаасобнае сялянства, дэпартацыі польскага насельніцтва, дыскрымінацыйная палітыка савецкай улады да палякаў як нацыянальнай меншасці, існаванне разгалінаванай сеткі польскага падполля і г.д.) аказвалі найбольш моцны ўплыў пры прыняцці рашэння аб перасяленні ў Польшчу.

У час перасялення выразна наглядаецца эвалюцыя адносін партыйнага кіраўніцтва рэспублікі да працэсу перасялення. З кастрычніка 1944 г. па красавік 1945 г. яно актыўна не ўмешваецца ў працу ўпаўнаважаных Польшчы па уліку, рэгістрацыі і перасяленню палякаў. Аднак масавая рэгістрацыя польскага насельніцтва вымусіла кіраўніцтва БССР прыняць захады па запаволенню яго ад'езду з рэспублікі. Пазіцыя кіраўніцтва рэспублікі з красавіка 1945 г. эвалюцыянуе ад нейтральнага стаўлення да жорсткага адміністрацыйнага кантролю за ходам перасялення, што праявілася ў стварэнні змешаных камісій і масавай праверкі рэгістрацыйных спісаў вясной-летам 1945 г. Стварэнне ў лістападзе 1945 г. абласных камісій па перасяленню пры аблвыканкамах сведчыла, па-першае, аб адхіленні упаўнаважаных урада Польшчы ад прыняцця рашэння аб рэгістрацыі і перасяленні і перадачы гэтых правоў адміністрацыйным органам, што сведчыла аб частковым адыходзе ад асноўных палажэнняў беларуска-польскага пагаднення ад 9

верасня 1944 г., па-другое, уздзеянні на працэс перасялення Саюзнага ўрада, бо рашэнне аб стварэнні абласных камісій прыняў урад СССР, а не БССР.

Вынікам жорсткага адміністрацыйнага кантролю з'яўлялася тое, што выехаць у Польшчу змаглі толькі 45,05% палякаў ад усёй колькасці зарэгістраваных. Адной з асноўных прычын таго, што амаль палова палякаў не змагла перасяліцца, з'яўлялася палітыка партыйна-савецкага кіраўніцтва рэспублікі, якая свядома праводзілася і была скіравана на спыненне масавага ад'езду насельніцтва.

Колькасныя паказчыкі сведчаць, што перасяленне насельніцтва, ажыццёўленае ў 1944-1946 гг., у гісторыі Беларусі савецкага перыяду з'явілася адной з самых масавых страт насельніцтва. Звыш 240 тыс. чалавек добраахвотна, без прымусу прынялі рашэнне аб змяненні грамадзянства і пераездзе на сталае месца жыхарства ў Польшчу. Людскія страты, панесеныя рэспублікай падчас перасялення, ні колькасна, ні якасна не магло кампенсаваць перасяленне беларусаў з Беласточчыны.

Тым не менш, нягледзячы на складанасці працы, розныя падыходы ў дачыненні да перасялення насельніцтва з боку прадстаўнікоў СНК БССР, упаўнаважаных ПКНВ, неадназначнае стаўленне да яго партыйна-савецкага кіраўніцтва рэспублікі, урад БССР выканаў умовы беларуска-польскага пагаднення ад 9 верасня і дадатковага пратакола ад 25 лістапада 1945 г. і ажыццявіў у 1944-1946 гг. перасяленне польскага насельніцтва з тэрыторыі БССР у Польшчу.

## Раздзел 4.
## З прасавецкай Польшчы ў камуністычную Беларусь

### Глава 1.
### Адзінства ўсіх: беларусы павінны выехаць за лінію Керзана

Змены, якія адбываліся ва Усходняй Еўропе ў выніку Другой сусветнай вайны, прынцыпова змянілі яе рэгіянальную палітычную карту. Бліжэйшая суседка Беларусі Польшча выходзіла з вайны з новым грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным ладам, новымі знешнепалітычнымі прыярытэтамі. Не менш значнымі з'ўляліся тэрытарыяльныя змены як на захадзе, так і на ўсходзе краіны, якія прывялі да істотных дэмаграфічных зменаў у структуры і колькасці насельніцтва на ўсходняй мяжы Польшчы. Гэта было звязана з вызначэннем беларуска-польскай часткі савецка-польскай мяжы. 27 ліпеня 1944 г. урад СССР падпісаў з ПКНВ часовае пагадненне аб новай савецка-польскай мяжы, у адпаведнасці з якім да Польшчы адыходзіла частка тэрыторыі Беларусі – амаль уся Беласточчына, а пазней, у верасні 1945 г., частка Брэсцкай вобласці: 4 сельсаветы Высокаўскага раёна, г. Гайнаўка і 11 сельсаветаў Гайнаўскага раёна, г.п. Кляшчэлі і 8 сельсаветаў гэтага ж раёна і цалкам Сямяціцкі раён[443].

Разам з "падарункам" І.Сталіна ў выглядзе Беласточчыны Польшча атрымала ўсе яе праблемы і адну з найбольш балючых і складаных – нацыянальную. Палітыка новай улады ў рашэнні нацыянальнага пытання ў 1944-1947 гг. заключалася ў "правядзенні планавага і добра арганізаванага перасялення нацыянальных меншасцяў і вяртання палякаў у краіну"[444]. Гэта значыла, што беларусы, як нацыянальная меншасць на Беласточчыне, падлягалі перасяленню ў Беларусь. Аднак, як гэта ні парадаксальна і дзіўна гучыць, у жаданні перасяліць усіх беларусаў з Беласточчыны ў БССР былі зацікаўлены ўсе: лонданскі эміграцкі

[443] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т.2 / Беларуская Энцыклапедыя.; Рэдкал.: Б.І.Сачанка (гал. рэд.) і інш.-Мн.:БелЭн, 1994.-С.93.

[444] Милякова Л. Польша на пути к моноэтничному государству. (1918-1947 гг) / http//:www.history.machaon.ru/all/number13/analit4/milyakova/index.html

ўрад, новая ўлада Польшчы, а таксама партыйна-савецкае кіраўніцтва Беларусі. Яднанне такіх рознаполюсных сілаў, іх зацікаўленасць у татальным перасяленні беларусаў з Беласточчыны ў БССР стварылі для апошніх надзвычай складаную сітуацыю. Збег акалічнасцей прывёў да таго, што ні адна палітычная сіла не адстойвала іх інтарэсы. Беларусы, якія спрадвеку пражывалі на Беласточчыне, супраць іх волі і жаданняў павінны былі перасяляцца ў БССР. Карыстаючыся нагодай, я выказваю шчырую ўдзячнасць прафесару Мікалаю Сакалову і дацэнту Аляксандру Ціхаміраву, якія дапамаглі мне больш дакладна і выразна сфармуляваць гэтую выснову.Адзінства і аднадушша ўсіх у гэтым пытанні непазбежна прывялі да ўзрастання напружанасці і канфліктнасці паміж палякамі і беларусамі, выклікалі ахвяры з аднаго і другога боку.

Ідэя перасялення беларусаў па-за лінію Керзана была сфармулявана яшчэ напачатку вайны Савецкага Саюза з Германіяй. Так, Стронніцтва Народовэ прытрымлівалася пункту гледжання, што ў выніку перамогі Савецкага Саюза над Германіяй частку беларускага насельніцтва неабходна будзе перасяліць з тэрыторыі Польшчы ў СССР. Гэтую ідэю падзяляла і Стронніцтва Працы[445].

Напрыканцы вайны пазіцыя лонданскага эміграцкага ўрада да нацыянальных меншасцяў была вызначана ў Дэкларацыі Савета нацыянальнага адзінства ў 1944 г. У раздзеле, які быў прысвечаны нацыянальным меншасцям, падкрэслівалася, што прызнанне іх правоў пасля вайны наўпрост залежыць ад іх вернасці і лаяльнасці польскай дзяржаве і пазітыўных адносін да правоў і інтарэсаў польскага народа, што аўтаматычна ставіла палякаў у пазіцыю народа-суверэна ў адносінах да іншых народаў[446]. Адзначым, што праблема перасялення як варыянт рашэння “беларускага пытання” на Беласточчыне а таксама іншыя варыянты яго рашэння разглядаліся таксама Дэлегатурай у Польшчы і камандаваннем Арміі Краёвай. Так, у аналітычнай запісцы аддзела знешніх зносін Дэлегатуры ў Польшчы, у якой разглядалася праблема нацыянальных меншасцяў у Польшчы (у давераснёўскіх межах), істотнае месца адводзілася праблеме беларусаў як нацыянальнай меншасці і варыянты яе рашэння. У ёй, у прыватнасці, адзначалася: “Неабходна прызнаць, што раней прымаемыя праекты рашэння праблемы нашых меншасцяў, украінскіх ці

[445] Turonek J. Kwescia Bialoruska w Polityce Obozu Londynskiego (1941-1944) // Studia dziejow ZSRR i Europy Srodkowej. Wroclaw. Instytut Historii PAN. T.XIX. 1973.-S.133.
[446] Мілякова Л. Назв соч.

беларускіх, не адпавядаюць нашым унутраным інтарэсам, а значыць, будуць складаць вялікія перашкоды ў нашай замежнай палітыцы. Перадача ўкраінцам, якія пражываюць у Польшчы, той ці іншай аўтаноміі, у рэшце рэшт раней ці пазней прывядзе да аддзялення ад Польшчы на карысць Расіі ці Украіны тэрыторый, якія заселены імі. Перадача ўкраінцам аўтаноміі пацягне за сабой перадачу аўтаноміі беларусам і выкліча такія ж самыя наступствы...”[447]. Выказваю шчырую ўдзячнасць Э. Ярмусіку за прадастаўлены матэрыял, які знаходзіцца ў Архіве Актаў Новых у Варшаве.

Аналагічныя матывы гучалі і ў дакументах “інфармацыйна-прапагандысцкага апарату падпольных польскіх арганізацый у БССР”, якія былі захоплены войскамі 3-га Беларускага фронту каля вёскі Эйшышкі Лідскага раёна і трапілі ў 7-ы аддзел палітычнага ўпраўлення гэтага ж фронту. Як адзначаў начальнік гэтага аддзела палкоўнік Нікіфараў, “ў ліку захопленых дакументаў маецца папка з матэрыяламі для брашуры аб Беларусі. Гэтыя матэрыялы падбіраліся па спецыяльнаму плану, выкладзенаму ў так званых “Нататках для брашуры “Беларуская праблема”. Далей ён паведамляў, што ў адным з раздзелаў “нататкаў” адзначаецца, што “... не можа быць ніякіх размоў аб аўтаномнай Беларусі ў рамках польскай дзяржавы, а беларускага народа не існуе”[448]. На жаль, у Нацыянальным архіве Рэспублікі Белаурсь не маецца арыгінала “дакументаў інфармацыйна-прапагандысцкага апарату падпольных польскіх арганізацый на тэрыторыі БССР”, бо, як адзначаў палкоўнік Нікіфараў, 31 жніўня 1944 г. арыгіналы былі высланы начальніку Галоўнага палітычнага ўпраўлення Чырвонай Арміі генерал-палкоўніку Шчарбакову.

Аднак вернемся да запіскі Дэлегатуры ў Польшчы. Наконт перасялення ў ёй адзначалася, што «праект перасялення па заканчэнні вайны ўкраінцаў і беларусаў па ўсёй Польшчы таксама ўтрымлівае шмат недахопаў. Нацыянальная меншасць застаецца нацыянальнай меншасцю нават тады, калі яна распыліцца па ўсёй дзяржаве. Нацыянальная свядомасць беларусаў і ўкраінцаў, а таксама іх рэлігійныя асаблівасці прывядуць да таго, што працэс асіміляцыі будзе праходзіць вельмі марудна”[449]. Разам з тым аўтары запіскі ўсё ж схіляліся да неабходнасці перасялення беларусаў з Польшчы ў савецкую Беларусь. У раздзеле “Нацыянальныя меншасці”, падраздзеле “Беларусы”, адзначалася:

[447] AAN w Warszawie, zygnatyra 202/II-51, mikrofilm 2225/ 10- II, k.170.
[448] НАРБ, ф.4., воп.29, спр.61, арк. 75.
[449] AAN w Warszawie, zygnatyra 202/II-51, mikrofilm 2225/ 10- II, k.173.

“Адносіны беларусаў да польскай дзяржаўнасці не былі такімі варожымі, як украінцаў. Прычынай гэтаму была, між іншым, вельмі нізкая ступень нацыянальнай самасвядомасці беларусаў... Калі прыняць пад увагу тыя абставіны, што да цяперашняга часу акупацыйная прапагандысцкая работа саветаў і камуністаў не акажа істотнага ўплыву на далейшае паглыбленне асэнсавання імі іх нацыянальных асаблівасцей, то, верагодна, і з беларусамі ... не ўдасца дасягнуць узгодненага існавання пад адным дахам. Гэта значыць, неабходна лічыцца з тым, што з часам беларуска-польскія адносіны пагоршыліся б. Гэты погляд, як і неабходнасць набыцця свабоднай зямлі для сялян-палякаў, гаворыць за тое, каб беларускае насельніцтва перасяліць далей на ўсход – на тэрыторыю савецкай Беларусі[450].

Праваднікам ідэй лонданскага эміграцкага ўрада на Беласточчыне з’яўлялася польскае падполле. Беларусы, з пункту гледжання падполля, з’яўляліся той грамадскаю сілай, на якую ў 1939-1941 гг. абапіралася савецкая ўлада, а ў гады вайны савецкая партызанка. Само існаванне беларусаў на Беласточчыне стварала для савецкай улады (галоўным чынам для Масквы), няхай нават і гіпатэтычную, але магчымасць для ўз’яднання з БССР[451]. Ва ўмовах існавання сталінскага рэжыму ў СССР і падпарадкаванага яму прасавецкага рэжыму ў Польшчы тэхнічна гэта магло быць ажыццёўлена. Таму дзейнасць падполля была скіравана не толькі супраць створаных структур і функцыянераў новай улады, але і супраць беларусаў.

Дзейнасць падполля супраць беларускага насельніцтва праяўлялася ў розных формах і мела для яго розныя наступствы. Як ужо адзначалася, адной з важнейшых задач падполля з’яўлялася жаданне вымусіць беларусаў выехаць з Беласточчыны ў БССР. Для выканання гэтай мэты выкарыстоўваліся як пагрозы, так і “пацыфікацыйныя акцыі”, у выніку якіх знішчалася беларускае насельніцтва. У вёсках з кампактным пражываннем беларусаў падполле раскідвала лістоўкі, у якіх насельніцтву загадвалася тэрмінова выязджаць на ўсход ад лініі Керзана. Так, стараста Бельск-Падляскага павета ў студзені 1946 г. паведамляў Беластоцкаму ваяводзе, што “ў вёсцы Шпакі (гміна Вышкі) былі раскіданы лістоўкі са зваротам да беларускага насельніцтва каб яно на працягу 14 дзён выехала з Польшчы. У выніку нявыезду - усе людзі будуць знішчаны"[452]. Летам 1946 г. стараста

---

[450] AAN w Warszawie, zygnatyra 202/II-51, mikrofilm 2225/ 10- II, k.179.
[451] Mironowicz E. Bialorusini w Polsce. 1944-1949. Wyd. Naukowe PAN. Warszawa, 1993.-S.140.
[452] Sosna G. Ibidem. S.71, 74.

Беластоцкага павета таксама паведамляў ваяводскім уладам, што "тэрарыстычныя банды шляхам пагроз і тэрору вымушаюць беларускае насельніцтва да хутчэйшага выезду па-за лінію Керзана"[453]. Актыўную дзейнасць падполля ў гэтым кірунку адзначаюць складальнікі зборніка дакументаў “ Беласточчына ў дакументах падполля і афіцыйных уладаў 1944-1945 гг.”. Яны звяртаюць увагу, што “як АК-ВіН, так і НОВ-НСЗ-НЗС былі за перасяленне беларускага насельніцтва і неаднаразова прымушалі да перасялення тых, хто быў не згодзен да яго. Такія акты мелі месца досыць часта там, дзе беларусы выказвалі актыўнае нежаданне перасяляцца”[454]. Дзейнасць падполля вымушала вёскі з перавагай беларусаў выязджаць у БССР. І.Круглік у запісцы “Аб праведзенай рабоце па эвакуацыі беларускага, рускага, украінскага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы ў СССР за перыяд з кастрычніка 1944 г. па 15 чэрвеня 1946 г.” адзначаў, што “з-за дзейнасці банд з Беластоцкага павета, з вёсак Тапілец, Завады, Загарляны, Касцюкі, Жоўткі, Вацюты і іншых, выехалі у БССР ўсе беларускія гаспадаркі”[455].

Дзейнасць падполля была настолькі моцнай і актыўнай, што вымусіла беларускую дэлегацыю пры падпісанні дадатковага беларуска-польскага пратакола ад 25 лістапада 1945 г. настаяць на ўнясенні дадатковага параграфа ў пратакол, у якім ад польскага боку патрабавалася “стварыць неабходныя ўмовы для работы ўпаўнаважаных беларускага ўрада на польскай тэрыторыі па рэгістрацыі беларусаў, якія жадаюць выехаць з Польшчы ў БССР”[456]. Тым не менш, нягледзячы на перманентную барацьбу з падполлем, якую вялі органы НКУС разам з рэгулярнымі часткамі Чырвонай Арміі, “пацыфікацыі” ў адносінах да беларусаў не перапыняліся і істотна ўплывалі на перасяленчую акцыю.

Мэты польскіх камуністаў у адносінах да беларусаў супадалі з мэтамі польскага эміграцкага ўрада. Аднак залежнасць ад Масквы не дазваляла ім ставіць пытанне так катэгарычна, як лонданскаму эміграцкаму ўраду. Польскія камуністы больш асцярожна і прыхавана падыходзілі да гэтага пытання. У першай праграмнай заяве ППР падкрэслівалася, што ў Польшчы, за якую яны змагаюцца, “будзе роўнасць і братэрскае супрацоўніцтва ўсіх народаў”[457]. Аднак гэтае, як і другое прынцыповае палажэнне

[453] Sosna G. Ibidem. S.51.
[454] Bialostocczyzna 1944-1945 w dokumentach podziemia i oficjalnych wladz / Oprac.Kulak J. Ins. Studiow Politycznych PAN.Warszawa, 1998.-S.179.
[455] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.66.
[456] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.26, арк.49.
[457] Мілякова Л. Назв. сач.

польскіх камуністаў, сфармуляванае ў лістападаўскай Дэкларацыі ППР (1943 г.), у далейшым знікла з праграмных даументаў ППР. Яно адсутнічала ў Маніфесце дэмакратычных, сацыяльна-палітычных і ваенных арганізацый, прынятым 15 снежня 1943 г. і ў Дэкларацыі Краёвай Рады Нарадовай (1 студзеня 1944 г.). У гэтых дакументах гаворка ішла аб вяртанні Польшчы яе гістарычных зямель на захадзе і вяртанні ўкраінскіх, беларускіх, літоўскіх зямель савецкай Украіне, Беларусі і Літве, адпаведна з волевыяўленнем насельніцтва, у імя прынцыпу самавызначэння нацый.

Ажыццяўленнем на практыцы ідэі польскіх камуністаў аб стварэнні ў Польшчы аднанацыянальнай дзяржавы з'явілася перасяленне насельніцтва. Характэрна, што адным з першых крокаў урада левых сілаў з'явілася падпісанне шэрагу пагадненняў і дагавораў, у тым ліку і з Беларуссю, аб перасяленні насельніцтва. Перасяленнем рашалася праблема, аб якой Б.Берут усваёй навагодняй прамове ў 1946 г. сказаў: "Польскі народ у выніку вайны і тэрытарыяльных зменаў пераўтварыўся з шматнацыянальнай краіны ў мананацыянальную"[458].

Ідэя пабудовы аднанацыянальнай дзяржавы знайшла падтрымку і разуменне на ўзроўні ваяводскіх і павятовых уладаў Беласточчыны. Так, беластоцкі ваявода С.Дыбоўскі ў справаздачы аб стане спраў у ваяводстве ў жніўні 1945 г. характарызаваў становішча на Беласточчыне наступным чынам: "Добрым рашэннем праблемы нацыянальных меншасцяў з'яўляецца стварэнне Польшчы як аднанацыянальнай дзяржавы". Спасылаючыся на выказванні Б.Берута, ён аргументаваў сваю пазіцыю тым, што "польскія тэрыторыі, якія заселены беларускім і ўкраінскім насельніцтвам, былі ачагом вечных клопатаў і войнаў"[459].

Жаданне "выціснуць" беларусаў з Беласточчыны асабліва праглядаецца з сярэдзіны 1945 г., калі ваяводскія ўлады пераходзяць да больш актыўнага ўмяшальніцтва ў яго ход, прымушаючы беларусаў да выезду з ваяводства. Галоўны ўпаўнаважаны СНК БССР у Польшчы І.Круглік накіраваў летам 1945 г. П.Панамарэнку запіску "Аб праследаваннях, ганеннях і тэроры над грамадзянамі беларускай нацыянальнасці, пражываючымі на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства Польскай рэспублікі, з боку палякаў і мясцовых органаў улады", у якой адзначалася, што калі на тэрыторыі Польшчы знаходзілася

[458] Мілякова Л. Назв. сач.
[459] Миронович Е. Выбор веры и судьбы // Нёман, 1994. №11.- С.86.

Чырвоная Армія, то "рэзкіх антаганістычных нацыянальных супярэчнасцей паміж беларусамі і палякамі не назіралася". Аднак сітуацыя кардынальна змянілася пасля адыходу войск Чырвонай Арміі з Польшчы. Адразу ж "узмацніліся нацыянальныя ганенні, нянавісць, здзекі над беларусамі з боку палякаў"[460].

Змены адносін у дачыненні да беларусаў Беласточчыны з боку мясцовых уладаў неабходна разглядаць у больш шырокім кантэксце, чым перасяленне. Неабходна пагадзіцца з Я.Мірановічам, які заўважыў, што ў другой палове 1945 г. ваяводскія ўлады былі зацікаўлены ў поспеху "рэпатрыяцыйнай акцыі". Зацікаўленасць абумоўлівалася жаданнем ажыццяўлення плана аб стварэнні Польшчы як аднанацыянальнай дзяржавы і пазбаўлення ад беларусаў як нацыянальнай меншасці і ўсіх праблем, звязаных з іх існаваннем. Па меркаваннях новага палітычнага кіраўніцтва Польшчы, вызначэнне ўсходняй мяжы Польшчы павінна было "назаўсёды і радыкальна вырашыць складаныя нацыянальныя адносіны". Зыходзячы з гэтага, ўсё беларускае насельніцтва разглядалася як непажаданы "элемент", які ў патэнцыяле стварае пэўныя перашкоды на шляху пабудовы аднанацыянальнай дзяржавы. Гэта значыла, што беларусы павінны былі або выехаць з Беласточчыны, або стаць "палякамі праваслаўнага веравызнання". Улічваючы вышэйадзначанае, неабходна прызнаць слушнай выснову Я.Мірановіча аб тым, што "пачуццё сваёй безабароннасці і бяссілля перад праявамі агрэсіўных паводзін польскага боку выклікала ўтойванне беларусамі сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці"[461]. Беларусы былі вымушаны прызнаць і падтрымаць існуючую ўладу, якая ўзамен нацыянальных памкненняў і за іх кошт забяспечыла беларускаму насельніцтву больш выгадныя ўмовы жыцця, чым камуністычная ўлада ў Беларусі.

Вынікам мэтанакіраваных дзеянняў беластоцкіх уладаў у адносінах да беларусаў з'явілася тое, што беларуская праблема на Беласточчыне "перастала існаваць". Крыху пазней ( у 1948 г.) стараста Беластоцкага павета, адказваючы на пытанне аб няпольскім насельніцтве, падкрэсліваў: "З нацыянальных меншасцяў на тэрыторыі павета не засталося нікога. Ёсць пэўная колькасць людзей, якія, магчыма, раней лічыліся беларусамі, аднак у цяперашні час у розных афіцыйных сітуацыях яны падкрэсліваюць сваю польскасць. Гэтыя элементы пераважна засяляюць пагранічныя гміны ва ўсходняй частцы павета".

[460] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.31.
[461] Миронович Е. Указ соч. С.96

Аналагічнае паведамляў сакольскі стараста: "На тэрыторыі нашага павета нацыянальных меншасцяў няма"[462]. Некалькі іншая сітуацыя назіралася ў Бельскім павеце, дзе, як адзначаў стараста, палавіна насельніцтва - беларусы, аднак "закрыццё беларускіх школ было з'явай, якая змякчыла нацыянальныя канфлікты"[463].

Такім чынам, на ваяводскім і павятовым узроўні на Беласточчыне не было рознагалоссяў і існавала зацікаўленасць у поспеху рэпатрыяцыйнай акцыі і пазбаўлення тым самым ад беларусаў як нацыянальнай меншасці, а таксама ўсіх праблем, звязаных з іх існаваннем.

У поспеху перасяленчай акцыі было зацікаўлена і партыйнае кіраўніцтва Беларусі, якое жадала, ні больш ні менш, прыняць у рэспубліку усіх беларусаў Беласточчыны. Асновай для гэтага магчыма лічыць наступнае. 19 верасня 1944 г., г. зн. праз дзесяць дзён пасля падпісання беларуска-польскага пагаднення аб перасяленні, адбылося пасяджэнне ЦК КП(б)Б, якое абмеркавала пытанне "Аб эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы ў Беларускую ССР і польскіх грамадзян з тэрыторыі Беларускай ССР у Польшчу". У выніку яго разгляду СНК БССР і ЦК КП(б)Б прынялі сумесную пастанову, якая прадугледжвала шэраг мерапрыемстваў па прыёму і размеркаванню беларусаў, пераселеных з Польшчы. Планавалася накіраваць перасяленцаў у наступныя вобласці: Баранавіцкую - 20 тыс. гаспадарак, Пінскую - 13, Вілейскую - 15, Віцебскую -5, Гомельскую - 2, Мінскую - 6, Магілеўскую - 6, Палескую - 3[464]. Такім чынам, усяго планавалася прыняць у БССР 70 тыс. гаспадарак. Нават калі дапусціць, што адна гаспадарка налічвала тры чалавекі, а гэта малаверагодна, бо сем'і былі значна большыя, то ў БССР павінна было пераехаць звыш 200 тыс. чалавек.

У сувязі з гэтым паўстае пытанне. Зыходзячы з якіх разлікаў кіраўніцтва рэспублікі вызначыла лічбу ў 70 тыс. гаспадарак, якія павінны былі перасяліцца ў БССР ? Пытанне паўстае таму, што ўлік беларускага насельніцтва ў Беластоцкім ваяводстве распачаўся толькі з сярэдзіны кастрычніка 1944 г., а прыблізная колькасць беларусаў, якія выказалі цвёрдае жаданне перасяліцца ў БССР, стала вядомай толькі ў канцы 1944 - пачатку 1945 гг. Улік беларускага насельніцтва, які правялі ўпаўнаважаныя ўрада БССР па перасяленню, паказаў, што на Беласточчыне пражывала каля 130 тыс. беларусаў. Прыблізна такія ж лічбы атрымалі і польскія

[462] Миронович Е. Указ соч- С.89
[463] Там сама, С.86.
[464] НАРБ, ф.4, воп.61, спр.73, арк.20.

ўлады, якія ў кастрычніку 1944 г. паспрабавалі вызначыць колькасць няпольскага насельніцтва ў ваяводстве. Калі ўзяць пад ўвагу гэтыя лічбы, то вынікае, што беларускія камуністы жадалі перасяліць у БССР не толькі тых, хто выкажа жаданне, як гэта было зафіксавана ў вераснёўскім пагадненні, а ажыццявіць татальнае перасяленне беларусаў. Магчыма адзначыць, а агульная колькасць пераселеных з Польшчы беларусаў гэта пацвярджае, што лічба ў 70 тыс. гаспадарак з'яўлялася нерэальнай і непадмацаванай сур'ёзнымі разлікамі і прагнозамі.

Аўтарам гэтага істотнага пралiку з’яўляўся першы сакратар ЦК КП(б)Б П.Панамарэнка. На пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б, якое адбылося 13 верасня 1944 г., ён заявіў наступнае: “Па маіх меркаваннях, да нас прыйдзе адтуль (з Польшчы. – А.В.) не менш 550-400 тысяч чалавек. Я думаю, што нашыя раённыя ўпаўнаважаныя павінны будуць аказаць сур’ёзную дапамогу польскім раённым упаўнаважаным, каб польскае (па ўсёй бачнасці П.Панамарэнка памыліўся, трэба – беларускае. – А.В.) насельніцтва пераехала”. І далей: “Будзем арыентавацца на 300 тысяч чалавек. Памылімся на 100 тысяч, тады раўнамерна размяркуем дадаткова. У асноўным па абласцях размяркуем зараз. Магчыма, і ў пацярпелыя раёны ўсходніх абласцей, як Асвейскі, туды неабходна народ накіраваць. Менавіта ў якой колькасці – зараз цяжка сказаць, але неабходна народ узяць. Магчыма ўзяць у Мінск, на Палессе”[465]. Як вынікае са слоў П.Панамарэнкі, ён абсалютна не валодаў сітуацыяй і вельмі прыблізна і вольна абыходзіўся з лічбамі. Такім чынам, у верасні 1944 г. партыйнае кіраўніцтва Беларусі нават і прыблізна не ўяўляла, колькі ж беларусаў пераселіцца ў Беларусь.

Тым не менш, улічваючы такую значную колькасць людзей, якую планавала прыняць у Беларусі кіраўніцтва рэспублікі, варта задацца пытаннем – з якой мэтай гэта рабілася ? У дзеяннях польскіх левых сіл, якія прыйшлі да ўлады, і лонданскага эміграцкага ўрада, нягледзячы на адрозненні, выразна праглядалася адна мэта – стварэнне ў Польшчы аднанацыянальнай дзяржавы і гэтым самым пазбаўленне ад усіх праблем, звязаных з беларусамі як нацыянальнай меншасцю. Што ж да Мінска, то, на наш погляд, усё было значна прасцей. Ужо ў верасні 1944 г. з відавочнасцю выявіліся матывы, якія абумоўлівалі жаданне кіраўніцтва Белаурсі прыняць у рэспубліку такую значную колькасць насельніцтва і геаграфію іх разсялення. Адной з

[465] НАРБ, ф.4, воп.61, спр.70, арк.149.

галоўных мэт з'яўлялася патрэба ў прыцягненні ў Беларусь, асабліва ў абязлюдзелыя ў выніку вайны раёны, па магчымасці большай колькасці людзей. На самай справе, аднаўленне гаспадаркі патрабавала значных людскіх рэсурсаў, якіх у беларускіх гарадах і вёсках катастрафічна не хапала. Тыя 70 тыс. гаспадарак, якія планавалася прыняць у Беларусі, безумоўна, не вырашылі б усіх праблем, аднак хаця б крыху змякчылі іх вастрыню. Улічваючы гэта, становіцца зразумелым жаданне кіраўніцтва Беларусі перасяліць па магчымасці больш беларусаў з Беласточчыны ў БССР. Па-другое, перасяленцаў планавалася накіроўваць галоўным чынам ва ўсходнія вобласці, а не рассяляць іх у заходніх абласцях.

Аналізуючы колькасць беларусаў, якія, паводле разлікаў палітычнага кіраўніцтва рэспублікі, павінны былі перасяліцца ў БССР, нельга пагадзіцца з меркаваннем А.Бодака, што "беларускае кіраўніцтва чакала прыняць каля 1 млн. беларусаў з Беласточчыны і Падляшша", тым больш што ён не прыводзіць доказаў абгрунтаванасці гэтай лічбы ці спасылкі на крыніцу з якой ён яе ўзяў[466].

Восенню 1944 г. паглыбленню гэтага пралiку спрыяла недакладная інфармацыя кіраўніцтва НКУС БССР. Так, на пачатку лістапада 1944 г. В.Абакумаў і Л.Цанава, якія па загаду Л.Берыі знаходзіліся на Беласточчыне, паведамілі П.Панамарэнку аб тым, што, па іх дадзеных, большасць беларускага, рускага і ўкраінскага насельніцтва выказвае жаданне перасяліцца ў СССР[467]. Недакладная інфармацыя В.Абакумава і Л.Цанавы, а таксама няведанне рэальнага становішча, настрояў, палітычнай арыентацыі беларусаў Беласточчыны прывялі да яшчэ больш памылковай ацэнкі працэсу перасялення. Так, 31 кастрычніка 1944 г. бюро ЦК КП(б)Б абмеркавала пытанне "Аб ходзе эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі Беларускай ССР" і заслухала даклады па гэтаму пытанню намесніка старшыні СНК БССР К.Кісялёва і Галоўнага ўпаўнаважанага СНК БССР І.Варвашэні, якія паведамілі, што беларусы ў Польшчы сустрэлі з "вялікім палітычным уздымам і ўзнёсласцю пагадненне паміж СНК БССР і ПКНВ аб эвакуацыі насельніцтва"[468]. Яны таксама падкрэслілі, што

---

466 Бодак А.Ю. Национальная политика в БССР. (1943-1955 гг.), Дис... канд. ист. наук. 07.00.02, Мн.,1996.- С.33.

467 НКВД и польское подполье (По «Особым папкам» И.В.Сталина): Сб. док. /Сост. Т.В.Волокитина и др.- М.:Рос. АН, ин-т славяноведения и балканистики, 1994.-С.80.

468 НА РБ, ф.4, воп.61, спр.91, арк.16.

ў шматлікіх лістах і тэлеграмах на адрас Галоўнага ўпаўнаважанага СНК БССР цэлыя сёлы і вёскі Беласточчыны выказалі жаданне неадкладна перасяліцца ў БССР.

Аднак неабходна пагадзіцца з высновай У.Снапкоўскага, што канстатацыя бюро ЦК КП(б)Б гэтага факта разыходзілася з рэчаіснасцю[469]. Справа ў тым, што “вялікая колькасць беларусаў жадала застацца на Беласточчыне, галоўным чынам з-за прывязанасці да месца жыхарства і сваёй маёмасці. Рэпатрыяцыяй скарысталася невялікая колькасць беларускага насельніцтва і толькі ў тых раёнах, дзе беларусы складалі меншасць і дзе супраць іх прымяняліся рэпрэсіі з боку падполля”[470].

Для дасягнення пастаўленай мэты аб перасяленні па магчымасці большай колькасці насельніцтва ўпаўнаважаныя СНК БССР прымушалі перасяляцца ўсіх, нягледзячы на заяўленую ў беларуска-польскім пагадненні “добраахвотнасць” прыняцця рашэння аб выездзе. У данясенні павятовага старасты Беластока, якое было накіравана ў лістападзе 1944 г. ваяводскім уладам, падкрэслівалася, што “адносіны ўпаўнаважаных (СНК. – А.В.) БССР да перасялення ў шматлікіх выпадках разыходзяцца з умовамі пагаднення аб добраахвотнасці перасялення. Асобныя ўпаўнаважаныя аказваюць ціск на насельніцтва, уводзячы яго у зман сцверджаннем, што ўсе асобы праваслаўнага веравызнання, гэта значыць беларусы, павінны выехаць ў СССР. Яны не пытаюцца згоды зацікаўленых, і апошнія баяцца, што справа можа дайсці да прымусовай эвакуацыі ў СССР”[471]. Партыйна-савецкае кіраўніцтва Беларусі ў мэтах заахвочвання беларусаў да перасялення пайшло на значнае спрашчэнне працэдуры набыцця грамадзянства БССР перасяленцамі з Польшчы. Так, 6 лютага 1945 г. Прэзідыум ВС БССР прыняў пастанову "Аб набыцці савецкага грамадзянства асобамі, якія перасяляюцца ў БССР з Польшчы", у адпаведнасці з якой "усе асобы, якія перасяляюцца з Польшчы ў БССР, незалежна ад таго, знаходзіліся яны ў польскім грамадзянстве ці не, з моманту іх прыбыцця на тэрыторыю Беларускай ССР набываюць грамадзянства БССР"[472].

Апошнім “штрыхам”, які паказваў зацікаўленасць кіраўніцтва Беларусі любым шляхам перасяліць у БССР па магчымасці большую колькасць насельніцтва, нягледзячы на іх нежаданне

---

[469] Снапкоўскі У.Назв. сач. С.93.
[470] Миронович Е.Выбор веры и судьбы… С.85.
[471] Bialostocczyzna 1944-1945 w dokumentach… S.191.
[472] Звязда, орган Навагрудскага раённага камітэта КП(б)Б і выканкама райсавета дэпутатаў працоўных. 12 лютага 1945 г., С.1

пераязджаць у БССР, стала наступнае. Па загаду камандавання Паўночнай групы войск, як адзначаў І.Круглік у красавіку 1946 г., "*з Беластоцкага ваяводства праводзіцца прымусовае высяленне ўсіх грамадзян СССР, якія па розных прычынах апынуліся ў час вайны на тэрыторыі ваяводства*"[473] (выдзелена мной. – А.В.). Аднак гэтае кароткае паведамленне І.Кругліка выклікае шэраг пытанняў, на якія надзвычай цяжка адказаць. Што гэта быў за загад, калі ён быў прыняты, якія групы насельніцтва падлягалі высяленню, як загад стасаваўся з беларуска-польскім пагадненнем аб перасяленні, хто выконваў яго, колькі грамадзян прымусова выселілі з Беласточчыны і г.д. Разам з тым тое, што такі загад быў прыняты і "праводзілася прымусовае высяленне", сведчыць аб жаданні колішняй улады правесці татальнае высяленне не толькі беларусаў, а ўвогуле ўсяго насельніцтва, якое мела грамадзянства СССР.

Такім чынам, нягледзячы на розныя мэты, якія ставілі перад сабой у час перасялення лонданскі эмігранцкі ўрад, польскія камуністы, якія прыйшлі да ўлады, кіраўніцтва Беларусі, усіх іх аб'ядноўвала адно – беларусы павінны былі выехаць з Польшчы. Беларускае насельніцтва Беласточчыны стала закладнікам сітуацыі і вымушана было манеўраваць, прыстасоўвацца да рознавектарных дзеянняў гэтых сілаў і самому, ні на кога не спадзяючыся, у такіх складаных жыццёвых умовах шукаць выйсце для сябе, сваёй сям'і, родных і блізкіх.

[473] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.48.

## Глава 2.
## "Чырвоная агітацыя"

Вераснёўскае пасяджэнне бюро ЦК КП(б)Б (12-13 верасня 1944 г.) вызначыла не толькі прадстаўнікоў СНК БССР па перасяленню ў Беларусі, але і ўпаўнаважаных урада Беларусі па перасяленню беларусаў з Беласточчыны. У гэтыя дні таксама было прынята рашэнне аб тым, што апарат Галоўнага ўпаўнаважанага СНК БССР будзе знаходзіцца не ў Любліне, як планавалася раней, а ў Беластоку. Справа ў тым, што першапачаткова месцам знаходжання апарата Галоўнага ўпаўнаважанага планаваўся Люблін, бо там знаходзіўся ПКНВ. Аднак П.Панамарэнка прапанаваў, "каб наш Галоўны ўпаўнаважаны знаходзіўся не ў Любліне, а ў Беластоку, бо гэта цэнтр ўсёй працы"[474]. Абгрунтаваная і лагічная прапанова П.Панамарэнкі была ўлічаная, і з пачатку перасялення і да яго заканчэння апарат Галоўнага ўпаўнаважанага знаходзіўся ў Беластоку.

13 верасня 1944 г. Галоўным ўпаўнаважаным у Польшчы быў прызначаны В.Чарнышоў, аднак ужо 19 верасня гэтага ж года з-за хваробы ён быў вызвалены ад абавязкаў, а замест яго быў прызначаны І.Варвашэня[475]. 13 верасня былі прызначаны і раённыя ўпаўнаважаныя: П.Токараў у Аўгустоўскім раёне, Д.Сукачоў – Бельскім, В.Няміраў – Лапскім, І.Чувікаў – Сямяціцкім, Ф.Кец – Беластоцкім, А.Сакольчык – Ломжынскім, П.Караткевіч – Валілаўскім, І.Шурман – Цэханавецкім, К.Сінякоў – Замбраўскім, Е.Ільін - Саколкаўскім, М.Кудзін – Бяла-Падляскім, С.Ключынскі – Кнышынскім[476].

Сярод упаўнаважаных СНК БССР па перасяленню ў Польшчы, як гэта было і ў БССР, прысутнічала значная колькасць прадстаўнікоў спецслужбаў. Вось што наконт гэтага сказаў П.Панамарэнка пры абмеркаванні кандыдатур кіраўнікоў раённых апаратаў упаўнаважаных як у Беларусі, так і ў Польшчы: "Даручыць (меўся на ўвазе падбор работнікаў па перасяленню. – А.В.) таварышам Маліну, Цанаве, Аўхімовічу, Бельчанку. Таму што справа больш- менш замежная, справа вострая і абавязкова павінна быць так: калі ёсць буйны чэкіст, ён павінен быць

---

474 НАРБ, ф.4, воп.61, спр.70, арк.148.
475 НАРБ, ф.4, воп.61, спр.73, арк.29.
476 НАРБ, ф.4, воп.61, спр.71, арк.16.

упаўнаважаным, слабейшы - наш чалавек, партыйны работнік – намеснікам няхай будзе"[477]. Заўвага першага сакратара ЦК КП(б)Б наконт "буйных чэкістаў" у якасці ўпаўнаважаных ні ў кога з членаў бюро не выклікала пярэчанняў, і супрацоўнікі спецслужбаў, калі не ўзначальвалі, то з'яўляліся, галоўным чынам так і было, намеснікамі раённых упаўнаважаных. Так, намеснікам П.Токарава, райупаўнаважанага ў Аўгустове, з'яўляўся М.Аўдашчанка - начальнік 3 аддзела 10 аддзялення 2 упраўлення НКДБ, у Лапах намеснікамі В.Нямірава з'яўляліся В.Ганцоўскі – начальнік 4 аддзялення 2 аддзела НКДБ па Мінскай вобласці і А.Родзін – старшы аператыўны ўпаўнаважаны НКУС БССР, упаўнаважаны ў Сямяцічах І.Чувікаў з'яўляўся намеснікам начальніка 2 аддзела 2 упраўлення НКДБ, у Беластоку намеснікамі Ф.Кеца з'яўляліся П.Сычоў – аператыўны ўпаўнаважаны 1 аддзялення ОББ НКУС і С.Дзяржынаў – старшы аператыўны ўпаўнаважаны 1 аддзялення 1 аддзела 2 упраўлення НКДБ, А.Сударыкаў – намеснік начальніка 3 аддзялення 2 аддзела УНКДБ па Мінскай вобласці з'яўляўся намеснікам П.Караткевіча, які ўзначальваў групу ўпаўнаважанага ў Валілах[478]. Такі ж самы кадравы падбор назіраўся і ў астатніх райпрадстаўніцтвах. Значная прысутнасць работнікаў спецслужбаў сярод упаўнаважаных па перасяленню беларусаў з Польшчы ў БССР з'яўлялася невыпадковай. Выснова П.Панамарэнкі аб "вастрыні" праблемы перасялення мела рацыю. Актыўная дзейнасць польскага падполля і шматлікіх бандыцкіх груповак, няўстойлівасць і слабасць структур ПКНВ на Беласточчыне, у шэрагу выпадкаў варожыя адносіны мясцовага польскага насельніцтва да беларусаў і да распачатага перасяленчага працэсу вымушалі спецслужбы кантраляваць сітуацыю, арганізоўваць ахову упаўнаважаных СНК БССР па перасяленню, а таксама беларусаў, якія выказалі жаданне перасяліцца ў БССР, праводзіць аператыўна-чэкісцкія аперацыі супраць падполля, рознага кшталту бандфарміраванняў і г.д.

Супрацоўнікі апарату Галоўнага і раённых упаўнаважаных СНК БССР пачалі працу па ўліку, рэгістрацыі і адпраўцы беларускага насельніцтва ў Беларусь у сярэдзіне кастрычніка, пасля ўзгаднення тэксту аб'явы аб умовах перасялення з Галоўным упаўнаважаным Польскага ўрада. Улік, рэгістрацыя і перасяленне беларусаў з Беласточчыны ажыццяўлялася з 12 прадстаўніцтваў - Аўгустоўскага, Беластоцкага, Бельскага, Бяла-Падляскага, Валілаўскага, Замбраўскага, Кнышынскага, Лапскага,

[477] НАРБ, ф.4, воп.61, спр.70, арк.151.
[478] НАРБ, ф.4, воп.61, спр.70, арк.115,119, 121,123, 127.

Ломжынскага, Сямяціцкага, Саколкаўскага, Цэханавецкага[479]. Пазней, з-за нязначнай колькасці беларускага насельніцтва, апарат Аўгустоўскага райпрадстаўніцтва далучылі да Саколкаўскага, а Ломжынскага да Беластоцкага.

Колькасны склад апарату Галоўнага і раённых упаўнаважаных СНК БССР па 10 астатніх райпрадстаўніцтвах складаўся з 284 работнікаў, якім на ўсім працягу перасялення дапамагалі праводзіць улік беларусаў і весці сярод іх агітацыйна-прапагандысцкую працу звыш 100 адказных партыйна-савецкіх работнікаў, камандзіраваных у Польшчу з ЦК КП(б)Б, СНК БССР, іншых ведамстваў ды устаноў. Усяго ж у лістападзе 1944 г. у працу па перасяленню было ўцягнута 341 чалавек, у тым ліку 25 работнікаў палітаддзелаў 2-га Беларускага фронту і 27 супрацоўнікаў органаў НКУС, НКДБ[480]. Акрамя гэтага, ваенныя саветы Першага і Другога Беларускіх франтоў накіравалі ў распараджэнне Галоўнага ўпаўнаважанага СНК БССР звыш 100 афіцэраў-палітработнікаў, якія былі размеркаваны паміж усімі райпрадстаўніцтвамі і вялі агітацыйна-прапагандысцкую працу сярод беларускага, рускага і ўкраінскага насельніцтва.

Упаўнаважаныя СНК БССР у Польшчы, у адрозненне ад аналагічнай працы ў БССР, праводзілі ўлік, рэгістрацыю і перасяленне беларускага насельніцтва без прадстаўнікоў польскага ўрада. Улік насельніцтва праводзіўся рознымі шляхамі. Напрыклад, у Бяла-Падляскім райпрадстаўніцтве двойчы праводзіўся падворны ўлік беларускіх гаспадарак, што давала дастаткова поўныя звесткі аб іх колькасці[481]. У той жа час у Лапскім, у якое ўваходзіла 5 гмін (Лапская, Саколкаўская, Суражская, Пасвенткаўская, Башымаўская), упаўнаважаныя СНК БССР атрымалі спісы беларусаў ад солтысаў гмін. Іх якасць правяралася выбарачным улікам беларускага насельніцтва, што вяло да пэўных хібаў пры складанні выніковых спісаў. У сувязі з гэтым неабходна пагадзіцца з высновай вядомага гісторыка з Беласточчыны Я.Міргановіча, што "ўлік колькасці беларускага насельніцтва з'яўляўся надзвычай цяжкай задачай, бо адміністрацыйныя структуры толькі фарміраваліся, не хапала людзей, якія б ведалі нацыянальнае становішча, і г.д."[482]. Таму, дзе праводзілі ўлік беларускага насельніцтва польскія чыноўнікі, дакладнасць

479 НАРБ, ф.788, воп.1, спр.10, арк.18.
480 Bialostocczyzna 1944-1945 w dokumentach ...S.186.
481 НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1918, арк.131.
482 Mironowicz. E. Polityka norodowosciowa PRL. Bialystok. 2000.- S.39.

прадстаўленых звестак аб колькасці беларусаў залежала ад іх прафесіяналізму і добрасумленнасці.

Недакладнасць звестак, прадастаўленых упаўнаважанымі ва ўрад БССР аб колькасці насельніцтва, якое належала да перасялення, вымусіла кіраўніцтва НКДБ СССР і БССР звярнуць на гэта ўвагу. Так, В.Абакумаў і Л.Цанава, якія знаёміліся ў кастрычніку 1944 г. з арганізацыяй працы па перасяленню насельніцтва з Беластоцкага ваяводства ў БССР, накіравалі 4 лістапада гэтага ж года на імя Л.Берыі ліст, у якім адзначалі "дрэнную працу І.Варвашэні ў гэтым напрамку". Яны паведамлялі, што "апарат упаўнаважаных і яго органы працуюць слаба. Імі дакументальна не пацверджана колькасць гаспадарак, што належаць перасяленню з Польшчы ў Савецкі Саюз. Апаратам упаўнаважаных колькасць гаспадарак, што падлягаюць перасяленню з паветаў: Бяла-Падляскага складае 13 925 чалавек, Саколкаўскага – 2600 гаспадарак і з 4 гмін павета Радзын – 2500 гаспадарак - улічана не шляхам абыходу і асабістага апытання асоб, якія могуць быць пераселеныя, а на аснове выпадковых і неправераных дадзеных. Да 22 кастрычніка апарат упаўнаважанага і яго органы атрымалі заявы на перасяленне ад 1244 гаспадарак, якія жадаюць выехаць у Савецкі Саюз, аднак ніякай працы сярод гэтых асоб не праводзілася, і ў выніку да выезду ў СССР падрыхтавана ўсяго 55 гаспадарак"[483].

Крытыка працы І.Варвашэні і ўпаўнаважаных СНК БССР па ўліку насельніцтва з боку кіраўніцтва НКДБ была неабгрунтаванай, бо ў шэрагу гмін з-за актыўнай дзейнасці польскага падполля дакладны ўлік насельніцтва немагчыма было правесці. Вось што паведамляў І.Варвашэня ў маі 1945 г. К.Кісялёву: “Актывізацыя дзейнасці банд АК у раёнах Беластоцкага ваяводства надзвычай абцяжарыла, а ў многіх месцах фактычна ліквідавала ўсялякую магчымасць далейшага правядзення работы па эвакуацыі”[484]. Пераемнік І.Варвашэні І.Круглік дакладваў П.Панамарэнку, што "ў красавіку-маі 1945 г., пасля адыходу Чырвонай Арміі з Беластоцкага ваяводства, з'явіліся арганізаваныя ў вялікія групы банды. Пры абстаноўцы, калі часцей Чырвонай Арміі на Беласточчыне засталася нязначная колькасць, формы і метады работы па эвакуацыі змяніліся. Работнікі, размеркаваныя па гмінах, былі сканцэнтраваны ў павятовых цэнтрах, і выезды ў вёскі праводзіліся толькі групамі і з узброенай аховай" [485].

[483] Bialostocczyzna 1944-1945 w dokumentach…S.179.
[484] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.10, арк.26.
[485] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.5, арк.62.

Не змянілася становішча і надалей. Так, у канцы верасня 1945 г. (г. зн. амаль праз год пасля падпісання пагаднення ад 9 верасня 1944 г.) упаўнаважаны СНК БССР па Сямяціцкаму райпрадстаўніцтву, у якое ўваходзіла 5 гмін, паведамляў І.Кругліку, што "ў Мельнікаўскай, Клімкавіцкай, Мілейшчыцкай гмінах праца (г.зн. улік, рэгістрацыя і перасяленне насельніцтва. - А.В) праводзілася недастаткова. Да цяперашняга часу ў Мельнікаўскай і Мілейшчыцкай гмінах упаўнаважаныя не працуюць"[486]. Аналагічная карціна назіралася і ў іншых гмінах, дзе праводзіўся ўлік беларусаў. Так, намеснік Галоўнага ўпаўнаважанага СНК БССР М.Джагараў адзначаў, што "з чэрвеня 1945 г. з-за ўзмоцненай дзейнасці банд выезд у вёскі і асабліва правядзенне там сходаў, гутарак з сялянамі сталі немагчымымі"[487]. На самай справе, упаўнаважаныя СНК БССР у Польшчы амаль штодня рызыкавалі жыццём, праводзячы ўлік, рэгістрацыю і адпраўку насельніцтва ў БССР. Вось толькі ўрыўкі з данясення, якія накіроўвалі з Беласточчыны П.Панамарэнку, К.Кісялёву ды іншым службовым асобам упаўнаважаныя СНК БССР: «У апошні час назіраецца шэраг нападаў банд так званай АК на работнікаў раённых упаўнаважаных. 25 лютага 1945 г. у вёсцы Ракітна Бяла-Падляскага раёна банда ў колькасці 10 чалавек здзейсніла напад на дом, дзе начаваў намеснік раённага ўпаўнаважанага т. Паплаўскі і сакратар т. Алейнікаў. У выніку перастрэлкі т. Паплаўскі атрымаў кулявое раненне правага бядра з пераломам косці і другой куляй ранены ў другую нагу. У час перастрэлкі т. Алейнікаў забіў аднаго бандыта ...26 сакавіка 1945 г. у вёсца Сорклічы Сямяціцкага раёна бандыты спрабавалі захапіць намесніка райупаўнаважанага т. Белаглазава, аднак у выніку супраціўлення Белаглазавым быў забіты адзін бандыт. Дадаткова падышоўшая банда забіла т. Белаглазава ...17 красавіка 1945 г. ноччу ў вёсцы Малышка Заблудаўскай гміны ў дом, у якім жыў намеснік райупаўнаважанага т. Стрыгін, была кінута граната, якая не трапіла ў акно, а ўзарвалася пад акном дома. Стрыгін не пацярпеў»[488].

Наколькі моцнай з'яўлялася дзейнасць падполля, сведчыць запіска П.Панамарэнкі «Аб ходзе працы па эвакуацыі беларускага, рускага і ўкраінскага насельніцтва з Польшчы на тэрыторыю СССР», якую ён у снежні 1945 г. накіраваў І.Сталіну. Першы сакратар ЦК КП(б)Б падкрэсліваў, што «масава-прапагандысцкая

[486] НАРБ. ф.7, воп.3, спр.1918, арк.52.
[487] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.23; ф.7, воп.3, спр.1918, арк.45.
[488] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.5-6.

праца, якая праводзіцца нашым перасяленчым апаратам, з'яўляецца недастатковай і праводзіцца толькі ў асобных вёсках, бо ў месцы дзейнасці банд выезд немагчымы»[489].

Улік і рэгістрацыя насельніцтва ўскладняліся і тым, што частка беларусаў не жадала рэгістравацца. Так, Я.Мірановіч адзначае, што ў лістападзе 1944 г. стараста Беластоцкага павета паведамляў, што ў гмінах Міхалава, Грудэк, Заблудаў, Чорна Весь упаўнаважаныя ходзяць па дамах і прымушаюць праваслаўнае насельніцтва рэгістравацца на выезд супраць іх волі. Аднак іх дзейнасць выклікала незадаволенасць сялянства і вяла да адваротнага выніку – беларусы ўстрымліваліся ад рэгістрацыі[490]. Нежаданне беларусаў рэгістравацца, выходзіць з польскага грамадзянства і ад'язджаць з Польшчы адзначалі і ваяводскія ўлады. Так, Беластоцкі ваявода С.Дыбоўскі ў справаздачах за студзень-люты, верасень 1945 г. паведамляў, што "беларусы Бельскага павета не жадаюць рэгіставацца на выезд у БССР. Вельмі часта некаторыя беларусы заяўляюць, што яны палякі праваслаўнага веравызнання"[491].

Факты нежадання рэгістравацца адзначалі не толькі гмінныя і павятовыя ўлады Беласточчыны, але і ўпаўнаважаныя СНК БССР. Так, упаўнаважаны па Сямяціцкаму райпрадстаўніцтву А.Лакціёнаў у запісцы, накіраванай І.Кругліку, адзначаў, што, “калі праводзілі ўлік беларускага насельніцтва, справа даходзіла да вялікіх кур'ёзаў і смехатворнага становішча: некаторыя адмаўляліся называць сваё прозвішча, некаторыя бязбожна хлусілі, некаторыя аб'яўлялі сябе палякамі, а некаторыя проста збягалі з дому па некалькі разоў, калі да іх накіроўваліся прадстаўнікі па рэгістрацыі. Таму журнал формы № 15 (журнал, у які ўносілі анкетныя дадзеныя. - А.В) – дакумент вялікай гістарычнай важнасці, але лічыць яго пунктуальна-дакладным не даводзіцца”[492].

Тым не менш упаўнаважанымі СНК БССР на Беласточчыне было ўлічана 36 197 беларускіх, рускіх, украінскіх гаспадарак агульнай колькасцю 136 526 чалавек. З іх ліку абсалютную большасць - 72% - складалі беларусы[493]. Улік, праведзены польскімі

[489] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.10, арк.136.
[490] Mironowicz E. Bialorusini w Polsce 1944-1949. Warszawa: Wyd-wo Nauk PWN.- 1993.- S.137.
[491] Sprawy narodowosciowe i wyznaniowe na Bialostoczezyzne (1944-1948): W ocenie wladz Rzeczpospolitej Polskij. Wybor dokumentow: Sityacyjne sprawozdania woewody Bialostockiego i Sokolskiego oraz Powiatowych starostow Bialostockiego, Bielspodlaskiego, Sokolskiego w latach 1944-1948 / Zebr. G.Sosna.- Ryboly., 1996.- S.16,23.
[492] НА РБ, ф.4, воп.29, спр.258, арк.58.
[493] НА РБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.23.

ўладамі, паказаў што, на Беласточчыне пражывала 127 363 беларусы[494]. Аднак да выніковых лічбаў аб колькасці беларусаў, прыведзеных раённымі ўпаўнаважанымі СНК БССР і польскімі ўладамі, улічваючы складанасць працы па ўліку насельніцтва, трэба адносіцца з пэўнай крытычнасцю і, магчыма, лічыць, што беларускага насельніцтва ў Беласточыне было ўсё ж больш, чым зафіксавана пры ўліку.

Неакрэсленасць і "часовы характар" мяжы, вызначанай савецка-польскім пагадненнем ад 27 ліпеня 1944 г., параджалі шматлікія чуткі і спадзяванні часткі беларусаў Беластоцкага ваяводства аб тым, што ў выпадку хадайніцтва ва ўрады СССР і БССР іх звароты будуць улічаны, і Беласточчына застанецца ў складзе БССР. Так, 14 верасня 1944 г. 6 тысяч беларусаў г. Белавежы Гайнаўскай гміны накіравалі калектыўны ліст у ЦК КП(б)Б, у якім выказвалі жаданне жыць у БССР і прасілі "партыю і ўрад БССР далучыць г. Белавеж і Белавежскую пушчу да БССР"[495]. Калектыўны ліст аналагічнага зместу 22 верасня 1944 г. накіравалі на імя І.Сталіна жыхары вескі Палічна Клешчальскай гміны. У ім яны прасілі І.Сталіна і ўрад СССР вярнуць тэрыторыю, на якой яны жывуць, у склад БССР, "бо ўсе яны па нацыянальнасці беларусы"[496]. Жыхары вёскі Гаркавічы Сакулкаўскага раёна накіравалі на імя І.Сталіна ліст наступнага зместу ( арфаграфія і стыль ліста захаваныя. – А.В.): «Мудрэйшаму правадыру вольнай Расіі таварышу Сталіну. Прашэнне. Мы, ніжэйпадпісаўшыяся жыхары вёскі Гаркавічы Беластоцкай вобласці Саколкаўскага раёна. Нацыянальнасці беларусы, веравызнання праваслаўнага, у колькасці 90 двароў. Па вызначанай польска-савецкай мяжы, якая праходзіць каля нашай вёскі і аддзяляе нас ад нашай прыходскай царквы і ад усіх сваіх родных, галоўнае ад нашага бацькі і правадыра Сталіна. Просім Вашай літасці Мудры правадыр Савецкай Вольнай Расіі, Маршал Сталін, перакінуць мяжу за вёску і далучыць нас да сваіх братоў Савецкага Саюза. Прасіцелі вёскі Гаркавічы, у чым і распісваемся»[497]. Ліст падпісалі 75 жыхароў вёскі. Каментуючы гэты ліст, сакратар Гродзенскага абкама партыі паведамляў, што «аналагічныя настроі маюць месца сярод жыхароў вёсак Скрабляві, Крушаняны, Сасновікі, Падшатнае, Шатнікі,

494 Миронович Е. Выбор веры и судьбы ... С.73.
495 НА РБ, ф.7, воп.3, спр.1905, арк.8.
496 НА РБ, ф.7 воп.3, спр.1902, арк.28.
497 НАРБ. ф.4, воп.29, спр.311, арк.193.

Барсукоўшчына, Паліпкі і г. Крынкі, якія прылягаюць да пагранічнай паласы, што адышла да Польшчы»[498].

Разам з калектыўнымі лістамі П.Панамарэнку дасылаліся лісты асобных грамадзян, у якіх эмоцыі перабіралі праз край. Летам 1945 г. былы чырвонаармеец Фёдар Савельеў пісаў П.Панамарэнку (арфаграфія і стыль ліста захаваныя. – А.В.): «1945 18 июля. Гвардеец, старшего возраста, 48 лет, демобилизован. Услыхал, что моя область – Белостокская отходит к Польше. Я не согласен. Мы приняли гражданство СССР и вошли в состав БССР, а теперь нас бросили к вечному врагу – Польше. А теперь нам, гвардейцам, воинам-победителям ехать к панам просить их ласки дать службу или работу для того, чтобы прокормиться, а детей без школы сделать вечными нищими и пастухами. Вот что сделала партия наша и правительство. Семьи все и мы – белорусы недовольны и не согласны остаться под Польшей. Товарищ Пономаренко, примите и передайте в Москву в Верховный Совет, возмите нас в СССР, хотя бы 3 района – Бельский, Клещельский и Гайновский. В г. Бельск вышлите комиссию по переписи и отправке белорусов в Белоруссию Советскую. Просим сейчас и ходатайствуем о принятии нас»[499].

Шматлікасць чутак і ўпэўненасць насельніцтва Беласточчыны ў тым, што яна застанецца ў складзе БССР, прынялі такі характар і маштабы, што вымусілі П.Панамарэнку паведаміць аб гэтым І.Сталіну. 1 снежня 1945 г. у лісце І.Сталіну ён адзначаў: «Да падпісання дагавора аб савецка-польскай дзяржаўнай мяжы па ўсяму Беластоцкаму ваяводству распаўсюджваліся чуткі, што савецка-польская мяжа з лініі Керзана будзе перанесена на раку Буг і што на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства будзе савецкая ўлада. Упэўненасць ў перанясенні мяжы ў насельніцтва пацвярджалася яшчэ і тым, што ў многіх вёсках Бельскага, Валілаўскага і іншых раёнаў сярод беларусаў збіралі подпісы да Савецкага ўрада са зваротам аб пераглядзе межаў. У Сакулкаўскім раёне чуткі аб пераносе мяжы на раку Буг прынялі настолькі вялікія памеры, што ім верылі не толькі беларусы, але і многія польскія грамадзяне, якія перасяляліся па суседству ва Усходнюю Прусію і іншыя месцы за Буг. У цяперашні час размовы аб пераглядзе мяжы спыніліся"[500].

Аднак гэта былі ілюзорныя спадзяванні беларускага насельніцтва, бо ўрад СССР 27 ліпеня 1944 г. падпісаў з ПКНВ

[498] Там сама, арк.195.
[499] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.471, арк.438.
[500] НАРБ, ф.788, воп.1,спр.10, арк.136.

пагадненне аб савецка-польскай мяжы і не меў намеру мяняць важнае ў стратэгічным плане для Масквы рашэнне аб заходняй мяжы. Што ж да беларускага ўрада, то ён не меў паўнамоцтваў самастойна рашаць пытанні, звязаныя са змяненнем межаў рэспублікі. Наадварот, восенню 1944 г. партыйна-савецкае кіраўніцтва Беларусі ўжо цвёрда было пераканана ў «непарушнасці» беларуска-польскага ўчастка савецка-польскай мяжы. 31 кастрычніка 1944 г. пры абмеркаванні на бюро ЦК КП(б)Б пытання «Аб ходзе эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі Беларускай ССР» падкрэслівалася, што «асноўным зместам нашай прапаганды павінна з'явіцца папулярызацыя сілы і перамог нашай Чырвонай Арміі, сілы Савецкай дзяржавы, непарушнасці межаў, выкрыццё шалёнай агітацыі падпольных польскіх нацыяналістычных варожых элементаў аб няўстойлівасці нашых межаў, якія разлічаныя на захоп заходніх абласцей Беларусі і Украіны»[501]. Таму гэтыя і іншыя звароты беларускага насельніцтва Беласточчыны засталіся па-за ўвагай саюзнага і рэспубліканскага кіраўніцтва.

Каб схіліць беларускае насельніцтва да выезду з Польшчы ў БССР, упаўнаважаныя СНК БССР не абмяжоўваліся правядзеннем сходаў, індывідуальных гутарак, чытаннем лекцый аб "шчаслівым жыцці" у БССР, а выкарыстоўвалі больш вытанчаныя метады агітацыі. Беларусы Беласточчыны пазнаёміліся з савецкай рэчаіснасцю на працягу 1939-1941 гг. і асабліва не давяралі інфармацыі, якая распаўсюджвалася ўпаўнаважанымі СНК БССР ды шматлікімі прапагандыстамі. Для іх больш важнымі з'яўляліся лісты, весткі ад тых, хто ўжо пераехаў у БССР і ўладкаваўся на новым месцы. Аднак весткі з Беларусі і расповяд тых, хто змог вярнуцца назад у Польшчу, значна адрозніваліся ад зместу лекцый ды гутарак, якія праводзілі ўпаўнаважаныя СНК БССР.

Вярнуўшыся назад у Польшчу, беларусы паведамлялі родзічам, сваякам, суседзям, знаёмым аб тым, як да іх ставіліся ў Беларусі. Іх расповяд з'яўляўся лепшай агітацыяй супраць пераезду ў Беларусь. Так, у радыёграме Галоўнага ўпаўнаважанага СНК БССР І.Кругліка, накіраванай намесніку старшыні СНК К.Кісялёву ў красавіку 1946 г., паведамлялася, што "з эвакуіраваных з Польшчы ў СССР у 1944-1945 гг. беларусаў, рускіх, украінцаў за апошні час вярнулася ў Польшчу значная колькасць гаспадарак. Толькі ў Бяла-Падляскі павет з СССР вярнулася на свае старыя месцы 73 гаспадаркі колькасцю 226

---

[501] НАРБ, ф.4, воп.61, спр.90, арк.31.

чалавек, ёсць некалькі выпадкаў вяртання ў Бельскі павет, Сямяціцкую, Валілаўскую гміны"[502]. Аднак найбольшую трывогу і заклапочанасць І.Кругліка вызываў не сам факт вяртання, а тое, што, "вяртаючыся з БССР, беларусы сваімі расказамі аднавяскоўцам аб прычынах свайго вяртання вядуць унушальную прапаганду супраць перасялення ў БССР. Па Бельскаму, Бяла-Падляскаму паветах, куды вярнуліся раней эвакуіраваныя з БССР, нават падаўшыя заявы на эвакуацыю сялянне-беларусы зараз адмаўляюцца эвакуіравацца"[503].

Таму, напрыклад, з Валілаўскага райпрадстаўніцтва ў тыя раёны БССР, куды пераехалі беларусы з гэтага павета, былі пасланы 4 упаўнаважаныя, якія "арганізавалі больш за 100 лістоў цудоўнага зместу" да сваіх родных, знаёмых, сваякоў, якія засталіся ў Польшчы. Як адзначалася ў справаздачы Валілаўскага райпрадстаўніцтва, "гэтыя лісты былі намі выкарыстаны і адыгралі станоўчую ролю ў агітацыйнай працы"[504].

«Цудоўнага зместу» лісты, якія былі напісаныя ці пад прымусам, ці падманутымі людзьмі, не маглі схаваць бяздушнасць, абыякавасць партыйна-савецкага чынавенства да перасяленцаў. Увагу да чалавека «як найвышэйшай каштоўнасці сацыялістычнага грамадства» адразу ж адчуў перасяленец Рыгор Антанюк. Бяздушны прыём, з якім яго сустрэла Беларусь, вымусіў яго накіраваць ліст да І.Сталіна. Ён невялікі, таму варта прывесці яго поўнасцю з захаваннем стылю і арфаграфіі. «Прозьба товарищу Сталину. Я, гражданин Антонюк Георгий М. Белостоцкой области Бельского района, Наревского сельсовета, д. Тростяница переселенец, проживающий в станции Слоним Брест-Литовской железной дороги, товарная контора. Просим товарища Иосифа Виссарионовича Сталина разрешить мне с моей семьей 5 душ возвратиться опять на свою родину, Белостоцкую область, на свое хозяйство и в свой сопственный дом в виду тово, что нам нет тово, что нам обещали дать дом, так как мы свой оставили в Польше и имеем опись имущества, а так же имеем чекотребование на картошку, сено и солому. Вопервых, говорят дома нам нет и не будет, живём в станции, несколько недель жили в сарае, а про остальное все и говорить нечево. Имею корову, и ту придется продать потому что нечем будет кормить, и вовторых, и себе ( далее текст неразборчив. – А.В.) потому что всё уже истощается, выехавши из Польши 5 января. Товарич Сталин разрешите нам

[502] НА РБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.46.
[503] Там сама, арк.48.
[504] НА РБ, ф.7, воп.3, спр.1918, арк.153-154.

опять вернуться на свою родину в свой сопственный дом и на свое хозяйство и просим вас, не откажите в нашей прозьбе»[505]. Ліст Р.Антанюка трапіў у асобы сектар ЦК УсеКП(б)Б, а адтуль у ЦК КП(б)Б – да К.Кісялёва. У сваю чаргу, у канцы верасня Кузьма Кісялёў накіроўвае старшыні Слонімскага райсавета ліст, у якім патрабуе ад Слонімскіх уладаў «прыняць неабходныя меры і стварыць грамадзяніну Антанюку Р.М. нармальныя ўмовы ва ўладкаванні на новым месцы пасялення»[506]. На жаль, невядома, чым скончылася гэтая бюракратычная перапіска, а самае галоўнае – ці атрымаў у рэшце рэшт Рыгор Антанюк ўсё неабходнае для «нармальных умоў жыцця» ці ўсё ж ён змог вярнуцца «на свою родину – Белостоцкую область».

Не ў лепшым становішчы апынулася і перасяленка А.Яфімава, якая звярнулася са скаргай у Слонімскі райвыканкам: «Я, як сябра КПЗБ, а потым сябра КПП прыйшла да высновы, што на нас, перасяленцаў, мясцовыя органы ўлады, сельскія саветы, райвыканкам, райкам партыі, не звяртаюць ніякай увагі. Была ў іх са сваёй справай некалькі разоў, аднак яны толькі абяцаюць, але нічога не робяць. Зараз я рашыла, што калі ў бліжэйшы час я не атрымаю больш-менш нармальных умоў жыцця, я буду дабівацца дазволу вярнуцца ў Польшчу»[507]. Таксама мы вымушаны канстатаваць, што не змаглі адшукаць у Нацыянальным архіве РБ дакументаў, якія б сведчылі аб далейшым лёсе А.Яфімавай: ці змагла яна атрымаць неабходную дапамогу ад мясцовага караўніцтва і ўладкавацца на новым месцы, ці ўсё ж вярнулася назад на Беласточчыну. Агульным, што вымушала перасяленцаў з Беласточчыны спрабаваць вярнуцца назад у Польшчу, з'яўлялася, па словах І.Кругліка, «незабяспечанасць іх жыллём, дрэннае рассяленне, грубыя, бесчалавечныя адносіны да іх запытаў на месцах, куды яны перасяліліся»[508].

Разам з такімі «адносінамі» да перасяленцаў існавалі і зусім іншыя. Мясцовыя ўлады стваралі больш-менш спрыяльныя ўмовы да перасяленцаў. Так, у лістападзе 1944 г. супрацоўнік апарата Галоўнага прадстаўніка СНК БССР па перасяленню І.Будаеў, які абследаваў стан размяшчэння перасяленцаў у Мінскім раёне, адзначаў: «Усе сем'і абследаваныя па Мінскаму раёну маюць дастатковую колькасць прадуктаў харчавання і розных рэчаў, ні ў

[505] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1916, арк.136-136
[506] Там сама, арк.132.
[507] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.53.
[508] НАРБ, ф.789, воп.1. спр.5, арк.471.

чым асабліва патрэбы не адчуваюць»[509]. Хутчэй за ўсё стан уладкавання перасяленцаў, мінімальнае задавальненне іх патрэб, увага да іх залежала ад мясцовага чынавенства.

Для таго, каб сагітаваць беларусаў на перасяленне, ўпаўнаважаныя СНК БССР у прапагандысцкіх мэтах перавозілі ў Беларусь усю маёмасць найбольш аўтарытэтных і паважаных грамадзян. Так, усе беларусы вёскі Студзёнка Беластоцкага павета ў колькасці 25 сямей адмовіліся пераязджаць у БССР, спасылаючыся на тое, што паважаны ў вёсцы селянін А.Гілік не збіраецца перасяляцца ў Беларусь. Пасля "доўгіх і ўпартых" гутарак упаўнаважаных СНК БССР з А.Гілікам ён пагадзіўся пераехаць, аднак выставіў умову, каб яму перавезлі дом. Як выключэнне яму гэта было зроблена. У выніку разам з А.Гілікам у Беларусь выехалі ўсе сяляне гэтай вёскі. Аднак, як падкрэслівалі ўпаўнаважаныя, "такія выключэнні рабіліся толькі асобным грамадзянам"[510].

Кіраўніцтва рэспублікі ў мэтах схілення беларусаў да пераезду ў БССР спрабавала выкарыстаць праваслаўную царкву, якая мела значны аўтарытэт сярод праваслаўнага беларускага насельніцтва, большасць якога лічылася прыхажанамі Беластоцкай епархіі, у якую ўваходзіла 60 прыходаў. Аднак праваслаўная царква Польшчы ў дачыненні да перасялення заняла адмоўную пазіцыю. Так, І.Круглік у запісцы, накіраванай у лістападзе 1944 г. сакратару ЦК КП(б)Б К.Кісялёву, паведамляў, што "ў апошні час святары разгарнулі ўзмоцненую працу супраць перасялення праваслаўных беларусаў у БССР. Пратапрасвітар Беластоцкага Епархіяльнага ўпраўленя І.Гушкевіч, у падпарадкаванне якога на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства ўваходзіць 16 праваслаўных прыходаў, адкрыта заяўляе, што перасяленне праваслаўнага рускага і беларускага несельніцтва разорыць праваслаўную царкву, а таму ні адзін праваслаўны беларус не павінен ад'язджаць з Польшчы. Сам І.Гушкевіч, і з яго прыходаў ніводзін святар, не эвакуіруюцца і ўсімі мерамі спрабуюць ўтрымаць ад перасялення ў БССР сваіх прыхаджан"[511].

Для таго, каб схіліць вернікаў і святароў выехаць з Польшчы, па ініцыятыве П.Панамарэнкі ў сярэдзіне снежня 1944 г была "арганізавана" прапагандысцкая паездка ў Бельск і Беласток архіепіскапа Беларусі Васіля Ратмірава ў суправаджэнні ўпаўнаважанага па справах рускай праваслаўнай царквы пры СНК БССР А.Лабанава. П.Панамарэнка ў размове з імі ў ЦК КП(б)Б

[509] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1902, арк.38.
[510] НА РБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.87.
[511] НА РБ, ф.4, воп.29, спр.828, арк.65.

звярнуў іх увагу на тое, што ўпаўнаважаныя СНК БССР "скардзяцца" на праваслаўных святароў, якія самі не выязджаюць у БССР і заклікаюць вернікаў не рабіць гэтага. Ён выказаў жаданне, каб прадстаўнік "аўтарытэтнага духавенства" адправіўся ў Польшчу і растлумачыў святарам і вернікам "рэальнае становішча царквы ў СССР" і схіліў іх да выезду ў БССР. Улічваючы "жаданне" першага сакратара ЦК КП(б)Б, В.Ратміраў згадзіўся на паездку ў Беласточчыну[512].

Пасля паездкі В.Ратмірава, як адзначаў П.Панамарэнка, сітуацыя з перасяленнем "рэзка змянілася"[513]. Аднак П.Панамарэнка перабольшваў яе вынікі. У сапраўднасці яго ў зман увёў А.Лабанаў, які ў ліпені 1945 г. паведаміў яму і Старшыні Савета па справах рускай праваслаўнай царквы пры СНК СССР Г.Карпаву, што "вынікі паездкі пераўзышлі ўсе чаканні. Святарства, атрымаўшы падрабязную інфармацыю, прызнала ўладу Маскоўскага патрыярхата. Пасля гэтага палажэнне з перасяленнем рэзка змянілася. Святарства, атрымаўшы ад архіепіскапа адпаведныя ўказы і прызначэнні, стала рыхтавацца да выезду, а ўслед за імі іх прыхаджане. Палажэнне настолькі змянілася, што транспарт, якога было дастаткова, стаў вострым месцам у перасяленні"[514]. Аднак інфармацыя, прадастаўленая А.Лабанавым П.Панамарэнку, з'яўлялася сфальсіфікаванай. У студзені 1946 г. А.Лабанаў быў вызвалены ад займаемай пасады, а прызначаны на яго месца Н.Часнакоў у дакладной запісцы, накіраванай Г.Карпаву, адзначыў, што ён "доўгі час выпраўляў яго (Лабанава. - А.В) памылкі. "Паездка ў Польшчу", як надзвычайна паспяховая, прывяла да адваротнага. Інфармацыя (Лабанава. - А.В.) ураду БССР, а таксама Савету па справах рускай праваслаўнай царквы пры СМ СССР аказалася нядобрасумленнай"[515].

У канцы снежня 1945 г. П.Панамарэнка, характарызуючы пазіцыю праваслаўнага духавенства, пісаў І.Сталіну, што «праваслаўнае духавенства, якое пражывае на тэрыторыі, што адышла па Дагавору да Польшчы, першапачаткова да перасялення ў Савецкі Саюз аднеслася рэзка адмоўна. Не абмяжоўваючыся асабістым жаданнем не пераязджаць у Савецкі Саюз, духавенства праявіла актыўнасць, каб адгаварыць і не дапусціць перасялення вернікаў сваіх прыходаў. У дадзеным

[512] НА РБ. Ф.951, воп.2, спр.2, арк.7.
[513] НА РБ, ф.788, воп.1, спр.10, арк.137.
[514] НА РБ, ф.951, воп.2, спр.2, арк.8.
[515] НА РБ, ф.951, воп.2, спр.5, арк.3.

выпадку духавенства кіравалася галоўным чынам сквапнымі пачуццямі, каб у сувязі з перасяленнем беларускага насельніцтва не застацца без матэрыяльнай базы»[516].

Праваслаўнае духавенства Беласточчыны ў большасці падтрымала стаўленіка польскага ўрада Ц.Шрэтэра, ярага прыхільніка аўтакефаліі праваслаўнай царквы Польшчы. Так, святар Бельскай царквы паведамляў упаўнаважанаму па справах рэлігіі пры СНК БССР, што "ў Бельску я застаўся адзін. Нават тыя, на якіх магчыма было паспадзявацца, падпісаліся за Цімафея (Шрэтэра)"[517]. У сапраўднасці на пачатку 1946 г. усе праваслаўныя прыходы Беластоцкага ваяводства прызналі ўладу Ц.Шрэтэра, за выключэннем Бельскай царквы, якая звярнулася нават у пасольства СССР у Польшчы з тым, каб апошняя "ўзяла пад спецыяльную ахову адзіную царкву ў Бельску, якая засталася вернай (Маскоўскай) Патрыярхіі".

Ц.Шрэтэр і падпарадкаванае яму духавенства занялі адмоўную пазіцыю ў дачыненні перасялення праваслаўнага насельніцтва ў БССР. Так, П.Панамарэнка ў снежні 1945 г. накіраваў В.Молатаву, Г.Маленкову і Л.Берыі запіску, у якой адзначаў рэзка адмоўнае стаўленне польскага духавенства да выезду праваслаўнага насельніцтва ў БССР. Ён паведамляў, што "польская царкоўная адміністрацыя з ведама органаў мясцовай улады прымае шэраг захадаў, скіраваных на зрыў перасялення. На чале праваслаўных у гэтых мясцінах пастаўлены Люблінскі епіскап Ц.Шрэтэр, які актывізаваў таварыствы праваслаўных палякаў, пагрозамі, матэрыяльным ціскам, подкупам, абяцаннямі схіляе беларусаў запісвацца "палякамі праваслаўнага веравызнання". Праваслаўныя святары, уплываючыя на свае прыходы ў сэнсе перасялення ў СССР, здымаюцца з прыходаў і замяняюцца апалячанымі людзьмі"[518].

Частка святароў, якая падтрымлівала архіепіскапа Васіля, заклікала вернікаў перасяляцца ў БССР. У прыватнасці, яго падтрымлівалі святары Вышкаўскага, Арлянскага прыходаў Бельскага павета[519]. Аднак гэта было хутчэй выключэннем, у той час як большасць праваслаўных святароў і вернікаў схіліліся да прызнання Ц.Шрэтэра ў якасці кіраўніка праваслаўнай царквы на Беласточчыне. У рэшце рэшт, як адзначыў Я.Міранові́ч, "большасць праваслаўных святароў пад ціскам улад прызналі

[516] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.10, арк.137.
[517] НА РБ, ф.951, воп.2, спр.5, арк.4.
[518] НА РБ, ф.4, воп.29, спр.828, арк.20.
[519] НА РБ, ф.7, воп.3, спр.1905, арк.24.

епіскапа Ц.Шрэтэра і правілы гульні, навязаныя польскай адміністрацыяй". Больш таго, жадаючы засведчыць сваю лаяльнасць новым уладам, праваслаўнае духавенства Беласточчыны на сходзе, які адбыўся ў лютым 1946 г., падкрэсліла, што, "жадаючы быць лаяльнымі грамадзянамі польскай дзяржавы, перапыняем усе адносіны з Мінскім архіепіскапам Васілём"[520].

Для нейтралізацыі дзейнасці Ц.Шрэтэра П.Панамарэнка прапанаваў саюзнаму кіраўніцтву наступнае: «Для змянення сітуацыі, якая склалася ў цяперашні час, і паралізацыі шкоднай дзейнасці епіскапа Цімафея, было б мэтазгодным накіраваць у Варшаву аўтарытэтную царкоўную дэлегацыю для перамоваў з мітрапалітам Варшаўскім Дзіянісіем аб уз'яднанні праваслаўнай царквы ў Польшчы з Маскоўскай патрыярхіяй. Ёсць асновы меркаваць, што Дзіянісій, які згубіў уплыў у польскіх колах, з мэтай атрымання падтрымкі Маскоўскай патрыярхіі пойдзе на гэтае ўз'яднанне»[521]. Аднак Масква, узважыўшы ўсе за і супраць, не рызыкнула прыняць прапанову П.Панамарэнкі.

Такім чынам, спадзяванні кіраўніцтва Беларусі выкарыстаць праваслаўную царкву ў сваіх інтарэсах не спраўдзіліся. Праваслаўная царква ў Польшчы заняла адмоўную пазіцыю ў дачыненні да перасялення і заклікала праваслаўнае насельніцтва Беласточчыны не перасяляцца ў БССР.

Нягледзячы на разнастайнасць форм і метадаў агітацыі, якія выкарыстоўвалі ў сваёй працы ўпаўнаважаныя СНК БССР і шматлікія прапагандысты і агітатары, каб схіліць беларусаў Беласточчыны да перасялення ў БССР, вынік іх працы і намаганняў быў мінімальны. Абсалютная большасць беларусаў Беласточчыны праігнаравала перасяленчую акцыю і не пажадала выехаць у БССР. Агульным, што ўтрымлівала іх ад пераезду ў Беларусь, з'яўлялася наступнае: неўспрыняцце савецкай улады, «прывязанасць» да сваёй уласнасці і маёмасці, родныя, сяброўскія сувязі ды іншае.

---

[520] Миронович Е. Выбор веры и судьбы ... С.94.
[521] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.10, арк.139.

## Глава 3.
## «Эвакуацыя» беларусаў і Армія Краёва на Беласточчыне

Фактар польскага падполля, а таксама шматлікіх бандыцкіх груповак, якія дзейнічалі ці ад імя падполля ці самастойна, з'яўляўся адным з найбольш істотных, які вымушаў беларусаў да перасялення. Неабходна пагадзіцца з меркаваннем Я.Мірановіча, што пасляваенны канфлікт паміж польскім падполлем і беларускім насельніцтвам быў у аднолькавай ступені як вынікам тых падзей, што адбываліся на Беласточчыне з верасня 1939 г., так і пасляваеннай рэчаіснасці. З пункту гледжання падполля беларусы з'яўляліся той грамадска-палітычнай групай насельніцтва, на якую абапіралася ў 1939-1941 гг. савецкая ўлада, а ў час нямецкай акупацыі - савецкая партызанка. Пасля вызвалення Польшчы ад немцаў існаванне на Беласточчыне беларусаў стварала патэнцыяльную магчымасць для яе аб'яднання з БССР[522]. Ажыццяўленне ў патэнцыяле такога сцэнару не толькі для Беласточчыны, але ўвогуле далучэнне да СССР Польшчы ў якасці «17-й рэспублікі» не выключалі палітыкі эміgranцкага ўрада. Так, генерал К.Саснкоўскі пасля Тэгеранскай канферэнцыі выказваў думку, што Польшча ў выніку падзелу сфер уплыву ў Еўропе трапіла ў залежнасць ад Масквы. Болей таго, пасля стварэння ПКНВ ён і шэраг палітыкаў, якія не жадалі ісці ні на якія саступкі Маскве, нават выказвалі думку, што «Польшча можа быць далучана да СССР як 17-я савецкая рэспубліка шляхам ажыццяўлення плебісцыту, што адбыўся на «Крэсах Всходніх» у верасні 1939 г.»[523].

З мэтай выключэння такой магчымасці і каб прымусіць беларусаў пакінуць Польшчу, падполле выкарыстоўвала ўсе сродкі - запалохванні, гвалт, рабункі, забойствы. Небяспеку і пагрозу падполля для беларусаў Беласточчыны і для ўпаўнаважаных СНК БССР палітычнае кіраўніцтва рэспублікі асэнсавала з пачатку перасялення. Так, на пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б 31 кастрычніка 1944 г., на якім абмяркоўвалася пытанне аб ходзе перасялення насельніцтва як з Польшчы ў БССР, так і наадварот, усе

---

[522] Mironowicz E. Bialorusini w Polsce ... S.140.
[523] Slusarczyk J. Stosunki Polsko-Sowieckie w latach 1939-1945. Wyd. Adam Marszalek.-Torun, 2004.-S.299.

выступоўцы звярталі ўвагу на актыўную дзейнасць падполля. Улічваючы гэты факт, ЦК КП(б)Б прызнаў неабходным "прымаць самыя рашучыя захады па ахове беларускага, рускага і ўкраінскага насельніцтва, якое падало заявы аб эвакуацыі з тэрыторыі Польшчы, ад нападу нацыяналістычна настроеных польскіх варожых элементаў"[524].

Тэрор з боку падполля прыводзіў да таго, што, як адзначаў Галоўны ўпаўнаважаны І. Круглік, "сяляне-беларусы настолькі запалоханыя, што многія з іх, асабліва мужчыны, сыходзяць на ноч з дому, хаваюцца ад банд, у шэрагу месц збіраюцца групамі і арганізуюць узброеную самаахову". Аднак і арганізацыя самаахові не заўсёды была дастаткова эфектыўнай і дзейснай. Рабаванні, забойствы, гвалт беларускага насельніцтва не прыпыняліся. Так, І. Круглік паведамляў, што "22 верасня 1945 г. у вёсцы Раманаўка Сямяціцкага павета бандыты забілі беларуса Філіманюка Аляксандра, які рыхтаваўся да выезду. 11 кастрычніка (1945 г.) жыхар вёскі Бацікі Сямяціцкага павета Федарук прыбыў у мястэчка Чарэмху да раённага ўпаўнаважанага і запісаўся на выезд у БССР. Вяртаючыся дамоў у ноч з 11 на 12 кастрычніка, ён быў забіты бандытамі. 15 кастрычніка ноччу ў м. Сямяцічы былі забіты беларусы – муж і жонка Менкоўскія за тое, што яны былі савецкімі партызанамі. 21 кастрычніка банда колькасцю 150 чалавек акружыла беларускую вёску Студзёнка. Пры гэтым збівалі насельніцтва, забралі ў сялян, падрыхтаваных да эвакуацыі 23 кані, 15 павозак, некалькі галоў буйной рагатай і дробную жывёлу"[525].

Самыя брутальныя злачынствы ў адносінах да беларусаў Беласточчыны здзейсніў атрад Нацыянальнага Ваеннага Саюза (НЗС), які ўзначальваў Рамуальд Райс ("Буры"). Так, 26 студзеня 1946 г. яго атрад з'явіўся ў вёсцы Заляшаны Бельскага павета. Жыхароў сагналі ў адзін будынак, які потым падпалілі. Тых, хто спрабаваў уцячы, забівалі; параненых замыкалі ў дамах, якія палілі. У гэты ж дзень атрад "Бурага" правёў "пацыфікацыйную" акцыю ў вёсцы Вулька Выганаўска (гміна Бранск), 3 студзеня – ў вёсцы Канцавізна (гміна Завыкі Беластоцкага павета). Па сведчаннях ацалелых ад пагромаў жыхароў вескі Зане, перад пачаткам аперацыі іх вёску акружылі моцным кардонам, які не даваў магчымасці ўцячы. Атрад рабаваў маёмасць, падпальваў дамы, якія належалі беларусам[526].

---

[524] НАРБ. Ф.4, воп.61, спр.91, арк.18.
[525] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.25.
[526] Mironowicz E. Bialorusini w Polsce… Ibid. S.141.

Аб жорсткасці тэрору супраць беларускага насельніцтва сведчыць інфармацыйная запіска "Аб палітычным становішчы ў раёнах нашага абслугоўвання", падрыхтаваная ў студзені 1946 г. намеснікам Галоўнага ўпаўнаважанага СНК БССР М.Джагаравым. У ёй адзначалася, што "абстаноўка ў Беластоцкім ваяводстве працягвае заставацца напружанай, аднак неабходна адзначыць, што дзейнасць банд у шэрагу месц, у прыватнасці ў раёнах Гайнаўка, Белавежа, Грудэк, Нараўка, значна скарацілася. У раёнах мястэчак Бранск, Гарадзіск, Топчава, Вышкі, Востраў-Мазавецкі па-ранейшаму працягваецца разгул банд. Толькі па адной Гарадзіскай гміне за апошнія два месяцы бандытамі разорана, абрабавана да 150 беларускіх гаспадарак. Сяляне пакідалі сваю маёмасць і бадзяюцца ў беларускіх вёсках каля Бельску"[527].

Разам з дзейнасцю ўзброенага падполля, якая мела элементы палітычнага характару, беларускае насельніцтва рабавалі шматлікія злачынныя бандгрупоўкі або асобныя злачынцы. Так, у сакавіку 1945 г. І.Варвашэня дакладваў К.Кісялёву, што ў хату жыхара вёскі Агароднікі С.Перавоя, які падаў заяву аб перасяленні, ноччу ўварваліся тры бандыты, пераапранутыя ў чырвонаармейскую форму і абрабавалі яго. Аднак у выніку аператыўных дзеянняў органаў СМЕРШ бандыты былі схопленыя і па прысуду ваенна-палявога суда расстраляныя[528]. Аналагічны выпадак меў месца і ў вёсцы Мокрае Бельскага павета, дзе ў дом селяніна Лукашука ўварваліся апранутыя ў чырвонаармейскую форму бандыты. Аднак іх напад на сям'ю Лукашука скончыўся больш трагічна, бо бандыты забілі яго жонку. У Вышкаўскай гміне Бельскага павета на працягу двух месяцаў банда ўласаўцаў рабавала мірнае насельніцтва[529].

Акрамя падполля, злачынных груповак, беларусаў рабавала і мясцовае польскае насельніцтва, якое скарыстоўвала безуладдзе для паляпшэння свайго матэрыяльнага дабрабыту. Напрыклад, у маі 1946 г. райупаўнаважаны СНК БССР па Бяла-Падляскаму райпрадстаўніцтву адзначаў, што, "са слоў эвакуіраваных устанаўліваецца, што, у асноўным, у рабаўніцтвах удзельнічаюць мясцовыя жыхары-палякі з суседніх вёсак і палякі, эвакуіраваныя з БССР і УССР. Так, грамадзянін П.Сацюк заявіў, што да яго ўначы 1 красавіка 1946 г. прыйшоў жыхар вёскі Янаў-Падляска

[527] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.29.
[528] НА РБ, ф.4, воп.29, спр.806, арк.49-50.
[529] Там сама, арк.50.

Анжыевіч і патрабаваў кантрыбуцыю. Акрамя гэтага, у яго забралі на працягу красавіка 20 тыс. злотых"[530].

Тэрор падполля непазбежна прыводзіў да чалавечых ахвяр. Так, за 1945 г. толькі па 5 паветах Беластоцкага ваяводства было "забіта 229 беларусаў, прымусова забрана ў лес 14 чалавек, абрабавана 256 гаспадарак. Акрамя гэтага, у беларускага насельніцтва бандамі адабраны сотні галоў жывёлы, сотні тысяч грошай, адзенне, харчаванне"[531].

Дзейнасць фарміраванняў АК, ВіН, НЗС, рознага кшталту бандгруповак не праходзіла беспакарана. З пачаткам перасялення органы НКУС распачалі жорсткую і бязлітасную барацьбу з польскім падполлем. На пачатку лістапада 1944 г. В.Абакумаў і Л.Цанава паведамлялі Л.Берыі аб тым, што імі для правядзення "спецыяльных мерапрыемстваў па Беластоцкаму ваяводству" створаны і накіраваны на месцы 10 аператыўных груп, падмацаваных падраздзяленнямі НКУС. У прыватнасці, "мерапрыемствы" былі скіраваныя супраць "асоб, якія аказваюць супрацьдзеянне праводзімым мерапрыемствам па перасяленню беларускага, рускага і ўкраінскага насельніцтва з Польшчы ў СССР"[532].

Улічваючы пастаянныя напады падполля на мірнае насельніцтва, упаўнаважаных СНК БССР, палітычнае кіраўніцтва краіны прыняло захады па арганізацыі іх аховы. Так, у адпаведнасці з загадам Л.Берыі з мая 1945 г. для аховы ўпаўнаважаных выдзяляліся воінскія часткі 10 стралковай дывізіі ўнутраных войск НКУС БССР, якія не толькі неслі ахову, але рэгулярна праводзілі аперацыі супраць падполля[533]. Так, Галоўны ўпаўнаважаны СНК БССР І.Круглік у адной з запісак, накіраваных у СНК БССР і ЦК КП(б)Б, у 1945 г. адзначаў, што "войскі НКУС з 27 чэрвеня па 5 ліпеня 1945 г. правялі аперацыю па разгрому аперыраваўшай у Шудзялаўскай гміне банды Багуна. У гміне стала спакайней"[534].

Значную дапамогу ў ахове ўпаўнаважаных аказвалі часткі Чырвонай Арміі. Аднак з іх адыходам на Захад сітуацыя значна пагоршылася. П.Панамарэнка ў снежні 1945 г. паведамляў у ЦК УсеКП(б), што "62 дывізія НКУС, якая да гэтага часу забяспечвала ахову ўпаўнаважаных і дапамагала эвакуацыі рускага і

[530] НА РБ. ф.7, воп.3, спр.1922, арк.58.
[531] НА РБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.26.
[532] НКВД и польское подполье ...С.60.
[533] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.828, арк.16.
[534] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.17.

беларускага насельніцтва, у цяперашні час перадыслацыравалася. Гэта сур'ёзна ўскладніла працу нашых аператыўных груп. У такіх раёнах, як Чарэмха, Бельск, Саколка, дзе асабліва актывізавалася дзейнасць банд, без узброенай аховы работу па эвакуацыі беларускага насельніцтва праводзіць немагчыма"[535].

Дзейнасць падполля была настолькі актыўнай і моцнай, што вымусіла беларускую дэлегацыю пры падпісанні дадатковага пратакола ад 25 лістапада 1945 г. настаяць на ўнясенні ў яго спецыяльнага артыкула, у якім ад польскага ўрада патрабавалася "стварыць спрыяльныя ўмовы для працы ўпаўнаважаных Беларускага ўрада на польскай тэрыторыі па рэгістрацыі беларусаў, жадаючых выехаць у Беларусь з Польшчы, забяспечыць аховай асабістую бяспеку як апарату ўпаўнаважаных, так і насельніцтва, якое эвакуіруецца ў Беларусь, і насельніцтва, якое эвакуіруецца ў Польшчу"[536].

Тым не менш, нягледзячы на жорсткую і бязлітасную барацьбу з падполлем, напады як на ўпаўнаважаных, так і на мірнае беларускае насельніцтва, якое рэгістравалася на выезд у БССР, не перапыняліся на ўсім працягу перасяленчай акцыі. З аднаго боку, гэта тлумачылася слабасцю мясцовых польскіх уладаў, у якіх не хапала сілаў, каб забяспечыць спакой і парадак на месцах. З другога – карэннае польскае насельніцтва аказвала значную падтрымку і дапамогу падполлю, і таму яно адчувала сябе даволі спакойна і ўпэўнена на Беласточчыне. Пацверджаннем высновы аб слабасці мясцовых павятовых і гмінных улад з'яўляецца адно з данясенняў І.Круглікa (1945 г.), у якім адзначалася, што, "пачынаючы з красавіка 1945 г. да студзеня 1946 г., у Бельскім, Саколкаўскім, Бяла-Падляскім паветах былі разагнаныя і не працавалі да 70% валасных упраў і пастарункаў міліцыі"[537]. Гэта ж самае сведчылі і польскія павятовыя ўлады. Так, стараста Сакольскага павету ў верасні 1945 г. паведамляў Беластоцкаму ваяводзе, што "распараджэнні павятовага кіраўніцтва не выконваліся з-за таго, што большасць гмінных установаў не працавала". Што ж да насельніцтва павету, то яно "так было запалохана дзейнасцю банд, што ўцякала ў поле, альбо ў лес"[538].

Аб падтрымцы часткай палякаў падполля сведчыць інфармацыя І.Круглікa аб тым, што "аперыруючыя банды АК, НЗС

---

[535] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.828, арк.20.
[536] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.26, арк.49.
[537] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.24.
[538] Sosna G. Ibid. S.83.

і мясцовыя кулацкія тэрарыстычныя групы ў шэрагу месц хавае і падтрымлівае мясцовае насельніцтва, у тым ліку і рэакцыйная партыя С.Мікалайчыка "Польска Стронніцтво Людовэ"[539].

Неабходна падкрэсліць, што за ўвесь перыяд перасялення ахвярамі тэрору падполля і злачынных груповак сталі 500 беларусаў, якія зарэгістраваліся на перасяленне. Таксама было забіта 8 і паранена 15 упаўнаважаных СНК БССР. Акрамя гэтага, звыш 1000 беларускіх гаспадарак былі абрабаваныя як падполлем, так і бандыцкімі групоўкамі[540]. Адзначым, што стаўленне беларускага кіраўніцтва да праблемы падполля і яго ахвяр характарызавалася дваістасцю і непаслядоўнасцю. З аднаго боку, яно не магло не рэагаваць на факты забойстваў, рабаўніцтваў, гвалту як перасяленцаў, так і ўпаўнаважаных СНК БССР. З другога - значна занізіла як чалавечыя, так і матэрыяльныя страты, панесеныя беларусамі. Так, у дакладной запісцы К.Кісялёва, накіраванай у маі 1947 г. загадчыку 4 Еўрапейскім аддзелам МЗС СССР А.Аляксандраву, паведамлялася, што ў час перасялення 5 упаўнаважаных СНК БССР былі забітыя, два параненыя, а 283 гаспадаркі на шляху ў БССР былі абрабаваныя. У сувязі з гэтым урад БССР патрабаваў ад урада Польшчы кампенсаваць страты абрабаваным у памеры 10 млн. рублёў. Сем'ям забітых упаўнаважаных Польскі Урад павінен быў сплаціць грашовую кампенсацыю і выплачваць пенсіі за страту кармільца[541]. Аднак аналіз выніковага пратакола, падпісанага беларускім і польскім бакамі аб сканчэнні тэрміну перасялення (май 1947 г.), не ўтрымлівае пунктаў аб матэрыяльнай кампенсацыі з боку Польшчы за страты, панесеныя перасяленцамі і ўпаўнаважанымі СНК БССР у час перасялення. Невядома ці згадзіўся, а калі згадзіўся, то ці выплаціў урад Польшчы ў поўным аб'ёме загінуўшым і абрабаваным беларусам матэрыяльную кампенсацыю. Незразумелым з'яўляецца і той факт, чаму К.Кісялёў так занізіў колькасць абрабаваных і загінуўшых беларусаў. Ён, як намеснік Старшыні СМ БССР і міністр МЗС БССР, ведаў дакладную інфармацыю аб колькасных стратах беларускага насельніцтва ў час перасялення. Можна меркаваць, што недакладнасць прадстаўленай у Маскву інфармацыі абумоўлівалася палітычнымі меркаваннямі, жаданнем пазбегнуць супярэчнасцей паміж Масквой і Варшавай.

[539] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.27.
[540] НАРБ. Ф.4, воп. 29, спр.154, арк.284.
[541] Архіў МЗС РБ, ф.907, воп.7, спр.112,арк.17.

## Глава 4.
## Правал перасяленчай акцыі

Рэгістрацыя беларускага насельніцтва на перасяленне адлюстроўвала агульную тэндэнцыю, характэрную як для ўсіх прадстаўніцтваў, так і для кожнага паасобку. Яна заключалася ў тым, што жаданне перасяліцца ў БССР выказала меншасць ад усёй колькасці улічаных беларусаў на Беласточчыне. І.Варвашэня на пачатку студзеня 1945 г. паведамляў К.Кісялёву, што ў Бельскім райпрадстаўніцтве з улічаных на 1 студзеня 1945 г. 10 000 гаспадарак толькі ад 1861 паступілі заявы на перасяленне[542]. Аналагічная сітуацыя назіралася ў Цэханавецкім райпрадстаўніцтве, у якім на выезд зарэгістравалася самая нязначная колькасць беларусаў. І.Варвашэня адзначаў, што праца ўпаўнаважаных ў Цэханаўцы з'яўлялася зусім нездавальняючай, бо "за 5 месяцаў работы, з кастрычніка 1944 г. па сакавік 1945 г., па Цэханавецкаму райпрадстаўніцтву сабрана ўсяго 42 заявы на эвакуацыю і адпраўлена ў СССР 33 гаспадаркі"[543].

Новы Галоўны ўпаўнаважаны СНК БССР І.Круглік у запісцы, накіраванай у канцы красавіка 1945 г. К.Кісялёву, паведамляў, што “нягледзячы на вялікую агітацыйна-прапагандысцкую працу, праведзеную апаратамі ўпаўнаважаных, камандзіраванымі ЦК КП(б)Б, СНК БССР і афіцэрскім складам, мы змаглі дасягнуць падачы заяў ад 8803 гаспадарак, што складае 25,15% у адносінах да ўсіх улічаных беларускіх, рускіх і ўкраінскіх гаспадарак, якія падлягаюць эвакуацыі”[544].

Архіўныя дадзеныя сведчаць, што ў кастрычніку 1944 - маі 1945 гг. зарэгістравалася і выехала большасць тых, хто падаў заявы на выезд і меў цвёрды намер пераехаць у БССР. У гэты перыяд у БССР пераехала 64,1% ад агульнай колькасці ўсіх, хто зарэгістраваўся[545]. Колькасныя дадзеныя (па стану на 1 мая 1945 г.) паказваюць, што большасць пераселеных прыпадае на Беластоцкі, Бельскі, Саколкаўскі паветы Беластоцкага ваяводства. Абсалютную большасць зарэгістраваных і пераселеных склала бядняцкая і серадняцкая часткі сялянства, што адзначалі і беларускі і польскі

[542] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.70, арк.52.
[543] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.7, арк.5.
[544] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.806, арк.51.
[545] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.62.

бакі. Так, І.Круглік паведамляў, што “да чэрвеня 1945 г. у абсалютнай большасці эвакуіраваліся бядняцкія і нязначная частка серадняцкіх сялянскіх гаспадарак. Перасяленне гэтай часткі сялянскіх гаспадарак праходзіла пад уплывам вялікай агітацыйна-растлумачальнай працы, якая праводзілася ў той час”[546]. Ад'езд у БССР бядняцкага сялянства адзначалі і ваяводскія ўлады. У прыватнасці, Беластоцкі ваявода С.Дыбоўскі паведамляў, што "ў БССР ад'язджае найбольш бедная частка сялянства"[547]. Магчымасцю перасялення ў БССР таксама скарыстаўся і партыйна-савецкі, прафсаюзны, камсамольскі актыў, які ўдзельнічаў у сацыялістычных пераўтварэннях на Беласточчыне ў 1939-1941 гг. Неабходна адзначыць, што гэта група насельніцтва не мела выбару. Палітычная рэальнасць была ў тым, што галоўным чынам супраць гэтай часткі беларусаў ужываўся тэрор з боку польскага падполля, і часцей за ўсё яны станавіліся яго ахвярамі. Так, І.Круглік паведамляў К.Кісялёву, што вясной-летам 1945 г. “у большасці эвакуіраваліся тыя беларускія сем'і, якім з-за штодзённых нападаў банд у далейшым заставацца на месцы стала немагчымым і небяспечным. У гэтую групу ўваходзіць найбольш перадавая частка вёскі – былыя савецкія работнікі, актывісты, сем'і савецкіх партызан і іншыя”[548]. Так, былы дэпутат Лапскага райсавета Н.Паплаўская заявіла ўпаўнаважанаму СНК БССР, што "тут нам заставацца небяспечна, як быламу савецкаму актыву, а ехаць туды, значыць разарыць гаспадарку і застацца жабраком". Людзі гэта асэнсоўвалі, але страх за сваё ўласнае жыццё, жыццё блізкіх, родных, быў мацнейшы за ўласніцкія пачуцці і прымушаў іх да ад'езду ў БССР.

Другую групу перасяленцаў склалі рабочыя, трэцюю - служачыя. Прадстаўнікі інтэлігенцыі (урачы, настаўнікі, інжынерна-тэхнічныя работнікі) і заможнае сялянства фактычна праігнаравалі перасяленчую акцыю, і толькі нязначная іх частка выказала жаданне і пераехала ў БССР. Неабходна пагадзіцца з высновай Я.Мірановіча, што "існуючая ўлада ў Польшчы забяспечыла больш спрыяльныя ўмовы жыцця". Большасць заможнага аднаасобнага сялянства, саматужнікі, рабочыя фактычна праігнаравалі заклікі аб пераездзе ў БССР. Так, І.Варвашэня ў сакавіку 1945 г. паведамляў К.Кісялёву аб тым, што “беларускія, рускія, украінскія гаспадаркі, якія засталіся на Беласточчыне, з'яўляюцца найбольш заможнай часткай вёскі. Яны маюць ад 15 да 50 га зямлі, па 2 кані, 3-4

[546] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.828, арк.64.
[547] Sosna G. Ibid. S.25, 28.
[548] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.828, арк.65.

каровы, шмат дробнай жывёлы, добрыя пабудовы, сады. Гэтыя гаспадаркі адкрыта не адмаўляюцца выязджаць, але і не падаюць заявы на эвакуацыю"[549]. Характарызуючы заможнасць гэтай групы насельніцтва, ён паведамляў, напрыклад, што аднаасобнік І.Крукоўскі, пражываючы ў вёсцы Канцавізна Завыкінскай гміны, меў 18 га зямлі, 3 кані, 3 каровы, малатарню, саломарэзку ды іншы сельскагаспадарчы інвентар. Жыхар гэтай жа вёскі М.Адамук меў 20 га зямлі, 3 кані, 4 каровы, 6 свіней, добры сельскагаспадарчы інвентар. Безумоўна, у гэтай часткі беларусаў Беласточчыны не мелася жадання і патрэбы ў перасяленні ў БССР. Заможны беларус Беласточчыны добра ведаў, ды гэта і падкрэслівалася ў беларуска-польскім пагадненні, што перасяленцы маюць права на атрыманне ў Беларусі зямлі не менш, чым яны мелі ў Польшчы, але не болей за 15 га на адну гаспадарку[550]. Гэта значыла, што ўжо згаданы П.Адамук, які меў 20 га зямлі, у Беларусі адтрымаў ба толькі 15 га, страціўшы без кампенсацыі 5 га зямлі. Да таго ж у пагадненні ад 9 верасня 1944 г. і дадатковым пратаколе ад 25 лістапада 1945 г. не было прапісана, як і ў якіх грашовых памерах будзе кампенсавацца страта "лішняй" зямлі. Фактычна савецкая ўлада такім чынам рабіла "абрэзку" зямлі ў тых заможных сялян, якія б пераехалі ў калгасна-саўгасную Беларусь. Аднак беларусы Беласточчыны добра ведалі і памяталі пра "абрэзку" зямлі, якую савецкая ўлада праводзіла ў 1939-1941 гг. і яе вынікі. Таму для заможнага беларуса, які меў 20 і болей гектараў зямлі, з відавочнасцю было зразумела, што пераязджаць у калгасна-саўгасную Беларусь, з яе галечай, прымусовай працай, бясконцымі і непамернымі пазыкамі, вялізнымі падаткамі, няма ніякага сэнсу.

Да таго ж дэклараванае ў пагадненні права на атрыманне перасяленцамі зямлі ў памеры 15 га мела абсалютна прапагандысцкі характар. Ці магло гэта адбыцца ў савецкай Беларусі, дзе панавала калгасна-саўгасная сістэма ? Безумоўна, не. Тым больш, што асноўную частку перасяленцаў планавалася накіраваць ва ўсходнія вобласці. Патрабаванні перасяленцаў аб надзяленні іх зямлёй у адпаведнасці з умовамі пагаднення мясцовыя органы ўлады сустракалі з незадавальненнем і неразуменнем. Прадстаўнік СНК СССР, які правяраў стан размеркавання і ўладкавання перасяленцаў у Слуцкім раёне ў сакавіку 1945 г., адзначаў, што у раён з Беласточчыны было перасялена 110 гаспадарак з жывёлай, сельскагаспадарчым інвентаром і іншай маёмасцю. Аднак на момант праверкі ні адна

549 НАРБ, ф.4, воп.29, спр.806, арк.47.
550 НАРБ, ф.788, воп.1, спр.1, арк.26.

гаспадарка не была надзелена зямлёю. Гэта тлумачылася тым, і аб гэтым прама заявіў загадчык зямельнага аддзела райвыканкама, што "калі надзяліць іх (перасяленцаў. – А.В.) зямлёй з калгасаў і саўгасаў, то гэта зможа паўплываць на ход умацавання калгасных гаспадарак нашага раёна"[551]. Не атрымалі абяцаных 15 га зямлі і перасяленцы, якія перасяліліся ў Свірскі раён Маладзечанскай вобласці. Раённая газета "Сталінскі шлях" з узнёсласцю паведамляла ў красавіку 1946 г.: "На працягу 1944-1946 гг. у Беларусь перасяліліся сотні беларускіх сем'яў, якія шчасліва зажылі разам са сваім народам. У наш раён з Польшчы перасялілася некалькі сем'яў, якія атрымалі дамы, будынкі, зямлю. Зямля ім выдана бясплатна. Рурык Іван атрымаў 7,79 га, у тым ліку 3,5 га ворыва. Дашчук П. атрымаў 8 га, з якіх 3 га сенакос, 3,5 га ворыва. 6 га атрымаў Лабачэўскі С. Усім ім выданы пазыкі ў памеры 35 000 рублёў"[552]. Аднак гэтым ды іншым перасяленцам нядоўга давялося працаваць на "бясплатнай зямлі". Неабходна нагадаць, што літаральна праз год-два ў заходніх абласцях пачалася прымусовая калектывізацыя, і ўсе яны апынуліся ў калгасах ды саўгасах.

Уласніцкія матывы ўтрымлівалі ад пераезду і саматужнікаў. І.Варвашэня адзначаў, што "ў Крынках пражывае шмат беларусаў саматужнікаў-гарбароў, якія адмаўляюцца пераязджаць, тлумачачы гэта тым, што "жыць нам тут добра, кожны мае свой дом, агарод, сваё абсталяванне па апрацоўцы скур. У Расіі больш не заробіш"[553].

Уласніцкая псіхалогія сялянства была галоўнай прычынай, якая ўтрымлівала беларусаў ад пераезду ў БССР. Так, упаўнаважаны з Валіл паведамляў, што "ў сялянства псіхалогія ўласніка з'яўляецца асноўным тормазам, нават у тых, хто аддана дапамагаў органам савецкай улады ў 1939-1941 гг."[554]. Трапную адзнаку гэтаму фактару даў упаўнаважаны Сямяціцкага райпрадстаўніцтва А.Лакціёнаў, які адзначыў, што "ў псіхалогіі селяніна, над якой яшчэ не працавалі ў сэнсе грамадска-палітычнага выхавання і які сам яшчэ не ўліўся ў калектыўна-творчую працу, гадамі выпрацоўвалася і замацавалася паняцце аб прыватнай уласнасці як крыніцы дабрабыту, а аб калгасе – як аб пекле"[555]. Нежаданне беларусаў перасяляцца ў БССР адзначала і польскае падполле. Так, камендант АК абвода Бельск-Падляскі падкрэсліваў, што, "нягледзячы на сімпатыі да БССР, большасць

---

[551] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1917, арк.58.
[552] Сталінскі шлях, 4 красавіка 1946 г., С.1.
[553] НАРБ, ф.787, воп.1, спр.23, арк.9.
[554] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1918, арк.164.
[555] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.258, арк.57.

беларусаў не жадае выязджаць за лінію Керзана. Да 20.1944 г. выехала менш за 209 грамадзян. Жыхары вёскі Малежа, гміна Бельск, заяўляюць, што калі будзе адбывацца прымусовае перасяленне, яны ўсе пяройдуць у каталіцызм і пажадаюць стаць палякамі"[556].

У далейшым большасць заможнага беларускага сялянства, саматужнікаў, рабочых так і не пажадалі падаць заявы на выезд. Так, І.Круглік у запісцы, накіраванай К.Кісялёву ў канцы 1945 г., паведамляў, што 24 227 гаспадарак, якія налічвалі 95 047 чалавек, да лістапада 1945 г. так і не выказалі жадання перасяліцца ў БССР. Ён звяртаў увагу, што ў гэтую групу ўваходзіла заможная і серадняцкая частка сялянства, якая жыла на хутарах, кулакі, рабочыя і служачыя, якія "нядрэнна ўладкаваліся ва ўстановах і на транспарце"[557].

Аналагічныя паказчыкі, з нязначнымі ваганнямі, былі ўласцівы і для асобных райпрадстаўніцтваў. Так, па Беластоцкаму райпрадстаўніцтву было ўлічана 2798 беларускіх гаспадарак агульнай колькасцю 10 212 чалавек. Аднак па стану на 15 мая 1945 г. у БССР перасялілася 594 гаспадаркі, што склала 21% да агульнай колькасці ўлічаных беларускіх гаспадарак[558]. З Сямяціцкага райпрадстаўніцтва перасялілася ўсяго 1244 гаспадаркі, што склала 27% ад усёй колькасці ўлічаных беларускіх гаспадарак[559]. Па Бельскаму райпрадстаўніцтву было ўлічана 9491 беларуская гаспадарка, аднак перасялілася ўсяго 2148, што склала 22,6% ад ўсёй колькасці ўлічаных гаспадарак[560]. Ня значна адрозніваліся гэтыя лічбы і па іншых райпрадстаўніцтвах. Такім чынам, большасць беларусаў Беласточчыны да лета 1945 г. прынцыпова вызначыла сваю пазіцыю і не выказала жадання перасяляцца ў БССР.

З Беласточчыны ў БССР перасяленне праводзілася выключна чыгуначным транспартам. Аднак, як і пры перавозцы палякаў з БССР, праца чыгуначнікаў выклікала значныя наракання і незадавальненне з боку як Галоўнага, так і раённых упаўнаважаных СНК БССР. Так, у снежні 1944 г. І.Варвашэня паведамляў намесніку старшыні СНК БССР К.Кісялёву аб тым, што "адпраўка эвакуіраванага беларускага, рускага, украінскага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы у СССР у другой палове снежня 1944 г.

[556] Bialostocczyzna 1944-1945 w dokumentach … S.98.
[557] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.828, арк.65.
[558] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.258, арк.45.
[559] Там сама, арк.56.
[560] Там сама, арк.63.

сарваная з-за непрадастаўлення паражняку пад пагрузку"[561]. Перавозка ўскладнялася тым, што кіраўніцтва Беластоцкай чыгункі напрыканцы снежня 1944 г. адмовілася прадастаўляць вагоны па заяўках Галоўнага ўпаўнаважанага і пачало прадастаўляць вагоны па загадзя складзеных планах. Аднак І.Варвашэня ўяўляў усю складанасць і цяжкасць задачы планавага падвозу людзей на станцыі пагрузкі, як таго патрабавалі чыгуначнікі. Складанасць заключалася ў тым, што для перавозкі маёмасці адной гаспадаркі, якую неабходна было падвозіць да чыгуначнай станцыі ў сярэднім за 30-35 км, патрабавалася 15 падвод, а таксама адчуваўся недахоп транспарту, у час падвозкі людзей і маёмасці да чыгуначных станцый адбываліся пастаянныя напады падполля..

Зімой 1944 г. сітуацыя значна пагоршылася з-за наступнай прычыны. Да 25 снежня 1944 г. з рэзерваў Першага і Другога Беларускіх франтоў выдзялялася 120 аўтамашын для падвозу грамадзян і іх маёмасці да чыгуначных станцый. Аднак пасля гэтага тэрміну камандаванне франтоў адазвала ўсе машыны ў сваё распараджэнне і ў далейшым адмовілася прадастаўляць транспарт для патрэб перасялення. У сувязі з гэтым І.Варвашэня ў канцы снежня 1944 г. накіраваў П.Панамарэнку паведамленне, у якім прасіў, каб ён, як Старшыня ўрада Беларусі, дамовіўся з камандаваннем франтоў, каб пакінуць у распараджэнні Галоўнага ўпаўнаважанага аўтатранспарт[562]. Аднак, нягледзячы на шматлікія звароты ўрада Беларусі і Галоўнага ўпаўнаважанага, камандаванне Першага і Другога Беларускіх франтоў адмовілася прадастаўляць транспарт для патрэб перасялення[563].

Нездавальняючая праца чыгункі прыводзіла да таго, што перасяленцы па некалькі тыдняў знаходзіліся на станцыях пагрузкі. І.Круглік у жніўні 1945 г. накіраваў у СНК БССР службовую запіску, у якой адзначаў, што "з 15 жніўня 1945 г. з перадачай участкаў чыгуначных дарог на тэрыторыі Польшчы ў падпарадкаванне Міністэрства камунікацый польскага ўрада нам зусім было адмоўлена ў прадастаўленні вагонаў"[564]. У лістападзе гэтага ж года ён зноў звяртаецца да К.Кісялёва і паведамляе яму, што "на станцыях Валілы і Беласток 15 дзён прастойваюць 60 вагонаў з насельніцтвам, якое неабходна эвакуіраваць, прычым вагоны зусім не абсталяваныя і не ацепленыя. Сярод людзей

[561] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1902, арк.72.
[562] Там сама, арк.74.
[563] Там сама, арк.76, 77: спр.1905, арк.14.
[564] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.17.

пачаліся захворванні. На настойлівыя патрабаванні нашага ўпаўнаважанага аб адпраўцы вагонаў на пункты перагрузкі дырэкцыя дарогі і Міністэрства шляхоў зносін (Польшчы. - А.В.) не рэагуе. Мясцовая чыгуначная адміністрацыя сабаціруе адпраўку вагонаў, спасылаючыся на адсутнасць вугалю і цягнікоў".

Дрэнная праца польскай чыгункі вымусіла П.Панамарэнку звярнуцца ў снежні 1945 г. з запіскай у ЦК УсеКП(б), у якой адзначалася, што "польская чыгуначная адміністрацыя нядобрасумленна забяспечвае эвакуацыю беларускага насельніцтва з Польшчы ў БССР". У сувязі з гэтым П.Панамарэнка прасіў ЦК УсеКП(б), "зрабіць прадстаўленне польскаму ўраду аб нецярпімай абстаноўцы, якая склалася ў раёнах эвакуацыі рускага і беларускага насельніцтва"[565].

Неабходна адзначыць, што дрэнная праца чыгункі абумоўлівалася недасканаласцю падпісанага беларуска-польскага пагаднення ад 9 верасня 1944 г., яго эканамічнай нявыгаднасцю для беларускага боку. Так, артыкул 5 раздзела 1 пагаднення значыў, што "перавозку эвакуіраваных з тэрыторыі Польшчы ў Беларускую ССР і з тэрыторыі Беларускай ССР бярэ на сябе Урад Беларускай ССР, па магчымасці выдзяляючы транспартныя сродкі"[566]. Улічваючы пасляваенную разруху, разбуранасць чыгуначных шляхоў, гэты пункт пагаднення не адпавядаў эканамічным інтарэсам Беларусі. Таму, падпісваючы 25 лістапада 1945 г. дадатковы пратакол з Польскім Урадам аб прадаўжэнні тэрміну перасялення, беларуская дэлегацыя настаяла, каб артыкул 5 Пагаднення быў запісаны зусім у іншай рэдакцыі. У ім пазначалася, што "дамаўляючыяся бакі забяспечваюць, па магчымасці, усіх эвакуіруемых транспартам, *кожны на сваёй тэрыторыі*"[567]. (выдзелена мной. – А.В.). Як бачна, гэты пункт Пагаднення працярпеў істотныя змены на карысць Беларусі. Аднак неканкрэтнасць яго фармулёўкі: "бакі, якія дамаўляюцца, забяспечваюць, па магчымасці, эвакуіруемых транспартам" давала бакам прастору для манеўра і перакладвання адзін на аднаго праблем, звязаных з перавозкай людзей. Тым не менш у параўнанні з першым варыянтам ён больш адпавядаў эканамічным інтарэсам Беларусі, бо і на польскія ўлады ўскладвалася адказнасць за перавозку грамадзян па тэрыторыі Польшчы. Аднак да заканчэння перасялення праца чыгуначнага транспарту выклікала

565 НАРБ, ф.4, воп.29, спр.828, арк.20-21.
566 НАРБ, ф.788, воп.1, спр.1, арк.32.
567 НАРБ, ф.789, воп.1. спр.26, арк.49.

справядлівыя нараканні і незадаволенасць упаўнаважаных СНК БССР.

У час перасяленчай акцыі частка беларусаў выказала жаданне перасяліцца не ў БССР, а ў іншыя вобласці СССР. Так, у студзені 1945 г. упаўнаважаны Бельскага райпрадстаўніцтва Д.Сукачоў паведамляў І.Варвашэню аб тым, што ў працы па ўліку і адпраўцы насельніцтва ўзнікаюць цяжкасці, якія абумоўлены галоўным чынам тым, што перасяленцы незадаволены абмежаваннямі, звязанымі з месцам выбару. Частка беларусаў выказвала жаданне перасяліцца па-за межы Беларусі, і, каб такая магчымасць была, то, як падкрэсліваў Д.Сукачоў, "заяў на перасяленне было б нашмат болей"[568]. Дакладныя такога характару вымусілі Галоўнага ўпаўнаважанага СНК БССР І.Варвашэню ў студзені 1945 г. накіраваць К.Кісялёву запіску, у якой адзначалася, што "насельніцтва, якое падлягае перасяленню з тэрыторыі Польшчы, выказвае жаданне перасяляцца ў розныя вобласці Савецкага Саюза і адмаўляецца пераязджаць у Беларусь. У той жа час раённыя апараты арыентуюць насельніцтва на пераезд толькі ў Беларусь. Аднак гэта з'яўляецца вялікім тормазам у працы. У мэтах паскарэння працы прашу Вас паставіць пытанне перад Саюзным Урадам аб дазволе эвакуацыі ў іншыя вобласці Савецкага Саюза"[569].

Неабходна заўважыць, што К.Кісялёў, рэагуючы на дакладную запіску І.Варвашэні, аператыўна ініцыяваў "пытанне" перад Саюзным Урадам аб дазволе беларусам перасяляцца ў адпаведнасці з іх жаданнем. Так, 27 студзеня 1945 г., г. зн. з моманту звароту І.Варвашэні не прайшло і месяца, як ён атрымаў ад Галоўнага ўпаўнаважанага СНК УССР Н.Падгорнага ліст, у якім паведамлялася аб тым, што 9 абласцей Украіны гатовыя прыняць 1000 беларускіх гаспадарак[570]. Аналізуючы гэтую перапіску, магчыма сцвярджаць, што ні Урад БССР, ні Урад УССР самастойна не маглі вырашыць пытання аб перасяленні такой значнай колькасці насельніцтва без дазволу саюзных органаў. Таму, улічваючы зварот К.Кісялёва, саюзнае кіраўніцтва дало адпаведную дырэктыву Ураду Украіны аб прыёме перасяленцаў–беларусаў. Аднак магчымасцю пераезду па-за межы Беларусі скарысталася нязначная колькасць беларусаў, у той час як абсалютная большасць перасяленцаў пераехала ў БССР.

У час перасяленчай акцыі частка беларусаў у сапраўднасці пажадала перасяліцца па-за межы БССР. Так, у студзені 1945 г. усе

[568] НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1905, арк.24.
[569] Там сама, арк.22.
[570] Там сама, арк.21.

беларусы вескі Забалацце Мілейшчыцкай гміны Бельскага павета ў колькасці 20 гаспадарак звярнуліся з хадайніцтвам у Вярхоўны Савет БССР аб прадастаўленні ім магчымасці перасяліцца ў Паволжжа[571]. Іх зварот не застаўся па-за ўвагай кіраўніцтва рэспублікі, і ў адпаведнасці з рашэннем К.Кісялёва ім прадаставілі такую магчымасць.

Летам-восенню 1945 г. стала відавочна, што большасць беларускага насельніцтва, нягледзячы на актыўную агітацыю, адмовілася пераязджаць у БССР. Гэта ў першую чаргу было звязана з тым, што ў канцы 1945 - пачатку 1946 гг. на Беласточчыне стабілізавалася абстаноўка і пачала трывала ўстанаўлівацца мясцовая ўлада. Так, упаўнаважаны па Саколкаўскаму райпрадстаўніцтву А.Ільін, дакладваючы І.Кругліку аб выніках эвакуацыі, зазначыў, што “з прыходам у лютым 1946 г. польскіх пагранічных частак трывала ўстанавілася ўлада ў гмінах і рэзка змяніліся настроі сялянства да эвакуацыі. Калі ў павеце не было польскіх воінскіх частак, беларускае сялянства вёскамі прасілася на выезд, каб пазбавіцца ад гвалтаў і рабункаў з боку бандытаў, а калі ўсталявалася ўлада ў гмінах і паветах, ад эвакуацыі сталі адмаўляцца”[572].

Наколькі моцным было нежаданне беларусаў, якія заставаліся на Беласточчыне пераязджаць у БССР, сведчыць запіска ўпаўнаважанага па Сямяціцкаму райпрадстаўніцтву А.Лакціёнава, накіраваная І.Кругліку ў чэрвені 1946 г. аб тым, што “эвакуацыю неабходна скончыць – іх (г.зн. сялян-беларусаў. - А.В) б'юць, рабуюць нават болей - іх забіваюць, яны бягуць у бяспечнае месца, аднак у БССР перасяляцца не жадаюць”[573].

Нягледзячы на актыўнасць працы ўпаўнаважаных СНК БССР, усё ж большая частка беларускага насельніцтва як увогуле, так і па асобных райпрадстаўніцтвах не пажадала пераехаць у БССР. Так, раўупаўнаважаны СНК БССР І.Сычоў дакладваў І.Кругліку, што па выніках працы з 15 верасня 1944 г. па 16 чэрвеня 1946 г., "нягледзячы на пастаянную растлумачальную працу, доўгатэрміновы час эвакуацыі, у Беластоцкім павеце 60% беларускага насельніцтва (у асноўным сельскага) адмовілася эвакуіравацца"[574]. Упаўнаважаны з Валілаўскага райпрадстаўніцтва паведамляў, што "частка беларускіх гаспадарак, у асноўным заможная, не праявіла ніякага жадання эвакуіравацца ў БССР". Па

[571] Там сама, арк.19.
[572] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.258, арк.69.
[573] Там сама, арк.58.
[574] Там сама, арк.47.

Валілаўскаму райпрадстаўніцтву, у якое ўваходзіла 5 гмін, адмовілася ад выезду 5014 беларускіх гаспадарак"[575]. Па Сямяціцкаму райпрадстаўніцтву, у якое ўваходзіла 6 гмін, выехала 2037 гаспадарак, што склала 27% ад ўсёй колькасці ўлічаных гаспадарак, у той час як 5626 гаспадарак не пажадалі пераехаць у БССР[576]. Па Бельскаму райпрадстаўніцтву з 9491 гаспадаркі пераехалі ў БССР толькі 2148, што склала 22,6% ад агульнай колькасці[577].

Выніковыя дадзеныя аб перасяленні беларусаў з Польшчы ў БССР (па стану на 15 чэрвеня 1946 г.) паказалі, што большасць улічаных беларускіх гаспадарак не пажадалі пераехаць у БССР і засталіся ў Польшчы. У Беларусь пераехала ўсяго 8015 гаспадарак, якія налічвалі 27 409 чалавек[578]. У сувязі з тым, што ўрады Беларусі і Польшчы згадзіліся прадоўжыць перасяленне да 31 снежня 1946 г., то з Польшчы ў БССР да снежня 1946 г. выехала яшчэ 379 грамадзян. Такім чынам, канчатковая лічба беларусаў, якія перасяліліся ў БССР, склала 27 806 чалавек[579].

Выніковыя дадзеныя (па стану на 31 снежня 1946 г.) сведчаць, што агульныя тэндэнцыі, якія склаліся з пачаткам перасялення і ўласцівыя паказчыкам па стану на 1 мая 1945 г., захаваліся да яго сканчэння. Найбольшая колькасць беларусаў перасялілася ў БССР з Бельскага райпрадстаўніцтва - 2076 гаспадарак, якія налічвалі 7253 грамадзяніна, Сямяціцкага - адпаведна 1928 - 6790, Беластоцкага - 1513 - 4217, Валілаўскага 1078 - 3692, Саколкаўкага - 727 - 2648.

Не адбылося змен у прафесійным і сацыяльным складзе перасяленцаў, абсалютную большасць якіх склалі сяляне – 14 587, рабочыя занялі другі радок - 1841, далей служачыя - 493 і г.д. Па полу нязначную перавагу мелі жанчыны, колькасць якіх склала 12 224, у той час як мужчын перасялілася 10 033. Разам з бацькамі ў Беларусь пераехала 14 141 дзіця да 16-гадовага ўзросту[580].

Пасля 15 чэрвеня 1946 г. пачалося згортванне працы ўпаўнаважаных СМ БССР у Польшчы. У чэрвені 1946 г. СМ БССР прыняў пастанову "Аб скарачэнні апарату Галоўнага ўпаўнаважанага і Галоўнага прадстаўніка СМ БССР па эвакуацыі", згодна з якой з 1 ліпеня 1946 г. упаўнаважаныя СМ БССР спынялі працу. Разам з тым для заканчэння працы да 1 студзеня 1946 г. у

[575] НАРБ, ф.789, воп.1, спр.3, арк.25.
[576] Там сама, арк.9.
[577] Там сама, арк.19.
[578] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.156, арк.287.
[579] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.22, арк.29.
[580] Там сама, арк.29.

Беластоку заставалася працаваць група Галоўнага ўпаўнаважанага СМ БССР.[581] Канчаткова перасяленне беларусаў з Беласточчыны скончылася 31 снежня 1946 г., калі ў Беластоку Галоўны упаўнаважаны СМ БССР па справах эвакуацыі і Галоўны прадстаўнік Ураду Польшчы па справах эвакуацыі падпісалі Акт аб сканчэнні працы. У §1 Акта пазначалася: "Лічыць эвакуацыю беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы ў Беларускую ССР, пачатую 15 верасня 1944 г., поўнасцю скончанай 31 снежня 1946 г". У §6 сцвярджалася, што "ўся работа праходзіла і скончана ў атмасферы ўзаемаразумення і згоды і што бакі ніякіх прэтэнзій адзін да аднаго па праведзенай рабоце не маюць"[582].

Аднак, як і пры перасяленні польскага насельніцтва з БССР у Польшчу, гэта сцвярджэнне мела спалітызаваны характар і не адлюстроўвала ўсіх складанасцей і супярэчнасцей перасялення беларусаў з Беласточчыны ў БССР. "Згодзе" не магла спрыяць дзейнасць польскага падполля (АК і постакаўскіх фарміраванняў), якая не перапынялася на ўсім працягу перасялення, антыбеларуская пазіцыя ваяводскіх уладаў, занятая імі з другой паловы 1945 г., дрэнная праца чыгуначнага транспарту і інш.

Неабходна адзначыць, што існуюць значныя разыходжанні ў колькасных паказчыках беларусаў, якія перасяліліся ў БССР, што прыводзіліся ў афіцыйных беларускіх дакументах і лічбах, што прыводзяцца польскімі гісторыкамі. Так, у заключным Акце, падпісаным Д.Сукачовым і С.Навакоўскім[583], і "Звестках аб эвакуіраваных беларускіх, рускіх і украінскіх гаспадарках з тэрыторыі Польшчы ў СССР па стану на 31 снежня 1946 г." адзначана, што ў БССР пераехала 8220 беларускіх гаспадарак, агульнай колькасцю 27 806 чалавек[584]. У той жа час Я.Міратовіч сцвярджае, што да канца 1946 г. у БССР пераехала 36 388 беларусаў[585]. Па ўсёй бачнасці ён уключае ў гэтую лічбу ўсіх перасяленцаў (беларусаў, рускіх, украінцаў, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей), бо агульная колькасць усіх пераселеных з Беласточчыны ў СССР практычна супадае з лічбамі, што прыводзяцца ім, – 36 398[586]. Аднак, на наш погляд, усё ж больш дакладнымі неабходна прызнаць лічбы, якія прыведзены ў выніковых "Звестках", прадстаўленых Галоўным упаўнаважаным СМ БССР па перасяленню.

---

[581] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.21, арк.21.
[582] НАРБ, ф.787, воп.2, спр.5, арк.28.
[583] НАРБ, ф.787, воп.2, спр.5, арк.26-28.
[584] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.22, арк.29.
[585] Mironowicz E. Bialorusiny w Polsce… S.111.
[586] НАРБ, ф.788, воп.1, спр.22, арк.29.

Такім чынам, перасяленне беларускага насельніцтва з Беласточчыны ў БССР у 1944-1946 гг. ажыццяўлялася ў складаных умовах ваеннага і пасляваеннага развіцця Польшчы. Асаблівасці ўнутранага і міжнароднага становішча Польшчы - праблемы вызначэння яе ўсходняй мяжы, працяг Другой сусветнай вайны, унутрыпалітычная барацьба двух лагераў нацыянальна-вызваленчага руху, прадстаўленых ППР і эмігранцкім урадам, дзейнасць польскага падполля і іншыя - уплывалі на працэс перасялення.

Апарату Галоўнага і раённых упаўнаважаных СМ БССР давялося працаваць у складаных умовах, ажыццяўляючы ўлік, рэгістрацыю і адпраўку беларускага насельніцтва з Польшчы ў БССР. Колькасць беларусаў, улічаных упаўнаважанымі СМ БССР, нельга прызнаць даставернай, бо іх дакладны ўлік у шэрагу гмін немагчыма было правесці з-за актыўнай дзейнасці польскага падполля. Магчыма лічыць, што беларусаў у Беластоцкім ваяводстве пражывала больш, чым улічылі ўпаўнаважаныя СМ БССР.

Разам з тым няведанне рэальнага становішча, палітычных настрояў большасці беларускага насельніцтва Беласточчыны прывялі да значных пралікаў у вызначэнні колькасці беларусаў, жадаючых перасяліцца ў БССР, з боку партыйна-савецкага кіраўніцтва рэспублікі. У Беларусь пераехала ўсяго 11,4% ад першапачаткова запланаванай Урадам БССР колькасці насельніцтва. Гэта паказала, з аднаго боку, неэфектыўнасць агітацыйна-прапагандысцкай працы ўпаўнаважаных СМ БССР па перасяленню. З другога - недавер беларусаў Беласточчыны да савецкага ладу жыцця, савецкай улады і нежаданне пакідаць сваю маёмасць і ўласнасць.

Праца па ўліку і перасяленню значна ўскладнялася з-за актыўнай дзейнасці польскага падполля, скіраванай на тое, каб прымусіць беларускае насельніцтва да выезду з Польшчы. Тэррор з боку падполля, які не перапыняўся на ўсім працягу перасялення, вымусіў беларускі ўрад настаяць на ўнесенні спецыяльнага артыкула ў дадатковы беларуска-польскі пратакол, абавязваючы Польскі Урад прыняць ўсе неабходныя захады па ахове як беларускага насельніцтва, так і ўпаўнаважаных СНК БССР. Аднак польскія ўлады не змаглі забяспечыць надзейную ахову насельніцтва і ўпаўнаважаных СМ БССР, што прывяло да чалавечых ахвяр і значных матэрыяльных страт з боку перасяленцаў.

З пачаткам перасялення вызначыліся сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя, міжнародныя, родасныя, канфесійныя

фактары, вымушаючыя беларусаў перасяляцца ў БССР. Усе яны дзейнічалі адначасова як паасобку, так і сукупна. Дамінуючымі неабходна лічыць грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя. Найбольшая колькасць беларусаў выехала з Беластоцкага, Бельскага, Саколкаўскага паветаў Беластоцкага ваяводства. Аднак гэтая тэндэнцыя адлюстроўвала рэчаіснасць, існаваўшую на Беласточчыне, менавіта ў гэтых паветах кампактна пражывала большасць беларусаў.

Характэрным для перасялення беларусаў з Беласточчыны з'яўляецца тое, што з кастрычніка 1944 г. па май 1945 г. зарэгістравалася і пераехала ў БССР абсалютная большасць ад усёй колькасці зарэгістраваных. У першую чаргу пераехалі былы савецка-партыйны, камсамольскі, прафсаюзны актыў, якому з-за пагрозаў падполля заставацца ў Польшчы стала немагчыма. Разам з ім у БССР пераехала бяднейшая частка аднаасобнага сялянства, якая не бачыла для сябе эканамічных перспектыў заставацца ў Польшчы.

Перасяленчая акцыя паказала эвалюцыю поглядаў ваяводскіх уладаў Беласточчыны ў адносінах да беларусаў-перасяленцаў. З другой паловы 1945 г. ваяводскія ўлады былі зацікаўленыя ў поспеху перасяленчай акцыі. У мэтах стварэння аднанацыянальнай дзяржавы ваяводскія ўлады Беласточчыны з другой паловы 1945 г. разглядаюць беларусаў як "непажаданы элемент", які павінен быў або пераехаць у БССР, або стаць "палякамі праваслаўнага веравызнання". Таму стаўленне да перасялення, ад нейтральнага ў пачатку перасялення, эвалюцыянуе ў бок ціску на беларусаў з тым, каб прымусіць іх выехаць у Беларусь.

З сярэдзіны 1945 г. стала відавочным, што большасць беларусаў, нягледзячы на актыўную агітацыйна-прапагандысцкую працу ўпаўнаважаных СМ БССР, ціск з боку уладаў, пагрозу з боку падполля, зрабіла свой выбар на карысць Польшчы. Для абсалютнай большасці беларусаў Беласточчыны галоўным з'яўлялася, на наш погляд, ***не дзе жыць, а як жыць.*** У гэтым сэнсе нават пракамуністычная, прамаскоўская Польшча прадаставіла беларусам лепшыя ўмовы простага чалавечага жыцця, чым савецкая Беларусь.

## Заключэнне

Перасяленне палякаў і яўрэяў з Беларусі ў Польшчу, а беларусаў з Польшчы ў БССР, якое адбывалася ў час першай перасяленчай хвалі (другая ажыццяўлялася ў 1956-1959 гг.), з'яўлялася інтэгральнай часткай агульнаеўрапейскіх перасяленняў людзей, якія былі абумоўлены зменамі межаў пасля Другой сусветнай вайны. Перасяленчую акцыю немагчыма разглядаць толькі як двухбаковыя беларуска-польскія стасункі, што мелі месца на заключным этапе Другой сусветнай вайны і пасля яе заканчэння. Вытокі гэтага працэсу сягаюць у 1939 г., у самы пачатак Другой сусветнай вайны, калі ў 1939 г. Заходняя Беларусь уз'ядналася з БССР. Для Беларусі, якая не з'яўлялася суб'ектам міжнародных адносін і не мела ніякіх дачыненняў да геапалітычных планаў і інтарэсаў Савецкага Саюза і Германіі, у верасні 1939 г. склалася спрыяльная сітуацыя для свайго нацыянальна-дзяржаўнага і нацыятворчага будаўніцтва. Землі і людзі, разарваныя Рыжскім мірным дагаворам 1921 г., аб'ядналіся у адно непарыўнае і непадзельнае цэлае.

Разам з тым Другая сусветная вайна, а потым распачатая Вялікая Айчынная вайна спрычыніліся да таго, што заходнія вобласці Беларусі і асабліва беларуска-польскае памежжа - рэгіён з умовамі жыцця людзей, якія складваліся стагоддзямі з іх поліканфесійнасцю, нацыянальнымі, роднаснымі сувязямі, структурай насельніцтва, культурай - стаў аб'ектам складаных геапалітычных інтарэсаў эканамічна і палітычна мацнейшых сусветных дзяржаў.

Беларусь не прысутнічала на сустрэчах і не ўдзельнічала ў перамовах, на якіх абмяркоўвалася будучыня яе заходняй тэрыторыі. Тым не менш яе нябачная прысутнасць заўсёды адчувалася, калі размова паміж саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі заходзіла аб пасляваеннай савецка-польскай мяжы. На завяршаючым этапе Другой сусветнай вайны, калі стала відавочнай перамога дзяржаваў антыгітлераўскай кааліцыі, разам з вострым пытанннем вызначэння савецка-польскай мяжы, заканамерна паўстала пытанне аб насельніцтве, якое пражывала на тэрыторыі, што ўвайшла ў склад СССР у 1939 г. Упершыню пытанне аб неабходнасці перасялення палякаў з тэрыторыі СССР у Польшчу (безумоўна, гэта закранала і тэрыторыю Заходняй

Беларусі) было ўзнята на перамовах кіраўнікоў Савецкага Саюза, ЗША і Англіі ў час Тэгеранскай канферэцыі. На наступных сустрэчах саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі ў Ялце, Маскве, Патсдаме яно канкрэтызавалася і ўдакладнялася. У рэшце рэшт саюзнікі канчаткова прыйшлі да рашэння ажыццявіць перасяленне палякаў, якія ў выніку Другой сусветнай вайны апынуліся на тэрыторыі СССР.

Для Беларусі, якой у 1944 г. было прадастаўлена права ажыццяўлення "самастойнай" знешнепалітычнай дзейнасці, гэта значыла неабходнасць перасялення палякаў і яўрэяў з тэрыторыі Заходняй Беларусі ў Польшчу, а беларусаў з Польшчы, галоўным чынам з Беласточчыны, у БССР. Неабходна ўсведамляць, што ініцыятыва ажыццяўлення перасяленчай акцыі ў першую чаргу зыходзіла ад Савецкага Саюза і новых уладаў Польшчы, а не ад кіраўніцтва Беларусі. Савецкі Саюз гэтай акцыяй рашаў некалькі важных унутрыпалітычных і знешнепалітычных задач стратэгічнага характара. Па-першае, перадачай часткі тэрыторыі Беларусі Польшчы і перасяленнем насельніцтва Крэмль яшчэ больш уцягваў у арбіту свайго ўплыву і рабіў залежным колішняе польскае кіраўніцтва. Па-другое, перасяленне магчыма разглядаць як "мяккую зачыстку" тэрыторыі Заходняй Беларусі ад ненадзейнага ў палітычным, сацыяльным, нацыянальным, канфесійным плане "элемента". Асновы для гэтага былі: варожасць палякаў, і часткі беларусаў, да савецкай улады, перавага каталіцкага насельніцтва. Актыўная дзейнасць польскага падполля – Арміі Краёвай вымушалі палітычнае кіраўніцтва СССР з падазрэннем і варожасцю адносіцца да насельніцтва заходняга рэгіёна Беларусі.

Польскі Камітэт Нацыянальнага Вызвалення, а потым Часовы ўрад нацыянальнага адзінства Польшчы таксама быў зацікаўлены ў ажыццяўленні перасяленчай акцыі. З аднаго боку, гэта было абумоўлена жаданнем параўтварэння Польшчы ў аднанацыянальную дзяржаву і мінімізацыі колькасці беларусаў як нацыянальнай меншасці. З другога, прыцягненнем у краіну па магчымасці большай колькасці людзей з-за надзвычай вялікіх людскіх страт, якія панесла Польшча ў час Другой сусветнай вайны.

Беларусі нічога не заставалася рабіць, як паслухмяна выконваць знешнепалітычныя планы Крамля. Беларусь, як суб'ект міжнародных адносін з вясны 1944 г., не дапускалася да ўдзелу ў перамовах, якія актыўна вяліся ў гэтым жа годзе паміж Крамлём, Польскім Камітэтам Нацыянальнага Вызвалення і польскім эміграцкім урадам, дзе ўшчыльную абмяркоўвалася пытанне аб

тэрыторыі Беларусі і ўмовах перасялення насельніцтва. Кіраўніцтва Беларусі не запрашалася і не прымала ўдзелу ў гэтых перамовах. Не запрашалася, нягледзячы на тое, што перасяленне наўпрост закранала лёсы соцень тысяч чалавек, якія з 1939 г. дэ-юрэ мелі грамадзянства БССР. Прынцыпова пытанні аб перадачы Беласточчыны Польшчы і ў сувязі з гэтым перасяленні насельніцтва вырашаліся ў Крамлі.

Беларуска-польскае пагадненне не з'яўлялася такім бездакорным і бясспрэчным, як падавалася раней у беларускім афіцыёзе, бо шмат якія яго артыкулы і палажэнні з'яўляліся прапагандысцкімі. Пагадненне вызначала, што "эвакуацыя" з'яўляецца добраахвотнай , а таму прымус не можа быць ужыты ні прама, ні ўскосна. Аднак аб добраахвотнасці цяжка казаць, бо перасяленне палякаў і яўрэяў ажыццяўлялася толькі з заходніх абласцей і толькі тых грамадзян, якія мелі польскае падданства да верасня 1939 г. і ў час перасялення жылі на тэрыторыі заходніх абласцей БССР. Гэта значыла, што палякі і яўрэі, якія пражывалі ў Мінскай, Гомельскай, Магілёўскай, усходняй частцы Віцебскай абласцей, не мелі права перасяляцца ў Польшчу. Не мелі права перасяляцца таксама татары і караімы, якія мелі польскае грамадзянства да верасня 1939 г. і таксама жылі ў заходніх абласцях у час перасяленчай акцыі. Як палажэнне аб "добраахвотнасці" суадносілася з жаданнем беларускага кіраўніцтва  ажыццявіць татальнае перасяленне ўсіх беларусаў Беласточчыны ў БССР ? Прапагандысцкім з'яўлялася дэкларыванае ў пагадненні палажэнне аб надзяленні перасяленцаў зямлёй у памеры 15 га Ва ўсходніх абласцях гэта было проста немагчымым, а ў заходніх пачынала набіраць тэмпы прымусовая калектывізацыя і тыя, хто пажадаў займацца сельскай гаспадаркай, атрымалі не 15 га бясплатнай зямлі, а калгасы ды саўгасы з іх прымусовай працай ды галечай.

У выніку перасяленчай акцыі сотні тысяч палякаў пажадалі змяніць  грамадзянства і выехаць на сталае месца жыхарства ў Польшчу. Агульная колькасць зарэгістраваных па ўсіх заходніх абласцях склала 535 284 чалавекі. У тым ліку: з Гродзенскай вобласці на выезд зарэгістравалася 192 859 чалавек, Маладзечанскай адпаведна – 101 241, Баранавіцкай – 99 955, Полацкай – 73 077, Брэсцкай – 46 311, Пінскай – 21 841. Разам з колькаснымі паказчыкамі вызначыўся сацыяльны, прафесійны, узроставы стан перасяленцаў. Большасць з іх склала аднаасобнае сялянства, якое з-за сацыялістычных пераўтварэнняў у сельскай гаспадарцы, якія пачалі набіраць тэмпы, а таксама непамерных

падаткаў, штогадовых дзяржаўных пазыкаў, рэгулярных прымусовых аргнабораў на працу па-за межы рэспублікі такім чынам выказала недавер савецкай уладзе і яе палітыцы ў адносінах да сялянства. Нягнуткая, дыскрымінацыйная палітыка бальшавіцкай улады ў адносінах да палякаў як нацыянальнай меншасці – прымусовае закрыццё польскамоўных школ, культурна-асветніцкіх устаноў, касцёлаў, рэлігійны праслед не маглі задаволіць інтэлігенцыю, рабочых, саматужнікаў і іншыя групы польскага насельніцтва, якія таксама пажадалі выехаць у Польшчу.

У час перасялення з відавочнасцю выявілася сукупнасць фактараў, якія вымушалі палякаў выязджаць у Польшчу. Галоўнымі з'яўляліся наступныя: сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя, канфесійныя, этнічныя, роднасныя ды іншыя, якія дзейнічалі як паасобку, так і сукупна. Аднак дамінуючымі неабходна прызнаць сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя.

Жорсткі адміністрацыйны кантроль за ходам перасялення, распачаты з вясны 1945 г., шырокамаштабная агітацыйна-прапагандысцкая кампанія, аслабленне ўздзеяння польскага падполля, устанаўленне ў Польшчы пракамуністычнага, падобнага на існаваўшы ў Савецкім Саюзе рэжыму, добраахвотнае адмаўленне ад перасялення прывялі да таго, што ў Польшчу пераехала меншая колькасць ад ліку ўсіх зарэгістраваных. Агульная колькасць ад'ехаўшых склала 231 152 чалавекі. У тым ліку з Гродзенскай вобласці выехала 67 118 чалавек, Баранавіцкай адпаведна – 49 778, Маладзечанскай – 42 525, Брэсцкай – 33 064, Полацкай – 22 797, Пінскай – 15 870. У сувязі з прадоўжаннем перасялення, галоўным чынам для ваеннаслужачых Войска Польскага і іх родных да 31 снежня 1946 г., дадаткова зарэгістравалася і пераехала ў Польшчу яшчэ 7630 палякаў. Такім чынам, агульная колькасць выехаўшых з кастрычніка 1944 г. па снежань 1946 г. склала 238 782 чалавекі, ці 45,05%. Пад уздзеяннем розных фактараў адмовілася ад перасялення 265 088, ці 49, 52% грамадзян. 39 044, ці 7,29% было адмоўлена ў выездзе з-за таго, што іх палічылі беларусамі-каталікамі, якія не мелі права на перасяленне.

Колькасныя паказчыкі сведчаць, што перасяленне палякаў з заходніх абласцей БССР у Польшчу ў гісторыі Беларусі з'явілася адной з самых масавых хваль беззваротнай міграцыі насельніцтва ў мірны час. Каля 240 тысяч чалавек добраахвотна прынялі рашэнне аб змяненні грамадзянства і пераездзе ў Польшчу.

Перасяленню беларусаў з Беласточчыны былі ўласцівы свае асаблівасці. Складанасці вызначэння ўсходняй мяжы Польшчы, унутрыпалітычная барацьба двух лагераў, прадстаўленых польскімі камуністамі і польскім эмігранцкім урадам за ўладу ў краіне, дзейнасць польскага падполля, жаданне палітычнага кіраўніцтва Беларусі татальнага перасялення беларусаў, уплывалі на перасяленчую акцыю. Пачатак перасялення вызначыў сукупнасць сацыяльна-эканамічных, грамадска-палітычных, роднасных, канфесійных фактараў, якія вымушалі беларусаў выязджаць у БССР ці заставацца ў Польшчы. Усе яны дзейнічалі як паасобку, так і сукупна. Дамінуючымі, у адрозненне ад перасялення палякаў з БССР, неабходна лічыць грамадска-палітычныя.

Польскія камуністы, якія прыйшлі да ўлады, былі зацікаўленыя ў поспеху "рэпатрыяцыйнай акцыі" з-за жадання пераўтварэння Польшчы ў аднанацыянальную дзяржаву. Не менш істотнай прычынай, якая вымушала беларусаў выязджаць у БССР, з'яўлялася дзейнасць польскага падполля на Беласточчыне. Кіраўніцтва Беларусі таксама было зацікаўлена ў поспеху гэтай акцыі. Упаўнаважаныя СНК БССР па перасяленню, шматлікі атрад партыйна-савецкіх работнікаў, камандзіраваных на дапамогу ўпаўнаважаным, палітработнікі Першага і Другога Беларускіх франтоў прыкладалі энергічныя намаганні, каб усе беларусы выехалі ў БССР. Як вынікае з гэтага, польскія камуністы і іх беларускія "калегі", нягледзячы на розныя мэты, задачы, праявілі аднадушша ў жаданні перасялення беларусаў з Беласточчыны ў БССР. Аднак з сярэдзіны 1945 г. стала відавочна, што большасць беларусаў праігнаравала перасяленчую акцыю і адмовілася пераязджаць ў савецкую Беларусь.

Важнейшымі прычынамі, якія ўтрымлівалі беларусаў ад перасялення, з'яўляліся наступныя: непрынятце савецкай улады, савецкага ладу жыцця, "прывязанасць" да сваёй уласнасці і маёмасці, роднасныя сувязі, адмоўнае стаўленне праваслаўнай царквы да перасяленчай акцыі і іншыя. У Беларусь пераехала галоўным чынам бяднейшае сялянства, якое не бачыла для сябе перспектыў заставацца ў Польшчы, партыйна-савецкі, прафсаюзны, камсамольскі актыў, актыўныя ўдзельнікі сацыялістычных пераўтварэнняў на Беласточчыне ў 1939-1941 гг., супраць якіх у першую чаргу былі скіраваны "пацыфікацыйныя" акцыі падполля. "Рэпатрыяцыйнай акцыяй" скарысталася ўсяго 8220 гаспадарак, агульнай колькасцю 27 808 чалавек. Гэта значыла, што перасяленне палякаў з заходніх абласцей Беларусі ў Польшчу значна перавысіла колькасць беларусаў, якія перасяліліся

ў БССР з Польшчы і ні “якасна”, ні колькасна не кампенсавала людскія страты Беларусі.

І апошняе. Напэўна, самым цяжкім і складаным пытаннем, на якое няма адназначнага адказу, з’яўляецца пытанне, што прынесла Беларусі перасяленчая акцыя. Ці мае рацыю М.Волаціч, сцвярджаючы, што перасяленне “было абсалютна непатрэбнаю акцыяй, якая, апрача шкоды для беларускага народа, нічога не прынесла”. Гэтую выснову магчыма падзяліць на дзве часткі. Для простага беларуса і паляка – сяляніна, рамесніка, саматужніка, рабочага, настаўніка, урача, якія спрадвеку пражывалі ў заходнім рэгіёне Беларусі, перасяленчая акцыя, выкажам асабістае меркаванне, на самай справе нічога не прынесла. Перасяленне разарвала трывалыя і ўстойлівыя роднасныя, сяброўскія, суседскія сувязі, парушыла векавы лад жыцця, значна змяніла традыцыйную структуру насельніцтва (напрыклад, у Гродзенскай вобласці на правабярэжжы колькасць палякаў скарацілася на 25-30%, а на левабярэжжы – на 15-20%), раз’яднала сем’і, родзічаў, суседзяў, знаёмых. Для соцень тысяч людзей гэта была асабістая трагедыя.

Аднак Маскву, Варшаву і Мінск менш за ўсё цікавілі турботы, перажыванні і клопаты “простага чалавека”. Выкананне палітычнага рашэння, прынятага ў Маскве і Варшаве (Мінск меў мінімальнае дачыненне да яго прыняцця), з’ўлялася галоўным, нягледзячы ні на якія цяжкасці і ахвяры. Адсюль вынікае, што колішняе кіраўніцтва Савецкага Саюза і Беларусі, з аднаго боку, і кіраўніцтва Польшчы з другога, нясуць усю адказнасць за перасяленчую акцыю, якая паўплывала на лёсы соцень тысяч людзей. Зараз, калі незалежная Беларусь і дэмакратычная Польшча будуюць міждзяржаўныя адносіны на прынцыпова новай аснове, ёсць патрэба і неабходнасць аб’ектыўна і непрадузята прааналізаваць прычыны, ход, вынікі перасялення для абодвух народаў і дзяржаў. Аўтар спадзяецца, што яго праца, нягледзячы на спрэчнасць многіх высноў і палажэнняў, будзе спрыяць далейшаму ўмацаванню сяброўства, узаемаразумення, павагі і даверу паміж беларускім і польскім народамі.

## Спіс скарачэнняў.

| | |
|---|---|
| АК КП(б)Б | абласны камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі |
| АК | Армія Краёва |
| БССР | Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка |
| ВС | Вярхоўны Савет |
| УсеКП(б) | Усесаюзная Камуністычная партыя (бальшавікоў) |
| ГК КПБ(б)Б | гарадскі камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі |
| КП(б)Б | Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі |
| КПЗБ | Камуністычная партыя Заходняй Беларусі |
| КПП | кантрольна-прапускны пункт |
| КРН | Краёва Рада Нарадова |
| ЛітССР | Літоўская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка |
| НКУС | Народны камісарыят унутраных спраў |
| НКДБ | Народны камісарыят дзяржаўнай бяспекі |
| НКШЗ | Народны камісарыят шляхоў зносін |
| НКЗС | Народны камісарыят замежных спраў |
| ПКНВ | Польскі Камітэт Нацыянальнага Вызвалення |
| ППР | Польская рабочая партыя |
| ППС | Польская сацыялістычная партыя |
| РК КП(б)Б | раённы камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі |
| РА НКУС | раённы аддзел НКУС |
| РА НКДБ | раённы аддзел НКДБ |
| СНК | Савет Народных Камісараў |
| СПП | Саюз Польскіх Патрыётаў |
| с/с | сельскі савет |
| СССР | Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік |
| УНКДБ | упраўленне НКДБ |
| УССР | Украінская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка |
| ЦК КП(б)Б | Цэнтральны камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі |

## Біяграфічныя звесткі

**Варвашэня Іван Дзянісавіч** (31.12.1904-4.03.1957). Нарадзіўся ў в. Быстрыца Капыльскага раёна Мінскай вобл. Член КПСС з 1927 г. Скончыў Маскоўскі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту (1934). З 1925 г. на камсамольскай працы: у 1927-1928 загадчык агітпропа Слуцкага ГК ЛКСМБ, у 1934-1938 намеснік начальніка 8-й дыстанцыі шляха і збудаванняў станцыі Мінск, потым начальнік 5-й жыллёва-будаўнічай канторы Заходняй чыгуначнай дарогі. У 1938-1940 загадчык транспартнага аддзела, у 1941 і ў 1944-1950 сакратар Мінскага абкама КП(б)Б. З чэрвеня 1941 па май 1943 2-гі сакратар Мінскага падпольнага абкама КП(б)Б, адначасова ў жніўні 1942-красавіку 1943 сакратар Слуцкага падпольнага міжрайкома КП(б)Б і камісар партызанскага злучэння Слуцкай зоны. У ліпені 1943 – чэрвені 1944 намеснік загадчыка аддзелам кадраў ЦК КП(б)Б. У 1944-1945 Галоўны ўпаўнаважаны СНК БССР у Польшчы па эвакуацыі беларускага, украінскага, рускага насельніцтва ў СССР. У 1950-19957 1-ы сакратар Мінскага гаркама КП(б)Б. Кандыдат у члены ЦК КП(б)Б (1949-1952). Член ЦК КП(б)Б (1952-1956) Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1947-1957).

**Васілеўская Ванда Львоўна** (21.01.1905-29.07.1964). Нарадзілася ў г.Кракаў (Польшча). Член КПСС з 1941. Трыжды лаўрэат Сталінскай прэміі (1943, 1946, 1952). Скончыла Ягелонскі ўніверсітэт (1927). У 1934-37 у складзе Галоўнага Савета Польскай сацыялістычнай партыі; удзельначала ў дзейнасці Лігі абароны правоў чалавека і грамадзяніна. Адзін з арганізатараў антыфашысцкага Кангрэса дзеячаў культуры ў 1936 у Львове. У 1939 пераехала ў Львоў, які быў далучаны да Украіны і прыняла савецкае грамадзянства. Заснавала і ўзначальвала ў 1943-1946 Саюз Польскіх патрыётаў; намеснік старшыні Польскага камітэта нацыянальнага вызвалення (1944). У гады Вялікай Айчыннай вайны ў званні палкавога камісара (потым палкоўніка) агітатар Галоўнага палітычнага ўпраўлення РСЧА на Паўднёва-Заходнім фронце, выязджала на Сталінградскі і Цэнтральны франты (1942-1943), рэдагавала газету «За Радяньску Украіну». У 1943-1945 галоўны рэдактар газеты «Свабодная Польшча». Член Усесветнага Савета Міра. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1940-1964). Жонка пісьменніка А.Карнейчука.

**Гарбуноў Цімафей Сазонавіч** (6.08.1904-8.10.1969). Нарадзіўся ў в.Саннікі Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобл. Член КПСС з

1926. Акадэмік АН БССР (1959). Скончыў Беларускі дзяржуніверсітэт (1936), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК ВКП(б) (1948). З 1919 работаў на лесазаводзе, ільнопрадзільнай фабрыцы «Дзвіна» у г. Віцебску. Потым знаходзіўся на культурна-асветнай, журналісцкай, камсамольскай рабоце. У 1933-1937 карэспандэнт газеты «Правда» у Мінску, Яраслаўле, Адэсе, у 1937-1939 галоўны рэдактар Дзяржаўнага выдавецтва БССР, у 1939-1941 рэдактар газеты «Звязда». У 1941-1947 і 1950-1960 сакратар ЦК КП(б)Б. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся на палітычнай рабоце ў Чырвонай Арміі, удзельнічаў у арганізацыі партызанскага руху. У 1942-1945 член Прэзідыума Усеславянскага камітэта і рэдактар часопіса «Славяне», адначасова ў 1942-1946 узначальваў камісію па гісторыі Айчыннай вайны пры ЦК КП(б)Б. У 1949-1950 намеснік старшыні Усесаюзнага таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў, рэдактар часопіса «Наука и жизнь». У 1960-1967 акадэмік-сакратар Аддзялення грамадскіх навук АН БССР. Аўтар прац па гісторыі Беларусі. Член ЦК КПБ (1941-1966). Член бюро ЦК КПБ (1945-1947, 1950-1960). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1946-1962). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1947-1967). У 1955-1963 старшыня Вярхоўнага Савета БССР.

**Закурдаеў Васіль Іванавіч** (25.12.1902-24.08.1974). Нарадзіўся ў г. Санкт-Пецербург. Член КПСС з 1927. Скончыў інстытут народнай гаспадаркі (1926). У 1920-1922 служыў у Чырвонай Арміі. У 1926-1930 на кіруючай кааператыўнай рабоце, у 1932-1934 начальнік аддзела сельскагаспадарчай літаратуры Галоўліта РСФС. У 1934-1935 начальнік палітадддела Міласлаўскай МТС. З мая па кастрычнік 1935 2-гі сакратар Міласлаўскага райкама УКП(б), у 1935-1937 інструктар аддзела арганізацыйна-партыйнай працы Маскоўскага абкама УКП(б), у 1937-1938 загадчык аддзела пячаці Разанскага абкама УКП(б), у 1938-1940 сакратар Разанскага гаркама УКП(б). З красавіка па лістапад 1940 загадчык аргінструктарскага аддзела Пінскага абкама КП(б)Б, у 1940-1942 намеснік загадчыка, у 1942-1946 загадчык аргінструктарскім аддзелам ЦК КП(б)Б, адначасова з чэрвеня 1942 па лістапад 1943 намеснік начальніка Беларускага штаба партызанскага руху. У 1946-1949 1-ы сакратар Баранавіцкага абкама і гаркама КП(б)Б, у 1949-1950 сакратар ЦК КП(б)Б, у 1951-1958 1-ы сакратар Мардоўскага абкама КПСС, у 1959-1961 старшыня Камісіі савецкага кантролю пры Савеце Міністраў РСФСР. Член Цэнтральнай Рэвізійнай камісіі пры ЦК КПСС (1952-1956),

кандыдат у члены ЦК КПСС (1956-1960). Член ЦК КПБ (1949-1950). Член бюро ЦК КПБ (1949-1950). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1949-1958). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1947-1951).

**Калінін Пётр Захаравіч** (25.011902-12.12.1966). Нарадзіўся на хутары Альховікі Шумілінскага раёна Віцебскай вобл. Член КПСС з 1928. Генерал-маёр (1943). Скончыў рэспубліканскую школу прапагандыстаў пры ЦК КП(б)Б (1937), Вышэйшую школу партарганізатараў пры ЦК УКП(б) (1941). З 1926 на савецкай і партыйнай рабоце. У 1938 загадчык сельскага аддзела ЦК КП(б)Б, у 1939 намеснік наркама земляробства БССР, у 1939-1940 1-ы сакратар Вілейскага абкама КП(б)Б, у 1941-1944 2-гі сакратар ЦК КП(б)Б, член Ваеннага савета 21-й арміі, намеснік начальніка штаба партызанскага руху пры Ваенным савеце Заходняга фронта, у 1942-1944 начальнік Беларускага штаба партызанскага руху. У 1944-1947 1-ы сакратар Гродзенскага абкама КП(б)Б, у 1948-1951 намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР, у 1951-1953 і 1953-1957 міністр саўгасаў БССР, у 1953 міністр дарожнай і транспартнай гаспадаркі БССР, у 1957-1958 міністр хлебапрадуктаў БССР. З 1959 саветнік Савета Міністраў БССР. Член ЦК КПБ (1940-1959, 1956-1960). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1946-1958). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1938-1955, 1959-1963). Аўтар кнігі “Партызанская рэспубліка (3-е выданне, Мн.. 1973).

**Кісялёў Кузьма Венедзіктавіч** (1.11.1903-4.05.1977). Нарадзіўся ў в.Лабкавічы Крычаўскага раёна Магілёўскай вобл. Член КПСС з 1925. Кандыдат медыцынскіх навук (1936). Скончыў Варонежскі дзяржуніверсітэт (1928). У 1928-1930 ардынатар нервовай клінікі Варонежскага ўніверсітэта, у 1932-1937 навуковы супрацоўнік Ўсесаюзнага інстытута эксперыментальнай медыцыны, з лістапада 1937 па чэрвень 1938 наркам аховы здароўя БССР. У 1938-1940 Старшыня СНК БССР. З 1940 намеснік дырэктара інстытута эксперыментальнай медыцыны, дырэктар Дзяржаўнага медыцынскага выдавецтва ў Маскве, старшыня Ульянаўскага аблвыканкама. З снежня 1943 1-ы намеснік, у 1944-1958 намеснік Старшыні СНК (з 1946 Савета Міністраў БССР), адначасова з 1944 наркам, у 1946-1966 міністр замежных спраў БССР. Член Цэнтральнай рэвізійнай камісіі УКП(б) (1939-1941). Член ЦК КПБ (1938-1966). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1937-1958). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1938-1967). Меў ранг

Надзвычайнага і паўнамоцнага пасла. Аўтар кнігі "Записки советского дипломата» М.,1974).

**Клімаў Іван Фролавіч** (10.09.1903-9.10.1991). Нарадзіўся ў в. Касцюкоўка Гомельскага раёна Гомельскай вобл. Член КПСС з 1925. Заслужаны работнік культуры БССР (1980). Скончыў ВПШ пры ЦК УКП(б) (1949). З 1923 знаходзіўся на прафсаюзнай, камсамольскай і партыйнай рабоце. У 1931-1934 інструктар, загадчык сектарам аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б, з 1936 выкладчык, загадчык вучэбнай часткай, дырэктар Рэспубліканскай школы прапагандыстаў, партыйных курсаў пры ЦК КП(б)Б. У 1940-1941 1-ы сакратар Вілейскага абкама КП(б)Б. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнік абарончых баёў на Магілёўшчыне. З лістапада 1941 па май 1942 сакратар Ташкенцкага абкама КП(б) Узбекістана. У чэрвені – ліпені 1942 сакратар Мінскага, у снежні 1942 – красавіку 1943 Вілейскага абкамаў КП(б)Б (у савецкім тыле), з мая 1943 па чэрвень 1941 сакратар Вілейскага падпольнага абкама КП(б)Б. З 1944 1-ы сакратар Вілейскага, Маладзечанскага, з 1952 – Баранавіцкага абкамаў КПБ, з верасня 1953 1-ы намеснік, з 1962 намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР. У 1968-1974 намеснік Старшыні Прэзідыўма Вярхоўнага Савета БССР. З 1974 навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, адначасова ў 1980-1986 старшыня Камсіі па справах былых партызан і падпольшчыкаў пры Прэзідыўме Вярхоўнага Савета БССР. Член ЦК КПБ (1949-1976). Член бюро ЦК КПБ (1953-1966). Член Рэвізійнай камісіі КПБ (1976-1986). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1954-1966). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1947-1975, 1980-1985). Аўтар кніг: "Партизаны Вилейщины" (2-е изд., Мн., 1970, с Н.Е.Граковым); "Далёкое и близкое"(Мн., 1987).

**Круглік Іван Сцефанавіч**. Нарадзіўся ў студзені 1902 у в. Смалянцы Чашніцкага раёна Віцебскай вобл. Член КПСС з 1926. У 1920-1923 слесар паравознага дэпо станцыі Віцебск, у 1923-1927 слесар механічнай майстэрні Чашніцкай папяровай фабрыкі "Чырвоная зорка". З 1927 на прафсаюзнай і партыйнай рабоце. У 1940-1941 начальнік палітаддзела Полацкага аддзелення чыгуначнай дарогі (г.Масква)., у 1942-1943 інструктар палітупраўлення Наркамата шляхоў зносін СССР, у 1943-1947 інструктар, у 1947-1953 намеснік загадчыка транспартнага аддзела ЦК КП(б)Б, у 1944-1946 Галоўны ўпаўнаважаны СНК БССР па перасяленню беларускага, рускага, украінскага насельніцтва з

Польшчы ў БССР. У 1953-1954 намеснік начальніка палітаддзела будупраўлення № 101 Міністэрства транспартнага будаўніцтва, з 1954 намеснік начальніка палітаддзела Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі.

**Маркаў Фёдар Рыгоравіч** (24.12.1913-14.01.1958). Герой Савецкага Саюза. (1.01.1944). Нарадзіўся ў в.Качанішкі Швенчонскага раёна Літвы. Член КАСС з 1934. Удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. У 1935-1939 знаходзіўся ў зняволенні ў канцлагеры Картуз-Бяроза, потым Віленскай турме. У 1939-1941 старшыня Свенцянскага райсавета, намеснік старшыні Вілейскага аблвыканкама. У партызанах з 1941: камандзір спецгрупы, з мая 1942 атрада імя А.В.Суворава, з лістапада 1942 партызанскай брыгады імя К.Е.Варашылава, адначасова з красавіка 1943 начальнік ваенна-аператыўнага аддзела Вілейскага падпольнага абкама КП(б)Б. З 1944 працаваў намеснікам старшыні Вілейскага, Маладзечанскага абвыканкамаў. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР з 1940.

**Наталевіч Нікіфар Якаўлевіч** (4(17.05.1900-28.03.1964). Нарадзіўся ў г. Орша. Член КПСС з 1922. Скончыў Ваенна-палітычную акадэмію імя Талмачова ў Ленінградзе (1934). У 1919-1937 служыў у Чырвонай Арміі. З лістапада 1937 па чэрвень 1938 выконваючы абавязкі Старшыні ЦВК БССР. У 1938-1947 Старшыня Прэзідыўма Вярхоўнага Савета БССР і намеснік Старшыні Прэзідыўма Вярхоўнага Савета СССР. У 1948-1956 на адказных пасадах у Пензенскай вобласці. У 1956-1960 на гаспадарчых работах у Мінску, Баранавічах, Брэсце. Член ЦК КП(б)Б (1937-1947). Член бюро ЦК КП(б)Б (1938-1947). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (19371950). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1938-1951).

**Панамарэнка Панцелеймон Кандратавіч** (27.07.(9.08).1902-18.01.1984). Нарадзіўся на хутары Шалкоўскі Беларэчанскага раёна Краснадарскага края. Член КПСС з 1925. Генерал-лейтэнант (1943). Скончыў Маскоўскі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту (1932). У 1918, 1932-1936 служыў у Чырвонай Арміі. З 1919 на нафтапромыслах і чыгуначным транспарце. З 1922 на камсамольскай рабоце. З 1936 на інжынернай рабоце. З 1937 у апараце ЦК УКП(б): інструктар, намеснік загадчыка аддзелам кіруючых партыйных органаў ЦК УКП(б). У 1938-1947 1-ы сакратар ЦК КП(б)Б, адначасова ў 1942-1944 начальнік

Цэнтральнага штаба партызанскага руху пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання, член Ваеннага савета Заходняга, Цэнтральнага, Бранскага і 1-га Беларускага франтоў. У 1944-1947 Старшыня СНК (з 1946 Савета Міністраў) БССР. У 1948-1953 сакратар ЦК УКП(б), адначасова ў 1950-1953 міністр нарыхтовак СССР. У 1953-1954 міністр культуры СССР, у 1954-1955 1-ы сакратар ЦК КП Казахстана. У 1955-1965 на дыпламатычнай рабоце (у 1955-1957 пасол СССР у Польшчы, у 1957-1958 у Індыі і Непале, у 1959-1961 у Нідэрландах), у 1961-1962 прадстаўнік СССР у МАГАТЭ, у 1965-1978 на выкладчыцкай працы ў Інстытуце грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Член ЦК КПСС (1939-1961). Член Прэзідыўма ЦК КПСС (1952-1953)., Кандыдат у члены Прэзідыўма ЦК КПСС (1953-1956). Член ЦК КП(б)Б (1938-1949). Член бюро ЦК КП(б)Б (1938-1948). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1940-1958). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1938-1951). Меў ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла. Аўтар кніг: «Партизанское движение в Великой Отечественной войне» М.,1943); «Всенародная борьба в тылу немецко-фашистских захватчиков. 1941-1944». (М.,1986) и др.

**Ратайка Пётр Іванавіч** (13.01.1898-16.06.1082). Нарадзіўся ў в. Пескі Кобрынскага раёна Брэсцкай вобл. Член КПСС з 1920. У 1930 скончыў Камуністычны ўніверсітэт Беларусі, у 1958 Цэнтральны завочны інстытут рыбнай прамысловасці. У 1915-1916 працаваў рамонтным рабочым Арэнбургскай чыгункі. У 1916-1917 служыў у царскай арміі, у 1917-1922 у Чырвонай арміі. З 1922 працавааў намесніка старшыні і старшынёй шэрагу рай- і аблвыканкамаў БССР. У 1941-1943 камісар 5-га запаснога палка, старшы інструктар палітаддзела, начальнік інтэнданцкага аддзела 3-й арміі на Бранскім і 2-м Прыбалтыйскіх франтах. У 1943-1944 намеснік Старшыні СНК БССР, начальнік Упраўлення па дзяржаўнаму забяспячэнню і бытавому ўладкаванню сямей военнаслужачых і партызан, у 1944-1948 старшыня Беластоцкага, Гродзенскага аблвыканкамаў. У 1948-1953 начальнік Галоўнага упраўлення рыбнай прамысловасці пры СМ БССР, у 1953-1957 намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення па перасяленню і арганізаванаму набору рабочых пры СМ БССР, у 1959-1973 начальнік Беларускага басейнавага ўпраўлення па ахове і аднаўленню рыбных запасаў (Белрыбвод). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1947-1959).

**Самуцін Васіль Емельянавіч** (15(28).6.1906-13.8.1981). Нарадзіўся в.Воўчы Перавоз Уладзімір-Валынскага пав. Валынскай вобл. Заслуж. дзеяч. Культуры БССР (1967). Скончыў курсы перападрыхтоўкі парт., сав., і газетных работнікаў ВПШ пры ЦК КПСС (1952). З 1927 сакратар Парыцкага, Глускага райкомаў ЛКСМБ, з 1930 рэдактар газ. "Чырвоная змена", "Звязда", "Камунар Магілёўшчыны", з 1934 на падпольнай рабоце ў Зах. Беларусі – сакратар Беластоцкага, акруговага камітэта КПЗБ. У лютым 1935 арыштаваны і зняволены польскімі ўладамі, з 1939 на журналісцкай рабоце. З чэрвеня 1941 на фронце. З 7.6.1942 рэдактар падпольнай газеты "Віцебскі рабочы", з 27.7.43 1-ы сакратар Беластоцкага падпольнага абкама КП(б)Б, кіраўнік Беластоцкага партызанскага злучэння. З жніўня 1944 рэдактар газет "Звязда", "Савецкая Беларусія". З 1946 2-і, 1-ы сакратар Баранавіцкага абкома КП(б)Б, з 1950 намеснік міністра лясной гаспадаркі БССР, у 1953-1966 галоўны рэдактар часопіса " Сельское хозяйство Белоруссии». Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1947-1951.

**Цанава (Джанджгава) Лаўрэнцій Фаміч** (10.08.1900-12.10.1955). Член КПСС з 1920. Генерал-лейтэнант (1945). Нарадзіўся ў в. Хут-Сапелі Гегечкорскага раёна Грузіі. У 1923-1933 начальнік асобага аддзела 1-й Грузінскай стралковай дывізіі, начальнік Чыантурскага гарадского аддзела ГПУ, памочнік начальніка ГПУ Грузінскай ССР, у 1933-1934 намеснік старшыні "Лімантрэста" Наркамзема СССР, у 1934-1935 намеснік начальніка "Галоўсубтропкома" Наркамзема СССР. У 1935-1937 сакратар Поцііскага райкама КП(б) Грузіі. У 1937-1938 1-ы намеснік наркама земляробства, начальнік "Калхідбудстроя" Грузінскай ССР. З 19 снежня 1938 па 9 сакавіка 1941 наркам унутранных спраў БССР. У 1941-1943 начальнік асобага аддзела НКУС Заходняга фронта, намеснік начальніка ўпраўлення асобых аддзелаў НКУС СССР, начальнік асобага аддзела Цэнтральнага фронта, намеснік камандуючага войскамі 2-га Беларускага фронта. У 1941 і 1943-1951 наркам (з 1946 міністр) дзяржбяспекі БССР. У 1951-1952 намеснік міністра дзяржбяспекі СССР. 4 красавіка 1953 арыштаваны, памер у зняволенні 12 верасня 1953. Член Цэнтральнай рэвізійнай камісіі УКП(б) (1939-1952). Член ЦК КП(б)Б (1940-1952). Член бюро ЦК КП(б)Б (1940-1951). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР 1937-1953). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1940-1953).

**Эльман Андрэй Пятровіч** (15.11.1903-20.12.1995). Нарадзіўся ў г. Елабуга Татарскай АССР. Член КПСС з 1919. Скончыў інстытут Чырвонай прафесуры (1937). У 1923-1924 сакратар ячэйкі КП(б)Б Віцебскай абутковай фабрыкі. У 1924-1925 сакратар Высачанскага, у 1925-1926 Езерышчанскага райкамаў КП(б)Б Віцебскай вобл. У 1928-1929 загадчык арганізацыйнага аддзела Віцебскага спажывецкага саюза. У 1929 загадчык агітацыйна-прапагандысцкага аддзела 2-га райкама КП(б)Б г. Віцебска, у 1929-1931 сакратар Віцебскага, у 1932-1933 Гарадоцкага, у 1933-1934 Камарынскага райкамаў КП(б)Б. У 1931 памочнік загадчыка агітацыйна-масавага аддзела ЦК КП(б)Б, у 1931-1932 загадчык культурна прапагандысцкага аддзела Бабруйскага райкама КП(б)Б. У 1937-1939 дырэктар Гомельскага педінстытута. У 1939-1940 2-гі сакратар Гомельскага гаркама КП(б)Б, у 1940-1941 сакратар Гомельскага, у 1941 Беластоцкага абкамаў КП(б)Б. У 1941-1944 2-гі сакратар Беластоцкага, у 1944-1947 Гродзенскага абкамаў КП(б)Б. У 1947-1948 намеснік Старшыні СНК БССР. У 1948-1952 намеснік старшыні Палескага аблвыканкама. У 1952-1968 дырэктар, рэктар Мозырскага педінстытута. Член ЦК КП(б)Б (1940-1949).

**Царук Уладзімір Зянонавіч** (8(20).12.1899-27.1.1957). Нарадзіўся ў в. Вялікае Вобрына Навагрудскага павета. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Баранавіцкай вобл. у Вялікую Айчынную вайну. Герой Савецкага Саюза (1944). У 1917 сакратар рэўкома, удзельнік грамадзянскай вайны 1918-1920. З 1920 на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі, з 1924 сакратар Мірскага падпольнага райкома КПЗБ, у 1926-1939 польскімі ўладамі зняволены ў турму. У Вялікую Айчынную вайну сакратар Стаўбцоўскага міжраённага падпольнага камітэта КП(б)Б і БШПР па Мірскім і Стаўбцоўскім раёнах, з 8.7.1943 член Баранавіцкага падпольнага абкома КП(б)Б, з 2.10 да 19.12 1943 кіраўнік Стаўбцоўскага падпольнага міжрайпартцэнтра, з кастрычніка 1943 сакратар, 1-ы сакратар Стаўбцоўскага падпольнага райкома КП(б)Б, камандзір Стаўбцоўскага партызанскага злучэння. Пасля вайны сакратар Стаўбцоўскага райкома КП(б)Б, намеснік старшыні Баранавіцкага аблвыканкама, старшыня Баранавіцкага райвыканкама. У 1944-1946 Галоўны прадстаўнік СНК БССР па перасяленню польскага насельніцтва з заходніх абласцей БССР у Польшчу. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1940-1947, 1955). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1946-1954).

## Літаратура і крыніцы


1. Аб набыцці савецкага грамадзянства асобамі, якія перасяляюцца ў БССР з Польшчы: Пастанова Прэзідыума ВС БССР // Звязда. - 1945. - 12 лютага. - С. 1.
2. Архіў Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь (МЗС РБ), ф.907. воп.2, спр. 23.
3. Там сама, ф.907, воп.2, спр. 400.
4. Там сама, ф.907. воп.7, спр. 112.
5. Белорусская ССР в международных отношениях: Междунар. договора, конвенции и соглашения Белорусской ССР с иностр. государствами (1944-1959). / Сост. С.П.Моргунский, А.С.Зайцев. - Минск: Изд-во АН БССР, 1960. - 1052 с.
6. Белорусская ССР на международнай арене / Под ред. К.К.Киселёва. - М.: Междунар. отношения, 1964. - 336 с.
7. Белорусские остарбайтеры: В 3 кн. / Сост.: Г.Д.Кнатько, А.И.Адамушко и др.; Редкол. В.И.Адамушко и др. - Минск: Нац. арх. Респ. Беларусь, 1998, Кн.3. Ч.1: Репатриация, 1944-1951 гг. - 367 с.
8. Белорусские остарбайтеры: В 3 кн. / Сост.: Г.Д.Кнатько, А.И.Адамушко и др.; Редкол. В.И.Адамушко и др. - Минск: Нац. арх. Респ. Беларусь, 1998, Кн.3. Ч.2: Репатриация, 1944-1951. - 677 с.
9. Белорусские остарбайтеры: ист.-аналит. исслед. / Г.Д.Кнатько, В.И.Адамушко, Н.А.Бондаренко, В.Д.Селеменев; Под. ред. Г.Д.Кнатько. - Минск: Нац. арх. Респ. Беларусь, 2001.- 336 с.
10. Бережков В. Страницы дипломатической истории. - М.: Междунар. отношения, 1984. - 616 с.
11. Бодак А. Урегулирование пограничных вопросов между Польшей и Белоруссией в первое послевоенное десятилетие // Granice i pogranicza. - Bialystok. - 1999. - T.1. - S. 255-261.
12. Бодак А.Ю Национальная политика в БССР. (1943-1955 гг.): Дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02. - Минск, 1996. - 162 с.
13. Внешняя политика Советского Союза. Документы и материалы, 4 сентября - 31 декабря 1945. - М.: Госполитиздат, 1949. - 202 с.
14. Внешняя политика Советского Союза. Документы и материалы, январь - декабрь 1946. - М.: Госполитиздат, 1952. - 136 с.

15. Волаціч М. Насельніцтва Заходняй Беларусі і яго перасяленне паміж сучаснай Польшчай і БССР // Беларускі зборнік. - Мюнхен, 1956. - Кн. - 4. - С. 34.
16. Волаціч М. Лінія Керзона на фоне падзеяў і тэрытарыяльных зьменаў у Усходняй Еўропе // Спадчына. - 1993.- № 6. - С. 30-33.
17. Демографический энциклопедический словарь. / Гл. ред. Д.И.Валентей. - М.: Сов. энцикл., 1985. - 607 с.
18. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў (ДАГА) Гродзенскай вобласці, ф.1, воп.1, спр.25.
19. Там сама, ф.1, воп.1, спр.37
20. Там сама, ф.1, воп.1, спр.74
21. Документы и материалы по истории советско-польских отношений: В 12 т. / Ред. коллегия И.А.Хренов, В.Т.Ковальский и др., М.: Наука, 1974. - Т. 8: январь 1944 г. - декабрь 1945 г. - 680 с.
22. Документы и материалы по истории советско-польских отношений: В 12 т. / Ред. коллегия И.А.Хренов, В.Т.Ковальский и др., М.: Наука, 1976. - Т. 9: январь 1946 г. - декабрь 1949 г. - 520 с.
23. Ермолович В.И., Жумарь С.В. Огнём и мечом: Хроника польского националистического подполья в Белоруссии (1939-1953 гг.). - Минск: БелНИИДААД, 1994. - 109 с.
24. Занальны дзяржаўны архіў г. Баранавічы (ЗДА), ф.184, воп.4, спр.3.
25. Там сама, ф.188, воп.1, спр.80.
26. Там сама, ф.188, воп.1, спр.436.
27. Занальны дзяржаўны архіў г. Маладзечна, ф.237, воп.4, спр.2.
28. Знешняя палітыка Беларусі: Зб. дак. і матэрыялаў. / Склад. Н.М.Дзятчык і інш. - Мінск: Бел. дзярж. ун-т, 2001. - Т.4: чэрвень 1941 г. - жнівень 1945 г. - 394 с.
29. Иларионова Т.Е. Обмен населением между СССР и Германией накануне и в начале Второй мировой войны // Отечественная история. 2004. № 4.-С.56.
30. Кнатько Г. К вопросу об обмене населением между Белоруссией и Польшей в 1944-1946 гг. // Тэзісы чацвертай навуковай канферэнцыі беларускіх і польскіх гісторыкаў "Армія Краёва на тэрыторыі Заходняй Беларусі" (чэрвень 1941- ліпень 1944 гг.), Гродна, 6-7 кастрычніка 1994. / Бел. навук. дaслед.цэнтр дакумент., археагр. і архіўнай справы. - 1994. - С. 103-108.

31. Колас Я. Збор твораў у чатырнаццаці тамах. Т.13. Пісьмы 1908-1949 гг. Мн., «Маст. літ.», 1997.
32. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК: В 6 т. / Под ред. Г.Г.Бартошевича и др. Минск: Беларусь, 1985. - Т.3: 1933-1945. - 550 с.
33. Лынькоў М. Беларуская прэс-канферэнцыя // Звязда. - 1945. - 26 мая. - С.1.
34. Маржала Т. Польскія школы ў БССР у пасляваенныя гады (1945-1949 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс, № 4.-2003
35. Милякова Л.Б. Польша на пути к моноэтничному государству (1918-1947 гг.) /http:www.history.machaon.ru/all/number_13/analit4/milyakova/index.html
36. Миранович А. Выбор веры и судьбы // Нёман. - 1994. - № 11. - С. 72-97.
37. Міранoвіч Я. Навейшая гісторыя Беларусі. - Беласток, 1999. - 270 с.
38. Началась эвакуация поляков из Белоруссии // Советская Белоруссия.- 1944.- 13 декабря. - С. 1.
39. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф.4, воп.2, спр.2933.
40. НАРБ, ф.4, воп.6, спр.1919.
41. НАРБ, ф.4, воп.6, спр.1952.
42. НАРБ, ф.4, воп.6, спр.1999.
43. НАРБ, ф.4, воп.6, спр.2103.
44. НАРБ, ф.4, воп.6, спр.2105.
45. НАРБ, ф.4, воп.6, спр.2107.
46. НАРБ, ф.4, воп.20, спр.213.
47. НАРБ, ф.4, воп.20, спр.217.
48. НАРБ, ф.4, воп.20, спр.224.
49. НАРБ, ф.4, воп.21, спр.2075.
50. НАРБ, ф.4, воп.29, спр.33.
51. НАРБ, ф.4, воп.29, спр.37.
52. НАРБ, ф.4, воп.29, спр.154.
53. НАРБ, ф.4, воп.29, спр.156.
54. НАРБ, ф.4, воп.29, спр.258.
55. НАРБ, ф.4, воп.29, спр.311.
56. НАРБ, ф.4, воп.29, спр.470.
57. НАРБ, ф.4, воп.29, спр.471.
58. НАРБ, ф.4, воп.29, спр.543.
59. НАРБ, ф.4, воп.29, спр.806.
60. НАРБ, ф.4, воп.29, спр.812.

61. НАРБ, ф.4, воп.29, спр.814.
62. НАРБ, ф.4, воп.29, спр.828.
63. НАРБ, ф.4, воп.33а, спр.165
64. НАРБ, ф.4, воп.33а, спр.568.
65. НАРБ, ф.4, воп.42, спр.94.
66. НАРБ, ф.4, воп.42, спр.97.
67. НАРБ, ф.4, воп.42, спр.111.
68. НАРБ, ф.4, воп.42, спр.140.
69. НАРБ, ф.4, воп.42, спр.150.
70. НАРБ, ф.4, воп.42, спр.245.
71. НАРБ, ф.4, воп.42, спр.246.
72. НАРБ, ф.4, воп.42, спр.375.
73. НАРБ, ф.4, воп.47, спр.25.
74. НАРБ, ф.4, воп.51, спр.7.
75. НАРБ, ф.4, воп.51, спр.11.
76. НАРБ, ф.4, воп.51, спр.13.
77. НАРБ, ф.4, воп.61, спр.70.
78. НАРБ, ф.4, воп.61, спр.73.
79. НАРБ, ф.4, воп.61, спр.90.
80. НАРБ, ф.4, воп.61, спр.91.
81. НАРБ, ф.4, воп.61, спр.101.
82. НАРБ, ф.4, воп.61, спр.141.
83. НАРБ, ф.4, воп.61, спр.157.
84. НАРБ, ф.4, воп.61, спр.237.
85. НАРБ, ф.4, воп.100, спр.2.
86. НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1902.
87. НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1905.
88. НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1915.
89. НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1916.
90. НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1917.
91. НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1918.
92. НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1922.
93. НАРБ, ф.787, воп.1, спр.1. Т.1.
94. НАРБ, ф.787, воп.1, спр.19.
95. НАРБ, ф.787, воп.1, спр.23.
96. НАРБ, ф.787, воп.1, спр.24.
97. НАРБ, ф.787, воп.1, спр.64.
98. НАРБ, ф.787, воп.2 спр.5.
99. НАРБ, ф.788, воп.1, спр.1.
100. НАРБ, ф.788, воп.1, спр.4.
101. НАРБ, ф.788, воп.1, спр.5.
102. НАРБ, ф.788, воп.1, спр.7.

www.kamunikat.org

103. НАРБ, ф.788, воп.1, спр.8.
104. НАРБ, ф.788, воп.1, спр.10.
105. НАРБ, ф.788, воп.1, спр.11.
106. НАРБ, ф.788, воп.1, спр.21.
107. НАРБ, ф.788, воп.1, спр.22.
108. НАРБ, ф.788, воп.1, спр.23.
109. НАРБ, ф.788, воп.1, спр.24.
110. НАРБ, ф.788, воп.2, спр.210.
111. НАРБ, ф.789, воп.1, спр.3.
112. НАРБ, ф.789, воп.1, спр.4.
113. НАРБ, ф.789, воп.1, спр.5.
114. НАРБ, ф.789, воп.1, спр.7.
115. НАРБ, ф.789, воп.1, спр.26.
116. НАРБ, ф.789, воп.1, спр.70.
117. НАРБ, ф.951, воп.2, спр.2.
118. НАРБ, ф.951, воп.2, спр.3.
119. НАРБ, ф.951, воп.2, спр.5.
120. НАРБ, ф.4683, воп.3, спр.365.
121. Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі, Пасл. А.Грыцкевіча; Укл: Н.Дашкевіч.- Мн.: «Навука і тэхніка», 1993
122. НКВД и польское подполье. 1944-1945: (По "Особым папкам" И.В.Сталина): Сб.док. / Сост. Т.В.Волокитина и др. - М.: Рос. АН, Ин-т славяноведения и балканистики, 1994. - 306 с.
123. Новейшая история стран Европы и Америки. 20 век. Учеб. для вузов: В 3 ч. / Под ред. А.М.Родригеса, М.В.Пономарева. - М.: Гуманит. изд. центр Владос, 2001.-Ч.3: 1945-2000. - 462 с.
124. Освобожденная Беларусь. Документы и материалы. В 2-х книгах. Кн.1. сентябрь 1943 – декабрь 1944 гг. / Сост.: В.Адамушко и др.-Мн.:НАРБ, 2004
125. Очерки истории советско-польских отношений. 1917-1977 гг.: / Ред. кол.: И.И.Костюшко, Л.Барылев и др. - М.: Наука, 1979. - 582 с.
126. Падпісанне пагаднення паміж ПКНВ і ўрадам Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі аб эвакуацыі польскіх грамадзян з тэрыторыі Беларускай ССР і беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы // Звязда. - 1944.- 10 верасня. - С. 1.
127. Паздняк Э. Суседзі і браты. - Мінск: Беларусь, 1970. - 112 с.
128. Памяць: Брэсцкі раён: Гіст. дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Уклад. В.П.Расіхін, Гал. рэд. Г.К.Кісялёў. - Мінск: БЕЛТА, 1998. - 571 с.

129. Памяць: Берастав. раён: Гіст. дакум. Хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Рэд. - уклад. М.І.Пацэка. - Мінск: БЕЛТА, 1999, 623 с.
130. Памяць: Валожын. ра-н: Гіст. дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Уклад. Я.Я. Янушкевіч, Рэдкал.: А.К.Лявонаў і інш. - Мінск: Маст. літ., 1996. - 453 с.
131. Памяць: Гіст. дакум. хроніка Глыбоц. р-на / Гал. рэд. Б.І.Сачанка і інш. Мінск: БелЭнцыкл., 1995. - 454 с.
132. Памяць: Гродна: Гіст. дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Склад. і навук. рэд. І.П.Крэнь. - Мінск: Бел.Энцыкл., 1999. - 711 с.
133. Памяць: Навагрудскі раён: Гіст. дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Навук. рэд. М.П.Касцюк і інш. - Мінск: Беларусь, 1996. - 559 с.
134. Памяць: Пастаўскі раён: Гіст. дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Уклад. К.І.Козак, А.І.Кузняцоў. - Мінск: БЕЛТА, 2001. - 686 с.
135. Памяць: Пінска: Гіст. дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Уклад.: В.М.Курсаў, С.Ф.Шапіра, Гал. рэд. Г.К.Кілсялёў. - Мінск: БЕЛТА, 1998. - 554 с.
136. Парсаданова В.С. Советско-польские отношения в годы Великой Отечественной войны. 1941-1945.- М.: Наука, 1982. - 280 с.
137. Парсаданова В.С. Советско-польские отношения. 1945-1949.- М.: Наука, 1990. - 191 с.
138. Переписка Председателя Совета Мнистров СССР с Президентами США и Премьер-Министрами Великобритании во время Великой Отечественной войны 1941-1945 гг.: В 2 т. / М-во иностр. дел СССР. Под. ред А.А.Громыко. - М.: Политиздат, 1986. - Т. 1: июль 1941 г. - ноябрь 1945 г. - 227 с.
139. Пичета В. Воссоединение земель в польском государстве: Стеногр. публич. лекции. - М.: Правда, 1945. - 24 с.
140. Поклад Б.И. Внешняя политика народной Польши. - М.: Междунар. отношения, 1978. - 256 с.
141. Прэс-канферэнцыя ў прадстаўніцтве Польскага камітэта нацыянальнага вызвалення ў Маскве // Звязда. - 1944. - 3 кастрычніка. - С. 4.
142. Ракашевич В. Послевоенная демаркация советско-польской границы и "великое переселение" белорусского и польского населения // Тэзісы чацвертай навуковай канферэнцыі беларускіх і польскіх гісторыкаў "Армія Краёва на тэрыторыі Заходняй Беларусі" (чэрвень 1941- ліпень 1944 гг.), Гродна, 6-7

кастрычніка 1994 г. / Бел.навук. даслед. цэнтр. дакумент., археагр. і архіўн. справы Гродна. - 1994. - С. 119-126.
143. Рыбак Н.А. Деятельность Армии Крайовой и постаковских формирований в Западной Белоруссии в 1944-1954 г. Дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02. - Мінск, 2001. - 116 с.
144. Рыбак Н.А. К вопросу об общественно-политической ситуации в западных областях БССР после освобождения Республики (1944-1945 гг.) / Беларусь в годы Великой Отечественной войны: уроки истории и современность: Материалы междунар. научн. конф. (Минск, 29-30 июня 2004 г.) / Сост. А.М.Литвин и др.-Мн.: Институт истории НАН Беларуси, 2004.-С.220.
145. Снапкоўскі У.Е. Міжнародныя аспекты вызначэння савецка-польскай мяжы ў 1943-1945 гг. // Бел. гіст. часопіс. - 1994. - № 3. - С. 9 -14.
146. Снапкоўскі У.Е. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі. 1944-1953 гг. / Пад рэд. Ю.П.Броўкі. - Мінск: Бел. навука, 1977. - 207 с.
147. Снапкоўскі У. Савецка-польскі дагавор 1945 г. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі / Гал. рэд. Г.П.Пашкоў. - Мінск: Бел.Энцыкл., 2001. - Т.6, кн.1. - С. 197.
148. Снапкоўскі У. Савецка-польскія пагадненні аб абмене насельніцтвам 1944-1945, 1957 г. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: / Гал. рэд. Г.П.Пашкоў. - Мінск: Бел.Энцыкл., 2001. - Т.6. Кн. 1. - С. 197-198.
149. Советский Союз и народная Польша: 1944-1947 гг.: Док. и материалы / Ред. кол.: Н.Н Родионов, С.Трепчиньский и др. - М.: Политиздат, 1974. - 664 с.
150. Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны. 1941-1945 гг.: Сб. док.: В 6 т. / Гл. ред. А.А.Громыко. - М.: Политиздат, 1984. - Т. 2: Тегеранская конференция руководителей трех союзных держав - СССР, США, Великобритании (28 ноября - 1 декабря 1943 г.). - 175 с.
151. Станкевіч А. Праблемы каталіцкага касцёла у БССР / Скарыніч. Літаратурна-навуковы гадавік. Вып.5: Мінск «Беларускі кнігазбор».- 2002
152. Толстой В.С. Братское сотрудничество белорусского и польского народов. 1944- 1964. - Минск: Наука и техника, 1966. - 135 с.
153. Томашевский Д.Г. Внешняя политика Польской Народной Республики. М.: Ин-т междунар. отношений, 1963. - 88 с.

154. Фейс Г. Черчилль. Рузвельт. Сталин. Война. Которую они вели и мир, которого они добились / Пер. с англ. Л.А.Игоревского.-М.: ЗАО Центрополиграф, 2003.
155. Черчилль У.С. Триумф и трагедия / ОЛМА ПРЕСС «Звёздный мир», 2004.
156. Царюк И.О. КПБ – организатор культурного строительства в западных областях Белоруссии (1939-1955 гг.). Минск.: Издательство БГУ им. В.И.Ленина, 1968.
157. Эбэрхардт П. Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі: 1889-1989. Менск: Бел. фонд Сораса, 1997. - 277 с.
158. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т.2 / Беларуская энцыклапедыя.; Рэдкал.: Б.І.Сачанка (гал. рэд.) і інш.- Мн.:БелЭН, 1994.
159. Этнасацыяльныя і культурныя працэсы ў заходнім рэгіёне Беларусі: гісторыя і сучаснасць: // Матэрыялы рэсп. навук. канф., Гродна, 5-6 снежня 1997 г. / Гродзен. дзярж. ун-т; Адк. рэд. И.П.Крэнь. - Гродна, 1998. - 441 с.
160. Ярмусік Э.С. Каталіцкі касцёл у Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны (1939-1945 гг.): Манаграфія.-Гродна.: ГрГУ, 2002.
161. Ясинский О. Польша социалистическая. - Минск: Беларусь, 1964. - 128 с.
162. Ясінскі А. Сябры-інтэрнацыяналісты. - Мінск: Беларусь, 1973. - 174 с.
163. Armija Krajowa w dokumentach. 1944-1945. T.V pazdernik 1944 – lipec 1945.-Londyn, 1981.
164. Bialorusini i stosunki polsko-bialoruskie na Bialostocczyznie 1944-1956: Wybor dokumentow / Oprac. S. Iwaniuk. - Bialystok: T-wo Hist., 1988. - T.1: sierpien 1944 - grudzien 1946, czesc 1: sierpien 1944 - grudzien 1945. - 1996. - 221 s.
165. Bialostoccyzna 1944-1945 w dokumentach podzemia i oficjalnych wladz / Oprac. Kulak J. Ins. Studiow Politycznych PAN.-Warszawa, 1998
166. Czerniakiewicz J. Repatriacja ludnosci polskiej z ZSRR 1944-1948. - Warszawa: Wyd-wo Nauk. PWN, 1987. - 263 s.
167. Glowacki A. Przemieszenia obywateli polskich w Zwiazku Radzieckim w 1944 r. Lods: Wyd-wo Uniw. Koszukiego 1989. - 130 s.
168. Kersten K. Repatriacja ludnosci Polskej po drugiej wojnie swiatowej: studium historiczne. - Wroclaw: Ossolineum, 1974. - 277 s.

169. Mironowicz E. Bialorusiny w Polsce. 1944-1949. Warszawa: Wyd-wo Nauk. PWN. - 1993. - 219 s.
170. Mironowicz E. Polityka narodowosciowa PRL. - Bialystok. - T-wo Hist., 2000. - 284 s.
171. Motas M. Nektore kwestie dotyczace przesiedlenia ludnosci Polskej z USRR
w latach 1944-1948. - Warszawa: 1975. - 245 s.
172. Przesiedlenie Ludnosci Polskiej z Kresow Wschodnich do Polscki 1944-1947. Wybor, opracow. i red. documentow Ciesielski S. - Warszsawa: "Neriton": Instytut Historii PAN, 1999. - 469 s.
173. Historia Dyplomacji Polskiej. T.5.-1939-1945 Pod. Red. Michanovicza. Warszawa.-1999. Wyd. Naukowe PWN
174. Siedlecki J.Losy Polakow w ZSRR w latach 1939-1986. Londyn: Gryf. Publ. 1988. - 404 s.
175. Sprawy narodowosciowe i wyznaniowe na Bialostocezyzne, 1944-1948: W ocenie wladz Rzeczpospolitej Polskiej. Wybor dokumentow: Situcyjne sprawozdania woewody Bialostockiego w Bialymstoku oraz Powiatowych starostow Bialostockiego, Bielspodlaskiego i Sokolskiego w latach 1944-1948 / Zebr. G. Sosna. - Ryboly, 1996. - 95 s.
176. Sword K. Deportation and Exile Poles in the Soviet Union, 1939-1948. - New York, St.Martin's Press, INC. 1994. - p. 183.
177. Tokc S. Zmiany stryktury narodowosciowej na pograniczu bialorusko-polskim w BSSR (1945-1959) // Bialoruskie Zeszyty Historiczne. Bialystok.-2004.
178. Turonek J. Kwestia Bialoruska w Polityce Obozu Londynskiego (1941-1944) // Studia dziejow ZSRR i Europy Srodkowej. Wroclaw. Instytut Historii PAN. T.XIX. 1983.